Яўген Анішчанка



КАМІСАРЫ КАСЦЮШКІ

1

ЯЎГЕН АНІШЧАНКА

Збор твораў у шасці тамах

Выдавец Віктар Хурсік

УДК 94(476)
ББК 63.3(4 Беи)
А32

А32 **Анішчанка Я. К.**
Збор твораў. У 6-ці т. Т.1. Камісары Касцюшкі: Дакументы паўстання 1794 г. у Літоўс. правінцыі /Я. К. Анішчанка.—Мн.:Выд.Хурсік, 2004.—364 с.

ISBN 985-6718-16-3 (т.1)
ISBN 985-6718-15-5

Збор твораў Я. Анішчанкі ў 6 тамах будзе ўключаць у сябе ўнікальныя, невядомыя раней дакументы, знойдзеныя аўтарам у архівах Беларусі і замежжа.

У першых трох тамах будуць змешчаны дакументы, што адносяцца да перыяду паўстання пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі.

У наступных тамах будуць прадстаўлены дакументы пра падзел Рэчы Паспалітай, а таксама інкарпарацыі Беларусі ў склад Расіі.

Першы том знаёміць чытача з дакументамі паўстання 1794 г. у ВКЛ, што знаходзяцца ў архіве Польскай акадэміі навук у Курніку. Вялікая значнасць дакументаў у тым, што яны дакладна адлюстроўваюць дзейнасць парадкавых камісій паўстання (асабліва, Гродзенскай) за ўвесь час іх існавання.

УДК 94(476)
ББК 63.3(4 Беи)

ISBN 985-6718-16-3 (т.1)
ISBN 985-6718-15-5

© Анішчанка Я., 2004
© Выдавец Хурсік В., 2004

Наталі і Ксеніі Раханавым

Уводзіны

Дадзены зборнік з'яўляецца працягам публікацый дакументаў аб паўстанні 1794 г. пад кіраўніцтвам Т.Касцюшкі ў Вялікім княстве Літоўскім (ВКЛ).

У гэтым выданні прадстаўляюцца матэрыялы толькі адной архіўнай справы, якая захоўваецца ў бібліятэцы польскай Акадэміі навук у Курніку і якой складальнік меў шанц карыстацца ў копіі дзякуючы спагадзе дырэктара тамтэйшай бібліятэкі сп.Станіслава Серпкоўскага. Дакументы гэтай справы ўнікальныя перад усім тым, што яны дазваляюць упершыню дэтальна азнаёміцца з дзейнасцю выканаўчых органаў паўстання — т.зв. парадкавымі камісіямі.

Зборнік задаволіць чытача ў гэтых адносінах значна, бо пра парадкавыя камісіі паўстання вядома пакуль мала. Знакаміты даследчык паўстання ў ВКЛ — Г.Масціцкі — толькі згадаў пра існаванне такіх органаў улады. В. Бартэль налічвае 21 такіх камісій у ВКЛ і адзначае, што да ўніфікацыі выканаўчых органаў улады паўстання ў Кароне і ВКЛ (30 мая 1794 г.), літвінскія камісіі ствараліся на ўзор цывільна-вайсковых камісій распушчанага ў 1792 г. Вялікага сейма, па яго штатах і па прынцыпах канстытуцыі 3 мая 1791 г. Першым гісторыкам, хто ўважліва паглядзеў на дзейнасць і функцыі парадкавых камісій ВКЛ, быў Е.Кавецкі. Прычым ён скарыстаў шэраг дакументаў цытуемай тут архіўнай справы адносна арганізацыі паспалітага апалчэння і рэалізацыі

Паланецкага ўніверсала Т.Касцюшкі. Падобнае становішча можна растлумачыць хіба тым, што гісторыкі засяроджваліся на ўзаемаадносінах вышэйшага кіраўніцтва паўстаннем у Кароне і ВКЛ і супярэчнасцях паміж імі.

З усіх адрозненняў найперш трэба вылучыць два. У кракаўскім акце 24 сакавіка Т.Касцюшка запэўніў, што ніводная мясцовая ўлада ні асобна ні разам не паўнамоцныя ўхваліць канстытуцый агульнадзяржаўнага значэння да перамогі паўстання, а таму ён адкладвае сацыяльныя перамены на волю скліканых на сейм пераможцаў. Засталося незразумелым, ці то ён меў на ўвазе скліканне паслоў распушчанага ў 1792 г. Вялікага сейма, ці то нанава сабраных. З-за часовасці ўсіх паўстанцкіх улад Касцюшка выдаў свой першы акт ад імя толькі Кракаўскага ваяводства і чакаў яго падтрымкі з іншых ваяводстваў Кароны і ВКЛ. Гэтая асцярожнасць і маруднасць Найвышэйшага начальніка паўстання разам з шэрагам абставін падштурхнула віленскае кіраўніцтва адразу выступіць ад імя ўсяго ВКЛ. 24 красавіка яно абвясціла сябе Найвышэйшай радай у краі і адначасова папрасіла прысланць для агульнага прадстаўніцтва дэлегатаў з месцаў, так, як быццам бы яны збіраліся на сейм. Тым самым віленчукі выканалі дзейства, якое Т.Касцюшка назваў у сваім кракаўскім акце "узурпацыяй" улады без упаўнаважання.

Другое адрозненне састаяла ў тым, што ліцвіны адразу прысвоілі сабе права завочнага смяротнага пакарання без "усялякага судаводства", тады як Касцюшка і яго каронныя паплечнікі клапаціліся пра захаванне законнасці працэдуры крымінальнага пераследу. Віленчукі на другі дзень паўстання (25 красавіка) павесілі гетмана Ш.Касакоўскага ў знак дэманстрацыі сацыяльнай роўнасці і прыгразілі без суда і следства распраўляцца з усімі праціўнікамі паўстання або сваёй Рады. Вобразна

кажучы, над Вільна ўзнялася грозная постаць палкоўніка Я.Ясінскага, які сказаў прысутнаму натоўпу, што калі хто пікне супраць, то той тут жа будзе павешаны на гэтай жа шыбеніцы. Гэтыя словы разам з шыбеніцай зрабілі Ясінскаму і віленскай радзе арэол "якабінізма" і радыкалізма на шляху да сацыяльнай роўнасці. Касцюшка наадварот казаў, што пачынае "не французскую рэвалюцыю" і стараўся не дапусціць вулічнага самасуда, масавага тэрору з яго трагічным узаемазнішчэннем.

Гэтыя акалічнасці апынуліся крыніцай непаразумення паміж каронным і віленскім кіраўніцтвам паўстаннем, якія Касцюшка спыніў сваёй дыктатарскай уладай. 10 мая ён стварыў Найвышэйшую нарадовую раду (ННР), якой прадпісаў арганізаваць Цэнтральную дэпутацыю (ЦД) ВКЛ і парадкавыя камісіі агульна для Кароны і ВКЛ. 21 мая ён скасаваў віленскую раду і замест яе 1 чэрвеня стварыў ЦД ВКЛ у якасці падначаленай ННР і сабе выканаўчай улады. На месцах ёй падпарадкоўваліся парадкавыя камісіі, якія дагэтуль раскалоліся паміж прыхільнікамі кракаўскага і віленскага актаў. З 30 мая камісіі ствараліся па адзінаму штату з 21 чалавек у складзе 7 аддзелаў (скарбу, парадку, бяспекі, справядлівасці, жыўнасці ці харчавання, ваенных патрэб і інструкцый).

Дакументы зборніка якраз адлюстроўваюць час гэтага пераўтварэння і пераходу да аднастайнай арганізацыі выканаўчых органаў паўстання ў Кароне і ВКЛ. Зборнік будзе асабліва карысны тым, што ён утрымлівае амаль цалкам дыярушы аб дзейнасці Гродзенскай парадкавай камісіі на ўсім працягу яе існавання. Такой магчымасці не маюць нават публікацыі адносна Кароны. Пакуль што гэта адзіны дакументальны збор, які дазволіць у дробязях меркаваць аб абліччы выканаўчай улады на месцах. Праўда, чытачу трэба пазбегнуць неапраўданых абагульненняў на прыкладзе адной камісіі паўстання.

Усе дакументы скарыстанай тут архіўнай справы напісаны на польскай мове і перакладзены на беларускую складальнікам. Таму гэтая акалічнасць не адзначаецца ў кожнай спасылцы на акт. У архіўным арыгінале дакументы скамплектаваны па тэрытарыяльнаму прынцыпу. Прынамсі, ідуць:

рэзалюцыі ННР (лл. 1—87),
матэрыялы па Віленскаму ваяводству (лл. 88—168),
Ашмянскаму павету (лл. 168—181),
Завілейскаму (лл.181—195),
Эйшышскаму (лл. 195—208),
Лідскаму (лл.208—265),
Вількамірскаму (лл. 266—327),
Браслаўскаму (лл.327—343),
Трокскаму (лл.343—386),
Мерачскаму (лл. 387—428),
Гродзенскаму паветах (лл.429—630).

Складальнік у большасці захаваў гэты прынцып, аднак змяшчае ў зборніку справы тых камісій, якія тычацца тэрыторыі сучаснай Беларусі, а ўжо сярод іх прытрымліваўся храналагічнага адбору. Пэўныя цяжкасці паўставалі пры перакладзе з-за дзённікавага, сціплага характару запісаў, а таксама з-за шматзначнасці многіх тэрмінаў. Таму даводзілася максімальна прытрымлівацца арыгіналу. Складальнік таксама вырашыў пазбегнуць каментарыяў у спасылках да кожнага дакумента адносна мясцовасцяў і асоб з разліку на працяг адпаведных публікацый. Фінансавыя цяжкасці выдання ў чарговы раз прымусілі скараціць імянны паказальнік да спісу асоб, фігурыруючых у крыніцах. На жаль, не ўдалося ахарактарызаваць усіх фігурантаў нават пры дадатковым пошуку належных звестак у іншых крыніцах.

КАМІСАРЫ КАСЦЮШКІ

№ 1. 8 мая. Заклік Часовай рады Мазавецкага княства да агульнага ўзбраення ВКЛ

Часовая рада Мазавецкага княства пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі, найвышэйшага начальніка збройнай сілы, да абывацеляў ВКЛ.

Як салодка і горда нам чуць аб вашым, абывацелі, паўстанні і злучэнні, што пахвальна пачатую справу поўным пашырэннем на народны агром утрымаеце. Дзеля гэтага маем гонар падаць вам абвяшчэнне аб паспалітым рушанні разам с устанаўленнем падаткаў і рэкрут у Мазавецкім княстве. Абывацелі! Аб'яднанне ўсіх жаданняў і ўзбраенне ўсіх людзей абавязкова патрэбны для адолення нашых непрыяцеляў. Звыш таго ведаем, што нашае войска, падкопамі здрады і гвалтам разваленае, зараз настолькі шчуплае, каб хацела і магло прадпрыняць агульную абарону края. Да зброі, абывацелі! Гэта крык паратунку Айчыны, які наша рада вам пасылае і беззупынна ва ўсе бакі польскай зямлі разсылаць будзе.

Даны ў Варшаве 8 мая 1794 г. Ян Высагот Закрэўскі, прэзідэнт месца Варшавы і Часовай рады.

Пад пячаткай

БПАНК, спр.1090, л.1

№ 2. 4 чэрвеня. Прадпісанне Найвышэйшай нарадовай рады аб паўсюднай арганізацыі парадкавых камісій

Найвышэйшая рада нарадовая.

Ужо маючы прапісаную да акта нарадовага паўстання агульную арганізацыю парадкавых камісій, але жадаючы яе мець з поспехам выкананай, пастанаўляе для належнай дзейнасці кожнай парадкавай камісіі правілы.

1. Зараз адарваныя ад цела Рэчы Паспалітай ваяводствы, землі і паветы, якія будуць вернуты зброяй нашых братоў, згодна сваіх магістратур управяцца, а астатнія часткі тым часам падпарадкуюцца парадкавым камісіям, з якімі бліжэй мяжуюць.

2. Прадпісанне 2-га пункта 1-га артыкула аб выбранні камісараў таго толькі тычыцца, дзе дагэтуль парадкавыя камісіі не абраны або не пастаўлены.

3. Там, дзе парадкавыя камісары або абраны або ўжо пастаўлены, там новым выбарам абывацелям не належыць займацца.

4. Калі б у якой-нібудзь існуючай парадкавай камісіі мелася асоб больш прадпісанага арганізацыяй або не адпавядала тым вопісам ці укладам, там Найвышэйшая рада скароціць або дабавіць столькі асоб, колькі гэта будзе патрэбнна адпаведна згаданаму вопісу.

5. Для гэтага ўсе зараз існуючыя парадкавыя камісіі павінны прысласць не марудзячы радзе: 1 — лісты асоб, зараз іх склад фарміруючых, 2 — лісты асоб, якія былі выбраны у парадкавыя камісіі згодна прадпісанню канстытуцыйнага сейма.

6. Па атрыманні такіх лістоў Найвышэйшая рада неадкладна дасць рэзалюцыю з якіх асоб будзе фарміравацца склад згаданых камісій, аднак пакуль тое наступіць, кожная парадкавая камісія не адступіцца выконваць прадпісаныя сабе абавязкі ў такім складзе асоб, у якім зараз знаходзіцца.

7. Кожная парадкавая камісія, існуючая ў цяперашнім складзе, па атрыманні арганізацыі зараз жа падзеліцца на вызначаныя аддзелы. Кожны з тых аддзелаў мусіць фарміраваць асобныя рапарты сваіх чыннасцяў, якія камісія з далучэннем на пленуме сваіх рапартаў будзе разам адсылаць у Найвышэйшую раду, чаму ўсяму належыць збірацца ў Польшчы.

8. У Літве жа парадкавыя камісіі свае рапарты падобным спосабам з-за асобнасці аддзелаў ЦД, а ЦД

будзе адсылаць ННР з той агаворкай, што якія літоўскія парадкавыя камісіі бліжэй да Найвышэйшай рады, чым да ЦД знаходзяцца, тыя два згодныя рапарты сваіх чыннасцяў складуць і адзін у раду, а другі ў ЦД павінны прысылаць.

9. Паколькі актам нарадовага паўстання выбар асоб у крымінальны суд даручаны Найвышэйшай радзе і яго забяспечыць з асоб, якія на урад суддзяў былі выбраны праз земскія і гродскія выбары апошніх вольных сеймікаў, а дагэтуль кіруемыя справядлівай стараннасцю некаторыя ваяводствы і землі, не жадаючы цярпець доўга беспакаранымі ўчынкі супраць народа і паўстання, самі прыступілі да выбару пастаноўленых асоб і судоў, тады, каб злучыць іх дбайнасць з прадпісаннымі абавязкамі, загадваем усім парадкавым камісіям спісаць і прысылаць радзе лісты не толькі тых асоб, якія згаданымі апошнімі сеймікамі і гарадскімі элекцыямі вольна абраныя, але і тых, хто зараз у крымінальныя суды пастаўлены.

Даны у Варшаве на сесіі Нарадовай рады 4 чэрвеня 1794 г.

Ксёндз Гуга Калантай, старшыня
Томаш Чэх, сакратар ННР

БПАНК, спр. 1090, л.3—3 адв.

№ 3. 9 чэрвеня. Прадпісанне ННР аб паслухмянасці ўпаўнаважанаму Катлу

Абывацелі! Абывацель Коцел упаўнаважаны асобнай інструкцыяй Найвышэйшага начальніка збройнай сілы і Нарадовай рады зносіцца з літоўскімі парадкавымі камісіямі ў тым, што належыць да вайсковых патрэб, а таму рада смее разлічваць, што ЦД ВКЛ загадае тым жа парадкавым камісіям слухаць абывацеля Катла і

чаго ён ад іх пажадае, усё тое стараліся неадкладна выконваць, быць цалкам яму дапамогай ва ўсім тым, што пункты інструкцыі, дадзенай яму Найвышэйшым начальнікам збройнай сілы і Нарадовай радай, ад парадкавых камісій патрабуюць і выкананне іх загадваюць.

Гуга Калантай, старшыня.

У Варшаве 9 чэрвеня 1794 г.

БПАНК, с.1090, л.9

№ 4. 18 чэрвеня. Рэквізіцыя ННР у ЦД аб падсумаванні спраў таргавіцкай канфедэрацыі

Рэквізіцыя ў ЦД літоўскую аб даручэнні літоўскаму метрыканту Казаноўскаму абагуліць чыннасці таргавіцкай канфедэрацыі

Аддзел бяспекі ННР

Жадаючы як мага дакладней даведацца аб асобах, якія склалі таргавіцкі спіс і аказаліся саўдзельнікамі ягоных здрадніцкіх прац, паколькі інфармацыя можа быць найлепшым сродкам пазнавання тых бяспраўных учынкаў, то аддзел загадаў каронным метрыкантам, каб яны выпісалі з таргавіцкіх актаў у метрыках лісты усіх асоб, таргавіцкі спіс склаўшых. Калі ж тыя метрыканты у той дзень зрабілі падсумаванні вынікаў з дапасаваннем да тлумачэння абавязкова патрэбных заўваг, то аддзел бяспекі, не знаходзячы ў іх дакладах ніякага сляда чыннасцяў, зробленых таргавіцкім спісам у Літве, паколькі яны змешчаны у літоўскай метрыцы, даручае ЦД ВКЛ у адпаведнасці з даным у копіі патрабаваннем да каронных метрыкантаў як мага хутчэй загадаць абывацелю Казаноўскаму, літоўскаму метрыканту, каб ён падобныя да каронных метрыкантаў усялякія падсумаванні дзействаў таргавіцкага спіса ў Літве з

хутка і дакладна зробленымі належнымі заўвагамі да тлумачэння зладжыў у ЦД ВКЛ, а дэпутацыя, ледзь толькі іх атрымае, не ўхіліцца ў жаданні прысладь ННР.

Даны у Варшаве на сесіі аддзела бяспекі ННР 18 чэрвеня

1794 г. М.Каханоўскі, прэзідэнт адз. бяспекі, А.Глінскі, сакратар.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.12—12 адв.

№ 5. 18 чэрвеня. Рэзалюцыя ННР на розныя прапановы Кобрынскай парадкавай камісіі

Вытрымка з рэзалюцыі ННР, дадзенай кобрынскай камісіі.

ННР атрымала прадстаўленне парадкавай камісіі Кобрынскага павета ў наступных пунктах. 1. Адносна прыняцця квоты у 50 злотых за рэкрута, пакінутага паза лічбай, прадпісанай з 5 дымоў. 2. Адносна збяднелай шляхты, трымаючай дробныя часткі зямель у няроўных спадчынах і не маючай здатнасці паставіць коннага ахвотніка. 3. Адносна рыштунку кантаністаў з сталовых эканамічных добраў.

Прапануем. Што да 1 і 2-га, то заўвагі кобрынскай парадкавай камісіі палічаны слушнымі, ды і ўклад у той меры прапанаваны, дазваляе выканаць. Што ж да 3-га: паколькі даходы з тых добраў належыць збіраць начальству эканомій, то каб яно скараціла той цяжар з грамад, тое будзе абавязкам дагляду парадкавай камісіі Кобрынскага павета.

Даны ў Варшаве на сесіі ННР 18 чэрвеня 1794 г.

Выданы з пратакола. *Т.Чэх,* сакратар ННР. Згодна з вытрымкай рэзалюцыі ННР *Караль Кулакоўскі,* пісар парадкавай камісіі Кобрынскага павета

БПАНК, с.1090, л. 14

№ 6. 21 чэрвеня. Рэзалюцыя ННР адносна аплаты сукна з гродзенскай фабрыкі

Скарбовая дэпутацыя ННР згодна рэзалюцыі ННР ад 18 дня і месяца бягучага, патрабуючай выплаціць 63034 зл. 25 грошаў гродзенскай фабрыцы за пастаўленае па кантракту сукно ў нарадовае войска, загадвае ЦД літоўскай абавязаць Гродзенскую парадкавую камісію ў такой належнасці задаволіць фабрыку з падаткавых рэштак і абывацельскіх ахвяр, а калі ў касе згаданай камісіі тым часам не акажацца дастатковага фундушу для заспакаення выпадаючай належнасці, тады недахоп няхай парупіцца задаволіць з публічных кас.

Даны у Варшаве на сесіі 21 чэрвеня 1794 г.

Ксёндз Г.Калантай.

БПАНК, с.1090, л.15

№ 7. 27 чэрвеня. Рэзалюцыя ННР аб назначэнні складу Брэсцкай парадкавай камісіі

Копія рэзалюцыі аб вызначэнні асоб у Брэсцкую парадкавую камісію.

ННР назначае ў Брэсцкую парадкавую камісію і падцвярджае абываценяў Паўла Ягміна, ксяндза Фабіяна Саковіча, Міхаіла Жытлока, Стэфана Райскага, Яна Крапінскага, Міхаіла Залескага, ксяндза Пашкевіча, Станіслава Лухоўскага, Раймуша, ігумна ябланоўскага, Яцэка Пашкоўскага, Яна Нямцэвіча, Станіслава Клакоцкага, ксяндза Адама Кукеля, прабошча воўчынскага, Вінцэнта Выганоўскага, ксяндза Бухавецкага, рэктара, і Клеманса Махвіца, якім загадвае разам з прыданымі яшчэ 5 асобамі з абываценяў, гарадскіх жыхароў, атрымаўшы розныя пратаколы мінулага склада камісіі, пастарацца выконваць абавязкі арганізацыі, агулам для ўсіх камісій прадпісаныя, і ўсякія распараджэнні як Найвысшага начальніка, так і ННР, а таксама аб сваіх чыннасцях радзе рапартаваць.

Даны у Варшаве на сесіі рады 27 чэрвеня 1794 г.
Тадэвуш Дэмбоўскі, старшыня. *Т.Чэх*, сакратар ННР.
Згодна з арыгіналам, *Мартын Пашкоўскі*, пісар Брэсцкай парадкавай камісіі.

БПАНК, с.1090, л.81

№ 8. 15 ліпеня. Рэзалюцыя ННР на меркаванні ЦД ВКЛ аб яўцы на паспалітае рушанне застаўнікоў і пасэсараў

ННР на прадстаўленне ЦД ВКЛ — ці павінны застаўныя, арэндныя пасэсары і дзяржаўцы каралеўскіх сталовых добраў з'яўляцца на паспалітае рушанне, дэкляруе, што пасэсары якога-небудзь звання не могуць вызваляцца ад абавязку паспалітага рушання і што яны выконваюць усе тыя ўмовы, якія маюцца ў універсале, выдадзеным 6 чэрвеня б.г.
Даны у Варшаве на сесіі рады 15 ліпеня 1794 г.
М.Каханоўскі, старшыня, *Т.Чэх*, сакратар ННР

БПАНК, с.1090, л.43

№ 9. 21 ліпеня. Адказ ННР на пажаданні гродзенскага генерал-маёра А.Казаноўскага адносна асігнаванняў гродзенскай касы

ННР з нагоды прапанаванага 18 дня бягучага месяца пажадання абывацеля Казаноўскага, генерал-маёра Гродзенскага павета, каб гродзенская каса па ягоных рэквізіцыях і квітанцыях выплаціла грошы на пенсіі, заробкі і кантынгент, дае адказ. Калі ўжо парадак скарба і прадпісанне ННР прызначае яго даходы выплочваць асігнацыямі ЦД ВКЛ і калі Найвышэйшы начальнік збройнай сілы нарадовай загадаў выдаваць плату афіцэрскай крэатуры карпусоў не раней, чым галоўнакамандуючы генерал засведчыць верны камплект галоў для фінансавання, з чаго абывацель, генерал-маёр

Казаноўскі, адпаведна таму павінен здабыць рэквізіцыю ў ЦД ВКЛ генеральнага каменданта, якая ўжо сваю асігнацыю падасць касе Гродзенскага павета. Гэтак жа і генеральны камендант праз сваю рэквізіцыю ў ЦД ВКЛ будзе высылаць фундуш на кантынгент палкоў і атрыманыя асігнацыі да корпуса абываацеля Казаноўскага.

Даны у Варшаве на сесіі рады 21 ліпеня 1794 г.

Выдана з пратаколу. *Т.Чэх*, сакратар ННР

БПАНК, с.1090, л.32

№ 10. 5 жніўня. Рэзалюцыя ННР адносна розных эканамічных пытанняў

У сувязі з тлумачэннем ад 29 ліпеня 1794 г. упаўнаважанага Ковенскага павета абываацеля Юзафа Фергіса аб абцяжарванні старасцінскіх мяшчан дзяржаўцамі старостваў у Літве, ННР, выконваючы рэгламент таго аб'екта, адасланы Найвысшым начальнікам у ННР, адказвае, што рэгламент Найвышшага начальніка ад 7 і 30 мая 1794 г., абешчаны універсалам рады аб палёгцы павіннасцяў людзей на карысць пасэсараў, аднолькава можа служыць пры скарачэнні дзён працы і жыхароў мястэчак Рэчы Паспалітай. А раз прывілеі мястэчкам Рэчы Паспалітай, паданыя канстытуцыйным сеймам на разгляд асэсорыі ВКЛ у падрабязнасцях і па сутнасці да таго суда належаць, таму рада адносна таго аб'екта зараз нічога не можа пастанавіць, а рэч тую пакідае да адкрыцця судоў у наступны час. А што да правоза на партовых рэках, то рада ні кранацца ўласнасці абываацеляў, якія пажыткі ўласнікам прыносяць, ні адбіраць іх не можа. Той аб'ект правадаўства завяшчае волі Нарадовай рады у прыдатны час. Што ж тычыцца мастоў і перавозаў, патрэбных для бяспечнага і зручнага праходу войскаў

Рэчы Паспалітай, то тое для рашэння парадкавых камісій Кароны і ЦД ВКЛ, згодна з выдадзенымі ўжо у той акалічнасці неаднаразовымі ўказамі, адсылае і даўярае.

Даны у Варшаве на сесіі рады 5 жніўня 1794 г.

Юзаф Заёнчак, старшыня, *Т.Чэх*, сакратар ННР

БПАНК, с. 190, л.72

№ 11. 16 кастрычніка. Тлумачэнні Віленскай парадкавай камісіі перашкод пры рэалізацыі ўніверсала ад 6 чэрвеня аб апалчэнні

Парадкавая камісія Віленскага ваяводства, маючы аб'ектам сваіх старанняў і намаганняў як мага хутчэй і пунктуальней выконваць распараджэнні і наказы ННР пад начальствам Тадэвуша Касцюшкі, прадугледжваючы некаторыя сумненні і цяжкасці, якія могуць перашкодзіць і затрымаць выкананне і ажыццяўленне пастаноў, выдадзеных універсалам ННР ад 6 чэрвеня, адносна вырашэння тых няпэўнасцяў і ўхілення паходзячых цяжкасцяў, загадзя звярнулася ў найсвятлейшую ЦД ВКЛ аб тым з наступнымі агульнымі пунктамі.

1. У першым пункце згаданага ўніверсала загадана ставіць рэкрута з 5 дымоў, аднак паколькі абывацелі ВКЛ паводле указаў літоўскай рады ўжо паставілі з 25 дымоў добра абмундзіраванага рэкрута і без 15 злотых месячнага жалавання, як апісвае той універсал, а з платай 100 зл., то і здаецца, што зараз трэба прыняць у лік 5-дымовага рэкрута і ў прадпісанае яму месячнае жалаванне 25-дымовых рэкрутаў і адпаведна захаваць плату пры ім, інакш Літва будзе больш Кароны прыцiснута, калі Карона дае рэкрута толькі з 5 дымоў, а Літва, замучаная 25-дымовымі, зараз зноў бы з 5 дымоў давала.

У Віленскім ваяводстве шмат таксама чыншавай шляхты, аселай у хатах земляробаў. Калі яна выйшла і

кожны час выйсці у паспалітае рушанне абавязана, тады здаецца, што не належыць лічыць занятыя ёю дымы сярод тых, якія абавязаны 5-ці або 10-ці дымовым рэкрутам. Гэта ж і да тых захожых і вольных людзей, якія па сваёй ахвоце пайшлі ў паспалітае рушанне, каб трапіць у лік шляхты.

У Віленскім ваяводстве шмат аселых маскалёў, пад назвай бурлакі, з якіх ніхто дасюль не пайшоў у паспалітае рушанне і за 25-дымовага рэкрута не ўзяты. А таму, каб не абцяжарыць радавітых земляробаў, выпадае магчымасць узяць тых жа бурлакоў або конна або пеша хіба што для ўжыцця супраць прусаў.

2. Другі пункт патрабуе з 50 дымоў коннага і няўзброенага рэкрута. Тым часам ягомосці ротмістры безапеляцыйна вымагалі з усіх абывацеляў Віленскага ваяводства плату за конных і ўзброеных рэкрутаў і так у адных месцах з 5 дымоў аднаго, а ў іншых агулам, навярнуўшы на цэлую воласць і двор(фальварак). Слушнасць жа тых пагалосак абывацеляў патрабуе палічыць выгнаных на паспалітае рушанне коннікаў за 50-дымовага рэкрута, асабліва якіх далёка ад сваёй воласці аддалілі і не ясна на які доўгі час затрымліваюць.

3. Пункт шосты прадпісвае рушыць з воласці палову грамады з харчовым забеспячэннем на 10 дзён. Значыць, тую грамаду нельга рушыць так далёка, як гэта парафіяльныя ротмістры вельмі хочуць і як зараз хацелі, выгнаўшы людзей на паспалітае рушанне адных конна, другіх пеша, узяць па 100 зл. на утрыманне тых, якія з дворных дымоў пайшлі. Які ж зараз спосаб прадастаўлення рэкрут абывацелямі? Якім спосабам далей весці земляробства, якім спосабам плаціць звычайныя падаткі і надзвычайныя паборы? Справядлівасць, здаецца, патрабуе, каб для палёгкі абывацелям лічыць людзей, выгнаных як конна, так і пеша, на паспалітае рушанне, коннымі і пешымі рэкрутамі хаця б да той пары, пакуль яны не вернуцца ў свае хаты, інакш земляробства вельмі падупадзе.

Парадкавая камісія Віленскага ваяводства, прыносячы ў тым свае скаргі на ротмістраў парафій, нарабіўшых шмат гвалту і надзвычайшчыны, просіць ЦД ВКЛ загадзя паведамляць і давяраць выконваць парадкавым камісіям розныя арданансы аб паспалітым рушанні, а ўжо тыя выконваць будуць праз пастаўленых у ваяводстве сваіх дазорцаў разам з ротмістрамі парафій.

4. Калі ўтрыманне земляробства начальнікам збройнай сілы даверана агульнаму клопату, а тое зараз выпала ці то з-за рэкрут, вельмі патрэбных да прац, ці то з-за паспалітага рушання, то ці не было б лепшым абавязаць бурлакоў адным днём паншчыны у тыдзень на двары і агульную дапамогу усёй грамадзе адной жа воласці.

5. Пунктам 4-м загаданы на войска фураж. Калі Віленскае ваяводства яго ўжо даставіла, а даць другі раз не ў стане, то, здаецца, зараз павінна быць зволеным ад фуражыравання.

Ігумен *Ежы Яноўскі*, камісар, старшыня парадкавай камісіі.

16 кастрычніка.

БПАНК, с.1090, л.88—90 адв.

№ 12. 30 красавіка. Рапарт парадкавай камісіі Ашмянскага павета аб адкрыцці сваёй прысутнасці

Адбылося на сесіі ў Ашмянах 30 красавіка 1794 г.

Вайсковая і парадкавая камісія Ашмянскага павета на моцы выданага 27 красавіка б.г. Найвышэйшай радай універсала ў складзе асоб элекцыі 14 лютага 1794 г., на ўзор канстытуцыі 3 мая 1791 г. выбраных тады на вольным сейміку, даносіць, што пачала свае чыннасці на ўзор той жа канстытуцыі 3 мая 1791 г. згодна з вышэй датаваным універсалам Рады.

Ануфры Місевіч, старшыня цывільна-вайсковай камісіі Ашмянскага павета, *Станіслаў Касацкі*, цывільна-вайсковы і парадкавы камісар Ашм. пав., *Францішак Пíслевіч*, цыв.-вайск. і парад. Камісар Ашм. пав., *Томаш Ган*, земскі рэгент ашмянскі.

БПАНК, с.1090, л.174

№ 13. 12 мая. Рапарт бурмістра Ашмян у віленскі магістрат аб ваеннай абстаноўцы

Рапарт у святлейшы галоўны магістрат месца Вільна з месца Ашмяны 12 мая 1794 г.

1. З Беліцы ягомосць камісар даносіць скаргу аб тым, што Беліца, усяго ў 6 мілях ад нас, разрабавана.

2. Маскалі з Данюшава прабраліся ў той бок. Атрымаць звестак нельга, дакуль дабяруцца, а тое ў 4,5 мілях ад Ашмян.

3. Двор Сулістроўскага Палачаны спалены і разрабаваны.

4. Гарадзіслаў і плебанію генерал-маёра Коцела разрабавалі.

5. Люд мяшчанскі і навакольныя двары ў якім хто можа ўзбраенні.

Не бачым толькі павадыра, які б пажадаў таго. Камісія пісала ягомосць дэлегату Ашмянскага павета, каб прадставіў у дапамогу жаўнераў. Застаемся з той просьбай аб хутчэйшым паведамленні – спадзявацца нам ці не ?

6. Крэсы тым (*зносінам — Я.А.*) гусцей пастаноўлены для хутчэйшага ва ўсім паведамлення.

Паверыўшы верныя ведамасці, рапарт чыніў *Вінцэнт Пазняк*, бурмістр м.Ашмяны.

БПАНК, с.1090, л.108

№ 14. 29 ліпеня. Рапарт парадкавай камісіі Ашмянскага павета аб сваім складзе

Мы, ніжэй паказаныя суддзі земскага і крымінальнага суда Ашмянскага павета, на моцы акта Кракаўскага паўстання Найвышэйшага начальніка прызначаныя да выбару з земскіх суддзяў 1792 года і радай літоўскай 24 мая 1794 г. назначаныя з асоб Юзафа Заблоцкага, Адама Корсака, Феліцыяна Бенкунскага, Адама Кунцэвіча, земскіх суддзяў, Мартына Супінскага, ашмянскага падстарасты, і Вінцэнта Пазняка, бурмістра месца Ашяны (акрамя адсутных на той час крымінальных суддзяў абывацеляў Ігнація Важынскага, шамбеляна, Стэфана Сулістроўскага, гранічнага камісара), выканалі 16 чэрвеня ў цывільна-вайсковай камісіі м.Ашмян прысягу на абавязкі крымінальных суддзяў, аднак потым, калі з-за ўварвання Масквы у м.Ашмяны Ашмянская цывільна-вайсковая камісія з 18 чэрвеня да цяперашняй даты не судзіла, а з прычыны атрымання 4 чэрвеня рэзалюцыі Найвышэйшай рады аб неабходнасці скласці крымінальны суд з 12 асоб, тая камісія дагэтуль не магла рапартаваць аб выкананай намі прысязе і лістоў у Найвышэйшую раду не пасылала, то затым мы, ніжэй паказаныя суддзі, учыніўшы рапарт аб выкананай прысязе і не могучы выконваць павіннасцяў з-за некамплекта паводле рэзалюцыі Найвышэйшай рады, просім дадаць да колькасці звыш паказаных 12-ці асоб крымінальных суддзяў адпаведна з лістамі(?) згодных абывацеляў Ашмянскага павета. Чакаем назначэння Вышэйшай рады з далучэннем таксама цывільна-вайсковых камісараў, абраных у 1792 г. і 29 мая дабраных. Пісана як вышэй.

Адам Ігнацій Корсак, земскі і крымінальны суддзя Ашмянскага павета.

Феліцыян Бенякунскі, земскі і крымінальны суддзя Ашм. пав.

Адам Кунцэвіч, земскі суддзя Ашмян. пав.

Мы, цывільна-вайсковыя камісары, па прычыне некамплекта разам з земскімі і крымінальнымі суддзямі чынім рапарт і падпісваем:

Францішак Післәвіч, цывільна-вайскові камісар, ротмістр ашмянскі.

Вінцэнт Грабскі, цывільна-вайскові камісар Ашм. пав.

Ліст асоб у крымінальны суд з абываценляў Ашмянска-га павета:

Віктар Чэховіч, за прэзідэнта земскага ашмянскага

Ігнацій Жаба, шамбелян

Тадэвуш Суліструйскі, гранічны каморнік, вайсковіч ашмянскі

Якуб Умястоўскі, гранічны каморнік

Ян Шчапановіч, актавы пісар Ашм. пав.

Пётр Зянковіч, старасціц ашмянскі

Вінцэнт Грабскі, ваўкавыскі гродскі судзіц

Тадэвуш Трацяк, ротмістр старадубаўскі

Міхаіл Чарнецкі, скарбнік (мазырскі?)

На дазорцаў:

Ігнацій Важынскі, шамбелян

Віктар Чэховіч, за прэзідэнта Ашм. пав.

Ліст цывільна-вайсковых камісараў, выбраных у 1792:

Казімір Коцел, ротмістр кавалерыі

Юзаф Шчыт, шамбелян

Юзаф Важынскі, падкаморы ашмянскі

Фабіян Козел, шамбелян

Юзаф Ляговіч,ількамірскі стольніковіч

Ануфрый Масевіч, скарбовы дваранін

Сымон Дмахоўскі, ротмістр ашмянскі

Баніфацый Ваяводскі, скарбнік мельніцкі

Фабіян Храптовіч, харужы
Адам Сучыцкі, ротмістр мінскі
Стэфан Камар, мінскі каморнік
Мартын Мечнікоўскі, харужы
Станіслаў Касацкі, ашмянскі земскі рэгент
Стэфан Прыстаноўскі, харужы
Францішак Пíслевіч, ротмістр

Камісары, выбраныя 29 мая 1794 г.:

Ян Шчапановіч, актавы пісар
Севярын Бенкунскі, скарбнік ашмянскі
Людвік Ходзька, лоўчы ашмянскі
Тадэвуш Сабанскі, будаўнічы ашмянскі
Ян Вітунскі, пісар ашмянскага земскага суда
Стэфан Сулістроўскі, гранічны каморнік
Гілярый Даўнаровіч, гранічны камісар
Вінцэнт Грабскі, ваўкавыскі гродскі суддзя
Ян Трацэўскі, гранічны камісар
Міхаіл Чэрніцкі, Антон Чыж

Ліст асоб у камісію з абываццеляў Ашмянскага павета:

Міхаіл Важынскі, стараста кервоўскі
Францішак Корэва, гранічны камісар
Рафал Бянкунскі, стралец ашмянскі
Тадэвуш Камар, гранічны камісар
Ян Арамовіч, гранічны камісар
Станіслаў Пашкевіч, гранічны камісар
Станіслаў Талібскі, гранічны камісар, ротмістр
Рафал Ваяводскі

З духавенства:

ксёндз Юзаф Любанскі, ашмянскі пробашч, канонік смаленскі

Міхаіл Станішэўскі, ашмянскі дэкан, інфлянцкі канонік

Рох Ланеўскі, пробашч івіцкі і дуцкі
Козел, пробашч жупранскі
Калыша, плябан евангеліцкі і жупранскі

Станіслаў Багушэвіч, прэсвітар трабскі
Міцэвіч, пісар кансісторыі, прэсвітар гердыскі
З м. Ашмяны у цывільна-вайсковую камісію:
Антон Садоўскі, браслаўскі каморнік
Юзаф Вагушэвіч, ротмістр
Антон Масевіч, пінскі каморнік
Антон Бабінскі

Ашмянскія мяшчане: *Антон Куніцкі, Францішак Кулікоўскі, Пятровіч*

БПАНК, с.1090, л.177-178 адв., 179—180

№ 15. 16 мая. Рапарт Завілейскай парадкавай камісіі аб цяжкасцях у сваёй дзейнасці

Рабілася ў Свіры 16 мая 1794 г. ННР

Уласна ў час некарыстання сваімі маёнткамі атрымалі мы вашу рэзалюцыю аб абывацельскіх жаданнях і ўвесь час да цяперашняга дня сядзелі ў цвярдыні, ратуючы толькі жыццё і здароўе ад маскоўскай дзікасці, аддаўшыся на міласць як вынішчаныя фаміліі, але лепш кожнаму саступіць тое і ўсё адважна аддаць у ахвяру Айчыне і на яе абарону ад такога здзічэлага непрыяцеля. Калі ўжо на моцы вашай рэзалюцыі ад 7 дня бягучага месяца нашым універсалам у павет назначаны дзень 26 мая на з'езд для стварэння элекцыі з падтрымкай акта літоўскага паўстання, то жадаем мець прадпісанне аб парадку яго выканання з рацыі пытання аб першынстве ўраднікаў па выбарах 1792 г. і свенцянскіх сеймікаў. Прысланае ваша распараджэнне і рэгламент дэпутацый аддаем да публічнага ведама. Выкананне іх абавязкова наступіць зараз жа па ўчыненым далучэнні і сапраўдным заснаванні на пленуме юрысдыкцый.

Абываделі, якія да астатку вынішчаныя, жадаюць палёгак у падатках. Мяркуем, што маем права на тую літасць і, па вышуку сумы страчанай маёмасці, трэба будзе прымусіць некаторых добраахвотна ўносіць падаткі ў касу. Верна тое, што той няшчасны лёс няроўна закрануў абывацеляў — для некаторых ён апынуўся звыш жудасным. Непрыяцельскае войска, спаліўшы Смаргонь і насмактаўшыся іншымі пажогамі, з начы 14 на 15-га дня паспяшалася праз Беніцу на Мінск.

Юзаф Івашкевіч, камісар цывільна-вайсковы і парадкавы Завілейскага павета, прэзідэнт

Андрэй Бучынскі, цывільна-вайсковы і парадкавы камісар Зав.пав.

Ігнацій Гутаровіч, цывільна-вайсковы і парадкавы камісар Зав. пав.

БПАНК, с.1090, л.183—183 адв.

№ 16. 31 мая. Прадстаўленне Завілейскай парадкавай камісіі перашкод пры публікацыі ўніверсалаў

Рабілася на сесіі 31 мая 1794 г. у Свіры

Цывільна-вайсковая і парадкавая камісія Завілейскага павета, знаходзячы важныя перашкоды ў абвяшчэнні да публічнага ведама ўніверсалаў і загадаў Тымчасовай рады праз свае ўніверсалы у межах свайго павета, якія ў лісце ксяндза, ягомосць Шульца, свірскага дэкана, адлюстраваны, атрымала прысланую ў арыгінале Тымчасовай радай такую экспедыцыю, дзе мяркуецца, што рада з імі паспяховей можа справіцца. Таму, даверыўшы кемлівасці і клопату ягомосць Шульца паведамленне ўніверсалаў абывацелям і не могучы сваёй уладай вызваліць яго ад таго абавязку, аддаем абмазгаванне дастатковых сродкаў на дагляд Тымчасовай рады. Дзены як вышэй.

Андрэй Бучынскі, камісар цывільна-вайсковы Зав.пав., прэзідэнт.

Гілярый Хржаноўскі, камісар парадкавы, цывільна-вайсковы Зав.пав.

Станіслаў Гізберт, камісар парадкавы, цывільна-вайск. Зав.пав.

Згодна з пратаколам: *Матэвуш Багуцкі, камісар цывільна-вайсковы і рэгент Зав.пав.*

БПАНК, с.1090, л.185

№ 17. 14 чэрвеня. Даклад завілейскай камісіі аб безабароннасці сваіх дзеянняў

Рабілася на сесіі ў Свіры 14 чэрвеня 1794 г.

Цывільна-вайсковая і парадкавая камісія Завілейскага павета, дасведчаная аб намеры ягомосць пана генерал-маёра павета ўтрымаць судовае месца Свір у якасці бяспечнага месца разам штаба і розных юрысдык, пры тым, што 5-дымовы рэкрут, дагэтуль не вымуштраваны, не можа сфарміраваць сілу, дастатковую для абароны месца і асоб, з абавязку занятых юрыдычнай функцыяй, а шмат ахвотнікаў, сабраных сваім коштам для стражы тутэйшага месца, таго не могуць задаволіць па прычыне мізэрнасці харчу у генерал-маёра на патрэбы як коней, так і людзей з-за секвестру добраў маскалямі-фуражырамі, таму цывільна-вайсковая камісія рэкамендуе святлейшай ЦД абмысліць які-небудзь фундуш на вышэйзгаданы аб'ект.

Андрэй Бучынскі, камісар цывільна-вайсковы Зав.павета, прэзідэнт,

Антон Гедройц-Юрага, камісар цывільна-вайсковы Зав.павета, ротмістр,

Бенедыкт Пашкевіч, камісар цывільна-вайсковы Зав.павета, ротмістр.

БПАНК, с.1090, л.188. За пячаткай.

№ 18. 11 ліпеня. Рапарт завілейскай камісіі аб змене сваёй дыслакацыі і склада

Рабілася на сесіі парадкавай камісіі 11 ліпеня 1794 г. у абозе пад Чорнай Лужай

Мы, камісары парадкавай камісіі Завілейскага павета, з мэтай рэалізацыі прадпісаных правілаў арганізацыі ў сэнсе вызначэння ўраднікаў у вызначаныя аддзелы, у сённяшні 9 дзень з'ехаліся у месца Свянцяны, вызначанае месцам часовай юрысдыкцыі, і згаданы расклад наступным учынілі спосабам, гэта значыць, у аддзел парадку абывацеляў Канстанціна Хамінскага і Ануфрыя Рудзінскага, у аддзел бяспекі Станіслава Гізберта і Канстанціна Смігельскага, у аддзел справядлівасці Ігнація Невяровіча і Караля Піўцэвіча, у аддзел скарбу Францa Піятроўскага і Яна Вукоўскага, у аддзел харчу Гілярыя Хржаноўскага і Юзафа Івашкевіча, у аддзел вайсковых патрэб Каэтана Завішу і Іяхіма Бакшанскага, у аддзел інструкцый Андрэя Бучынскага, Пятра Халецкага і Бенедыкта Пашкевіча адзінагалосна са згодай усіх нас назначылі. Затым у далейшых нашых чыннасцях з прысланых 21-га дня мінулага месяца лістоў асоб, земскі і крымінальны суд складаючых, а таксама з лістоў асоб абывацеляў, на агульную думку здатных да прысутнасці ў парадкавыя камісары Міхаіла Козела, Філіпа Чаховіча, Матэвуша Антановіча, Адама Багушэвіча, Мартына Супінскага, Квашэўскага, пасэсара добраў Літвяны, а ў крымінальны суд за кандыдатаў падаем Ігнація Чаховіча, Яна Пятровіча, Лявона Сароку, Іяхіма Хамінскага, Мацея Чаховіча. Нарэшце, паколькі не можам бяспечна здзяйсняць свае чыннасці з нагоды бліжэй чым 1,5 мілі ад месца Свір кружачага непрыяцельскага войска, і асабліва з-за выдалення з таго месца ў абоз, таму пастанавілі перанесці сваю прысутнасць у месца Свянцяны як зручнае месца, тым больш, што і павятовая

сіла, там стаячая, згаджаецца на заснаванне там нашай юрысдыкцыі. Затым паведамляем у святлейшую ЦД аб прывабнасці таго месца для перасылкі розных экспедыцый па тракту у Нямечын і рэкамендуем для атрымання згоды.

Даны на сесіі як вышэй.

Канстанцін Хамінскі, камісар цывільна-вайсковы завілейскі

Пётр Халецкі, камісар цывільна-вайсковы Завілейскага павета

Каетан Завіша, староста, камісар цыв.вайск. Завіл.пав.

Канстанцін Смігельскі, камісар цыв.вайск. Зав.пав.

Караль Піўцэвіч, камісар цыв. вайск. Зав. пав.

Венедыкт Пашкевіч, камісар цыв. вайск. Зав. пав.

Ян Букоўскі, камісар цыв. вайск. Зав.пав.

Станіслаў Студніцкі-Гізберт, камісар цыв.вайск. Зав. пав.

Ануфрый Рудзінскі, камісар цыв.вайск. Зав.пав.

Згодна з пратаколам:

Матэвуш Багуцкі, рэгент парадкавай камісіі Завілейскага павета.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.191

№ 19. 11 ліпеня. Выпіска з пратаколу штодзённых чыннасцяў ваенна-парадкавай камісіі Завілейскага павета

Рабілася на сесіі цывільна-вайсковай камісіі Завілейскага павета ў абозе пад Чорнай Лужай 11 ліпеня 1794 г.

Мы, ніжэй падпісаўшыяся камісары парадкавыя Завілейскага павета, пасля ўчарашняй рэцірады з месца Свір з-за падыходу на 1,5 мілі да таго месца непрыя-

цельскіх войскаў, сённяшнім днём паўторна памкнуліся к таму месцу для спраўлення нашых чыннасцяў, аднак паглядзелі на вынік з таго, калі абоз павятовага генерал-маёра пакінуў месца папярэдняй сесіі, палічыўшы Свір яўна небяспечным месцам для выканання абавязкаў нашага ўрадавання. Аднак, як пільныя выканаўцы сваіх павіннасцяў, не прывязваючыся моцна і трывала да месца, меней усяго прыдатнага да нашых мэтаў, хаця толькі і ў паўмілі ад абоза, але ў бяспечным становішчы склалі сваю сесію і, зрабіўшы на ёй рапарт аб сваіх чыннасцях, адаслалі яго крэсамі ў ЦД у двух экземплярах. У гэты момант з бліжэйляжачага дома прыбыў абывацель камісар Андрэй Бучынскі і, абвінаваціўшы нас у бяспраўнасці нашай сесіі, не толькі гвалтам выдзер спамянуты і ўжо падпісаны рапарт, але рознымі імпрэсіямі, жадаючы абумовіць міжвольнасць утварэння актаў, гэтак высільваўся стрымаць бясспрэчна патрэбную справу. Аднак мы, ніжэй паказаныя камісары, большасцю думак прызнаўшы бясспрэчнасць учынку на моцы прадпісання арганізацыі, патрабуючай рапарт з нашых спраў, такі рапарт пастанавілі ўчыніць як для пераліку асоб у прызначаных аддзелах і лістоў абывацеляў з кандыдатаў на ўрады,так і аб змене месца Свір на Свянцяны, як на месца больш бяспечнае для юрысдыкцыі. А для дэманстрацыі справядлівых нашых намераў у сувязі з учыненай апазіцыяй аднагалосна выбіраем з нашага кола дэлегатам у святлейшую ЦД літоўскую абывацеля *Пятра Халецкага.*

Канстанцін Хамінскі, камісар цывільна-вайсковы Завіл.пав.

Канстанцін Смігельскі, камісар цывільна-вайсковы Завіл.пав.

Ян Букоўскі, камісар цывільна-вайсковы Зав.пав.

Каетан Завіша, камісар цывільна-вайсковы Зав.пав.

Францішак Піятроўскі, камісар цыв. вайск. Зав.пав.

Караль Піўцэвіч, камісар цыв.вайск. Зав.пав.

Бенедыкт Пашкевіч, камісар цыв. вайск. Зав.пав.
Ануфрый Рудзінскі, камісар цыв.вайск. Зав.пав.
Згодна з пратаколам: *Матэвуш Багуцкі*, камісар парадкавы Зав.пав. *За пячаткай.*

БПАНК, с.1090, л.186—186 адв.

№ 20. 4 жніўня. Рапарт Завілейскай камісіі аб сваіх чыннасцях пасля 11 ліпеня.

Рабілася на сесіі 4 жніўня 1794 г. у Калтынянах

Парадкавая камісія Завілейскага павета ад дня 11 мінулага месяца, даты пераносу сваёй юрысдыкцыі з абозу пад Чорнай Лужай да Свенцян, хаця і выконвала па розных месцах увесь час даручаныя пастаяннаму ўрадаванню павіннасці(па прычыне нагляду за амаль непрыкметным непрыяцелем), аднак на моцы загаду святлейшай ЦД ад 20 ліпеня чыніць рапарт наступных сваіх спраў.

Дня 14-га паводле адтэрміноўкі, сабраўшыся толькі ў 6-ці асобах і пілнуючыся правілаў прадпісанай арганізацыі, не маючы нікога з камісараў у аддзеле харчу з-за іх няяўкі, перанесла сесію на наступны дзень. Дня 15-га гэтак жа не здолела дачакацца калегаў вышэйзгаданага аддзела, аднак заняла сваю сесію чытаннем прыбыўшых крэсамі экспедыцый святлейшай ЦД і некаторыя, патрэбныя для публічнага ведама, загадала абвяшчаць з амбонаў, а з-за адсутнасці бяспекі пасля выхаду павятовай сілы ў Пашэмуны, перанесла туды ж сваю юрысдыкцыю. Дня 18-га паслала экспедыцыю ў святлейшую ЦД аб адсутнасці павятовага тарыфа і пратакола ахвяр 10-га граша, няяўцы экзактара абываццеля Заблоцкага(на што дасюль няма рэзалюцыі), а таксама не менш была занята чытаннем ужо прысланых для публікацыі ўніверсалаў і ўказаў. Дня 19-га з нагоды выпаўшай сутычкі з непрыяцелем у тым жа месцы нашых сесій і гойсання непрыяцельскага

войска па значным абшары павета, не маючы амаль ніякага бяспечнага закутка, нейкі час не магла быць чыннай у сваіх абавязках.

Дня жа 31-га, у зборы тых ж асоб у Калтынянах, выслухаўшы рэляцыю дэлегата свайго кола абывацеля Халецкага, загадала памясціць у актах прывезеную ім рэзалюцыю святлейшай ЦД на дазвол складаць сесіі ў кожным бяспечным месцы. Выпіску святлейшай ЦД наконт скаргі абывацеля палкоўніка Дэскура аб захопе курлянчыкам, маскоўскім дызерцірам, экіпажа са зброяй даручыла стараннасці абывацелю Залускаму, свірскаму эканому, для задавальнення ў той меры, а што да абвінавачванняў абывацеля паручніка Жукоўскага, тое адаслана абывацелю Зяньковічу, генерал-маёру Завілейскага павета. Па жаданню генерал-маёра выдала квіт(палет) на збор фуражу ў павятовае войска са свенцянскай парафіі(акрамя Свенцян) з кожнага дыма па 15 фунтаў хлеба, 1,5 фунтаў круп, 0,5 кварты гарэлкі. На мемарыял генерал-маёра абывацеля Зяньковіча з нагоды рассеяных чутак аб прадастаўленні яго камандзе фальшывых зарадаў для сутычкі пад Кабыльнікамі, для высвятлення іх дэлягавала са свайго кола абывацеля Завішу. Дня 1-га жніўня, даведаўшыся ад вышэйзгаданага дэлегата, што з большасці разданых зарадаў на спамянутую сутычку адныя 3 і 5-га гатунку, а іншыя па добрай мерцы пораху на ствол маюць, а з таго выдумленне фальшывых даносаў на генерал-маёра аказваецца проста зламысным паклёпам, то камісія, як бліжэйшы сведка, які дагэтуль часта свае сесіі пры абозе спраўляла, аддала ў аддзел сведчанне справядлівай яго нявіннасці. Выдала выпіску(рэквізіцыю) для збору камплекта калегаў. Загадала абвясціць з амбонаў універсалы аб дастаўцы на ваенныя сутычкі 1 каня з 200 дымоў і рэзалюцыю Найвышэйшай рады аб абавязку розных пасэсараў старасцінскіх і арэндных добраў самастойна ставіць на паспалітае рушанне, а ў сувязі з

намаганнем абываца Агінскага, камандуючага збройнай сілай Завілейскага і Браслаўскага паветаў, перанесла свае сесіі ў месца Свіраны для сувязі на прадмет хутчэйшага збору паспалітага рушання. Дня 2-га жніўня ў адозве да абывацеляў Завілейскага павета загадала прыбыць на паспалітае рушанне ўсім вотчыннікам і розным пасэсарам застаўных і арэндных добраў. Гэтым жа выдала агульны палет(квіт) на пастаўку за рэверсамі ў войска фуража для каманды абывацеля Агінскага, а з-за нечаканага выхаду спамянутага аб.Агінскага з войскам, не могучы бяспечна складаць сесіі ў згаданым месце, лепшым месцам сваёй юрысдыкцыі прызначыла мястэчка Калтыняны.

Дня 4-га атрымала рэзалюцыю аб.Заблоцкага аб бязвінным прыняцці абавязкаў экзактара, якую ў арыгінале адаслала ў ЦД. Няхай святлейшая дэпутацыя возьме пад увагу і справядліва разсудзіць з тых паведамленняў і гэтых частых пераносаў сесій з месца на месца ў якім стане знаходзіцца камісія(!) асабліва тады, калі з-за пастаяннага праходу непрыяцельскіх карпусоў праз Завілейскі павет яна нямнога мела вольнага часу для выканання сваіх павіннасцяў.

Даны на сесіі як вышэй.

Ануфрый Рудніцкі, прэзідэнт, камісар цывільна-вайсковы парадкавай камісіі

Францішак Піятроўскі, камісар цыв.вайсковы, аддзел скарбу

Пётр Халецкі, камісар з аддзела інструкцый.

Караль Піўцэвіч, камісар цыв.вайск. і парадк. з аддзела справядл

Каетан Завіша, камісар цыв. вайск. і парадк. з аддз. вайск. патрэб

Канстанцін Смігельскі, камісар цыв.вайс.Зав.пав. з аддз.бяспекі

Згодна з пратаколам: Матэвуш Багуцкі, камісар, рэгент парадк. камісіі Завіл. павета. За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.192—193.

№ 21. 13 жнiўня. Тлумачэннi Завiлейскай камiсii сваiх вандровак

Рабiлася на сесii 13 жнiўня ў Лабанарах

Парадкавая камiсiя Завiлейскага павета пад начальствам Тадэвуша Касцюшкi!

Будучы у цьмяных абставiнах з пачатку свайго iснавання заўжды разам з абывацелямi таго ж павета, але да гэтага моманта з найбольшым клопатам выконвала сваё урадаванне. Зараз жа, пасля выхаду малой павятовай сiлы з межаў павета з-за перамяшчэння з Вiдзаў у Даўгелiшкi i Калтыняны, апошняга яшчэ вольнага ад непрыяцельскiх войскаў закутка, нi абывацелi не здольны выконваць нiводных наказаў усякай урадавай улады, нi камiсiям таксама немагчыма дзейнiчаць паспяхова. Склаўшы сваю сесiю ў агульным павятовым месце, доўга адвяла ўвагi таму, якiя могуць быць наступствы чыннасцяў юрысдыкцыi, калi яна выдалена ў чужы павет, а абывацелi кiнуты войскам. Вымушана збiраць касцёльнае срэбра як магчыма праз дэлегатаў толькi з некаторых касцёлаў перад нашэсцем Масквы, выконваючы часткова ўласнае патрабаванне. З-за адсутнасцi бяспечнага памяшкання забранае срэбра адсылаецца кепска спакаваным у святлейшую ЦД праз аб. Матэвуша Багуцкага, рэгента сваёй юрысдыкцыi. Пры тым паўторна даносiць, што акрамя выдадзенага з скарбовага аддзелу загада ўнесцi генеральны падатак, хацела б разам з абывацелямi ведаць з унiверсала Найвышэйшай рады якi мець павоз згаданага падатку. Камiсiя, будучы амаль штодня ў трывозе, была вымушана складаць сесii па розных месцах, а абывацелi i ксяндзы, ратуючы сваё жыццё ад частых i нечаканых нападаў непрыяцеля, хавацца па лясах, што i стала вынiкам невыканання ўказаў, прадпiсаных унiверсаламi Найвышэйшай рады, аб чым усiм спамянутаму аб.Багуцкаму пры гэтым рапарце шырэй загадала паiнфармаваць. Вельмi моцна просiм прысланць

пратакол ахвяр 10-га гроша, патрэбны для складання тарыфу працэнтаў, а пры змене абставін у кожны бяспечны час займемся сабе даручанымі абавязкамі. Даны на сесіі як вышэй.

Францішак Піятроўскі, камісар цывільна-вайсковы і парадкавы Завілейскага павета, прэзідэнт

Ігнацій Невяровіч, камісар цыв. вайск. і парад. Зав.пав.аддз.справ.

Ануфрый Рудзінскі, з аддзела парадку, камісар цыв.вайск. Зав.пав.

Юзаф Івашкевіч, камісар цыв.вайск. Зав.пав.аддзел харчу

Каетан Завіша, камісар цыв.вайск.Зав.пав. з аддз. вайсковых патрэб

Пётр Халецкі, камісар цв.вайск. Зав.пав. з аддз. інструкцый

БПАНК, с. 1090 л.194

№ 22. 29 мая. Рапарт камісіі Эйшышскага павета аб самавольных уцёках сялян у валанцёры і замяшаннях пры гэтым

Няма ніводнага абывацеля ў нашым павеце, які б не палымнеў руплівасцю або не жадаў прыкласціся на падтрымку Айчыны сваёй крывёю, жыццём і маёмасцю, у гатоўнасці палегчы у яе абарону. Аднак у такім палымяным запале шляхты і кожнага стану вольных людзей значная колькасць занятых гаспадаркай сялян, свавольна пакінуўшы хаты, жонак і малых дзетак, падаліся да валанцёраў пад камандай ягомасці Юзафа Сядліцкага, генерал-маёра Эйшышскага павета, без пісьмовага дазволу уласнікаў, а самы іх учынак, паходзячы з магчымасці пастаўкі рэкрут згодна з указам Найвышэйшай рады, пагражае занядбаннем ралля і спусташэннем гаспадаркі, аб чым ад тых жа ягомосцяў у нашу камісію былі занесены скаргі з

жаданнем выдаць тых з уцёкаў і забараніць надалей падобныя прыклады, або пры неаддачы прыняць іх замест назначанага 5-дымовага рэкрута, на што камісія не атрымала ніякай рэзалюцыі ад генерал-маёра. З бачанага камісія не можа заключаць сама без дакладу, або лепш тлумачэння Найвышэйшай рады, і прадстаўляецца з жаданнем высветліць — ці можа ягомосць Сёдлікоўскі, генерал-маёр, жывучых у хатах прынімаць без пасведчання пана і называць іх валанцёрамі або ахвотнікамі (бо прынянцце самавольна ідучага хлопа, а лепш залежнага ад пана, робіць мёртвым плён яго ралля і падатак за пустую хату з крыўдай пан павінен плаціць). Ці камісія, ведаючы стан удоў і сірот, а тым больш пагарэльцаў, можа здаваць ахвотніка або яго вызваліць ад складкі, у якой шмат сірот з пагарэльцаў на конях сабрана мемарыяламі, ці могуць быць узяты рэкруты з 5-ці дымоў на некалькі тыдняў для стражы месца, або, таксама адпаведна з універсалам Найвышэйшай рады, ці можна браць сцягнутых у бліжэйшую парафію і ці павінен уласнік пры запісу у павятовы полк даваць 2 рублі ягомосць генерал-маёру? Даны на сесіі.

Мартын Крагельскі, прэзідэнт, земскі суддзя, камісар цывільна-вайсковы Эйшышскага павета.

Ануфрый Мракоўскі, камісар адзела вайсковых патрэб Эйш.пав.

Казімір Кабылінскі, цыв.вайск.камісар Эйш.пав.

Франута Крагельскі, рэгент цыв.вайск.камісіі Эйш.пав. За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.199.

№ 23. 27 чэрвеня. Адказ эйшышскай камісіі на скаргі шляхты аб стратах пры зборы паспалітага рушання

Парадкавая камісія Эйшышскага павета на паданы мемарыял ягомосцяў Багдановіча, Маргевіча, Чарнецкага

і напісны другімі 50 асобамі шляхты ўсяе забалоцкай парафіі дае наступны адказ. Паколькі ўніверсалам Найвышэйшай рады ад 5 чэрвеня за арданансам генерала, камандуючага паспалітым рушаннем, загадана браць палову здатных людзей супраць непрыяцеля, а падаўшы мемарыял абываценлі без патрэбы адарваны ад працы і, не будучы пасланымі супраць непрыяцеля, некалькі дзён утрымліваюцца з вялікімі выдаткамі, стратамі і спусташэннем гаспадаркі, то камісія падаўшых мемарыял абываценляў адпускае з месца Эйшышак, наказваючы быць узброенымі і гатовымі на паспалітае рушанне па закліку камандуючага генерала, якім з'яўляецца камендант усяе Літвы. Што да скаргі тых жа абываценляў аб паборах падначаленымі Эйшышскага павета па 18 і па 20 злотых, то парадкавая камісія, згодна з абвяшчэннем ЦД ВКЛ, скасаваўшы ўсякія ўхвалы і наклады, ухваленыя і выкананыя неўласцівымі ўладамі, загадвае вярнуць зараз жа такія грошы.

Даны на сесіі 27 чэрвеня 1794 г. у Эйшышках

Антон Бародзіч, земскі суддзя і камісар цывільна-вайсковы Эйшышскага павета.

Ануфрый Мракоўскі, камісар цыв. вайск. Эйш.пав.

Фульгенд Яч, камісар цыв. вайск. Эйш. пав.

Згодна з пратаколам: Франута Крагельскі, рэгент цыв. вайск. Эйш. пав. За пячаткай.

БПАНК, с. 1090, л.200.

№ 24. 1 верасня. Справаздача эйшышскай камісіі аб выкананні фінансавых даручэнняў

Рабілася ў Эйшышках на сесіі парадкавай камісіі 1 верасня 1794 г.

Парадкавая камісія Эйшышскага павета, атрымаўшы са скарбавага аддзела святлейшай ЦД ВКЛ рэквізіцыю аб забранні срэбра з касцёлаў і кляштараў, мае гонар у

адказ данесці святлейшаму аддзелу, што яшчэ па загаду Часовай літоўскай рады вызначаным ад самой камісіі абываделем Бародзічам, абозным эйшышскім, тое срэбра са ўсіх касцёлаў ужо забрана, акрамя пакінутага на неадкладныя патрэбы святой рэлігіі, і адразу ж перавезена ў скарбовы аддзел, аб здачы якога ў камісіі таго ж павета маецца квіт. Акрамя таго, скарбовы аддзел патрабуе прыслаць бірчыя(пабораўыя) рэестры прыходаў, паступіўшых у касы парадкавых камісій з пачатку паўстання. Такую табель падаткаў і розных даходаў за падлікамі абываделя Барталамея Кругельскага, мінулага касіра(які выкліканы зрабіць калькуляцыю) для задавальнення рэквізіцыі парадкавая камісія Эйшышскага павета зараз жа высылае. Нарэшце, камісія паведамляе святлейшаму скарбоваму аддзелу, што ў касе камісіі ніякіх грошай няма, а назначаны экзактарам абывацель Бадзінскі(аб чым аддзелу тройчы паведамлена) дагэтуль не з'явіўся.

Рабілася ў Эйшышках як вышэй.

Ксёндз Фауліцый Валчацкі, канонік інфлянцкі, парадкавы камісар Эйшышскага павета.

Ян Корсак, камісар парадкавы Эйш.пав.

Мікалай Седлікоўскі, камісар парад.Эйш.пав.

Мацей Матушэвіч, камісар парад.Эйш.пав.

Адам Кіркуць, камісар парад.Эйш.пав.

Казімір Кабылінскі, камісар парад.Эйш.пав.

Францішак Гумпрэхт, камісар парад.Эйш.пав.

ксёндз Францішак Кучэўскі, камісар парад.Эйш.пав.

Стэфан Ліпінскі, рэгент парадкавай камісіі Эйш.пав.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.205.

№ 25. 6 мая. Паведамленне камісіі Лідскага павета аб першых падзеях свайго існавання

Адбылося ў Лідзе 6 мая 1794 г.

Парадкавая, цывільна-вайсковая камісія Лідскага павета на моцы ўніверсала Найвышэйшай нарадовай рады ВКЛ пасылае рапарт аб заснаванні 5 мая сваёй юрысдыкцыі з асоб ніжэй падпісаных і даносіць аб разсылцы у парафіі і чытанні ўніверсалаў шматлікаму люду, сабранаму на таргу ў Лідзе. Усе слухалі іх з вялікай цікавасцю, прысягнулі і радасным крыкам паказалі праўдзівы намер забіваць і знішчаць непрыяцеля. Аднак самі яны могуць быць стрыманы у падтрымцы акта ўжо нападаючым, рабуючым і вынішчаючым непрыяцелем (на што маем свежы прыклад у добрах Ражанка абываценя Паца, старасты вілейскага, у добрах Шчучын Сцыпіёнаў, у Дуброве ксяндза Козіча, Скіндэра, а таксама іншых абываценяў) без каманды рэгулярнага войска, таму моцна прасім як хутчэй прысланць каманду для заслоны усяго Лідскага павета ад уварвання лютага ворага. Магчыма можа напасці з погляду на шчуплае войска, а прысылцы значнай дывізіі могуць перашкодзіць невядомыя нам абставіны, тым не меней, застаемся на тым, што нават малалікае рэгулярнае войска ажывіць дух абываценяў, заахвоціць смялей злучацца, можа хутчэй абудзіць дагэтуль пахаваную адвагу, прыспешыць ваколіцы, вёскі і двары сабрацца на абарону, што стане зручней пасылаць весткі і прымушаць, з чаго атрымаецца шырэйшая экзекуцыя і рэгулярнейшы дазор, больш бяспекі для касы ад паступлення падаткаў і збору рэкрутаў. Таму парадкавая, цывільна-вайсковая камісія павета пасылае гарачую просьбу аб прысылцы часткі войска як з памянутых прычын, так і па згоднаму жаданню ўсіх

абываценяў Лідскага павета на заслону ад пагражаючай небяспекі. Сягоння лідскі магістрат паслаў рапарт аб маршу маскоўскага войска з-пад Гродна, а таму, не робячы таго паўторна, цывільна-вайсковая камісія паведамляе аб тым жа.

Юзаф Сцыпіён, лідскі стараста

Міхаіл Тукала, гродскі суддзя, камісар цывільна-вайсковы лідскі

Францішак Александровіч, пісар земскі, харужы, камісар цыв.вайск.

Адам Коркуць, камісар цыв.вайск. Лідскага павета, мечнік

Адам Гарваскі, камісар цыв. вайск. Лід.пав.

Пратакол трымаючы *Казімір Маскевіч*, камісар, дэлегат м. Ліды.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.209—10.

№ 26. 23 чэрвеня. Прадстаўленне лідскай камісіяй цяжкасцяў пры фарміраванні павятовага апалчэння

Рабілася на сесіі ў Лідзе 23 чэрвеня 1794 г.

Парадкавая камісія шляхам зносін з генералам свайго павета, абывацелем Каралем Сцыпіёнам, для спрыяння ўрадаваму намеру дзеліцца наступнымі неабыякавымі пытаннямі. 1. У якім тлумачэнні трэба разумець весь(вёска) у ВКЛ у выпадку, калі б хто, не могучы сам ехаць на паспалітае рушанне, паставіў за сябе асоб. 2. Калі з кожнага шляхецкага дыма загадана стаць у паспалітае рушанне або даць ахвотніка з 5 дымоў, то ці можна тады быць вызваленым, або затрыманым і якім спосабам, а таксама, ці патрэбна з 5-дымовых ахвотнікаў плата згодна з пунктам 2 універсала абываценя Ясінскага. 3. Як належыць камісіі і генерал-

маёру абыходзіцца з тымі шляхецкімі дымамі, якія застаюцца па хатах, не маючы здольнасці сесці на каня ўзброенымі, і тымі, якія з-за ўбоства не здольныя паставіць сабе замену, а таксама з тымі, у якіх хаты непрыяцельскім войскам спалены і дашчэнту вынішчаны, нарэшце, з тымі, хто, займаючы шляхецкія дымы, заняты спраўнай паслугай краю. 4. Ці павінен ставіць са свайго дыму сабе замену ў паспалітае рушанне абывацель, які ўсіх або некалькіх сыноў аддаў у краёвае войска ў ахвотнікі, а сам ехаць не здольны па важных прычынах. 5. Ці абавязаны занятыя ўрадавымі чыненнямі асобы даваць за сябе заступнікаў. 6. Што рабіць з такімі абывацелямі, якія або ад неўраджаю, або ад рабункаў непрыяцеля настолькі пацярпелі, што не могуць зносіць кватэравання краёвага войска, а толькі могуць даваць правіянт і фураж на агульную патрэбу і на выпраўленае паспалітае рушанне, хаця і не маюць спосабу залажыць іх грашыма з-за страты запасаў і цяжкасцяў курса. 7. З-за пастаяннай пагрозы непрыяцеля камісія просіць вызначыць якую-небудзь частку лінейнага войска для дапамогі павятовай збройнай сіле і бяспекі актаў і юрысдыкцый. 8. Калі на патрэбу бяспечнага вывазу актаў усяго павета і на ўтрыманне канцылярыі камісіі падаткі ўжо ўнесены, а з моцы даўнейшага ўніверсала шэлягамі не выбіраліся, то няхай ЦД паведаміць, адкуль камісія можа прыдумаць фундуш. 9. 6 гармат, забраных у абывацеляў Сцыпіёнаў з добраў Шчучын, што ў Лідскім павеце, пры назначэнні абывацеля Сцыпіёна лідскім генерал-маёрам адпраўлены пры іншай зброі генерал-маёрам Гродненскага павета абывацелем Ельскім у Гродна, то лідская камісія моцную заносіць просьбу аддаць іх на патрэбы Лідскага павета і генерал-маёра Сцыпіёна па загаду ЦД. 10. Ці могуць камісія і крымінальны суд, у выпадку набліжэння непрыяцеля да месца Ліды, часова перамясціць сваю юрысдыкцыю на іншае месца без(?)

паведамлення. 11. Камісія пытае — ці можа яна прынімаць ад тых абывацеляў, якія не ў стане плаціць падаткі грашыма, у якасці падатку збожжа па цане коней і зброі.

Адам Нарбут, актавы пісар парадкавай камісіі Лідскага павета.

Францішак Александровіч, дакрэтавы пісар парад. камісіі

Аляксандр Шумкоўскі, парадк.камісар Лід. пав.

Караль Сцыпіён, генерал-маёр Лід. пав.

Згодна з пратаколам: *Эдвард Захваловіч*, рэгент камісіі Лід. пав.

Прыпіска.

1-е. Ці могуць быць вызвалены ад паспалітага рушання пастаноўленыя новымі ўніверсаламі паборцы.

2-е. Калі ўніверсал вызваліў падданых ад 6-дзённай паншчыны і потым дазволіў наймацца, то каб сусед суседу не рабіў пярэкупу і не ставілі прымусова ў кантрактах цану наёмных дзён падданых для дагаджання (нараўлення) панам, камісія просіць назначыць яе ў павеце з мужчынскага дня паншчыну з вупражжу ў цэлым, будзь то летам, па 20 грошаў, а жаночы па 10 гр., гэтак жа, як з мужчынскага з вупражжу.

Адам Нарбут, пісар парадкавай камісіі Лід. пав.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.218—219 адв.

№ 27. 25 чэрвеня. Рапарт лідскага бургамістра Ю. Раеўскага аб пагрозах і рабунках непрыяцеля вакол Ліды

Рабілася ў Лідзе 25 чэрвеня 1794 г. Рапарт у ЦД ВКЛ.

Сення, 25-га дня, з мястэчка Геранёны у Лідскім павеце паведамілі аб падыходзе Масквы у мястэчка Дзевянішкі

Ашмянскага павета, намагаючай пайсці з 2 гарматамі на Ліду. Па гэтым паведамленні генерал-маёр Лідскага павета абывацель Сцыпіён паслаў дабіцца той праўды некалькі дзесяткаў ахвотнікаў, якія дабраліся (як чуваць са слоў спамянутых) ажно да самых Геранён, дзе, убачыўшы казакоў, павярнулі назад і данеслі генерал-маёру Лідскага павета, што насамрэч гэта казакі і збіраюцца яны рушыць на Ліду. Я не ведаў якой колькасцю і колькі магло быць сілы, аднак жа пакуль тут у пакоі застаемся. Той патруль ахвотнікаў у наступны дзень вярнуўся і адразу з прыбыццём яго генерал-маёр абывацель Сцыпіён з пікінерамі і ахвотнікамі пакінуў месца і пайшоў на гродзенскі тракт да Мыта. За ім паследвала цывільна-вайсковая камісія Лідскага павета, а за камісіяй ўсе абывацелі, асабліва земскія на чале з(?). У пакінутым месцы застаўся толькі адзін я з абывацелямі гараджанамі і адразу так паступілі. Я загадаў расставіць гарадскую варту на ўсіх вуглах вуліц, нікога не ўпускаць у месца, асабліва там, дзе маглі паказацца маскалі, выслаў двух конных мяшчан, аднаго да Тракель пад Геранёнамі, а другога да Ліпнішак, з паспешнасці якіх даведаўся, што невялікі маскоўскі абоз ўжо ў Дзевяніштках, мае некалькі сот, але невядома колькі, што казакі з карабінерамі ўжо рабуюць наездамі і зрабавалі Геранёны. Высланы таксама шпіком жыд з Ліды, не ведаю толькі ці то ад камісіі, ці павятовага генерала. Той жыд паехаў з чалавекам пад самыя Геранёны, дзе іх казакі надыбаўшы, таго жыдка з возам забралі. Чалавек вырваўся, лясамі прыбыў у Ліду і расказаў як аб усім выпадку, так і як удалося ўцячы ад казакоў, абвясціў, што тыя дашчэнту разрабавалі Тракелі і Дварышча, як аб тым на самой справе пацвердзіла таксама другая вестка. А другой гадзіне прыбег у маю кватэру жыд, паварочаны за транспартам з Здзяцела і даносячы, што казакі ў (?) і што шмат іх па лясах хаваецца ў такім

яшчэ месцы, што спадзяюцца, узнікнуўшы, сузіраць усю плашчыну (распалажэнне) мястэчка Беліцы.

19-га дня бягучага (года) бачылі за Нёманам выпраўленых у мястэчка 24 казакоў, узяўшых з сабой 2 жыдоў таго мястэчка. Калі адзін з іх рук вырваўся і да сябе вярнуўся, тады камендант абывацель Бяляк быццам бы паслаў за ім за здабычай нейкіх звестак аб абаротах Масквы і для таго навокал яшчэ 11 коней. Аднак нашы не толькі казакоў не распужалі, але і іх, быццам бы, салдаты ў няволю забралі. Так гавораць ралядцы, аднак, жадаючы дабіцца пэўнай яснасці, паслаў я за тым кемлівага жыхара, ад каго, спадзяюся, буду выразней паінфармірававаны. Аб чым з чуласці сваёй і абавязку добрасумленна ўчыніўшы рапарт, падпісваюся *Юзаф Раеўскі*, крымінальны суддзя Лідскага павета, бурмістр вольнага месца Ліды.

Прыпіска: Сесія парадкавай камісіі лідскай на месцы.

БПАНК, с.1090, л.214—215.

№ 28. 13 ліпеня. Рапарт членаў крымінальнага суда Лідскага павета аб пачатку сваёй дзейнасці

Мы, суддзі крымінальнага суда Лідскага павета, па сіле ардынацыі Часовай рады літоўскага народа ад 24 мая бягучага 1794 года, пастаўляючай крымінальны суд у ваяводствах і паветах, і па ўніверсалу, выдадзенаму ў дзень 7 ліпеня святлейшай вайсковай камісіяй Лідскага павета, сабраўшыся ў назначаны тэрмін, або дня 10-га таго ж месяца, у месца Ліду, прынеслі прысягу згаданай ардынацыі і ў той жа дзень пачалі свае суды, а для ўтрымання сентэнцыяруша(дыяруша) абывацеля Матэуша Глушынскага, суддзю, у судовыя пісары абывацеля Ігната Яча, у адвакаты жа абывацеля Мацея Шалевіча адзінагалосна выбралі і адразу выслухалі прысягу выбраных у пісары і адвакаты згаданых асоб.

Для перасылкі жа ў Найвышшую раду цяперашняга нашага рапарта, гэтаксама для рэквізіцыі нашай канцылярыі, менавіта для вядзення пратаколаў і пячаткі, а таксама для атрымання рэзалюцый на вусныя пытанні абывыцеляў, давераных намі пісару, таго ж нашага пісара дэлегуем і свае суды да дня 23 ліпеня бягучага адкладваем.

Рабілася на сесіі ў Лідзе 13 ліпеня 1794 г.

Антон Александровіч, крымінальны суддзя Лідскага павета, прэзідэнт.
Аўгуст Шамет, суддзя Лід.пав.
Міхаіл Зяньковіч, суддзя Лід.пав.
Пётр Губарэвіч, суддзя
Ян Макрэцкі, суддзя
Матэвуш Глушынскі, суддзя
Тадэвуш Паўлікоўскі, суддзя
Юзаф Раеўскі, суддзя

БПАНК, с.1090, л.221

№ 29. 15 ліпеня. Рапарт лідскага рэктара Ф.Крушэўскага аб захопе Ліды

Рапарт у святлейшую Цэнтральную раду віленскага абываделя, ксяндза Крушэўскага, лідскага рэктара, парадкавага камісара, учыненага 15 ліпеня 1794 г.

1-е. Калі 5 ліпеня парадкавая камісія на вячэрняй пленарнай сесіі прыступіла да выбару дазорцаў над 1200 сялянамі, разсылцы па парафіях універсалаў і выбару сярод сябе камплекта членаў для выканання прадпісаных чыннасцяў, як затрубілі трывогу з-за прыбліжэння непрыяцеля. У той момант амаль усе камісары выскачылі, а сакратар абывацель Ахматовіч, забраўшы акты той камісіі, з універсаламі з'ехаў туды, дзе здавалася бяспечней.

2-е. 300 расійскай кавалерыі разам з казакамі і 2 гарматамі польнымі прымаршыравалі ад Дварышч пад Ліду і, убачыўшы спераду месца Ліды каля 100 коней шыкоўнай кавалерыі пад камандай абываццеляў Александровіча і Дамініка Шалевіча, некалькі разоў грымнулі з гармат. Тым часам казацтва счапілася з ротмістрамі Вілбекам і Спыпёнам. Ледзь толькі яны рэціраваліся па масту пры піярскім млыне, як тут абывацель Шалевіч зблізіўся з маскалямі і загадаў вярнуцца, што вельмі выратавала ад няшчасця, бо маскалі падаліся налева і, рассыпаўшыся перад месцам, выпусцілі 12 гранат. Хаця тыя падалі ў месце, але ўсё ж такі нікому не шкодзілі, толькі месца запалілі, а тым часам павятовая кавалерыя адступіла ад Мыта.

3-е. А 7-й гадзіне Масква ўварвалася ў месца і загадала мне, стаяўшаму на чале жыдоў, каб ксяндзы кармеліты выплацілі 100 зл., а жыды — 200 зл. кантрыбуцыі. Калі пасланы мной за пазычкай 50 зл. у ксяндзоў кармелітаў ксёндз Шалевіч атрымаў ад прэора адказ, што хаця грошы і ёсць, але ў схове і невядома дзе, як яго тут жа схапілі пад варту, а кляштары выдалі на рабунак, ад якога ксяндзы кармеліты страцілі ўсе запасы, рухомасць і грошы.

4-е. 5 дзён у Лідзе стаяў гарнізон, штодня высылаючы рабаваць абываццеляў, з якіх найбольш панеслі шкод войскі Нарбут, Тукала і Жаба, а войт Маскалевіч і бурмістр выжыты з усяе маёмасці. Звыш таго, уцякаючая з дзіцем Маскалевічова страціла руку, якую адбіў драгун. Ксёндз Навіцкі, лідскі камендант, з-за ўцёкаў страціў у фальварку абору з рухомасцю. У цяперашні 11-ы дзень выйшлі з Ліды. Назаўтра я з абозам рушыў на Ліпнішкі і Суботнікі, дзе быў прадстаўлены на допыт генералу Кнорынгу, ад якога даведаўся, што ў сакавіку быў выкрыты нейкі Якубоўскі,

прысланы з жонкай у Ліду і зараз забраны імі, а таксама зямяне з Нясвіжа, пасланыя нібыта да княжны Радзівіл і арыштаваныя праз некалькі тыдняў у Вільна, былі шпікамі і зараз маскоўскімі фурманкамі адасланы ў Нясвіж. 14 ліпеня прысланы з Вільна пан, ідаць з універсаламі, атрымаў пасведчанне.

Ксёндз Фларыян Крушэўскі, камісар парадкавы Лідскага павета

БПАНК, с.1090, л.226.

№ 30. 4 жніўня. Рапарт лідскай камісіі з месца новай дыслакацыі

Рабілася на сесіі ў Новым Двары 4 жніўня 1794 г.

Парадкавая камісія Лідскага павета з-за пагрозы набліжэння непрыяцеля да месца Ліды 28 ліпеня 1794 г. паведаміла аб тым у святлейшую ЦД і на 2 жніўня перанесла свае чыннасці да Новага двара, у бок ад непрыяцельскіх маскоўскіх войскаў пад камандай Дэрфельдэна, маршыруючых, ідаць, на Вільна. Туды у той дзень не ўсе сабраліся, бо адныя, як к прыкладу, Габіхт, палонены Масквой, другія, не ў стане прыехаць у прыняты тэрмін з-за той жа Масквы, толькі часткова сабраліся ў Новым Двары, быццам бы прызначаным за бяспечнае месца, і ў момант прыбліжэння Масквы ў адлегласці 3-х міляў ад Шчучына і Васілішак, атрымаўшы вестку ад камандуючага, генерал-маёра Лідскага павета, вымушаны былі раз'ехацца. Цяперашнім днём ніжэй падпісаўшыяся прыбылі да таго Новага Двара, дзе не знайшлі не толькі павятовага войска з абывацелем Казаноўскім, але і бяспекі ад непрыяцельскага войска, якое разрывае камунікацыю і імкнецца выследзіць кур'ераў. З абавязку даносім аб такой пагрозе для таго, каб не быць асуджанымі і завочна

абжалаванымі злаcліўцамі камісіі, як гэта даводзілася ведаць. Калі камісія для істотнай кансістэнцыі і аховы сваіх чыннасцяў не можа знайсці бяспечнага месца, калі тая камісія, зноў-такі, з-за разарвання шляхоў зносін не можа абвяшчаць універсалаў, выбіраць падаткі, прынімаць рэкрутаў у паразуменні са сваім упаўнаважаным, гэтак жа ад Масквы унікаючым, з самога пачатку камісіі не прадстаўляючым ні інфармацыі, ні выкананых указаў з-за той жа небяспекі, да той пары, пакуль павет не будзе абаронены ад маскоўскага войска, а таму, прадстаўляючы рапарт аб прычынах вышэйзгаданай сваёй бяздзейнасці, даем выпіску з просьбай аб абароне нашага Лідскага павета як для выбару рэкрутаў, так і для належных чыннасцяў камісіі. А прынятую сходам рэзалюцыю адсылаем ужо не ў камісію, а ўпаўнаважанаму.

Томаш Вільканц, земскі суддзя, камісар Лідскага павета
Юзаф Рыхлоцкі, камісар, аддзел інструкцый
Міхаіл Тукала, камісар, аддз. бяспекі
Антон Александровіч, камісар, аддз. справядлівасці
Ігнат Кастравіцкі
Аляксандр Шумкоўскі, камісар, аддз. харчу
Тадэвуш Паўлоўскі, Тадэвуш Фуярскі
Юзаф Радзівонаўскі, камісар, аддз. скарбу
За пячаткай

БПАНК, с.1090, л.230—231.

№ 31. 12 жніўня. Рапарт лідскай камісіі з апісаннем сутычкі пад Слонімам

Рабілася на сесіі 12 жніўня 1794 г. у Новым Двары

Сёння адзін пэўны абывацель, прыбыўшы з маскоўскага абоза пад Слонімам, падаў парадкавай камісіі Лідскага павета наступнае паведамленне, якое адсылаем

святлейшай ЦД ВКЛ. 31 ліпеня нарадовае войска, стаяўшае пад Слонімам, атакавала непрыяцельскае войска пад камандай генерала Ласі, якое гарматнымі стрэламі паваліла ў абозе некалькі палатак і прымусіла яго хутка адступіць у лясы абапал здзяцельскага тракта са Слоніма. Дня 1 жніўня генерал Загражскі, стаяўшы з генералам камандуючым Дэрфельдэнам у в.Гезголы пад Новагародавічамі, у 7 мілях ад Слоніма, паслаў удагон Ласі. Дня 2 жніўня генерал Дэрфельдэн з стаяўшым у Беліцы генералам Зубавым адправіўся у той жа сукурс(пагоню) і спыніўся ў Дзяцеле абозам, адкуль на 4-ы дзень рушыў на 1 мілю ў Вензавец. Адтуль дня 6 жніўня пасунуўся на Казлоўшчыну, дзе, пакінуўшы ўвесь абоз з арыштантамі, той жа генерал камандуючы Дэрфельдэн сам з адной дывізіяй памаршыраваў да в.Воля за Шчарай, а генерала жа Зубава адправіў з дывізіяй другім трактам з жаданнем ахапіць вакол нарадовыя войскі. Дня 7 жніўня генералы Загражскі і Ласі, прыбліжыўшыся да Слоніма, намагаліся ўварвацца праз грэблю ў месца гвалтоўнай атакай, але нарадовае войска пад камандай абываццеля Серакоўскага, даючы мужны адпор, цэлы дзень адпіхала непрыяцеля ад уварвання ў месца і яго бараніла. Дня 8 жніўня, раніцой, непрыяцель спаліў млыны, якія перашкаджалі яму штурмаваць месца, пасля чаго нарадовае войска пакінула Слонім у напрамку Ражанкі, што ў 5 мілях ад Слоніма, а непрыяцельскае войска ўвайшло ў Слонім і стала абозам за месцам на ражанскім тракце ў злучэнні з камандамі Дэрфельдэна і генерала Зубава, якія нядаўна дэманстравалі намеры агарнуць нарадовыя войскі. За тым непрыяцельскія войскі на грэблі 7 жніўня панеслі ў стратах 3-х штаб-афіцэраў, аднаго палкоўніка, аднаго маёра і аднаго капітана, акрамя малодшага рангу афіцэраў, а салдат 600, якіх потым глыбока пахавалі, а месца, каб не было прыкметы дзе, павозкамі зраўнялі і затапталі канямі, а таксама для сховы на тых жа

могілках размясцілі абоз, аб чым вядома ад тых людзей, якія трупы вазілі і хавалі. Пры гэтым той жа абывацель паведаміў:

1-е, што 1 жніўня пад в.Герголы прагучала 5 разоў гарматных стрэлаў і даведаўся ад кур'ера, што генерал-аншэф князь Рэпнін прыбыў у Нясвіж. 2-е, у Казлоўшчыне бачыў абоз выбудаваны шчыльным квадратам, коней сярод абоза, на кожным рагу абоза акапаную 12-фунтовую гармату, у кожнага фурмана карабін, 10 зарадаў і дзіду. 3-е, што непрыяцельскае войска збіралася пайсці на Вільна і калі б нарадовае войска не дало акаізіі пад Слонімам, то пэўна б і атрымалася для маршу, бо генерал Зубаў, ужо стаяўшы з дывізіяй у Беліцы, збіраўся маршыраваць на Вільна ў авангардзе, а польскіх арыштантаў, 39 здаровых, пехам, а няздольных збіраліся адправіць у Нясвіж на падводах пад вартай конных егераў.

Тадэвуш Фуярскі, прэзідэнт, камісар Лідскага павета

Дамінік Нарбут, ротмістр Нарадовай рады, прысутны на сесіі ўпаўнаважаны, такое данясенне чуў і прызнае праўдзівым.

Згодна з пратаколам, *Эдвард Захваловіч*, сакратар парадкавай камісіі Лід.пав. За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.232—232 адв.

№ 32. 20 жніўня. Рапарт лідскай камісіі аб першых сваіх дзеяннях у Новым Двары

Пасля крыху сцішанай трывогі ў Лідскім павеце, парадкавая камісія Лідскага павета сёння, дня 11-га бягучага года, у асобах абывацеляў Томаша Вількаца, ксяндза Юзафа Рыхліцкага, аддзел інструкцый, Тадэвуша Паўлікоўскага, аддзел скарбу, Аляксандра Шумкоўскага, аддзел харчу і Міхаіла Тукалы, аддзел бяспекі, сабралася ў Новым Двары , дзеля бяспекі прызначаным пад камісію, аднак з-за няяўкі камісараў

з другіх аддзелаў перанесла сесію на аўторак. У аўторак, дня 12-га, прыбылі Юзаф Александровіч з аддзела справядлівасці, аб. Юзаф Радзіваноўскі з аддз. скарбу, аб. Матэвуш Глушынскі з аддз. парадку, аб. Габіхт, аддз. інструкцый, а таксама Тадэвуш Фуярскі і паколькі з дня 12-га да сённяшняга больш ніхто з камісараў не прыехаў, а менавіта з аддзела вайсковых патрэб, калі на месца аб. Рачуцкага ніякай замены няма, а абываацелі Мартын Умястоўскі і Дамінік Шалевіч з аддз. вайсковых патрэб дагэтуль нічога аб сабе не паведамілі, то не маючы згодна з арганізацыяй 7 камісараў, членаў аддзелаў, кожны аддзел не мог прыстойна спраўляць свае абавязкі і ніжэй паказаныя асобы тады выконвалі наступныя чыннасці.

1. Зрабіў расклад павета на дазоры.

2. Учыніў расклад дастаўкі абываацелямі з 200 дымоў параконных брычак з канямі.

3. Згодна з універсаламі ад 22 ліпеня склаў смету на 1 каня, а зараз займаецца паборавым тарыфам.

Паколькі ж Лідскі павет застаецца ў небяспецы і нічым не абаронены, а паставіць брычкі ў камісію ў тэрмін немагчыма, бо непрыяцельскае войска спадзяецца хутчэй да яе дабрацца, то адносна тых брычак і коней камісія чыніць рэквізіцыю, каб аддзел вайсковых патрэб святлейшай ЦД ВКЛ перасцярогся аб транспарце і падаў надзейны сродак да яго распараджэння і суправаджэння ў дакладнае месца.

Томаш Вільканц, земскі суддзя, камісар аддзела інструкцый

Тадэвуш Фуярскі, камісар, прэзідэнт парадкавай камісіі

Міхаіл Тукала, камісар аддзе. бяспекі

Матэвуш Глушынскі, камісар

Аляксандр Шумкоўскі, камісар аддз. харчу Лідскага павета

Юзаф Александровіч, камісар аддз. скарбу Лід.пав.

Юзаф Радзівонаўскі, камісар аддз. скарбу Лід.пав.

Тадэвуш Паўлоўскі, камісар аддз. скарбу Лід. Пав.

Эдвард Захваловіч, сакратар парадкавай камісіі Лід.пав.

БПАНК, с.1090, л.233—233 адв.

№ 33. 26 жніўня. Справаздача лідскай камісіі аб тыдні сваіх дзеянняў

Рабілася на сесіі ў Новым Двары 26 жніўня 1794 г.

У належным абавязку рапартаваць ураду ад усіх аддзелаў свайго складу, парадкавая камісія Лідскага павета пасылае ў святлейшую ЦД ВКЛ пленарны рапарт сваіх агульных чыннасцяў ад дня 16 жніўня.

1. Дня 17 і 18-га з-за адсутнасці камісараў з аддзела вайсковых патрэб, агульныя чыннасці камісіі не спраўляліся.

2. Дня 19-га ў сувязі з прыбыццём з люстрацыі касцельнага срэбра камісара аддзела вайсковых патрэб абываценя Мартына Умастоўскага і азначэнні, што мусіць адбыць для завяршэння той люстрацыі, камісія па даручэнню святлейшай ЦД абывацелю Сцыпіёну прадоўжыць распачатую справу з аб.Умастоўскім, якія б сваім выездам сарвалі камплект да прыбыцця камісара аддзела вайсковых патрэб аб. Даменіка Шалевіча, загадала падаць рэзалюцыю у дзень 24-ы.

3. 20-га дня на рэквізіцыю генерал-маёра Лідскага павета абываценя Караля Сцыпіёна аб некаторых матэрыях, прынамсі — аб стварэнні тарыфа аб фуражы і правіянце для збройнай сілы Лідскага павета, аб універсале, які загадвае даць коннага рэкрута з 5 мяшчанскіх дымоў, паколькі камісія не можа зрабіць тарыфа для пастаяннай патрэбы, то яна звярнулася ў аддзел харчу за атрыманнем спецыфікацыі галоў збройнай сілы павета і аказаць ёй дапамогу ў дастаўцы належнага паспалітаму рушанню харча, і адказала, што

не мае ўніверсала аб пастаўцы з 5 мяшчанскіх дымоў аднаго коннага рэкрута.

Выслала юрыдычную рэквізіцыю да не прыбываючых на пісьмовыя сесіі камісараў для ўдасканалення прадпісаных арганізацыяй абавязкаў і стварэння раскладу сесій — найперш дзеля бесперапыннай дзейнасці той камісіі і дазнання, хто адказны за зрыў камплекта. Рэквізіцыю да бурмістра месца Ліды абываделя Раеўскага, каб паведаміў, ці захоўваюцца ў сваім парадку пастаноўленыя крэсы, дзеля чаго тут жа падала ведамасць аб непрыяцельскіх абаротах. Аддала ў аддзелы на выкананне ўніверсалы і ўказы, нездзяйсненыя з часу ўцёкаў камісіі з Ліды ад непрыяцельскага войска.

4. 21 жніўня. Цыдулу, датаваную ў Гродна 10 жніўня, невыкананыя экспедыцыі святлейшай ЦД і тры рэквізіцыі генерал-маёра Лідскага павета абываделя Караля Сцыпіёна і аб.Казаноўскага, генерал-маёра Гродзенскага павета аб 50-дымовых рэкрутах, прачытаўшы на пленуме, раздала ў аддзелы. Загадала Ёдцы, назначанаму жалудскім дазорцам, прыбыць 26 жніўня ў камісію для атрымання інструкцый.

5. 22 жніўня. Рашыла даць рэзалюцыю з напамінкам ноты генерал-ад'ютанта ВКЛ Юзафа Нарбута аб 50-дымовым рэкруце па прычыне незлажэння загаду і некалькіх нот ад генерал-маёра Лідскага павета Казаноўскага пры лісце Найвышэйшага начальніка збройнай сілы. На рэквізіцыю генерал-маёра абываделя Сцыпіёна аб фуражу на збройную сілу павета, аб 50-дымовым рэкруце і брычках для войска прыняла рэзалюцыю, каб тым заняліся аддзелы камісіі. На прадстаўлены ад'ютантам аб.Юзафам Нарбутам загад генерал-лейтэнанта ВКЛ аб.Якуба Ясінскага адказала, што адносна пастаўкі 50-дымовага рэкрута і харчу для збройнай сілы павета адсылае да рэзалюцыі, даручанай абываделю генерал-маёру Сцыпіёну. А што да

абмундзіравання, паколькі генерал-маёр Гродзенскага павета аб.Казаноўскі ў сваёй рэквізіцыі аб тых 50-дымовых жаўнерах прадпісвае не той мундзір, які апамінае ад'ютант аб.Нарбут, то камісія будзе чакаць хуткага паведамлення ад камандуючых генералаў, ад каго і належыць. Вырашыла пытанне аддзела вайсковых патрэб, што ў вёсках дымы земляробаў, фальваркавыя і сельскія, акрамя халупнікаў і агароднікаў, а ў месцах усе агулам трэба лічыць у раскладзе 50-дымовага рэкрута.

6. 23-га. На рэквізіцыю генерал-маёра Лідскага павета аб. Сцыпіёна аб фуражу і правіянце для збройнай сілы Лідскага павета загадала аддзелу харчу даставіць у прапорцыі і абавязкова адрапартаваць у святлейшую ЦД.

7. 24 жніўня. Атрымала ад святлейшай дэпутацыі экспедыцыі, адну аб пасылцы рапарта ў Гродна, другую патрабуючую вызначыць асоб для забрання касцельнага срэбра, і з гэтай нагоды толькі падцвердзіла і загадала завершыць тую справу абывацелям Сцыпіёну, лідскаму старасце, і камісару Мартыну Умастоўскаму, не выдзяляючы іншых асоб. А абывацелю Даменіку Шалевічу і аб. Мартыну Умастоўскаму, камісару аддзела вайсковых патрэб, які неадкладным ад'ездам мог бы сарваць камплект, выслала ўрадавую рэквізіцыю з патрабаваннем яўкі на 26-ы дзень пад адказнасцю сарваўшых. Выдала пасведчанне на асабістае жаданне генерал-маёра Лідскага павета аб.Сцыпіёна, каб паводле ўніверсала Найвышэйшай рады літоўскай 50-дымовы рэкрут быў дастаўлены ў Вільна разам з 100 зл. пры кожным.

8. 25-га. Атрымала адказ на рэквізіцыі камісараў аб.Даменіка Шалевіча і Казіміра Маскалевіча, якія адмовіліся прыбыць і засведчыць няяўку, а астатнія

камісары прыбылі. Атрымала ліст механіка аб. Дыянісія Корца, адрасаваны камісіі лідскай, які ў арыгінале адсылае ў святлейшую дэпутацыю і будзе чакаць пажаданай ім рэзалюцыі. Паколькі парадкавая камісія Лідскага павета з-за небяспекі існуе ў шчуплым месцы і не мае зручнасці перадрукоўваць універсалы, прысланыя выконваць толькі па адной штуцы, і не мае фундушу на перапіс дакументаў, якіх вельмі патрэбна для публікацыі і абвяшчэння па парафіях абывацелям, то гэта без тыражыравання ў адпаведнасці з колькасцю парафій не спадручна з погляду на адсутнасць друкарні ва ўсім павеце. Выразна чыніць просьбу як хутчэй прысласць да наступнага тыдня аб намечаных экзекуцыях, менавіта — кажухоў, ботаў, кашуль, сярмяг, а таксама фуражу, з паведамленнем 12-ці экземпляраў на кожную, а затым намечаныя распараджэнні па 12 штук ужо не прысылаць. Хаця ўжо даўно адрапартавана аб назначэнні камісарам лідскай камісіі ксяндза Ручынскага, абывацеля евангелістскага вызнання, аднак таму, што ён з-за сапраўднай сталасці і свайго слабага здароў'я не можа прыехаць выконваць абавязкі, то просім вызначыць на яго месца абывацеля евангелістскага вызнання, ксяндза Самуэля Кунцэвіча, беліцкага кожнадзея, па рэкамендацыі аб.кс. Ручынскага.

Даны як вышэй. За пячаткай.

Аляксандр Шумкоўскі, камісар, прэзідэнт.

Згодна з пратаколам, *Эдвард Захваловіч*, сакратар парадкавай камісіі Лід. пав.

БПАНК, с.1090, л.236—238.

№ 34. 26 жніўня. Распараджэнне ЦД ВКЛ адносна забеспячэння войскаў

Рабілася ў Коўна на сесіі ЦД ВКЛ 26 жніўня 1794 г.

Следам за выданнем усім парадкавым камісіям 17-га дня бягучага месяца ўніверсала адносна ўладкавання паспалітага рушання з 5 або 10-ці дымоў, ЦД ВКЛ узнаўшы, што ў некаторых паветах абываце́лі вымушаны іншым спосабам адбываць тое паспалітае рушанне, мае абавязак засцерагчы ўсе камісіі стасавацца да ўжо выдадзенага ўніверсала і волі, засведчанай у тым найвышэйшага ўпаўнаважанага ВКЛ абывацеля Карла Прозара. Рэкрутаў жа 50-дымовых, якія маюцца ў паветах, належыць як хутчэй даставіць у м.Коўна са зброяй або на што паветы здольныя, а на тое месца ў паветы будуць прыбываць жаўнеры з паспалітага рушання. Пастараюцца тыя святлейшыя камісіі рабіць боты утрая большай меры па ўсіх месцах і мястэчках са скур, якія толькі маюцца ў магазінах, і аплочваць працу такіх паветаў з нарадовай касы, з якой экзактары абавязаны даць квіты, а ў дэпутацыю ведамасць аб колькасці наяўных ботаў. А паколькі гэтым днём атрымана новая рэквізіцыя Найвышэйшага начальніка аб дастаўцы ў наша месца адной сярмягі з 3-х дымоў, то святлейшыя камісіі тым аб'ектам займуцца і, выбраўшы, разам з рапартамі прышлюць у Коўна. Даны на сессіі як вышэй.

Антон Тызенгауз, прэзідэнт
(Тадэвуш) Кукевіч, сакратар.
За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.239—239 адв.

№ 35. 26 жніўня. Адказ лідскай камісіі на розныя загады ЦД ВКЛ

Рабілася на сесіі ў Новым Двары 26 жніўня 1794 г.

Парадкавая камісія Лідскага павета, атрымаўшы з святлейшай ЦД камплект распараджэнняў і не знайшоўшы пры іх на раней учыненую рэквізіцыю інструкцыі для дазорцаў аддзелаў і цаны наёмным дням, просіць прыслаць абедзьве тыя для хутчэйшага і належнага выканання ўсіх наказаў. Пры тым, паколькі з святлейшай ЦД прыслана розных тэрміновых наказаў аб кажухах, ботах, кашулях і г.д., а таксама ўніверсалаў толькі па адным экземпляры, а публікацыю іх па парафіях немагчыма выканаць без перапісу гэткай колькасці(усіх парафій 11-ць), на што камісія не мае ні фундушу, ні часу, ні моладзі, таму камісія чыніць рэквізіцыю аб прысылцы па 12 штук усіх указаў і чакае загаду, каб потым атрымаць яшчэ некалькі ўніверсалаў. А яшчэ не маючы тэкста прысягі для прадпісаных арганізацыяй двух дазораў і ведаючы аб атрыманні яе для выканання дазорцамі аддзелаў іншых камісій, камісія просіць тую прысягу.

Аляксандр Шумкоўскі, камісар, прэзідэнт

Згодна з пратаколам: *Эдвард Захваловіч*, сакратар парад.кам. Лід. пав.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.240.

№ 36. 26 жніўня. Справаздача лідскай камісіі на розныя загады аб харчу

Рабілася на сесіі ў Новым Двары 26 жніўня 1794 г.

Выконваючы ўскладзены ўніверсалам ННР абавязак, аддзел харчу парадкавай камісіі Лідскага павета рапартуе ў святлейшую ЦД ВКЛ:

1. У адпаведнасці з арганізацыяй камісіі прысланыя ад Нарадовай рады і святлейшай ЦД універсалы і атрыманыя пры агульным разборы, запісала іх у свой пратакол.

2. Дня 4 жніўня. Па дамаганню генерал-маёра збройнай сілай Лідскага павета аб.Караля Сцыпіёна дазволіла ў незанятых непрыяцельскім войскам парафіях на тую ж збройную сілу выбраць з дыма па 3 фунты сухара або па 6 фунтаў хлеба.

3. 18 жніўня. Выдала загад тром абывацелям на 3 вазы сена для стаячай у Васілішках збройнай сілы.

4. 24 жніўня. На рэквізіцыю таго ж генерал-маёра Лідскага павета з дакладам, што збройная сіла паспалітага рушання з-за недахопаў і ўбоства не здольная пракарміцца сваім коштам, пасля высвятлення патрэбы і з агульнай згоды выдала ў 2 парафіі ўніверсал аб забеспячэнні яе з кожнага дыма па 2 фунт.сухароў, па паўкварты круп, па 15 фун. сена і па гарцу аўса. Аддзел харчу пытае ў святлейшай ЦД — што рабіць, калі той правіянт і фураж абываці затрымаюць з моцы ўніверсала НР ад 12 жніўня толькі ўчора, або 25-га, атрыманага ?

5. Таксама звяртаецца ў святлейшую ЦД ВКЛ за інфармацыяй адносна загаданага ўніверсалам ад 6 чэрвеня фуражу — з дыма па 24 фунт.сух., па 8 гарцаў аўса, па 24 фунт. сена — дзе яго абываццелям належыць размяшчаць і якой стражай забяспечыць яго цэласць?

6. Просім рэзалюцыю аб тым, як адбіраць фураж, разабраны канцылярыстамі таргавіцкай канфедэрацыі і часткова раздадзены абываццелям?

Аляксандр Шумкоўскі, камісар, прэзідэнт

Згодна з пратаколам аддзела харчу: *Эдвард Захваловіч*, сакратар парадковай камісіі Лідскага павета.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.241

№ 37. 27 жніўня. Хадайніцтва камісара Ю.Шалевіча аб сваёй працы

Рабілася на сесіі ў Новым Двары 27 жніўня 1794 г.

Ніжэй падпісаны мае гонар данесці святлейшай ЦД ВКЛ наступнае.

Паводле рэквізіцыі камісіі Лідскага павета ад 24 жніўня, атрыманай вечарам 25-га ў Лідзе, як з-за далечыні месца(8 міляў), так і слабасці здароў'я не могучы паспець на 26-ы дзень, прыбыў у Новы двор на сесію зранку 27-га, і хаця дашчэнту абрабаваны Масквой, аднак, паставіўшы агульнае дабро вышэй асабістага, заняўся сваімі чыннасцямі. Паколькі ж у аддзеле вайсковых патрэб толькі 2 асобы, то прашу назначыць рэкамендаванага ў агульным рапарце ксяндза Самуэля Кунцэвіча і тады такім узаемапаразуменнем мне будзе салодка несці спалучаную з выдаткамі працу. Застаюся слугой і г.д.

Юзаф Шалевіч, камісар аддзела вайсковых патрэб.

Згодна з пратаколам аддз. вайск. патр.: *Эдвард Захваловіч*, сакратар парадкавай камісіі Лід.пав.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.242.

№ 38. 1 верасня. Рапарт лідскага аддзелу харчу аб сваёй дзейнасці

Рабілася на сесіі ў Новым Двары 1 верасня 1794 г.

Аддзел харчу парадкавай камісіі Лідскага павета пры змене камплекту, даручанага ўніверсалам ННР, мае гонар прадставіць святлейшай ЦД ВКЛ рапарт сваіх чыннасцяў наступнага зместу.

1. Выдала рэквізіцыю абывацелю Маскалевічу, быўшаму пісару даходаў Лідскага павета за часы Рады літоўскай, прыбыць 31 жніўня ў месца Новы Двор для

разліку і калькуляцыі рэестраў выбранага фуражу з Лідскага павета, а таксама з квітамі, узятымі нарадовым войскам.

2. 29 жніўня. На моцы 7 дзён ад публікацыі ўніверсала святлейшай ЦД ВКЛ, прызначыла дзень 8 верасня для дастаўкі абывацелямі правіянту і фуражу ў месца Ятры.

3. Даверыла абавязак калькуляцыі і прыёма згаданых правіянта і фуража справядлівым весам і мерай аб. Кжы Дашкевічу, абранаму ад Лідскай парадкавай камісіі генеральным пісарам фуражу і правіянту з Лідскага і Эйшышскага паветаў.

4. На рэквізіцыю святл. ЦД ВКЛ ад 29 жніўня бягучага года прадстаўляе лісты канцылярыстаў таргавіцкіх, якія разабралі правіянт і фураж і якія раздалі абывацелям:

— з Дварышча аб. Шукевіч аўса бочак 15
— з Перапечыц аб. Юзаф Нарбут 14
— з Кандрацішак аб. Юзаф Вілбек 7, асьмін 6
— аб. Адам Нарбут, пісар 5
— Абрамовіч, канцылярыст 4, асьмін 6
— Караль Альшэўскі 2
— аб. Клеманс Пратасевіч, канцылярыст 12
— аб. Ян Глушынскі, таргавіцкі пісар 11
— аб. Ян Лазоўскі, асьмін 2
— аб. Шукевіч сена 10 вазоў
— аб. Ян Глушынскі 50 камянёў
— аб. Іяхім Глушынскі 6
— аб. Міхаіл Альшэўскі 8
— аб. Ян Лазоўскі 8

Між тым, некаторыя абывацелі не паказалі квітаў на пазычаны і аддадзены імі фураж, што няхай застанецца на іх сумленні. Пры тым далучаецца перасцярога, што пасланыя лісты яшчэ не пэўныя, бо камісары таргавіцкай канфедэрацыі дагэтуль не далі класіфікацыі

фуражу і правіянту і асоб, якім пазычылі, не паказалі. Адсюль узнікае пытанне — ці належыць тады здаваць калькуляцыю, якую ўсправядлівіць трэба ?

Аляксандр Шумкоўскі, камісар аддзела харчу Лідскага павета. Згодна з пратаколам аддз.харчу: Эдвард Захваловіч, сакратар парадкавай камісіі Лідскага павета.

БПАНК, с.1090, л.243—243 адв.

№ 39. 1 верасня. Рапарт вайсковага аддзела лідскай камісіі аб забеспячэнні войска.

Рабілася на сесіі ў Новым Двары 1 верасня 1794 г.

Аддзел вайсковых патрэб парадкавай камісіі Лідскага павета мае гонар прадставіць аддзелу вайсковых патрэб святлейшай ЦД штодзённы рапарт у наступных словах:

1. У наваколлі Лідскага павета няма цэхмайстраў рознага рамяства, а таму нельга учыніць кантракты на выраб ботаў па ўніверсалу аддзела вайсковых патрэб ЦД ВКЛ ад 5 чэрвеня бяг.года. Хаця, па праўдзе, такіх у некаторых мястэчках па адным або больш двух, а астатнія па вёсках, аднак агульная іх колькасць невядомая з-за непрадстаўлення дазорцамі рапартоў у камісію Лідскага павета. Гэта ж тычыцца і іншых рамеснікаў або паказаных у ўніверсалах 3 і 13 чэрвеня бягучага года матэрыялаў, якіх зусім няма ў Лідскім павеце і яго ваколіцах. У магазінах аддзела вайсковых патрэб парадкавай камісіі Лідскага павета не маецца амуніцыі, зброі, пораху, шабель, волава. Наадварот, абывацелі зведваюць цяжкасці з-за немагчымасці знайсці шаблі і пісталеты для ўзбраення 50-коннага рэкрута.

2. Абывацелі Лідскага павета даставілі 5-дымовых рэкрутаў у каманду генерал-маёра Лідскага павета аб.Сцыпіёна разам з належнай для іх платай, у якога

яны сапраўды знаходзіліся ў якасці заступнікаў, а 5 ліпеня таго ж года пасля рэцірады з м.Ліды тым жа генералам былі распушчаны па хатах.

3. Тарыф аб 50-дымовых рэкрутах зроблены, якіх на Лідскі павет выпадае 175 галоў. Указам 27 жніўня Найвышшага начальніка Тадэвуша Касцюшкі яны аддадзены пад каманду палкоўніка міліцыі Лідскага павета аб.Юзафа Нарбута, які гэтым днём бяг.года уласным загадам спыніў іх абмундзіраванне.

4. Прапісаны і разасланы для публікацыі сярод абывацеляў парафій 2 універсалы пад датай 16 і 17 жніўня гэтага года, адзін — аб кажухах, другі — аб ботах, кашулях і сярмягах.

5. У пратакол сесіі запісана аб завяршэнні 29 жніўня гэтага года збору 50-дымовых рэкрутаў.

Юзаф Дамінік Шалевіч, аддз.вайск.патрэб Лід.пав.

Згодна з пратаколам аддз.вайск.патрэб: *Эдвард Захваловіч*, сакратар парадкавай камісіі Лід.пав.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.245—246.

№ 40. 2 верасня. Справаздача лідскай камісіі за тыдзень дзейнасці

Рабілася на сесіі ў Новым Двары 2 верасня 1794 г.

Парадкавая камісія Лідскага павета, завершыўшы гэтым днём, згодна з раскладам узаемадапамогі, сваю прысутнасць у агульным складзе, чыніць наступны рапарт у святлейшую ЦД ВКЛ аб сваіх дзеяннях пасля 27 жніўня.

27 жніўня зрабіла наступны расклад узаемадапамогі: раней засядаўшы да гэтага дня аб. Шалевіч з аддзела вайсковых патрэб заступіў месца аб. Умастоўскага, зараз занятага люстрацыяй касцёльнага срэбра, з 2 верасня і

далей — абываценяў Казлоўскага, Глушынскага, Свідэрскага, Радзівонаўскага, ксяндза Даукшу, ксяндза Ручынскага і ксяндза Рыбіцкага, з 2 кастрычніка да 1 лістапада — аб. Ксяндза Крушэўскага, Машэўскага, ксяндза Віслоцкага, Шалевіча, Маскалевіча, Ждановіча і Габіхта і так жа згодна на далейшы час прадпісала парадак пераемнасці камплекту і ўзаемадапамогі. Не будучы ў стане з-за небяспек ахапіць сваім прыстойным наглядам актаў арганізацыі, пакінула земскія акты аб.Нарбуту, актаваму пісару, а дакрэтавыя да далейшай сваёй волі пры Юзафе Александровічу. Згодна з пунктам 10 артыкула 4-га арганізацыі прадпісала распарадак сабе і аддзелам. На месца аб. Томаша Гродзіцкага, які адмовіўся ад функцыі дазорцы, дазорцам 7-га цыркуля(астрынскага) назначыла аб. Юзафа Пірускага. Ухваліла падрыхтаваны канцылярыяй расклад дазораў і загадала тое ўпісаць у пратакол аддзела парадку. Прыняла складзеную для гродзенскіх дазорцаў інструкцыю з умовай дапаўнення пры патрэбных абставінах. Засведчыла сапраўднасць скаргі ксяндза Эйсманта, які адмовіўся ад месца новадворскага плябана з-за слабасці здароў'я, і дазволіла звярнуцца ў святлейшую ЦД ВКЛ. На споведзь абывацелькі Агаты Вільбікавай заключыла, што не можа зволіць ад здачы заступцы, фуражу і іншых цяжараў, але дазволіла адаслаць мемарыял у дэпутацыю, які пасылае за атрыманнем рэзалюцыі і ўрадавай думкі. Атрымала экспедыцыю святлейшай ЦД ВКЛ са скарбовага аддзелу, які патрабуе даставіць наяўныя грошы. Таксама і другую экспедыцыю Найвышэйшай рады з патрабаваннем пастаўкі правіянту і вопіс харчу на месцах і вёсках.

Дня 28-га. На пададзены сялянамі вёскі Біскупцы мемарыял аб уціску дзяржаўцам аб.Тупальскім, дала рэзалюцыю, каб той не рабіў неналежнага ўціску і з'явіўся ў камісію 30 жніўня. На мемарыял кагала

Васілішак дала рэзалюцыю, каб генерал-маёр Лідскага павета аб.Сцыпіён устрымаў збройную сілу павета ад нанясення крыўд.

Дня 29 жніўня. На моцы ўніверсала ЦД ВКЛ аб зборы фуража і правіянта з Лідскага і Эйшышскага паветаў, на камісара выбрала аб.Ежы Дашкевіча з абавязкам прадстаўлення калькуляцыі ў аддзел харчу, а тыя вызначыла даставіць у Астрын 8 верасня.

30 жніўня атрымала экспедыцыю Найвышэйшай рады і святлейшай ЦД і на моцы назначэння камісарам абывацеля ксяндза Самуэля Кунцэвіча даручыла таму прыбыць 8 верасня для прысягі. Акрамя раздачы ў аддзелы атрыманых экспедыцый, больш чыннасцяў у агульным складзе не рабіла.

1 верасня паслала ў лідскі магістрат рэквізіцыю, каб вагі і меры для атрымання фуражу былі пастаўлены ў месца Астрын. На рэквізіцыю аб.Юзафа Нарбута, палкоўніка міліцыі, які лістом напамінае аб 50-дымовых кантаністах, адказала, што выпусціць універсал аб умундзіраванні іх і дастаўцы на працягу 15 дзён ад публікацыі. Кошт абмундзіравання 50-дымовага жаўнера камісія папярэдне ацэньвае ў 500 зл., вызначыла сплаціць па 10 зл. на дымы, прыцягнутыя даставіць спамянутага рэкрута, і абавязала абывацеляў паставіць іх у камісію. Мемарыял сялян в.Біскупцы супраць дзяржаўцы, аб.Тупальскага адаслала на дослед і вырашэнне дазорцы лідскага цыркуля. Паколькі заняты іншымі функцыямі і абавязкамі абывацель Ігнат Бачкоўскі без паведамлення запісаны дазорцам, то таго вызваліла ад абавязкаў дазорцы, а на яго месца дазорцам таго ж лідскага цыркуля назначыла аб.Базыля Гімбута. На зварот лідскага старасты аб.Юзафа Сцыпіёна і парадкавага камісара Лідскага павета Мартына Умастоўскага, люстратараў касцельнага срэбра, камісія

пастанавіла, каб яны загадалі ксяндзам дастаўляць срэбра з тых месцаў да люстратараў, пакуль не будзе забяспечана бяспека люстрацыі.

2 верасня парадкавая камісія Лідскага павета занесла ў пратакол квіт генеральнай касы Літоўскай правінцыі.

Тадэвуш Паўлоўскі, парадкавы камісар Лідскага павета, прэзідэнт скарбовага аддзела

Тадэвуш Фуярскі, камісар Лід. пав. аддз. парадку

Міхаіл Тукала, аддз. бяспекі, камісар парад. камісіі Лід. пав.

Юзаф Александровіч, парадк.камісар Лід. пав. аддз. справядлів.

Аляксандр Шумкоўскі, парад. камісар Лід. пав. аддз. харчу

Юзаф Дамінік Шалевіч, аддз. вайск. патрэб, камісар Лід. пав.

Томаш Францішак Вільканц, вайсковы суддзя, эйшышскі парадкавы камісар, аддз. інструкцый Лід. пав.

Згодна з пратаколам агульным: *Эдвард Захваловіч*, сакратар парадк. камісіі.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.249—250.

№ 41. 4 верасня. Данясенне лідскай камісіі аб ваенных здарэннях

Рабілася на сесіі ў Васілішках 4 верасня 1794 г.

З-за шчупласці і непрыдатнасці пагарэлага месца Новы Двор, парадкавая камісія Лідскага павета перанесла сваю юрысдыкцыю 2 верасня ў месца Ваўкавыск і аб сваёй рэзідэнцыі ў тым месцы камісіі рапартуе святлейшай ЦД ВКЛ і разам паведамляе аб абаротах непрыяцельскага войска, аб якіх у той час даведалася.

З рапарта магістрата вольнага месца Ліды ад 2 верасня добра вядома, што 1 верасня некалькі казакоў напалі на ваколіцу Няцечы і абрабавалі абываццеляў Калясніцкага і Вілямовіча, а потым Косаўшчыну аб.Мігдала. Тыя фальваркі ад Ліды не далей як 1 мілю ў бок Ліпнішак. А ў 2 мілях ад Ліды, у Дакудаве, радзівілаўскіх добрах, збожжа малоцяць і ў далейшых месцах таго боку каля Нёмана вынішчаюць палеткі. З другога боку Беліцы немагчыма ўтрымаць рэгулярнай сувязі з абываццелямі без абдуманага спосабу камунікацыі паміж кагаламі. Рапарт беліцкага кагала да кагала Васілішак аб знаходжанні непрыяцельскіх войскаў у перакладзе на польскую мову далучаецца да гэтага рапарта ў святлейшую ЦД і адсылаецца, а аб далейшых абаротах войска камісія пастараецца даносіць па магчымасці. Акрамя таго, далучае ліст аб.ксяндза Кунцэвіча, які з'ехаў па прадпісанню святлейшай ЦД з аддзела вайсковых патрэб лідскай камісіі на люстрацыю касцельнага срэбра, а паколькі аб. Умастоўскі тым заняты, то камісія дапрашаецца на месца таго аб.Кунцэвіча іншага абываццеля назначыць для прысутнасці.

Матэвуш Глушынскі, камісар, прэзідэнт, аддз. парадку

Ігнат Кастравіцкі, аддз. бяспекі, камісар

Юзаф Радзівонаўскі, парадкавы камісар Лідскага павета, аддз. скарбу

ксёндз Ян Даукша, камісар, аддз. харчу

Юзаф Шалевіч, аддз. вайск.патрэб, камісар

ксёндз Юзаф Рыбіцкі, аддз. інструкцый, камісар

Ян Габіхт, аддз. інстр. Камісар

Згодна з пратаколам: *Эдвард Захваловіч*, сакратар парад. кам. Лід. пав.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.251

№ 42. 12 верасня. Данясенне камісара Я.Габіхта ў лідскую камісію

Святлейшая парадкавая камісія Лідскага павета!

Учора вечарам праз кемлівага кур'ера з Гродна атрымаў я экспедыцыю ад аб. Клімантовіча аб наступным. Той аб. Клімантовіч, камісар добраў аб.Тышкевіча, просіць, каб святлейшая камісія не прынімала як 50-дымовых (рэкрутаў), так і брычак з маёнткаў належачых да Эйшышскага павета, бо з надзеі на гатоўнасць непрыяцель дабярэцца да Гарадніцы і, баронь бог, прыйдзе і тое ўсё забярэ. Яшчэ піша мне аб звальненні эйшышскіх ураднікаў. Эйшышскія камісары і крымінальныя суддзі вярнуліся. Кнорынг усё запісанае з актаў павыдзіраў і папаліў, а саміх тых аб'лаяўшы, выпусціў на волю і на тым усё завершылася.

Толькі пачаў я той рапарт пісаць, як прыбыў да мяне аб.Юзаф Кучынскі, аселы жыхар месца Ліды, родам з Васілішак, чалавек добра мне знаёмы з дзяцінства і пачцівы. Толькі ён увайшоў у мой дом, як адразу з жалем распавёў наступным спосабам аб сваёй бядзе. Што ўчора апоўдні прыйшлі ў Ліду некалькі дзесяткаў казакоў і карабінераў, арыштавалі абывацеляў Маскевіча і Пілецкага і з эскадронам адаслалі да князя, а таго ґаротніка пад пагрозай канфіскацыі маёмасці лідскіх радцаў выслалі шпіёніць да Васілішак і Астрыны наконт таго, колькі нашага войска ў тым баку знаходзіцца. Адсылаю знаёмага і прымушанага да той пасылкі абывацеля ў святлейшую камісію. Ён жа гаварыў, што маскалёў збіраецца на Ліду да 7000. Высылаю таксама знойдзенага ў Васілішках арыштанта, якога вельмі прашу святлейшую камісію аддаць пад мясцовую варту. На мой погляд добра б было, калі б частка нарадовай збройнай сілы змагла заняць перавозы і масты на рэках

Дзітва і Лебедзь, не дазваляючы непрыяцелю глыбей пасоўвацца. Інакш, калі ён тыя рэчкі возьме ў сваю стражу, тады мы ўсе ў бядзе будзем. Даносячы аб усім тым, застаюся найніжэйшым з пакорнай пашанай святлейшай парадкавай камісіі Лідскага павета верны слуга

Ян Габіхт, камісар парадкавы

З Васілішак 12 верасня 1794 г. а 9-ці чвэрці ранка

Допіс: экспедыцыя з лідскай крэсы далучана.

БПАНК, с.1090, л.253—253 адв.

№ 43. 12 верасня. Адрас лідскай камісіі з поваду шпіёнства Ю.Кучынскага

Акрамя іншых звестак, парадкавай камісіі Лідскага павета вядома аб пасоўванні да Ліды і ўварванні з розных бакоў у павет, аб забароне выконваць розныя прыгата-ванні па загадам рады і святлейшай дэпутацыі. Сягоннішні дзень цалкам пераканаў аб іх намерах дабрацца ажно да Астрыны, паколькі ўчора, прыбыўшы ў Ліду на некалькіх дзесятках коней і паслаўшы спераду патруль з некалькіх казакоў да Васілішак і да Мыта, віленскага старасты аб. Паца, паказалі ў які бок выбіраюць сабе дарогу. Звыш таго, гарадскую ўладу прымусілі арыштаваць лідскага мешчаніна, аселага гаспадара Юзафа Кучынскага, якога паслалі да Васілішак і Астрыні, каб ім паведаміў, ці ёсць у тых месцах якое войска і дзе сядзіць камісія. Сівы жыхар пад ціскам гвалту падаўся шпіёніць, аднак ледзь толькі прыбыў у Васілішкі, як прызнаўся Габіхту для чаго з'явіўся, а той пры рапарце адаслаў у камісію, але той жыхар Юзаф Кучынскі не пажадаў вяртацца ў рукі непрыяцеля і перасцерагае самую камісію быць асцярожнай... На тым камісія, хаця і не ў поўным

камплекце членаў, чыніць рапарт у святлейшую дэпутацыю аб сведчаннях таго самага Кучынскага, адсылае рапарт аб.Габіхта, паручніка, камісара лідскага з Васілішак і ліст аб. Гаусмана, дакудаўскага радцы добраў аб.ксяндза Любецкага, а для аховы абывацеляў і стварэнння якой-небудзь заслоны ад непрыяцеляў, праз што б камісія і абывацелі маглі задавольваць наказы святлейшай дэпутацыі, камісія просіць каманду вайсковую з Найвышэйшай літоўскай рады і выдаць на тое пастанову святлейшай дэпутацыі, тым больш, што абывацелі не прыгатавалі нават вайсковых рэквізітаў і не адважваюцца пастаўляць правіянт з фуражом з-за пастаяннай пагрозы разрабавання складоў. Рабілася ў Астрыне 12 верасня 1794 г.

Ксёндз Юзаф Рыхліцкі, з аддз. інструкцый, прэзідэнт

Ігнат Кастравіцкі, аддз. бяспекі, камісар Лідскага павета

Аляксандр Шумкоўскі, парадкавы камісар Лід. пав.

Тадэвуш Фуярскі, парадкавы камісар, аддз. парадку

Юзаф Радзівонаўскі, парадкавы камісар, аддз. скарбу

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.254—254 адв.

№ 44. 13 кастрычніка. Апісанне камісарам Ф.Машэўскім рабункаў расійскіх войскаў у Лідзе

Рапарт аддзела бяспекі парадкавай камісіі Лідскага павета ў святлейшую ЦД ВКЛ.

Ніжэйпадпісаны, з уласцівага абавязку аддзела бяспекі і з патрыятычнага клопату аб дабры края, па раскладу прысутнасці зараз вольны ад агульных чыннасцяў экспедыцый бяспекі сядзець дома да 2 кастрычніка, мае гонар паведаміць наступнае аддзелу бяспекі ЦД ВКЛ.

Да 60 конных карабінераў маскалей на чале з маёрам ці ротмістрам былі ў Лідзе 11 і 12-га гэтага года. Увайшлі ў Ліду 11-га дня а адной гадзіне з поўдня ад Дубровы. Першымі заляцелі 12 казакоў. Тыя ўсе згаданыя пінчукі прызналіся ім, што іх забралі ў казацтва нядаўна ў Пінску. Тыя спакойна абыходзіліся. Праз некалькі хвілін з забранага краю прыбыў у Ліду маёр ці ротмістр на чале некалькі дзесяткаў конных карабінераў. Усё адбылося на маіх вачах, прыбыўшага ў Ліду ад камісіі выслухаць узаемныя скаргі мяшчан па загаду святлейшай ЦД. Смела аддаўшыся на волю вышэйшага, я звярнуўся да маёра за дазволам выехаць дамоў. Той спытаў прысутнага пры мне кагальнага жыда - дзе камісія і суддзі. Атрымаў адказ, што ў Васілішках або Астрыне. Тут жа запытаўся пра бурмістра і войта і загадаў ім з'явіцца да яго. А мне, загадаўшы прыслаць яму 2 вазы сена і паўбочкі аўса, дазволіў выехаць, аднак ледзь толькі я дарэмна агаварыўся, што ёсць сам суддзя, як загадаў мне вярнуцца. Абывацелі жа ўтаілі маю годнасць.

Дазнаўшы, што я не суддзя, ён дазволіў мне пакінуць Ліду. За некалькі гадзін я выслаў запатрабаваны фураж, а мае людзі бачылі ў кватэры маёра тых самых жыдоў, якія за замком, без ніводнага каталіка, распавядалі яму пра абароты нашага войска і розныя весткі, ад якіх цяжка даведацца, што тварылася ў размове паміж маёрам і жыдамі. У той жа дзень ён паслаў 6 казакоў да Мыта і адтуль(як я даведаўся пасля хуткай рэцірады нашых сямі павятовых жаўнераў) яны прывезлі каля 9 вазоў сухароў з кажухамі і ботамі. У той жа дзень маёр загадаў схапіць войта Маскалевіча, бурмістра Раеўскага і лоўчыца(?), паслаўшы пацярпелых ад тае блытаніны да каменданта Іўя і загадаўшы улагодзіць салдат тут, у Лідзе. Усю ноч ён правёў на экзаміне ці канферэнцыі з жыдамі і некаторых паслаў да Васілішак і Астрыны.

Зранку, або 12-га дня гэтага года з усходам сонца, сам маёр з 10 казакамі паімчаў у маёнтак Курасоўшчына, каб арыштаваць аб.Тукалу, суддзю і парадкавага камісара Лідскага паведа з аддзелу бяспекі. Аднак не знашоўшы там таго, схапіў жонку Тукалы і загадаў адвезці яе проста ў Ліду пад вартай казакоў на простай фурманцы і на адным кулі саломы. Па дарозе ў Ліду маёр прыхапіў у лазоўскай карчме хворую пані Нарбутаву, а затым з 2 казакамі павярнуў да дому аб.Юзафа Нарбута, лідскага харунжага, дзе пабавіўшы цэлы дзень з хатняй прыслугай, хутка вярнуўся у Ліду. Следам за ім прывезлі літоўскую харунжыну Нарбутаву, якая прасіла адпусціць Тукалаву. Аднак той не паслухаў просьбы харунжыны, але пасля даў Тукалавай сваю каляску з 3 коньмі, фурманам і чалавекам для суправаджэння. Разам з Тукалавай у каманду паехаў лідскі віцэ-пробашч, ксёндз Навіцкі, а харунжына вярнулася дамоў.

Таго ж часу раніцой зняволены лідскі эканом Макоўскі, служачы у камісара аб.Коркуця, і заспеты на двары Сцыпіёна. Яго звязанага адправілі пешшу пры канях. На лідскім двары пабрана ўся жывёла і на ім забаронена малаціць збожжа. Тым жа ранкам сам маёр маскоўскі забраў знойдзеныя ў бурмістра і ксяндза пробашча паперы, пратаколы, рэестры, універсалы і г.д. Ён забараніў абывацелям даваць патрэбныя і прадпісаныя ў краёвае войска фураж і розныя рэквізіты і патрабаваў паведаміць, калі выпадкам прыйдуць польскія жаўнеры. Потым запрашаў іх у Іўе на пагулянку. Пабраўшы ўсе 10 параконных фурманак, акрамя тых, якія фураж павезлі, папярэдзіўшы, што хутка зноў вернецца ў Ліду, папрасіўшы прабачэння, калі каму ў чым зрабіў прыкрасці, ён шчырым і лагодным тонам з усімі развітаўся і са ўсім сваім конным корпусам а 12-й гадзіне раніцой 12-га дня паехаў назад у Іўе праз Дуброву. Вернутыя адтуль без коней людзі

вечарам паведамілі, што ўся армія да 4000 пяхоты і кавалерыі пад камандай брыгадзіра Цыцыянава стаіць ў Іўе і далей, пікеты не далей Ліпнішак, а сам корпус — у Іўі. Сядзім па хатах змярцвелыя ад страху, што наша войска пакінула Лідскі павет і ад нясцерпнага рэха, якое разносіць, што маскалі тут зазімуюць. О, божа, адвярні тое жудаснае рэха ад вольнага і вернага сваёй Айчыне паляка, а мы не здраднікі, а сумленна будзем благаслаўляць чыны нашых каманд і абаронцаў. Яшчэ загадалі аддаць той фураж, які ўніверсалы рады загадалі даць абывацелям. Яго, як належную сабе спадчыну, пад суровай карай і спагнаннем загадалі везці ў Іўе. Ратаваць абывацеляў спрабавалі аб.Маскалевіч і бурмістр Раеўскі. Сёння яны вярнуліся з рапартам аб сваім здарэнні. Са сваёй весткай сёння жа вярнулася і абывацелька Тукалава.

Францішак Машэўскі, парадкавы камісар Лідскага павета, аддзел

БПАНК, с.1090, л.255—255 адв.

№ 45. 13 кастрычніка. Допыт лідскага мешчаніна, абывацеля Юзафа Кунцэвіча

Гаварыў, што бягучага 11-га дня прыехалі казакі і карабінеры на 50 конях і з паўдня да вечару выбралі на фураж некалькі коп аўса. Вечарам жа, калі дапытаны вярнуўся з поля, радцы места даручылі яму паехаць па жаданню казакоў у Васілішкі, каб даведацца, дзе знаходзяцца войска і Лідская парадкавая камісія, а калі не акажацца, то ехаць аж да Астрыны. Радцы загадалі пасланцу сцерагчыся каманды. Казакі жа прыказалі, каб пры сустрэчы з нашым войскам гаварыў, што ў Лідзе іх стаіць не болей 10-ці і дадаць, што ў Іўі ў калоне каля 7000. Дапытаны, не знайшоўшы нікога ў

Васілішках, паехаў у Астрыну, а з прычыны пажару ў Васілішках папярэдзіў камісію аб мэце сваёй пасылкі, пасля чаго быў пасланы ў Гродна ў ЦД. Акрамя казакоў, больш ні ад кога не чуў, дзе стаіць непрыяцельская калона, таксама і пра абароты непрыяцельскіх войскаў. І на тым закончыў сваё прызнанне.

Падпісана трыма крыжыкамі.

БПАНК, с.1090, л.257

№ 46. 14 кастрычніка. З допыту лідскага магістрата аб налётах ворага

Рабілася ў Лідзе 14 кастрычніка 1794 г.

Рапарт у святлейшую парадкавую камісію Лідскага павета

Гэтым 10-м днём перад прыбыццём Масквы ў Ліду лідскі жыхар, жыд Юдка паведаміў нам аб адпраўцы з жыдоўскім лістом у Іўе жыда тутэйшага кагала перадаць, што як войт, так і бурмістр арыштаваны маскалямі. Так і атрымалася, хаця маскалёў не было той ночы, калі жыд перасцерагаў нас не знаходзіцца дома, аднак па палудні прыбылі 15 казакоў і 15 карабінераў з камендантам іх, ротмістрам. Ледзь толькі прыбылі, так адразу распарадзіліся даць з месца 3 вазы сена і 5 коп аўса. Потым той камендант выклікаў кагальнага на сваю кватэру і паслаў за войтам і бурмістрам, каб даведацца, дзе нашыя суддзі. А калі яму адказалі, што іх няма, то ён гэтаму не паверыў, бо яго запэўнівалі, што тут непадалёку фальварак аднаго суддзі. Мы адказалі, што паблізу няма ніводнага. Зноў спытаў - ці даўно тут у вас быў ротмістр Вілбек? Мы адказалі, што тыдні з два назад. Ці браў ён у вас які правіянт? У нас не браў правіянту, хіба толькі недзе. А калі кватэраваў з салдатамі, то колькі іх было? Магчыма да 50 коней, акрамя стральцоў. Ці ўзяў ён у жыдоў 1000

злотых? Адказалі, што жыды асобна далі 800 зл., потым на абвестцы іншых конных салдат аддалі 200 зл., а зноў 800 зл. было выбрана з хрысціянаў. Ці аддавалі па загаду начальства па 24 фунты сена, 24 фунтаў сухароў і па 8 гарцаў аўса? Мы адказалі, што не аддавалі. А па якой прычыне? Па той, што паўторным указам загадалі ўстрымацца разам з мясцовым бурмістрам. А дзе той універсал? Мы адказалі, што ў парафіі, а там разасланы па плебаніях. А больш няма тых універсалаў? Адказалі, што не.

Тады ён паслаў за ксяндзом апытаць яго, а калі больш нічога не змог дабіцца, то загадаў адразу мець у гатоўнасці 12 коней. Мы стараліся, а тут над'ехаў рэвізор з крыўдай на тое, што ўжо мае фураж, нагатаваны у адпаведнасці з універсалам ЦД ВКЛ. Ён загадаў таму разам з 6 казакамі ўзяць і прывезці той фураж, а нам, войту з бурмістрам загадаў зноў стаць перад ротмістрам. І так увесь вечар пытаўся ў ксяндза Навіцкага — дзе мясцовыя тарыфы? Яму адказвалі, што там дзе і каманды. Ён жа настаяў прысягнуць у тым, што не маем, а каб дабавіць крэдыту гэтай аказіі, загадаў войту і бурмістру ехаць у Іўе за сведчаннем брыгадзіра Ланскога і разам з намі адвесці арыштанта з адным пры ім лістом. У адшуканага тлумача цікавіўся — што гэта за пісьмы?

Перацярпеўшы так усю ноч, прыехалі ў Іўе да кватэры таго брыгадзіра, але мусілі чакаць з 2-х гадзін начы аж да 8-й раніцы. Тады ён дапусціў да сябе і найперш пацікавіўся аб універсалах - дзе, якія і ў каго? Мы адказалі, што не ведаем больш ніякіх, як толькі аб адным, які патрабуе фураж. Дзе той фураж? Адказалі, што не рыхтавалі і не маем. А другі раз не рыхтавалі, бо не мелі з чаго, і што паўторна нам паведамілі, што быццам бы не трэба, а таму не адсылалі і не рыхтавалі яго. Не жадаючы больш мець з намі дыскусію, ён загадаў узяць нас пад варту, але потым, праз гадзіну, выклікаў зноў і

паўторна дапытваўся — дзе тыя універсалы? Мы адказвалі, што ведаем той, які ўжо прадстаўлены. А чаму аказваецца, акрамя атрыманага, два ўніверсалы пра кашулі і сярмягі? Тады мы прызналіся, што сярмяг і кашуль не давалі, не маем і не рыхтавалі.

Потым спытаў у бурмістра — ты дом трымаеш?, а калі той адказаў што так, то дадаў — мушу паглядзець у цябе газеты і розныя лісты. Аднаму афіцэру з салдатам ён тут жа даручыў ехаць з намі ў Ліду, каб забраць усе паперы у бургамістра. Калі пад'ехалі ўжо пад Жыжму, то спаткалі вяртаючага ротмістра з яго камандай, які спытаў нас, адкуль мы едзем з афіцэрам. А калі той адказаў, што едзем забраць паперы, то пачулі — калі за паперамі, то яны ўжо ўсе забраныя, дзе толькі ў яго хаце маглі знайсці. І так назад нас павярнуў. Мы мусілі начаваць у Ліпнішках, а паперы прывезлі ягомосць пан з судзінай Тукалавай трактам на Гаў'е ў Іўе.

Назаўтрашні дзень загадаў нам вярнуцца ў Ліду і той фураж, які быў загаданы, устрымацца адсылаць да Астрына, пад суровай экзекуцыяй загадаў яго прывезці з месца ў Іўе, а калі не будзе ў назначаны дзень, тады абяцаў прыслаць 20 казакоў. Адсюль просім аддзел бяспекі святлейшай камісіі якую-небудзь ахову для абароны ад непрыяцельскіх на нас напасцяў.

У той жа дзень, адразу за вывазам нас, войта і бурмістра, у Іўе, паслаў той жа маскоўскі ротмістр па свайму інстынкту(як кажуць жыды) тутэйшага мешчаніна ў Астрыну даведацца аб нашым войску і дзе яно абарачаецца, а недачакаўшы звароту, паехаў сам з Ліды у 5 апоўдня. Мы вярнуліся з Іўя ў суботу а гадзіне папалудні гэтага дня і паслалі радцу, мешчаніна Гуйновіча з двума кагальнымі вызваліць месца ад таго фуражу. Не ведаем толькі адказу. У той жа час івейскі кагал прыслаў ліст з загадам аб правіянце пад суровай экзекуцыяй(пастаўкі якога яшчэ няма з Ліды) і быццам

бы маскоўскім брыгадзірам у чвэрці начы загадана кагальнаму і мешчаніну стаць заўтра ў Іўе.

Тое чытаў кагальны жыд Берка. Даносім і падпісваемся.

Юзаф Раеўскі, бурмістр месца Ліды.

Допіс: лідская камісія просіць вярнуць рапарт для допыту лідскага кагала.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.258—259 адв.

№ 47. 17 кастрычніка. Рапарт лідскай камісіі аб небяспецы Астрыні

Ніжэйпадпісаныя парадкавыя камісары Лідскага павета: адсылаем у святлейшую ЦД у арыгіналах рапарты аб абаротах непрыяцельскіх войскаў пад м.Ліда (крэсамі, бо некаторыя камісары не прыбылі, а другія выбылі з месца Астрыны). Таксама даносім, што абвешчаная дыслакацыя міліцыі Лідскага павета ў месцы Астрын поспеху не мела. Абываце́лі ўздымалі, што пакончылі з сыпкай адпаведна ўніверсалу ад 6 чэрвеня і пачынаюць дастаўляць 50-дымовых кантаністаў, а таксама складаць кажухі, сярмягі і кашулі для войска. На выпадак жа вынікаючай з рапартоў небяспекі, няхай святлейшая дэпутацыя заспакоіць лідскую камісію і дасць ёй дыспазіцыю аб ахове тых складоў.

Даны у Астрыне 17 кастрычніка 1794 г.

Ксёндз Ян Даукша, камісар, прэзідэнт, аддзел харчу

Ігнат Кастравіцкі, камісар, аддз.бяспекі

ксёндз Сабасцьян Думбоўскі, камісар парадкавай камісіі Лідскага павета, аддз. вайсковых патрэб

Юзаф Радзівонаўскі, камісар пар.кам. Лід.пав. аддз.скарбу

Тадэвуш Фуярскі, камісар пар.кам. Лід.пав. аддз. парадку

БПАНК, с.1090, л.261

№ 48. 26 кастрычніка. Рапарт лідскай камісіі аб апошніх сваіх дзеяннях са Скідзеля

Парадкавая камісія Лідскага павета многімі рапартамі паведамляла ў святлейшую ЦД аб пастаянных перашкодах сваім чыннасцям. Існавала, хоць і з перапынкамі, ва уласным павеце, аднак дайшла да таго, што не мае ў ім ніводнага кутка, дзе б магла схавацца ад непрыяцеля. Лідская міліцыя, пакінуўшы на 23-і дзень месца Астрынь, стала ў Скідзелі, а аб.Трубіцкі, палкоўнік, падкрочыўшы са сваёй камандай у Шчучын за мілю ад Астрыні, таксама рэціраваўся ў Скідзель. За тым камісія, наколькі можна пралічыўшы абарот непрыяцеляў, перавезла ў Скідзель правіянт з фуражом і загадала перавезці сабраныя на вайсковыя патрэбы рэквізіты. Нарэшце, не будучы у стане знайсці фурманак на перавоз фуражу і правіянту, адразу, як толькі войска выйшла, а непрыяцель стаў набліжацца, яна задумалася, як захаваць свае асобы і акты. Таму пасунулася на той бок Котры у Гродзенскі павет і, стаўшы, нарэшце, пры абозе ў Скідзелі, даносіць аб сітуацыі лідскай камісіі наступнае:

1. З атрыманым ад каманды патрулем разаслалі да бліжэйшых ад Астрыны абывацеляў квіты (палеты) на фурманкі, каб забраць імі пакінуты у Астрыне правіянт і фураж. Раней жа ўзятыя вазы стаяць у Скідзелі распакаваныя.

2. З-за непрыяцельскага войска немагчыма сабраць поўны камплект камісіі, а хаця б яна і існавала ў такім камплекце за мяжой павета, аднак не можа выбіраць без дазволу і пасведчання павета. Няхай святлейшая дэпутацыя, бліжэйшая да вайсковых планаў, падасць старанным і жадаючым верна служыць Айчыне параду — куды можна падацца са згаданага месца і дзе з актамі схавацца ад непрыяцеля, дзе б хутчэй магла распарадзіцца з учыненымі распараджэннямі пасля заняцця павета непрыяцелям.

3. Гэтай ноччу атрымалі з аддзелу скарба святлейшай ЦД экспедыцыю, якая ўзнаўляе наказ хуткага ўнясення падаткаў абывацелямі. Старалася б камісія тое ўлажыць, аднак, выжытая з павета, не можа абмысліць сродкаў, якія б магла выканаць. Разам прыйшла экспедыцыя аб Навіцкага, экзактара, які з погляду на выдаленне камісіі з Астрыны, паехаў дамоў. Дом за мілю ад Васілішак і непрыяцелем заняты. У такім становішчы чакаем рэзалюцыю.

Даны ў Скідзелі 26 кастрыніка 1794 г.

Ксёндз Ян Даукша, камісар аддзела харчу

ксёндз Сабасцян Дэмбоўскі, камісар аддз.вайсковых патрэб

Юзаф Радзівонаўскі, камісар аддз. скарбу

Эдвард Захваловіч, сакратар лідскай камісіі

БПАНК, с.1090, л.263—263 адв.

№ 49. 27 жніўня. Даклад кобрынскай камісіі аб цяжкасцях у сваёй дзейнасці

Ледзь толькі кобрынская камісія распачала сваю дзейнасць пасля выхаду калоны генерала Дэрфельдэна з межаў павета напачатку жніўня, як у Кобрын з боку Пінска щварвалася 150 коннікаў з каманды брыгадзіра Дзівава. Яны захапілі трох камісараў, якія толькі сваёй ветлівасцю выратавалі архіў і толькі з дапамогай вялікіх высілкаў былі вызвалены з тыднёвага арышту. З тым перапынкам часу надыйшла намінацыя асоб у камісію і крымінальны суд і ЦД ВКЛ даручыла мне дазор павета, але без інструкцыі, якая б выразнымі пунктамі дазваляла мне ўжыць паўнамоцтвы. Я здолеў дзейнічаць толькі самастойным адумам у дробных выпадках, а істотным чыннасцям перашкаджалі захоп непрыяцелем значнейшых парафій ці пагроза нападу на іх. Апошняе вызначэнне ЦД прывязала пабор падаткаў да брэсцкай экзекуцыі, у выкананні якой

мудрасць і стараннасць абываценя змяшалася з няздручнасцю і небяспекай. Не кожны так паступае ў дапамогу патрэбам Айчыны, а гэта вынікае з рапарта аб брэсцкім паборы.

Ні папярэдні, ні толькі што назначаны камплект (камісіі) не прыпісваў 7200 злотых, якія выплачаны па прадстаўленню генерала Макраноўскага і якія камісія атрымала выпадкам, што і выражала ясна ў ранейшым рапарце. Абывацель Гараін, упаўнаважаны начальніка і Нарадовай рады, сваёй уладай забраў на 607 грывен касцельнага срэбра ў Картузы Бярэзскай, уласна у той момант, калі корпус генерал-лейтэнанта адтуль выйшаў і тое срэбра адаслаў у Варшаву. Па ягонаму распараджэнню ім жа вызначаныя афіцэры збіраюць 50-дымовых кантаністаў і заступцаў. Яны б забралі срэбра яшчэ ў Тараканцах і іншых невялікіх касцёлах, аднак дабрацца да іх перашкаджае распылены непрыяцель. На каронны абоз, які на нашай зямлі, хапае фуража і хлеба, а вось аўса і ячменю сапраўды не маем, а яшчэ горш, што паборы падвод на маскоўскія таборы справадзілі заразу на скаціну нашых вёсак. Універсалы пра ссыпку, боты, кашулі, сярмягі і кажухі выконваюцца, няхай толькі ЦД зробіць ласку вызначыць месца складу і патрэбы куды, уласна, тое трэба прадставіць. Паколькі ніколі не будзе камплекта камісіі і крымінальнага суда, бо значная частка асоб маецца ў занятых парафіях або якім пагражае напад непрыяцельскага войска, то прашу ў ЦД ВКЛ выразнага азначэння іх у такім здарэнні. Маю клопат усё рабіць старанна, што толькі можна. Быў бы месяц на заслону ад напасці драпежнікаў, то бы ўсё зрабілася па загадам ЦД. З боку Пінска і Кобрына маем пастаянную пагрозу, аднак адгаворы і перашкоды не спыняць кожнага выканаць свае павіннасці і паслухмянасць.

(Стэфан) Райскі, кобрынскі палкоўнік

БПАНК, с.1090, л.321—321 адв.

№ 50. 25 мая. Рапарт браслаўскай камісіі аб паўторных выбарах свайго складу

Рабілася ў Таўрогінах на сесіі парадкавай, цывільна-вайсковай камісіі 25 мая 1794 г.

Калі на моцы ўніверсала Вышэйшай рады літоўскага народа і папярэдняга ўніверсала браслаўскага падкаморага, ягомосці Багуслава Мірскага абывацелі таго ж павета з'ехаліся 12 мая ў належачае па праву абрадаў месца Браслаў, але знайшлі тое месца занятым Масквой і ўначы 21 дня ператвораным у папялішча, і жадаючы паўторна выдадзенае абвяшчэнне таго ж падкаморага паспяхова падтрымаць сваёй стараннасцю, 24 мая сабраліся ў мястэчку Таўрогіны і адпаведна з прадпісаннем той жа Вышэйшай рады выканалі прысягу на падтрымку выказанага ў тым акце, а прыступіўшы да далейшых абрадаў, выбралі дэлегатаў у Вышэйшую раду васпана Багуслава Мірскага, браслаўскага падкаморага, вядомага добрадзейнасцю мужа, і ў генерал-маёры зямянскага суддзю васпана Вінцэнта Беліковіча, а не здолеўшы дачакацца якіх цывільна-вайсковых камісараў, па канстытуцыі 3 мая абраных і прыбыць абавязаных, у той жа дзень нанава назначылі камісарамі ягомосцяў Юзафа Рудоміна, стольніка, Аўгуста Гедройца, паручніка ВКЛ, Дамініка Каменскага, харунжага нарадовай кавалерыі, Юзафа Мазуркевіча, скарбовага дваараніна, Францішка Савіцкага, каморніка, ксяндза Юзафа Халецкага, таўрогінскага прабошча, Пятра Тачылоўскага, браслаўскага прабошча і каморніка Юзафа Красніцкага, а для вырашэння крымінальных спраў у суддзі выбралі Антона Квінта, падчашага, Бурага, экс-суддзю браслаўскага, Яна Рэхцінда, цывільна-вайсковага камісара, рэгента браслаўскага Якуба Палашэўскага. Акцэс(акт падтрымкі) абывацеляў Браслаўскага павета падпісваем і з-за адсутнасці ў бліжэйшым месце канцылярыі таму ж

васпану, дэлегату Мірскаму даручаем занесці ў віленскія акты.

Юзаф Рудомін, браслаўскі стольнік, прэзідэнт

Ян Салмановіч, шамбелян караля, камісар цывільна-вайсковы Браслаўскага павета

Ежы Самсон Падбярэзскі, камісар цв.вайск. Брас.пав.

Аўгуст Гедройц, камісар цыв.вайс. Брас.пав.

Ксёндз Юзаф Халецкі, прабошч таўрогінскі, камісар цыв.вайс. Б.п.

Дамінік Каменскі, камісар цыв.вайс. Брас.пав.

Францішак Савіцкі, камісар цыв.вайс. Брас.пав.

Юзаф Мазуркевіч, камісар цыв.вайс. Брас.пав.

БПАНК, с.1090, л.329

№ 51. 3 чэрвеня. Справа аб арышце маёмасці графоў Мануцыяў

Парадкавая, цывільна-вайсковая камісія Браслаўскага павета, зыходзячы з універсала дэпутацыі публічнага ўладкавання, выдадзенага 9 мая на тое, каб сачыць за ўсімі шкоднымі народу здарэннямі, зведаўшы, што ў добрах ягомосцяў Мануцыяў, ляжачых у Браслаўскім павеце, падрыхтаваны для вывазу за маскоўскі кардон і ўжо зрушаны з месца розныя скрыні, куфы і вазы з разнастайнымі рэчамі, то браслаўская камісія неадкладна загадвае начальству тых добраў ягомосцяў Мануцыяў спамянутыя скрыні і вазы, дзе б яны не былі, прывезці ў Браслаўскую камісію. Для расследавання гэтага дзейства сёння ў камісіі сталі рэвізор Ян Кавалеўскі і маршалак ягомосцяў Мануцыяў Павел Рымашэўскі, якія добраахвотна прызналі, што спамянутыя скрыні і вазы былі прадназначаны на вываз за маскоўскі кардон па загаду ягомосцяў паноў Мануцыяў. За тым, браслаўская камісія адсылае спамянутых Кавалеўскага і Рымашэўскага для

разбіральніцтва Найвышэйшай рады, розныя скрыні і куфы, не кранаючы іх, апячатвае пячаткай камісіі, а вопіс рэчаў, падпісаны тымі ж, адвозіць у Вільна пад канвоем генерал-маёра Браслаўскага павета. Даны ў Таўрагінах 8 чэрвеня 1794 г.

Юзаф Рудомін, прэзідэнт камісіі цывільна-вайсковай Брасл. пав.

Юзаф Халецкі, пробашч таўрогінскі, камісар цыв.вайск. Брас. пав.

Аўгуст Гедройц, камісар цыв. вайск. Брас. пав.

Францішак Савіцкі, камісар парадкавы, цыв. вайск. Брас. пав.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.332.

№ 52. 6 чэрвеня. Рапарт браслаўскай камісіі аб розным

Парадкавая, цывільна-вайсковая камісія Браслаўскага павета адсылае крэсамі рэчы Мануцыяў у Вышэйшую раду, а пры іх і рэвізора Томаша Кавалеўскага аддае. Пасылае атрыманы мемарыял з абвінавачваннямі таго рэвізора і выпіску з яго для далейшага пераканання ВР у тым, што той уласнаручна перадае мемарыял у Вільна. Адначасова камісія даносіць, што з абывацельскіх грошаў, аплочаных маскалямі за фураж і правіянт, у камісіі складзена 1306 штук галандскіх чырвоных, з якіх ужо выдала 200 чырв. На пастаянныя патрэбы і жалаванне валанцёраў згодна з рэквізіцыяй павятовага генерал-маёра Вінцэнта Белiковіча і павятовай ухвалы. Камісія жадала б атрымаць рэзалюцыю ННР на папярэдняе жаданне пры рапарце ад 27 мая.

Рабілася ў Таўрогінах 6 чэрвеня 1794 г.

Юзаф Рудомін, стольнік і прэзідэнт камісіі цыв. вайск. Брас. пав.

ксёндз Юзаф Халецкі, прэсвітар, камісар парадкавы, цыв. вайс. Б. П.

Аўгуст Гедройц, камісар парад. цыв. вайск. Брас. пав.

Францішак Савіцкі, камісар парад. цыв. вайс. Брас. пав.

БПАНК, с.1090, л.328

№ 53. 5 ліпеня. Даклад браслаўскай камісіі аб недахопах кадраў

Рапарт парадкавай камісіі.

Для выканання прадпісанняў святлейшай ЦД ВКЛ аб вызначэнні асоб у Браслаўскую парадкавую камісію, мы, ніжэй паказаныя, з'ехаліся ў мястэчка Таўрогіны, месца часовай павятовай юрысдыкцыі, і вызначылі Браслаўскую парадкавую камісію, а з-за няяўкі яшчэ трох з вызначаных абывацеляў маюцца толькі рэкамендацыі нездольных зараз у склад камісіі па мемарыялу ад трох гарадскіх уласнікаў ды яшчэ два мемарыялы абывацеляў, жадаючых зволіцца з-за немагчымасці засядаць у той камісіі, з чаго не можам зрабіць расклад тых патрэбных аддзелаў. Маючы пры тым і рапарты крымінальных суддзяў аб зборы няпоўнага камплекту, а перад усім паведамляючы аб тым у святл. ЦД ВКЛ з далучэннем абагуленых 4-х арыгіналаў, знаходзім слушнай рэччу, каб святлейшая ЦД, з погляду на смутны стан гарадскіх уласнікаў, дазволіла замяшчаць абывацелямі і свяшчэнаслужыцелямі не хапаючых асоб як у парадкавую камісію, так і асабліва ў крымінальны суд, дзе патрабуецца хуткае выкананне. Таксама маем дастаўленых двух дэзерціраў з непрыяцельскага войска, якія выказваюць імкненне сваё служыць у краёвым войску. За тым тых жа Пятра Собалева і Івана Сухава камісія пасылае, калі можна толькі іх памясціць у лінейнае войска.

Даны 5 ліпеня 1794 г. на сесіі парадкавай камісіі Браслаўскага павета ў Таўрогінах.

(   ) Ваўжэцкі, прэзідэнт
Юзаф Рудомін, стольнік, камісар Брасл. пав.
Цыбор Новаконскі, земскі суддзя браслаўскі
(Яцэк) Пашкоўскі, камісар
Буры, гараднічы, камісар
Якуб Палашоўскі, камісар
Тэафіл Вырвіч, камісар
Мірскі, мечнік
Юзаф Славінскі, камісар
ксёндз Францішак Кузніцкі, камісар
Юзаф Мазуркевіч, камісар
ксёндз Пётр Тачылоўскі, камісар
Дамінік Каменскі, камісар цыв. вайск. Брасл. пав.

БПАНК, с.1090, л.335

№ 54. 14 ліпеня. Справаздача браслаўскай камісіі аб сваёй папярэдняй дзейнасці

Парадкавая камісія Браслаўскага павета, пачаўшы па выбару павета 24 мая бяг.года сесію з расклада распараджэнняў нарадовага валадарства, згодна з папярэднім назначэннем святлейшай дэпутацыяй новых асоб ужо ў новым складзе да гэтай даты выконвала чыннасці, якія пратлумачаны ў рапарце.

24 мая. На сесіі прыняла ад абываццеляў акцэс (далучэнне) да паўстання народа, адрапартавала аб ухваленні паветам асоб у парадкавую камісію і крымінальны суд, а таксама генерала і дэлегата, размеркавала склад камісіі на 3 сесіі, прыняла маніфест Валенція Квінта на браслаўскага парадкавага камісара Яна Салмановіча, выдала да Вільна пашпарт выбранаму дэлегату павета.

26 мая. На сесіі прыняла акцэс абываццеляў да паўстання народа, звярнулася да мінулых рэгентаў браслаўскай камісіі адносна вывазу актаў з Браслава, выдала 6 пашпартоў у розныя бакі едучым, праз

універсал абвясціла павятовыя выбары, і расклад сесій камісіі з патрабаваннем выконваць акцэсы і паведамляць аб месцы сваёй часовай юрысдыкцыі ў мястэчку Таўрогінах, аб увядзенні крэсаў, аб дастаўцы рэкрутаў з 24 (гарадскіх) і 5-ці парафіяльных дымоў з рэквізітамі і аб ухвале па 1 злот. на браслаўскіх ротмістраў. Дапрасіла маскаля Івана Панфілава, жыхара Опсы, і дазволіла яму вярнуцца дамоў.

27 мая. На сесіі прыняла акцэс абывацеляў да паўстання, атрымала сведчанне паступіўшага рэгента Казановіча, перадала яму ж рапарты з прапановай прыслаць неабходную камісіі перапіску з далучэннем маніфеста ягомосць Квінта на пана Салмановіча, выдала 2 пашпарты на вольны праход пасля экзамену просьб.

28 мая. На сесіі прыняла акцэс абывацеляў да паўстання народа, зволіла траіх з пашпартамі, дастаўленых з крэсаў пасля допыту.

29 мая. Дзень святочны, нядзельны.

30 мая. На сесіі прыняла акцэс абывацеляў да паўстання народа, пасля допыту выдала 6 пашпартоў, вярнула раней зволенага са службы у літоўскай артылерыі Улінскага, загадала ягомосць пану Штадэну вярнуць грошы земляробам, узятыя на рэкрут, выдала пасля допыту пашпарты людзям, прыбыўшым з-за граніцы на жыхарства ў край, атрымала ліст і сведчанне земскага рэгента ў земскіх актах аб некаторых кнігах, спаленых у Браславе.

31 мая. На сесіі прыняла акцэс абывацеляў да паўстання народа, выдала па іспыту 6 пашпартоў, атрымала ад камісара камісіі, ягомосць пана Салмановіча, грашыма 1306 чырвоных злотых за фураж, раней выданы расійскаму войску, а зараз, паводле ўхвалы, аддадзены на павятовыя патрэбы браслаўскаму генерал-маёру пры сведчанні таго ж ягом. Салмановіча, забараніла што-небудзь вывозіць за мяжу з добраў ягомосцяў Мануцы, акрамя камісіі.

1 чэрвеня. Прыняла акцэс абываceляў да паўстання народа, выдала па іспыту 6 засведчаных пашпартоў.

2 чэрвеня. Прыняла акцэс абываceляў да паўстання народа, выдала пашпарты на праезд, адаслала ў тайную дэпутацыю прадстаўленага з новага кардону арыштанта.

3 чэрвеня. Прыняла акцэс абываceляў да паўстання народа, распарадзіла дастаўку пакаў, рухомасці і рэчаў Мануцых, атрымала прызнанні 2-х афіцыялістаў, якія меліся пакі ягомосцяў Мануцых везці за мяжу, а іх з пакамі без пячаткі адаслала ў літоўскую раду, выдала 3 пашпарты для вольнага праезду ў Вільна, атрымала некалькі нядаўна вывезеныя з Браслава кнігі за двумя пячаткамі.

4 чэрвеня. Прыняла акцэс абываceляў да паўстання народа, дапытала дастаўленага Людвіка Шадзінскага, а па іспыце адпусціла дамоў. Прыняла ад інфлянцкай ваяводзіны Тэклі сведчанне на пасылку ў каралеўскую службу дзяцей і дала ім да Варшавы пашпарты, пастанавіла крэсы для камунікацыі з ашмянскай камісіяй, атрымала сведчанні — адно ад Тадэвуша Агінскага з нагоды няяўкі да акцэсу пад час жыхарства ў доме сваіх братоў, другое — ад ксяндза Ластоўскага адносна непастаўкі рэкрутаў з-за прыбліжэння кардону і рабункаў, атрымала мемарыял павятовых ротмістраў аб разборы выпадкаў у добрах Мануцых.

5 чэрвеня. Прыняла акцэс абываceляў да паўстання народа, узяла за квітам генерал-маёра Браслаўскага павета з касы 200 штук чырвоных злотых на павятовыя патрэбы, выдала 4 пашпарты па іспыце для вольнага праезду, выдала ўніверсал у парафіі з далучэннем табліцы размеркавання рэкрутаў на 5 і 25-дымовых.

6 чэрвеня. Абавязала генерал-маёра Браслаўскага павета загадаць пасыльным камандам папярэджваць данясеннямі праходзячых і едучых у камісію, атрымала маніфест з абвінавачваннем рэвізора добраў Мануцы у затрымцы рухомасці, які зараз жа адаслала ў раду, з

павятовых грошаў перадала генерал-маёру 200 зл. для вайскоўцаў, запэўніла крэсавую дэпутацыю аб месцы юрысдыкцыі ў мястэчку Таўрогінах, выдала 2 пашпарты па іспыце ў Вільна, атрымала падпісаны генерал-маёрам рэестр атрыманых ад абывацеляў зброі і амуніцыі.

7 чэрвеня. Прыняла акцэс абывацеляў да паўстання народа, згодна з рэзалюцыяй літоўскай рады, абрала да абавязкаў у камісіі ранейшага рэгента Шацілу, выдала 14 пашпартоў па іспыце для вольнага праезду, разаслала прысланыя ўніверсалы у парафіі з далучэннем сваіх, атрымала абвяшчэнне генерал-маёра Браслаўскага павета аб падрыхтоўцы у парафіях рэкрутаў, зняла допыт з дастаўленых Лебкоўскай і яе селяніна, а таксама богінскага ляснічага Ясінскага, пасля чаго выдала пашпарты на вольны зварот дамоў, прызначыла месца забраных з богінскага склепа трункаў, паслала пад сваім канвоем у Вільна абывацеля Томаша Чаховіча, прыбыўшага з-за кардону з лістамі да жывучых у Вільна абывацеляў і, дзеля ўзаемапаразумення ў гэтым, прыняла сведчанні аб. Забржыцкага адносна немагчымасці яўкі на акцэс з-за хваробы.

9 чэрвеня. Дні святочныя.

10 чэрвеня. Прыняла акцэс абывацеляў да паўстання народа, выдала па іспыце 9 пашпартоў, выслухала прысягу 2-х афіцыялістаў генеральнай канфедэрацыі ў прысутнасці генерал-маёра, прыняла інструкцыю, выдадзеную тым генералам пісару магазіна, дала рэзалюцыю на мемарыял Людвіка Страдзенскага, загадваючы сялянам паслухмянасць і зварот забраных у яго рэчаў, атрымала сведчанне харунжага Бабскага адносна забраных у Богіне 9 штук карабінаў і якія зараз у салдат каманды павятовага генерал-маёра.

11 чэрвеня. Выдала земляробам 36 пашпартоў з пасведчаннем на вольны пераход, учыніла правеж дастаўленаму жыду і зволіла яго з пашпартам, праэкзаменавала бурлака-маскаля, навадзіўшага

гвалтам маскалей пад час яго паходу, і рашыла адпусціць яго дамоў з пашпартам.

12 чэрвеня. Дала рэзалюцыю на мемарыял павятовага генерал-маёра, атрымала рапарт афіцыялістаў мытнага скарбу, адрапартавала аб набліжэнні непрыяцельскага войска ў раду, выдала ў парафіі ўніверсал аб падрыхтоўцы належнага фуражу, дала 7 пашпартоў на вольны праезд.

13 чэрвеня. Прыняла акцэс абываделяў да паўстання народа, вызначыла фурманкі да Вільна пад ахвотнікаў, адасланых па рэквізіцыі генерал-маёра, атрымала данясенне абываделяў аб находзячым непрыяцельскім войску і аб тым паведаміла вількамірскай камісіі, выдала па іспыце 11 пашпартоў на вольны праезд.

14 чэрвеня. Зрабіла адозву ў крэсавую дэпутацыю, атрымала звесткі аб спаленых у Браславе позвах, прысланых Рудніцкаму для захавання ў добрах Мануцыяў, вызначыла па рэквізіцыі генерал-маёра 2 параконныя фурманкі для вывазу пораха з Вільна, выдала абываделям загад аб вызначэнні крэсаў праз высланага з Вільна ў патрэбнае месца абываделя, учыніла рапарт у дэпутацыю бяспекі адносна падыходу маскоўскага абозу да Браслаўскага павета, выдала па іспыце 14 пашпартоў для вольнага праезду ў краі.

15 чэрвеня. Дзень святочны, нядзельны.

16 чэрвеня. З масы павятовага фундуша выплаціла 200 штук чырв. зл. на рэквізіцыю і па квіту генерал-маёра, абрала ў часовую раду дэпутата для прадстаўлення пажаданняў камісіі, праэкзаменавала дастаўленага жыда і затрымала яго для прыгавору крымінальнага суда, выдала 9 пашпартоў на вольны праезд.

17 чэрвеня. Праэкзаменавала 2-х земляробаў, бачыўшых пад час пажару Браслава спамянутага жыда з маскалямі, разаслала па парафіях апублікаваць атрыманыя праз крэсы ўніверсалы аб новых арганізацыях, выдала за сведчаннем 6 пашпартоў для праезду.

18 чэрвеня. Улажыла распараджэнне аб лінейным(жаўнеры) з 25 дымоў і аддала ў віленскую камісію адпаведны экземпляр, адрапартавала ў ЦД аб находзячым непрыяцельскім войску, учыніла рэквізіцыю да павятовага генерал-маёра з мэтай забеспячэння судовага месца на выпадак выступлення да абозу, вызначыла пад лазарэтавыя рэчы 3 жалезныя фурманкі з 1-га палка для суправаджэння іх да Вільна, выдала па іспыце 21 пашпарт для праезду людзям.

19 чэрвеня. Дзень святочны, нядзельны.

20 чэрвеня. Выдала пашпарт да Вільна рамізніку рухомасці Мануцых па завяршэнні рэестра, прадстаўленага той жа камісіі, вызваліла арыштаванага бурлака па іспыце дамоў, атрымала рапарт павятовага генерал-маёра аб абаротах яго войска, да якога далучыла сваю экспедыцыю, выдала ўніверсал аб неабходнасці дастаўкі рэкрутаў з 50 дымоў згодна з новым прадпісаннем, а другім натхніла ўсіх далучацца са зброяй да павятовага генерала, выдала 32 пашпарты, для праезду патрэбных.

21 чэрвеня. Абвясціла ўніверсалам аб патрэбе хутчэйшага ўзбраення, разаслаўшы яго ў парафіі, загадала земскаму рэгенту справадзіць акты з Браслава ў Таўрогіны пад бяспечны дазор, дзеля чаго распарадзілася аб канвоі, выдала на іспыце 6 пашпартоў на вольны праезд.

22 чэрвеня. На рэквізіцыю завілейскага генерал-маёра дала сваю рэзалюцыю, адказала на прадстаўленне браслаўскаму генерал-маёру, рапартавала ў ЦД ВКЛ з выражэннем патрэбаў лінейнага войска для ўмацавання абароны павета, адаслала па камунікацыі экспедыцыю ў вількамірскую камісію.

23 чэрвеня. Прыняла 2 пісьмовыя сведчанні афіцыялістаў добраў Мануцых і дала ім адказ, прызначыла асобу для часовага дазору добраў Лодзь Мануцых, загадала вярнуць вывезеныя рэчы, арыштавала Магдалену Крашэўскую, будучую паручнікам у камандзе валанцёраў Аскеркі, учыніла рапарт з

апісаннем учынкаў таго ж Аскеркі, выслала лодзьскага эканома і тую кабету пад канвоем у ЦД, выдала загад да княжны аб пасылаемых універсалах, улажыла расніcанне паставак фальваркамі праз прыстойныя крэсы, абвясціла ўніверсалам бяспеку сялян, праэкзаменавала 2-х маскоўскіх грэнадзёраў і адаслала іх у Вільна, разаслала ў парафіі прысланыя з ЦД універсалы, выдала 5 пашпартоў на вольны праезд людзей.

24 чэрвеня. Загадала лодзьскаму эканому вярнуць вывезенае ў Вільна, па іспыце выдала 4 засведчаныя пашпарты для праезда людзям.

25 чэрвеня. Атрымала скаргу земляробаў на спамянутую паручніцу Крашэўскую, загадала аплаціць забраны фураж, выдала 12 пашпартоў па іспыце для вольнага праезду.

26 чэрвеня. Прадпісала павятоваму генерал-маёру меры адносна забраных коней і г.д., прыняла ад таго экспедыцыю адносна забраных коней і г.д., прыняла ад таго экспедыцыю адносна забраных нявольнікаў і рапартавала аб тым у ЦД, выдала па іспыце 10 пашпартоў на вольны праезд у розныя бакі.

27 чэрвеня. Загадала аб. Аскерцы, каменданту валанцёраў, забараніць падначаленым браць бясплатна фураж, рапартавала аб пачатку спусташэння маскалямі і не меншых пажогах вёсак справаджонымі і арыштантамі, выдала па іспыце 4 пашпарты на вольны праезд жадаючым.

28 чэрвеня. На запыт павятовага генерала абвясціла праз універсал аб паспалітым рушанні ў некаторых парафіях, выдала 4 пашпарты на вольны праезд.

29 чэрвеня. Адпаведна з распараджэннем ЦД учыніла месца ўтрымання арыштантаў, для бяспекі распарадзілася аб вызначэнні варты і павятовай каманды, выдала па іспыце 3 пашпарты для вольнага праезду людзей.

30 чэрвеня. Рашыла вярнуць і зрабіць часовым службовым памяшканнем Мануцыяў добры Лодзь. Даверыла пільны нагляд над арыштантамі камандзе. Прыняла ад абываценяў сведчанні немагчымасці стаць у паспалітае рушанне.

1 ліпеня. Атрымала намінацыю асоб у парадкавую камісію і крымінальны суд, дала тым жа асобам абвестку, абавязала засведчыць рабункі і спаленне мястэчка Дрысвяты з фальваркам, прыняла сведчанні абываценяў адносна крыўд ад павятовых каманд, атрымала вопіс быдла, рухомасці і збожжа, забраных нявольнікамі, а таксама прэтэнзіі некаторых сялян да вываду быдла, выдала 6 пашпартоў на вольны праезд.

2 ліпеня. Праэкзаменавала 3-х дастаўленых і арыштаваных у заборы бурлакоў і адпусціла іх дамоў, атрымала, згодна з рапартам, жывёлу арыштаваных бурлакоў, забраную пад нагляд абываценяў, і аплату за ўтрыманне дойных кароў, выдала ўніверсал з прапановамі ЦД ВКЛ аб паспалітым рушанні, выплаціла фельшару за вылечаных арыштантаў, выдала загад, абавязваючы сялян да пакорнасці і паслухмянасці ў староствах Мануцых, загадала вярнуць разабраную маёмасць тых добраў, выдала 7 пашпартоў на вольны праезд людзей.

3 ліпеня. Дапытала арыштанта і вызваліла за сведчаннем, выдала 9 пашпартоў на вольны пераход, учыніла рапарт аб тым, якім спосабам забаронена ўхіляцца павятовых каманд пры разабранні імі маёмасці, выдала прадпісанне павятоваму генерал-маёру адносна забеспячэння бурлакоў, наказала апытаць арыштантаў у разабраных маёнтках, выдала ўніверсал аб бяспецы жыхароў бурлакоў і мяшчанскага люду, засведчыла атрыманую з Часовай рады дыспазіцыю аб адпраўленні адміністрацыі ў староствах Мануцых, зрабіла рэестр дастаўленай маёмасці нявольнікаў.

11 ліпеня. Па атрыманні абвяшчэння ЦД аб сталай намінацыі асоб, на сходзе сённяшняга дня новая камісія акрэсліла сваю сесію ў паказаных чыннасцях ад дня 24 мая да сённяшняга, і адсылае у ЦД гэты рапарт аб выкананых працах з далучэннем асобнага рапарта аб сабраных да гэтага часу ахвярах абывацеляў і асобнага рапарта аб арыштантах. Даны ў Таўрогінах 11 ліпеня 1794 г.

Юзаф Рудомін, стольнік, камісар парадкавы Браслаўскага павета

ксёндз Юзаф Халецкі, камісар парад. Брасл. пав.

Аўгуст Гедройц, камісар парад. Брасл. Пав.

Францішак Савіцкі, камісар пара. Брасл. Пав.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.336—339.

№ 55. 23 ліпеня. Паведамленне браслаўскай камісіі аб пераносе сваёй прысутнасці ў Анікшты

Рабілася ў Анікштах 23 ліпеня 1794 г.

Парадкавая камісія Браслаўскага павета, абавязаная выконваць прадпісанні, хацела б цешыць сябе за поспех свайго ўрадавання і дакладваць аб розных намерах да хуткай іх падтрымкі ў павеце, аднак, калі пасля адыходу за кардон апошнім разам мізэрнейшай памежнай часткі ён амаль увесь знішчаны і абрабаваны нападамі непрыяцельскага войска, якія даказаны попелам спамянутых крокаў у сядзібах, асадах і дварах абывацеляў, у тым самотным назіранні набліжэння непрыяцеля да апошняй парафіі і размяшчэння ў ім сваёй юрысдыкцыі, а таксама імкнення яго звонку ў Вількамірскі павет да мястэчка Антопаль і двара Бабцы, як і з другога боку ў Завілейскі павет да мястэчка Пашамяны і ў Віленскае ваяводства да мястэчка Лынкмяны, то парадкавая камісія Браслаўскага павета,

з прычыны аточанай небяспекі захопу і з мэтай забяспечыць акты, перанесла сваю юрысдыкцыю ў мястэчка Анікшты Вількамірскага павета, а для адпраўлення даручаных сабе абавязкаў, асабліва ў паскарэнні экзамену значнай колькасці арыштаваных бурлакоў і для атрымання розных урадавых прадпісанняў, чыніць рапарт у святлейшую ЦД ВКЛ з цяперашняга месца.

Ксёндз Цэзары Новаконскі, цывільна-вайсковы і парадкавы камісар Браслаўскага павета, прэзідэнт

Юзаф Рудомін, стольнік, камісар Брасл. пав.

Дамінік Каменскі, камісар цыв. вайск. і парадкавы Брасл. пав.

Ксёндз Пётр Тачылоўскі, камісар Брасл. пав.

Юзаф Мазуркевіч, камісар цыв. вайск. і парад. браслаўскі

ксёндз Францішак Кузніцкі, камісар парадкавы браслаўскі

ксёндз Тэафіл Вырвіч, апат недаўскі, камісар браслаўскі

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.341.

№ 56. 2 чэрвеня. Зварот мерацкай камісіі, занепакоенай лёсам паўстання

Парадкавая і цывільна-вайсковая камісія Мерацкага павета хаця і чыніць дужа пакараную адозву да Часовай рады літоўскага народа, аднак упэўнена, што тыя асобы, якія на пачатку далі спосабы ратавання з-пад срамотнай няволі, у якой народ быў цягам 2-х гадоў, і які знаходзіць людзей бараніць праўдзівую вольнасць, якой па самой істоце прагне народ, што яны не будуць здзіўляцца таму клопату абывацеляў, што пасылаюць гэтую экспедыцыю з запытаннем — што ж адбываецца ў Вільна, калі люд уцякае за віленскімі пашпартамі праз мястэчка Мерач?

Ію не трэба доўга тлумачыць тое пытанне, а рада можа лёгка здагадацца, што мяст. Мерач, скрыжаваннем мноства трактаў выстаўленае розным прыпадкам ад праходу войскаў, ужо спазнала няшчасце пад час шчаслівай перамогі ў Вільна, калі аж да самой страты таго месца для навакольных абывацеляў бліснуў шчаслівы час падыхаць вольным паветрам з неба, якое, аднак, тым разам пасылае з чорных аблокаў перуны. Люд уцякае з Вільна безупынна, так што акрамя кабет (якія маюць панічныя душы, а таму слушна, што выязджаюць) гэтым захоплена шмат здольных да зброі і ўзброеных мужчын. З другога боку тут чуем, што Сапега са сваёй дывізіяй ухіліўся ад атакі Цыцыянава. Весткі прыносяць трывогу і страх абывацелю, які ледзь пачаў збіраць рэкрутаў, як ужо пачаў сумнявацца ў сабе з відовішча процьмы збягаючых да Варшавы абывацеляў. Сярод рэкрутаў чуваць гаворкі — « Што ж гэта такі вялікі агром люду ўцякае, відаць непрыяцель ужо непадалёку». Дазваляе тое страх, але ці варта так трывожыць народ ? Вольна тое пакідаць месца, каб не было каму бараніць народ! Пахаваемся ўсе разам у папялішчы, няхай непрыяцель усіх нас да астатку забівае, абы толькі з вечным сорамам не пакласці зброі перад палохаючым непрыяцелем. Тое ёсць голас агульны вольнага народа. Станем думаць заадно, няхай не будзе разважаючых з погляду на вышэйшага: абы усе прапалі, а ён цэлы застанецца. Абмыслім патроху выправу супраць Цыцыянава: відаць, як толькі дывізія Сапегі пакінула месца, як гэтую акцыю звязалі з уцёкам люду з Вільна для вываду ад блізка падступіўшай трывозе. Зважце, абывацелі ў радзе, людскую думку (можа і нявінную), што відаць нейкія, праціўныя ўкладам паўстання народа паразумеліся столькі люду аддаць на вынішчэнне і луп непрыяцеля.

Дай жа згуртаваны народ вызначыцца з усім тым, аб чым камісія жадае асведаміцца. Памятайце аб тым, што

вырушаны на тую святую справу абывацель так павінен дзейнічаць, як пачцівы паляк, абаронца славы, вольнасці, цэласці і незалежнасці ўчыніць павінен, бо вас некалькі дзесяткаў над укладам дабра Айчыны працуе, а мы, паслухмяныя вам, гледзячы на вашу справу, усе чыннасці крытыкаваць будзем. Нялёгкае тое запытанне ідзе не аб жыцці некалькіх асобаў (аб маёмасці ўжо не гаворым, яе ўжо няма і яна ў руках непрыяцеля), а лічыце аб мностве тысяч, прагнучых ваяваць.

Рабілася ў Мерачы 2 чэрвеня 1794 г.

Людвік Жылінскі, зямянскі суддзя, камісар цывільна-вайсковы і парадкавы Мерацкага павета, прэзідэнт.

Людвік Карловіч, камісар цыв.вайск. Мер.пав.

ксёндз Ян Вішнеўскі, камісар Мер.пав.

Вінцэнт Элснер, камісар цыв. вайск. Мер.пав.

Мацей Снарскі, камісар цыв.вайск. Мер.пав.

Антон Элснер, рэгент земскі і парадкавы камісіі Мер.пав.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.392—392 адв.

№ 57. 13 мая. Даручэнні гродзенскай парадкавай камісіі свайму дэлегату ў Часовую раду ВКЛ

Парадкавая камісія Гродзенскага павета на моцы ўказа Вышэйшай часовай рады ВКЛ аб высылцы абранага дэлегата ў тую раду ад усяго павета (туды) прадстаўляе ягомосць пана Дамініка Маткевіча з рапартам аб сваіх чыннасцях, якому даручае выклапатаць рэзалюцыю на ўсе ахопленыя рапартам няпэўныя пункты, загадвае рэгулярна прысылаць усе распараджэнні Часовай рады ВКЛ да свайго павета, нарэшце ўсё тое, што яму даручана як бясспрэчнаму сведку ўсіх чыннасцяў, аддаем і давяраем яго характару, дабрадзейнасці і клопату і жадаем і патрабуем прыняць

з удзячным ахвераваннем, каб памясціць яе сярод абывацельскіх заслуг за такія ахвотныя для павета паслугі.

Даны ў Саколцы 13 мая 1794 г.

Францішак Боуфал, камісар парадкавы Гродзенскага павета, прэз.
Ігнат Лахніцкі, камісар
Ігнат Скарбек, камісар
Шыман Завістоўскі, камісар
Іяхім Храптовіч, камісар
Геранім Барэцкі, камісар
Фларэнцій Крывіцкі, камісар
Мікалай Мілкевіч, камісар
Юзаф Міхоцкі, камісар
Антон Занеўскі, камісар Гродз. пав. сакратар.

БПАНК, с.1090, л.440

№ 58. 13 мая. Апісанне пачатку дзейнасці гродзенскай камісіі

Даўно ўжо адчуваў Гродзенскі павет, што яму дыктавалі абывацельскі абавязак і міласць Айчыны і што яму заставалася рабіць у стане цяперашніх акалічнасцяў, аднак на працягу 2-х гадоў трывожнай прысутнасці непрыяцеля ў кожным пачыне і намеры пазнавалі надзвычайныя цяжкасці. Нарэшце, падышоў і той момант, калі слаўныя поспехі святой рэвалюцыі ў Варшаве і Вільна рэшткі тых недабіткаў і некалькіахопленых страхам маскоўскіх каманд, сабраных пад Гродна ў адну сілу, зрабілі тое месца мэтай іх помсты і зайздрасці, якія тым вальней і беспакаранней зваліліся на няшчасных абывацеляў, што ў звычайным непаразуменні жаўнеры паўцякалі на некалькі міляў, а адсунутыя адсюль да Бельска на доўгую затрымку і адтуль звароchаныя далей, не маглі вырыць ямы іх дзёрскасці і лютасці.

Нарэшце, пры амаль поўным вынішчэнні таго конту сабранай пад Бельскам камандзе літоўскіх войскаў удалося па неаднаразовай просьбе абывацеляў і дэлегацыі прыслаць у бок Саколкі 100 коней з каманды палкоўніка Азулевіча на заслону рэштак абывацеляў, да якіх непрыяцель не прасцёр зброі. Тая малая каманда, узмоцненая натхненнем аб.Казаноўскага, патэнтаваным Найвышэйшым начальнікам Тадэвушам Касцюшкам у палкоўнікі нарадовай збройнай сілы, сабраўшы у тым месце купку валанцёраў, якіх супольна падцягнуў абывацель Гродзенскага павета, толькі тут ратуючых сваё жыццё ад рабункаў і непрыяцеля, дазволілі нам, хто толькі вольны быў сабрацца, сфармаваць акцэс (падтрымку) да акта нарадовага паўстання ў Кракаве, які пасылаецца ў выпісцы пад № 1 разам з іншымі чыннасцямі без магчымасці іх хуткага надрукавання з-за далечыні друкарні, дзе адракліся ад імя і экзістэнцыі Сакольскага павета ад усіх урадаў, паходзячых са здрадніцкага гродзенскага сейма, і ўсе выканалі прысягу адпаведна з акцэсам.

Потым прыступілі да выбару каменданта павятовай збройнай сілы ягомосць Канстанціна Ельскага і подпісамі папрасілі Вышэйшага начальніка збройнай сілы Тадэвуша Касцюшку ўпаўнаважыць яго, а ўсё тое разам з прыналежнасцямі акта адправілі праз кур'ера да таго ж. Потым прыступілі да выбару парадкавай камісіі, у якую павет адзінадушна пазваў 60 асоб, выбар і прысягу ўсіх іх пасылаем у Вышэйшую часовую раду ВКЛ праз дэлегаванага ад Гродзенскага павета ў тую ж раду ягомосць Дамініка Маткевіча згодна з указамі і распараджэннямі ВЧР ВКЛ, усе ўніверсалы якой занадта позна атрымалі, а з іх з першага адно да № 4 няма. Словам, выканалі ўсё, што ад нас жадалі мець наказ кракаўскага акта і абывацельскія абавязкі. Пасля выканання па прадпісанай форме прысягі парадкавых камісараў, распачалі сваю дзейнасць выданнем

памешчанага тут друкаванага ўніверсала і стварэннем кнігі ахвяраванняў, якую потым раздрукуем да ведама і рапартам паведамім, а таксама ўсяго таго, што хутка вымагалі абставіны бягучага моманта. Для ўзнагароды ж стараннасці і прыклада, увачавідку ўвасобленых у адрачэнні ад урадаў і ўсіх знакаў, якія б магі вылучаць яго з роўнасці, а таксама прадастаўленнем свайму падданству жаданай вольнасці, якое б пайшло на абарону Айчыны і там мужна білася, павет адзінагалосна абраў прэзідэнтам парадкавай камісіі і да той жа прысягі папрасіў ягомосць Францішка Боуфала.

На 10-ы дзень адгэтуль у вызвалены ад непрыяцеля Гродна паехаў генерал-маёр ягомосць Канстанцін Ельскі, які, зрабіўшы патрэбны парадак і неабходныя перасцярогі ў часе ўзбраення таго месца, пазваў абываццеляў далучыцца да акцэсу, які пачалі ўчора, аднак адклалі на 14-ы дзень з погляду на намечаны тады з'езд поўнага камплекта камісіі ў Гродна, з разлікам папоўніць яго яшчэ некалькімі парадкавымі камісарамі. Заходзіла і яшчэ зараз заходзіць пытанне, якое застаецца вырашыць Часовай радзе правінцыі ВКЛ, а менавіта. У атрыманым з ЧРН ВКЛ наказе ад 27 сакавіка гаворыцца, што ніводная асоба, прыцягнутая да ўрадавання па спісу таргавіцкай канфедэрацыі, ні ў якім разе не можа быць допушчана да якіх-небудзь урадаў. Мы, падтрымліваючы пераканание аб недапушчэнні тых асоб да выбараў, у апошнім універсале скарбовай дэпутацыі ад 27 сакавіка знаходзім вырок, каб тыя ўнеслі і аддалі ў скарб узятыя грошы і ўсялякія квіты (палеты). Ведаючы свой абавязак выконваць найвышэйшую волю святлейшай рады ў роўнай меры са сваім жаданнем, не можам не прапанаваць сваім абавязкам, што некаторыя з іх у тое ўцягнуты са сваіх дамоў прымусам прысягаць у канцылярысты і мусілі адзяйсняць сляды пачыненага гвалту пад прымусам волі. Некаторыя жа, пад шчытом маскалей абрабаваныя,

не ў стане хутка вярнуць узятыя грошы, якія некаторыя да вернага звароту хавалі ў павеце, аднак ад поўнай здачы іх утрымліваў страх пераследу. Магчыма тыя знойдуць дарогу і спосаб сваім разборам ад Вышэйшай рады ВКЛ, а як зараз пачаць камісіі з паветам, аб тым цяперашняя парадкавая камісія па жаданню павета пытаецца ў Часовай рады ВКЛ.

Што да падаткаў. Калі Гродзенскі павет, не маючы яшчэ ад Часовай рады правілаў віленскага акта, учыніў свой акцэс адпаведна з думкай акта кракаўскага паўстання ў Кракаве, калі ён згодна з тым ужо выдаў універсалы аб паборы рэкрутаў падобна як і ў Кароне, якія ўжо паведамлены Найвышэйшаму начальніку збройнай сілы, калі па прадмету падаткаў выяўляецца спосаб поўнай асобнасці Літвы ад Кароны, — то пытаецца, якога жа прытрымлівацца, мяркуючы тым часам і згодна з тым выдаць адозву на актыўны збор як валанцёраў, так і патрыятычных ахвераванняў. З некаторых месцаў ужо ахвотна збіраюцца рэкруты і пастаянна прыбываюць вольныя людзі. Іх камісія часова ўзбройвае пікамі і аддае на агледзіны ягомосць Казаноўскага, які дзе прыкладам, а дзе і сваім клопатам сабірае валанцёраў. Фураж і харч для іх камісія загадала разлажыць на дымы і згодна з раскладам утрымліваць іх у якасці рэкрутаў нарадовай збройнай сілы, аснашчаць зброяй адшукае адпаведныя і лепшыя сродкі разам з ягом. генерал-маёрам Ельскім, а рапарт аб сваіх штотыднёвых чыннасцях будзе мець абавязкам адсылаць на рукі свайму дэлегату. Гэтым днём камісія атрымала ўніверсал ВЧР ВКЛ аб здачы стралкоў у Вільна і адразу занялася іх зборам, і як толькі збярэ, то адашле іх як хутчэй у Вільна.

Даны ў Саколцы 13 мая 1794 г.

Францішак Боуфал, камісар парадкавы Гродзенскага павета, прэзід.

Ігнацій Лахніцкі, камісар

Ігнацій Скарбек, камісар
Шыман Завістоўскі, камісар
Геранім Барэцкі, камісар
Фларэнцій Крывіцкі, камісар
Мікалай Мілкевіч, камісар
Юзаф Міхальскі, камісар
Іяхім Храптовіч, камісар
Антон Ланеўскі, парад.камісар, пяро трымаючы.

БПАНК, с.1090, л.441—442.

№ 59. 13 мая. Рапарт начальніка гродзенскай міліцыі К.Ельскага

Рапарт генерал-маёра міліцыі Гродзенскага павета, выбранага на элекцыі 9 мая 1794 г. у Саколцы, у Вышшую раду нарадовай збройнай сілы ВКЛ.

1. 9 мая а 10-й гадзіне ў месцы яго каралеўскай мосці Саколка, што ў 6 мілях ад Гродна, у бок бліжэйшы да Варшавы, абраны генерал-маёрам пры акцэсе і саюзе, учыненым гродзенскімі абывацелямі да злучэння Вышэйшай рады нарадовай збройнай сілы ВКЛ прынцыпова згоднага з саюзам пад начальствам ягомосці Тадэвуша Касцюшка, вышэйшага начальніка нарадовай збройнай сілы.

2. Экстракт той элекцыі для атрымання патэнта ад ягом. Т.Касцюшкі, начальніка нарадовай збройнай сілы, пасланы з кур'ерам 11 мая з Саколкі разам з даняседнем іншых чыннасцяў таго створанага саюза і з паказам асоб парадкавай камісіі пры тым рапарце.

3. Да ягом. Т.Касцюшкі за маім подпісам адпраўлена хадайніцтва на ранг палкоўніка рэгімента, які намечана сфарміраваць згодна са штатам нарадовай збройнай сілы з выбару аднаго чалавека з 5 дымоў сярод заўжды

гатовых кантаністаў Гродзенскага павета. Назначаць і шукаць іншага рангу афіцэраў у маю дывізію — пакінуць мне, бо я буду шукаць годных на тыя рангі асоб па іх талентам і веданню ваеннага майстэрства.

4. Такім шляхам заснаваўшы мае далейшыя чыннасці, прыбыў у Гродна 11 мая ўслед за выхадам князя ягом. Цыцыянава, генерала расійскіх войскаў, стаяўшага дагэтуль пад Шчучынам. Далей ён, відаць, пойдзе на Ліду да мяжы сваёй дзяржавы, пра што ведаю ад шпікоў, якія дабраліся да яго абозу.

5. Далучаю рэестр забраных мной у скарбе князя Панятоўскага амуніцыі, таксама спецыфікацыю жалеза біскупа Касакоўскага, таксама пакінутай зброі літоўскай пешай гвардыі і іншых патрэбных войску рэквізітаў.

6. 12 мая выдаў абывацелям Гродзенскага павета сведчанне маіх абавязкаў адносна бяспекі таго павета, сачэння за Цыцыянавым і далейшых падыходаў адкуль небудзь каманд. Застаюся.

Даны ў Гродна 13 мая 1794 г. Найяснейшай рады нарадовай збройнай сілы ВКЛ ніжэйшы слуга *Канстанцін Ельскі*, генерал-маёр міліцыі Гродзенскага павета.

БПАНК, с.1090, л.443—443 адв.

№ 60. 14 мая. Рапарт К. Ельскага адносна кантрыбуцыі з Гродна

Найвышэйшая рада нарадовай збройнай сілы ВКЛ

Мяшчане і гарадскія абывацелі былі пад страхам разарэння месца Гродна камандай князя Цыцыянава, калі не заплоцяць яму асабіста перад самым выйсцем належных 15000 чырвоных злотых. Тады тое месца выпрасіла ў непрыяцеля Айчыны літасці столькі, што

загаданая кантрыбуцыя была зменшана з 15 да 6 тысяч чырвоных злотых, якія ў сваім старанні выплаты грошаў места Гродна запазычыла ў скарбовых афіцыялістаў, пра што сведчаць атрыманыя на тую суму дакументы. Цяпер, калі Вышэйшая нарадовая рада ВКЛ загадала скарбовым афіцыялістам адвезці рэшткі грошаў у Вільна, абывацелі і мяшчане м.Гродна прапанавалі мне паведаміць Радзе, што не могуць у такім хуткім часе даставіць тых грошаў і не маюць спосабу. Тыя ж афіцыялісты жадаюць, каб Вышэйшая рада перадала тыя самыя грошы парадкавай камісіі ў месце Гродна на патрэбы міліцыі Гродзенскага павета, вызначыўшы, колькі гродзенскіх абывацеляў па дакументах места абавязаны запазычаныя скарбовым афіцыялістам, або, калі ННР канчаткова пажадае месцу Гродна іх адвесці і скласці ў скарбовую дэпутацыю Вільна, тады ўказаць дакладны час той сваёй волі, а мяне тое места абавязала прапанаваць Вышэйшай радзе сваю просьбу аб здачы грошаў. Яснавельможны Дэконскі, літоўскі надворны падскарбій, зрабіўшы акцэс і прысягу да таго саюзу, настаецца на тым, што Вышэйшая рада падасць сваё рашэнне скарбовым афіцыялістам, а не яму, міністру скарба, і папярэдзіў, што скарбовая камісія разлічыла яшчэ не ўсіх афіцыялістаў, а калі з гэтага ў публічным скарбе не апынецца якіх недахопаў, то жадае загаду асабіста стаць у Вышэйшай радзе, каб асвятліць стан публічнага скарбу, абы толькі афіцыялісты, кожны у сваёй вобласці, дакладна здаволіліся з засведчаных прыходаў грошаў. Па прапанове таго ж яснавельм. Дэконскага, падскарбія надворнага, я, як генерал-маёр міліцыі Гродзенскага павета, загадаў узяць у палітычны арышт скарбовага касіра Язерскага, які пад маскоўскімі пагрозамі паказаў маскалям места, дзе былі схаваныя грошы з волі падскарбія мінулай камісіі. Парадкавая

камісія ўжо перабралася з Саколкі ў Гродна для выканання сваіх чыннасцяў. Я маюся ў Гродна толькі тымчасовым заступнікам для данясенняў гэтай парадкавай камісіі ў ННР і каб не скарачаць радзе час для выканання адпаведных і патрэбных у тым Гродзенскім павеце распараджэнняў.

14 мая 1794 г. у Гродна. Заўжды верны і ніжэйшы слуга Вышэйшай рады нарадовай збройнай сілы ВКЛ *Канстанцін Ельскі*, генерал-маёр Гродзенскага павета.

БПАНК, с.1090, л.438—439.

№ 61. 16 мая. Рэзалюцыя Вышэйшай літоўскай рады адносна дызерціраў

Дэпутацыя публічнай бяспекі на мемарыял ягом. Дамініка Дзядзеркі ад дня 12-га бягучага дае рашучы адказ.

Паколькі голас грамадскасці робіць гонар пакідаючым фартэцыю без фармальнасцяў абароны ці капітуляцыі, як гэта патрабуецца разабраць у справе Дзівановіча з 8-га пешага палка за кардонам, а раз таму ўсяму стаць сведкамі не могуць афіцэры і жаўнеры, якія былі ў Нясвіжы, ужо занятым кардонам, і рассеяныя на бакі, то з тых абставін мяркуе дэпутацыя аб немагчымасці прадставіць пажаданы суд ягом. Дзядзерцы, асабліва калі 2 пункты, менавіта Нясвіж са сваімі ваколіцамі і месца, дзе дзяжурыў 5-ы полк, апынуўся пасля вызвалення ад непрыяцеля пляцам уласцівым для выканання папярэдняй інквізіцыі.

Даны на палуднёвай сесіі 43-й 16 мая 1794 г.

Станіслаў Мірскі, Валенцій Гарэцкі, Міхаіл Дашкевіч, ксёндз Юзаф Міцкевіч, Ігнацій Лахніцкі, Вінцэнт Паплаўскі, пісар.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.437

№ 62. 18 мая. Меркаванні Вышэйшай рады ВКЛ адносна збору рэкрутаў

Камісія Гродзенскага павета, маючы універсал рады ад дня 9-га бягучага, загадваючы абывацелям даць з 5 дымоў узброенага чалавека ў каманду генерал-маёра і яго ротмістраў у парафіях, а з другога боку, мае пракламацыю генерал-маёра і камісіі Віленскага ваяводства, якая абавязвае абывацеляў да пастаўкі тых узброеных людзей у Вільна з рэквізітамі і харчам на 15-ы дзень, а раз тыя людзі адрываюцца ад ралля, то яна бачыць у гэтым цяжкасці для земляробства і абывацеляў, што не адпавядае намерам універсала рады. Паўторна гэтымі аснашчанымі ў рэквізіт і да месца прыведзенымі людзьмі немагчыма распарадзіцца, як і толькі памясціўшы іх у лінейнае войска, а з гэтага мноства іх па сваёй неасветнасці і няведанню хатняй каманды пакінула б свае дамы і пахавалася б па лясах, у выніку чаго скараціцца дапамога войску і апрацоўка ралля, а ўласнікі, з-за немагчымасці паставак, апынуцца нявіннымі супраціўленцамі нашых уставаў. Каб папярэдзіць тады тым пагрозам, дэпутацыя (?) прапануе ягом. генерал-маёру пасля атрымання сельскіх людзей ротмістрамі і падначаленымі ў свае парафіяльныя каманды, вызначыць іх для субардынацыі і муштры ў бліжэйляжачыя да жылля месцы, а потым садзейнічаць адводу на патрэбнае месца і дапамагчы землеўласнікам у забеспячэнні намераў паўсюднай абароны.

Дадзены на сесіі 4-й ранняй 18 мая 1794 г.

Юзаф Міцкевіч, прэзідэнт, Ігнацій Лахніцкі, Валенцій Гарэцкі, Міхаіл Дашкевіч, Бістром, Юзаф Меер.

БПАНК, с.1090, л.435.

№ 63. 19 мая. Запрос А. Казаноўскага адносна пастаўкі валанцёраў

Рэквізіцыя ў Часовую раду ВКЛ пад начальствам Т.Касцюшкі.

Прысвяціўшы асобу і сваю працу на публічную паслугу, я самадзейна пачаў спярша са збору, абмундзіравання і аснашчэння каньмі, зброяй і розным парадкам некалькі дзесяткаў валанцёраў. Мая сітуацыя не дазваляе зараз мець сродкі пры сабе для павелічэння вярбоўкі. Шукаю шляху, каб, відаць, ужо практыкаваным у ВКЛ спосабам атрымаць падсілак з публічнай касы, бо змагу таго жаўнера сабраць для Айчыны і ўправіць так, што ён можа быць карысны і для края. Я са свайго боку не буду шкадаваць працы па іх удасканаленню з прысутнымі пры мне здольнымі афіцэрамі некалькі соцен і як змагу вышлю, аднак выставіць 400 кавалерыі і 400 стралкоў немагчыма ў маёй сітуацыі.

Допіс: з погляду на засіленне з публічнай касы.

Даны ў Гродна 19 мая 1794 г. а 11 гадзіне перад палуднем.

Андрэй Казаноўскі, палкоўнік вольнай збройнай сілы літоўскай.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.434.

№ 64. 24 мая. Апраўданні гродзенскіх таргавічан у сваёй нявіннасці

Святлейшая парадкавая гродзенская камісія !

Цяперашняе паўстанне народа і жаданне памкнуцца вызваліцца ад знешняга ўціску — гэтую пахвальную справу кожны абывацель падтрымаць павінен.

Ніжэйпадпісаныя, пранікнёныя падобным духам, жадаем учыніць садзеянне па меры нашай магчымасці і адпаведна магчымасцяў нашых маёнткаў, аднак паколькі са створанага зараз саюза выключаны асобы, уцягнутыя ў таргавіцкі саюз, то з гэтага ў грамадскасці маюцца падазрэнні (і на нас). Мы, ніжэйпаказаныя, гвалтам і прымусам, асабліва гетманам Касакоўскім і яго супрацоўнікам Рудніцкім, упісаныя ў канцылярысты мясцовай канфедэрацыі Гродзенскага павета, адбывалі гэтую паслугу без прыціснення абывацеляў і абрыдзіліся хіба тады, калі нас прымушалі задавальняць прысланым распіскам камендантаў. Аб усім тым сведчыць акт і дыяруш штодзённых чыннасцяў, да якіх апелюем, асабліва жа да акта, як найпершай падставы. А не жадаючы мець на нашых асобах ніводнай скаргі і плямы і не перадаць іх у нашыя пакаленні, перадусім жадаем і моцна просім назначыць нам хутчэйшы суд з моцай доследу і прыняцця ўсякіх довадаў нашай нявіннасці. Па-другое, паслуга наша павету ўвядзеннем некалькі тысячаў расійскага войска для аховы абывацеляў ад уціску не магла стацца панясеннем блізку 2-гадовых расходаў і ўцяжлівых выдаткаў, колькі гэта было пад час так значнай дарагавізны ў Гродна. Звыш таго, выпадкам ёсць запушчэнне хатняй гаспадаркі і значная страта ва ўласных інтарэсах. Яшчэ свежы пачынены Масквой гвалт і рабунак, якія выжылі нас з маёнткаў і грашовых запасаў так далёка, што неймаверная натуга не змагла дапамагчы нам атрымаць крэдыты. Па тых яўных двух вышэйзгаданых матывах, хаця ж і па ўказу і па наляганню Касакоўскага, узялі са скарбу пенсіі, а яны не былі дастатковым забеспячэннем блізка 2-гадовага жыцця, што натуральна пры пазбаўленні ўласных фундушаў. А таму маем гонар прасіць спамянутыя пенсіі палічыць справядліва ўзятымі.

З найбольшым шанаваннем найніжэйшыя слугі святлейшай камісіі.

Мартын Юзаф Данкевіч,
земскі суддзя Гродзенскага павета
Анзельм Эсмонт,
земскі пісар Гродз. пав. 24 мая 1794 г. у Гродне.

БПАНК, с.1090, л.432—432 адв.

№ 65. 30 мая. Адказ Т.Касцюшкі на спрэчныя моманты ў дзейнасці мясцовых камісій ВКЛ

Адказ парадкавай камісіі Гродзенскага павета на рапарт ад 25 мая 1794 г.

Хачу паправіць класіфікацыю кантаністаў, уведзеную Гродзенскім паветам, і каб Літва ў той акалічнасці ва ўсім трымалася прынятых у Кароне правілаў, а менавіта, належыць выбіраць з 5 дымоў пешага рэкрута, а з 50-коннага, а тых парадкавая камісія абавязана неадкладна пастаўляць на даўкамплектаванне па кожнаму загаду, з рэштак жа фарміраваць батальёны міліцыі павятовых генерал-маёраў. Акрамя таго, усе абывацелі і сяляне павінны быць узброенымі і па кожнаму закліку гатовымі на паспалітае рушанне. Гэтаксама і наборы ахвотнікаў, якіх зграмаджае пад харугвы Айчыны абывацельская стараннасць. Ведаю, што па жаданню князя Сапегі 800 кантаністаў парадкавая камісія, хаця і мела іх выбранымі, дала яму не больш 100 таму, каб толькі не адступіцца ад фармальнасці ўложанай класіфікацыі. Не адабраючы гэтага учынка, патрабую выдаваць нанятых кантаністаў па кожнай рэквізіцыі генералаў камандуючых лінейным войскам. Павятовую міліцыю належыць вымуштроўваць у парафіяльных аддзелах. За атрыманнем асоб для трэніровак міліцый камісіі звяртацца да таго генерала камандуючага лінейным войскам, дывізія якога размешчана ў Гродзенскім або

бліжэйшым павеце. Намінацыю афіцэраў у міліцыю аддаў павятовым генералам, па іх рэкамендацыі. Намінаваных афіцэраў буду патэнтоўваць сам, але не раней, чым будуць выстаўлены міліцэйскія батальёны.

Часовая віленская рада не мае права прысвойваць сабе расцэнкі ні павятовых пабораў, ні абывацельскіх ахвераванняў. Тая ацэнка належыць парадкавай камісіі для аплаты міліцый, на загатоўку і дастаўку вайсковых патрэб або на тое, што прызначана ННР. Штат павятовай міліцыі, якую маецца фарміраваць з рэштак камплектавання лінейных карпусоў, назначаю такі, які прадпісаны для колькасці галоў 100-тысячнага лінейнага войска, аднак тую міліцыю належыць фарміраваць не ў рэгіментах, а ў асобныя батальёны. Што ж да платы афіцэраў пры міліцэйскіх батальёнах: пакуль не трапяць у камплект лінейнага войска, то атрымаюць за ніжэйшую ступень. Пачаўшы з генерал-маёра плата будзе за палкоўніка і так аж да падпаручніка, якому прыпадае плата харунжага, харунжых жа пакідаю пры плаце старога штата, гэта значыць за (?) злотых у год. За фураж і харч плаціць наяўнымі грашыма з магазінаў маршыруючых карпусоў, але толькі даваць квіты, а за тое, што з якога магазіна бяруць, адпаведна са сваімі класамі складаць апраўданні (агаворкі).

Генералы, камандуючыя дывізіямі лінейнага войска, абавязаны засланяць камандамі Гродзенскі павет па рэквізіцыі парадкавай камісіі, калі тая палічыць гэта патрэбным. Валанцёраў, прызначаных на агульную паслугу народу, ужываць адпаведна з ардынансамі галоўнакамандуючага лінейным войскам, які вызначае фундуш утрымання — або з павятовай касы, або з палкавой касы ў залежнасці ад абставін. Што да камплекта асоб у камісіі, гэтак жа і аб звальненні ад рэкрутства добраў на 3 мілі адлеглых ад мяжы. У гэтым

парадкавая камісія мае падацца да ННР у Варшаву, а (тая) адтуль па ўсіх неваенных акалічнасцях звяртаецца за маёй рэквізіцыяй. Званы з касцёлаў камісіі адсылаць або ў Вільна, калі там ужо гатова майстэрня, або ў Варшаву. Касцельнае срэбра належыць таксама адсылаць у манетны двор.

Даны ў абозе пад Хржцыцамі 30 мая 1794 г. *Тадэвуш Касцюшка.*

Згодна з арыгіналам: *Леапольд Ліпніцкі*, пісар крымінальнага суда і сакратар парадкавай камісіі Гродзенскага павета.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.429—430.

№ 66. 7 чэрвеня. Пастанова Часовай рады ВКЛ наконт арыштаваных таргавічан

7 чэрвеня. Дэпутацыя публічнай бяспекі прагнула дагэтуль дакладна выконваць з абавязку свайго кірунку і ажыццяўляць кардынальныя пункты даручэнняў Часовай рады, следячы і зараз за асобымі выпадкамі агульнай бяспекі насуперак выданага 30 мая ўніверсала, які абвясціў колькасць арыштантаў і намер па чарзе даць думкі пра іх.

Дзеля поспеху таго ўніверсала падрыхтавала зварот да грамадскасці, што ў 6 асобах немінуча дасць меркаванне аб арыштантах услед за атрыманнем: 1-е, адозвы Найвышэйшага начальніка ў віленскую раду ад 21 мая, ужо раздрукаванай па ягонай волі, аб чым віленская часовая рада адразу паведаміла настаўляючай Вышэйшай радзе, 2-е, спіса асоб і арганізацыі ННР, змешчаных у варшаўскай газеце, як і дэкларацыі ЦД Літвы аб гэтым, 3-е, пракламацыі Найвысшага

начальніка, дзе гаворыцца, што паколькі Найвысшая нарадовая рада створана, а Варшаўская і Віленская часовыя рады скасоўваюцца, то ў выніку адмяняецца Варшаўская рада. З тых указаў гэта роўназначна і да тых думак, каб адныя выдаць неадкладна, арыштаваных асоб або здаць у крымінальны суд, або вызваліць, аб другіх не даваць ніякіх, або устрымацца да арганізацыі крымінальных судоў, якія Вышэйшая рада збіраецца заснаваць. У такім здарэнні дэпутацыя публічнай бяспекі прагне запісаць у дыяруш ясную і выразную пісьмовую рэзалюцыю, каб тая дэпутацыя, і так не беструботная, а пастаянна занятая патокам здарэнняў з прывезенымі арыштантамі, наступнымі рэзалюцыямі магла апраўдацца перад грамадскасцю і той жа Часовай радай аб сваіх чыннасцях. Ва ўсім тым яна просіць рэзалюцы: ці можна абвяшчаць думку аб арыштантах ці з нагоды гэтых думак адразу заснаваць крымінальны суд і ці замоўчыць вышэйзгаданыя адозву і праклама­цыю, каб выражэннем думак не нашкодзіць істотным матэрыям людскога жыцця, бо аддзел бяспекі мае абавязак пастаянна ўпэўнівацца ў бяспецы праз дослед спраў арыштантаў да моманту адабрання ў яе той улады з волі начальніка і Вышэйшай рады. Рабілася на сесіі 7 чэрвеня 1794 г.

Флор Бетц, прэзідэнт

Ксёндз Юзаф Міцкевіч

Антон Турскі, Венедыкт Гаціскі, Францішак Мучынскі, Л. Лапа, Юзаф Бакоўскі, Тадэвуш Пуцілоўскі, ксёндз Міхаіл Дулскі, Юзаф Меер, Ігнацій Лахніцкі, Вінцэнт Паплаўскі, сакратар аддзела бяспекі

За пячаткай.

БПАНК, с. 1090, л. 447—447 адв.

№ 67. 22 чэрвеня. Скарга дэпутацыі бяспекі на разлад вайсковай субардынацыі па розных пытаннях

Дэпутацыя публічнай бяспекі, ведаючы сваю пакорлівасць загадам ННР, знаючы, што павінна найстаранней выконваць усе даручаныя абавязкі, прызнае, аднак, Вышэйшай радзе, што яе абавязкі зараз пачынаюць перавышаць яе здольнасці. Дэпутацыя публічнай бяспекі, абавязаная сцерагчы краёвую і прыватную бяспеку, сачыць за войскам, пільнаваць вязняў, шукаць адпаведныя для таго сродкі і зручнасці, не можа ў кожнай патрэбе ні папярэджваць Вышэйшую раду, ні спраўляцца аб публічнай бяспецы, не маючы яшчэ ні паслухмянасці войскаў, ні дакладных рапартоў, бо з пачатку свайго ўрадавання мела толькі адзін рапарт ад генерал-маёра, ягом. Хлявінскага, які Вышэйшай радзе паведаміла. Не можа ведаць чаго якой камандзе не хапае, як ёй паступіць, не можа сама заснаваць ні сувязі паміж падзеленымі карпусамі, ні камунікацыі, не смее на ўсе тыя мэты выдаваць сваіх загадаў, не ўпэўненая ў паслухмянасці і сваёй уладзе над войскам. Нават палонныя без варты і аховы, чаго дэпутацыі бракуе і патрабуецца. У такім стане рэчаў дэпутацыя публічнай бяспекі сведчыць, што ў сваіх абавязках ухілялася ва ўсім, што без ведаў ёй ведаць належыць, чаму парадзіць не можа і не мае патрэбнай асцярожнасці, а таму просіць або скараціць абавязкі, якіх выконваць не можа, або ўдакладніць спосабы іх выканання. Дэпутацыя бяспекі, не жадаючы узурпаваць сабе чыннасці або пазбаўляцца іх, просіць дакладных правілаў сваім учынкам, каб трыумфавала пакорнасць ім.

Даны на сесіі ранішняй 22 чэрвеня 1794 г.

Антон Лахніцкі, прэзідэнт, Бенедыкт Марыконі, пісар ВКЛ, Ежы Грабоўскі, генерал, Станіслаў Мірскі,

ксёндз Юзаф Міцкевіч, Валенцій Гарэцкі, Міхаіл Дашкевіч, Фрыдрых Вільгельм Кранеман, генерал-маёр, Цайрынец, генерал.

БПАНК, с.1090, л.445.

№ 68. 27 чэрвеня. Прапановы гродзенскай камісіі ў адносінах да фарміравання паспалітага рушання

Рабілася ў Гродна на сесіі ў Новым замку 27 чэрвеня 1794 г.

Парадкавая камісія Гродзенскага павета, прагнучы усім намаганнем прыстасавацца да згаданага ў універсале Вышэйшай рады ад даты 6 бягучага паспалітага рушання, знаходзячы у 5-м пункце, што на чале грамады сваёй вёскі абывацель павінен стаць сам са зброяй і служачымі людзьмі, а няздольны сам стаць павінен быць замешчаны 2-ма ўзброенымі коннымі заступнікамі з месячнай платай таксама ў кожнай вёсцы, то існуе патрэба спытаць у ЦД ВКЛ — ці могуць абывацелі, занятыя публічным урадаваннем, пасля пастаўкі за сябе збройнага коннага заступніка, быць інакш скарыстанымі пры выходзячай грамадзе, або, ці можа заняты абывацель быць адразу дырэктыўна замешчаны за пастаўку абавязковых 2-х заступнікаў з кожнага фальварка, або, нарэшце, калі па ўказу універсала ад 9 чэрвеня толькі ўсе абывацелі памежных вёсак не даюць ніякіх заступцаў на рушанне грамад, то ці павінны яны з 1 або 2-ма заступцамі чакаць, калі будзе загадана рушыцца грамадам іх вёсак. Даны як вышэй.

(Франц) Боуфал, камісар, прэзідэнт

Згодна з пратаколам: *Леапольд Ліпінскі, сакратар пар. кам. Гродз. павета.*

БПАНК, с.1090, с.431.

№ 69. Апісанне гродзенскай камісіі сваіх чыннасцяў з 10 да 30 чэрвеня

Рапарт штодзённых пленарных чыннасцяў парадкавай камісіі Гродзенскага павета з 10 чэрвеня, як даты адасланага рапарта ў ННР, да дня 30-га таго ж месяца 1794 г. у ЦД ВКЛ адсылаемы.

10 чэрвеня 1794 года. Камісія атрымала мемарыял лейпунскіх жыдоў, жадаючых атрымаць пашпарты да Краляўца для 4-х асоб, жадаючых сплавіць таварнае дрэва. Адказала, што не можа выдаць пашпартоў за граніцу згодна з правіламі, вынікаючымі з сучасных абставін. На жаданне абшчыны гродзенскіх жыдоў, — што асобам належаць выключна да кампетэнцыі кагала. На мемарыял абываццеля Міхаіла Трубіцкага загадала ўсім скарбовым афіцыялістам на прускай граніцы, каб адсылалі дызерціраў з прускага войска ў каманду М.Трубіцкага. Загадала парадкавай камісіі адозву начальніка Т.Касцюшкі, выданую 7 мая 1794 г. да літоўскага народа, раздрукаваць і апублікаваць з амвонаў. Данесла ў Нарадовую раду сваё ўяўленне аб належных да паспалітага рушання асобах і гэтай мэтай дэлегавала Эйсмонта і Каменскага, камісараў, да генерал-маёра, аб.Ельскага прасіць яго не прыцягваць у паспалітае рушанне асоб не абавязаных, а таксама рашыла як хутчэй адаслаць спамянутую экспедыцыю ў раду з эстафетай. Выдала рэзалюцыю, што прызначаны універсалам Часовай віленскай рады рэкрут з 25 дымоў адменены рэзалюцыяй Вышэйшага начальніка, а замест таго трэба паставіць з 50 дымоў коннага рэкрута, што аб. Мальчэўскі з гэтай пары не будзе адбіраць дастаўленых з 25 дымоў рэкрут і што аб. Мальчэўскі разам са зваротам квітоў абываццелям верне выданыя на тых жа рэкрутаў грошы, выклапатаўшы плату ў дэпутацыі забеспячэння на харч тых жа рэкрут. На мемарыял кс. Кучэўскага, жадаючага люстрацыі і

знішчаных агнём сваіх добраў Лейпуны, выдала рэзалюцыю аб пасылцы парадкавага камісара аб. Шумкоўскага на такую люстрацыю, а што да паштавіка і пошты, тое адаслала дырэктару пошты. На мемарыял генерала Ельскага адносна трубачоў адказала, што тых можна ужыць з месца.

Дня 11 чэрвеня. У камісію прадстаўлены патэнт на генерал-лейтэнанта аб. Міхаілу Вяльгорскаму, выданы Найвышэйшым начальнікам 9 мая. На падаены мемарыял аб.Ромеравай, трокскай судзіны, рашыла, каб зборца Гродзенскага павета аб. Канопка занес персанальна ў падатак з Гродзенскага павета квіт з ахвяр 10-га гроша Ваўкавыскага павета. Была ўчынена рэзалюцыя з нагоды звароту аб. і камісара Андрэйковіча з абозу генерал-маёра Беляка адносна пастаўкі фуражу ў памянуты абоз, на што быў дэлягаваны аб.Андрэйковіч. Такую ж рэляцыю ўчынілі абывацелі і камісары Ліпніскі з Круповічам адносна выканання пленарнай інструкцыі для Язерскай, Каменскай, Мастоўскай, Лунінскай і Квасаўскай парафій, а менавіта, 1-е, аб здачы вопісаў у тых парафіях збожжа, коней, быдла, свіней, сена. 2. Пастаўленых у парафіях інтэндантах. 3. Срэбры у касцёлах і царквах. 4. Спецыфікацыю коней і быдла ў дварах. 5. Пакінутыя плябанам рэверсы па сіле інструкцыі. 6. Кагальныя парукі. 7. Рэестр ахвяр і языччак абывацеляў. 8. Абывацельскія акцэсы. 9. Спецыфікацыю збожжа. 10. Асобную спецыфікацыю тлусту, сена і інш.

Для выражэння патрэбных пытанняў Вышэйшай радзе ўпаўнаважаны з кола (камісіі) аб. Булгарын, Лахніцкі, Скарбек, Бабінскі, Гоувальт, Маткевіч. Да перамоваў з аб. генерал-лейтэнантам, камандуючым Вяльгорскім аб абставінах агульнага ўзбраення з кола дэлягаваны аб. Боуфал, прэзідэнт, Бабінскі, Лахніцкі, Маткевіч. Дала 3-х дзённы водпуск аб. Манюшку. Атрымала выданыя Часовай намесніцкай радай

універсалы. У адпаведнасці з дэкларацыяй Вышэйшага начальніка нарадовай збройнай сілы ад 30 мая аб папраўленні класіфікацыі рэкрутаў пастанавіла, каб дагэтуль бранага з 25 дымоў рэкрута лічыць сярод 5-дымовага і ў поўным складзе здаваць у каманды, а на тое месца ўласнікам здаваць з 50 дымоў аднаго конніка дзеля таго, каб дагэтуль браных 5-дымовых рэкрутаў узалежыць з кожнага двара і пасэсіі ў такой прагрэсіі, у якой іх бралі з 25 дымоў. Камісія пастанавіла, каб дэпутацыя забеспячэння аддала коней пад літоўскую артылерыю ў Шчучын па рэквізіцыі генерал-маёра, камандуючага аб.Беляка, паказаўшы від, узрост і кошт у інвентары і за рэверсам, выданым камандзіраванаму падпалкоўніку літоўскіх войскаў Дыпацыпу, якому загадала перадаць генералу і копію інвентара. Пастанавіла, каб скарбовы дэпартамент выдаў на 30 галоў жыдоў, ужытых у якасці фурманоў да парка літоўскай артылерыі, па 4 злотых, і асобна, каб той дэпартамент даручыў тым жыдам як хутчэй парабіць кузні і аўчарні.

12 чэрвеня. Адказала на зварот аб. Казаноўскага, павятовага генерал-маёра, адносна прыгатавання розных рэквізітаў для палка конных валанцёраў, адзначыўшы, што на такую вялізную суму нельга паставіць, але пастпіць у тым пытанні згодна з прадпісаннямі Вышэйшага начальніка не ўпусціць. Дазволіла генерал-маёру, аб. Казаноўскаму раздрукаваць і разаслаць па ўсіх парафіях патрабаванне Вышэйшага начальніка і адозву таго ж генерал-маёра да абывацеляў Гродзенскага павета адносна дапамогі ў рэкрутаванні палка конных валанцёраў. Дала рэзалюцыю на мемарыял аб.Расткоўскай, загадаўшы, каб Астроўскі ключ выдаў гвалтам забранага ў яе чалавека і каб яна хутчэй вярнула ў полк дызерціра. Рашыла выдаць на абшлагі павятовых рэкрутаў сукно з сеймавай залы гродзенскага замка. З удзячнасцю атрымаўшы павіннае сведчанне гродзенскага судовага стараста, аб.Храптовіча аб ахвераванні 500

чырв.зл. на сучасныя патрэбы Рэчы Паспалітай, загадала камісарыяту вярнуць яму забраных коней. Прыняўшы ад імя аб.Фердынанда Эйсмонта 2000 польскіх зл.ахвяры, загадала запісаць яе ў пратакол ахвераванняў. На мемарыял аб Самуэля Крычэўскага парадкавая камісія ў адказ загадала татарам, жывучым у Крушынянах, у адпаведнасці з надаўчым прывілеем стаць на так патрэбную зараз абарону Айчыны, а хто з таварыства не паспяшаецца на яе, тады аб. Крычэўскаму дазваляецца прымусіць іх да таго абавязку занятцем іх сядзіб. Атрыманую ад генерала Хлявінскага рэквізіцыю на пленуме адаслала для выканання ў дэпутацыю забеспячэння. На пленуме атрымала рэзалюцыю аб. Міхаіла Вяльгорскага па розных пытаннях, якую адаслала ў дэпартаменты і загадала сваёй канцылярыі паведаміць праз копіі гэтыя патрабаванні для выканання іх па некаторых прадметах. На рэквізіцыю таго ж генерал-лейтэнанта, камандуючага літоўскім войскам аб.Вяльгорскага аб назначэнні з камісіі дэпутацыі для забору кніг, кас і рэквізітаў харугваў, дэлягавала з сябе капітана аб. Карвоўскага, скарбніка харугвы, аб.Сака-лоўскага і Міхалкевіча, камісараў, для такой чыннасці. Са свайго кола выслала аб.Андрэйковіча, Канопку і Занеўскага, каб аблегчыць выкананне распараджэння камісіі аб выбары 25-лінейных рэкрутаў у абоз генерал-маёра літоўскіх войск аб.Беляка тымі абывацелямі, якія па ардынансу Беляка абавязаны ставіць рэкрутаў з 50 дымоў.

На просьбу павятовага генерал-маёра аб.Ельскага аб назначэнні камісараў, якія б падалі думку, якім спосабам прыстасаваць убогую шляхту да паспалітага рушання, дэлягавала камісараў Андрэя Эйсмонта, гродскага суддзю, Бульчынскага, Пачобута і Жылінскага. На сумесны даклад камісараў Залескага і Хлявінскага аб тым, што розныя людзі без пашпартоў маюць вольны праезд з Мерацкага павета і што ў некаторых парафіях

таго павета не апублікаваныя ўніверсалы аб паспалітым рушанні, парадкавая камісія Гродз.павета палічыла за слушную рэч паведаміць аб тым Мерацкай камісіі. На запыт аб.генерал-маёра Беляка, камандуючага калонай князя Сапегі, загадала скарбовай дэпутацыі па асігнацыі камісіі выдаць з павятовых падаткаў на рукі камандзіраванага ад 2-га палка падпалкоўніку аб. Дыпацыту 24000 поль.зл. за квітам таго ж падпалкоўніка.

13 чэрвеня. Мемарыял графа аб.Гіблера аб вызначэнні яму квартальнай пенсіі адаслала за рэзалюцыяй у Вышэйшую раду. Адаслала да генерал-маёра, камандуючага, рапарт Гушчы, інтэнданта шчучынскай каморы, з далучэннем іншых звестак аб прыбліжэнні прускіх войскаў. Два мемарыялы ад асоб татарскага народа, паданыя дня 12 бягучага, адаслала на рэзалюцыю аб.Самуэлю Крычэўскаму, на моцы якой ніводны пасэсар не можа быць выключаны з абавязку яўкі на абарону Айчыны. Па запыту камісара аддзелу бяспекі аб.Берка загадала выдаць яму пашпарт да Вільна. Дэлягаваным для збору падаткаў камісарам загадала прынімаць у касу замест наяўных грошаў прадукты і розныя ваенныя рэквізіты.

Дала рэзалюцыю на запрос ксяндзоў камедулаў адносна экзекуцыі прысланай з каманды аб.генерала Беляка у фальварак Венгры. На запрос аб.Бараноўскага адносна думкі дэлягаванага камісара аб.Андрэйковіча пастанавіла лічыць яго абавязаным удзельнічаць у так патрэбнай абароне Рэчы Паспалітай сумесна з палкоўнікам аб.Крычэўскім, маючым паставіць 40 таварыства з паштовымі. Адказала на запыт аб.Юзафа Кліманскага. На пленуме ўхваліла складзеную дэпутацыяй бяспекі інструкцыю для гродзенскага маста. Генерал-маёру аб.Ельскаму загадала не перашкаджаць абывацелям даваць тых рэкрутаў, якія яны пажадаюць, замест прадугледжаных з 50 дымоў рэкрутаў. Абмысліла зварот аб. Старжынскага адносна фуражу.

14 чэрвеня. Загадала разасланым у розныя парафіі камісарам даставіць за рэверсамі ў Гродна рознае срэбра и касцёлаў рускага абраду. Прачытаўшы дасланы камісара аб.Скродскім рапарт, камісія адказала на пункты аб валах і скурах. Праз аб. Сухадольца адаслала ў абоз даклад сумесна дэлегаваных камісараў за забор у капітана Карвоўскага касы, кніг і рэквізітаў харугваў, а 960 зл. загадала прыняць у павятовую касу за належную для літоўскай гвардыі зброю. Дала рэзалюцыю на ноту аб.князя Любецкага у тым, што, не будучы у моцы адказаць на яго пытанні, адсылае яе ў Выш.раду. Выслала ў Выш.раду разам камісараў аб. Булгарына, Скарбека і Маткевіча, якім прадпісала інструкцыю для атрымання рэзалюцыі на розныя пытанні. Атрыманы ад падкаморага гродзенскага аб.Юндзіла аб вялікім заборы збожжа далучыла да інструкцыі дэлегатам у Вышэйшую раду з запытаннем — з якога фундушу таму абываценлю атрымаць сабе належную сатысфакцыю, які б злажыў квіты за столькі набраных войскамі падаткаў, якія б паказалі такую суму, якую ад яго немагчыма патрабаваць у скарб Рэчы Паспалітай нават за 6 год, калі без задавальнення ён будзе нязодольны задаволіць сваіх крэдытораў і ўплаціць у адукацыйную камісію належныя працэнты з паезуіцкіх сумаў. На палуднёвай сесіі камісія адказала на паданыя мемарыялы абываценляў татарскага народа. Выдала да абываценляў дэкларацыю, каб кожны з гэтага дня стаў у паспалітае рушанне, а калі ўжо прыцягнуты да палка конных валанцёраў аб.Казаноўскім, або даў за сябе заступцу, тады за такі свой крок атрымае рэверс генерал-маёра. Дала рэзалюцыю на мемарыял аб.Новамейскага адносна магчымасці вываду быдла з Індурскага графства і належнай узнагароды індурскім і крынскім жыдам. Асігнавала на ўзятых пад брычку коней з разліку 300 зл. на 2-х паштовых коней.

15 чэрвеня. Загадала раздрукаваць універсал часовай

скарбовай дэпутацыі ВКЛ з мэтай спагнання пенсій раздадзеных на тэрмін камітэтам і міністрам таргавіцкім і гродзенскім з'ездамі. Выдала да абываццеляў універсал аб 50-дымовых рэкрутах, дэкляруючы свабоду прынімаць 25-лінейных з грашыма пры іх. На моцы загаду Найвышэйшага начальніка аб усялякай дапамозе аб.Казаноўскаму, палкоўніку конных валанцёраў, занятаму рэкрутцвам абываццеляў, загадала скарбовай дэпутацыі завесці асобны пратакол для запісак учыненых добраахвотных ахвяр і выдала ўніверсал, натхняючы на гэта. Выдала рэзалюцыю да генерала Беляка за яго рэквізіцыяй, звярнулася з рэзалюцыяй у часовы скарбовы дэпартамент ВКЛ, каб той хутчэй даслаў вопіс асоб, якія па пастановах таргавіцкай канфедэрацыі і гродзенскага з'езда атрымліваюць пенсіі разам з паказам колькасці пабранага са скарбу Рэчы Паспалітай. Атрымала рапарт ад пасланага ў парафіі аб. Ахотніцкага, а заключаныя ў ім пытанні разаслала па рэзалюцыю ў адпаведныя для кожнага дэпутацыі. Выдала асігнацыю ў скарбовую дэпутацыю на зарплату 440 зл.рамеснікам, занятым рамонтам зброі літоўскай гвардыі. Выдала асігнацыю ў скарбовую дэпутацыю на 474 зл. для стралкоў.

16 чэрвеня. Чытала прысланы інтэндантам рапарт і яго адаслала ў дэпутацыю бяспекі. На месца аб. Ваўкавіцкага, Міхаэліса і Растальскага, пасланых канваіраваць парк артылерыі з варшаўскага арсеналу, вызначыла аб.Кулікоўскага і Ключэўскага, камісараў, з інструкцыяй. На запыт аб.генерал-маёра Ельскага наказала сваёй канцылярыі паведаміць загад Выш.начальніка адносна 50-дымовых рэкрутаў. Разгледзіла мемарыял аб.Маркевіча з абавязкам выдачы яго зброі аб.Даўнаровічам. Камісія асігнавала аб.Міхаэлісу 241 зл. на зарплату фурманам за правоз амунічнага рэквізіта з Беластоку ў Саколку. Асігнавала 160 поль.зл. аб.Сухадольцу са скарбовай дэпутацыі, пасланаму ў абоз

для правозу касы, кніг, рэквізітаў харугваў і скарбу. Камісія падсумавала чыннасці пасланых у парафіі камісараў аб.Гансеўскага і Яленскага і пытанні з іх рэляцый адаслала ў адпаведныя дэпартаменты. Атрымала ад генерал-лейтэнанта аб.Паўла Грабоўскага запрот аб.Хлявінскага, генерал-лейтэнанта, аб 200 пікінерах, 600 касінерах і палатках, якія адасланы ў дэпутацыю забеспячэння. На мемарыял Петрыкоўскага, жадаючага каня і служыць Айчыне ў палку Казаноўскага, выдала рэквізіцыю, каб ён прынёс сведчанне генерала аб сваім рэкруцтве для атрымання сатысфакцыі свайму жаданню. На паведамлены з дэпутацыі бяспекі мемарыял аб.Далкоўскага выдала рэзалюцыю аб тым, што пашпарты ніводнаму абывацелю за граніцу не могуць быць выданыя.

Камісар, аб.Тадэвуш Сухадольскі, неаднойчы пасыланы сярод іншых на публічныя патрэбы, тую паслугу выконваў сваім коштам, асабліва пры адвозе ў абоз касы, кніг і рэквізітаў скарбовай харугвы. Ён не прыняў вызначаных камісіяй за расход 180 зл., заявіў, што адбудзе тую паслугу сваім коштам і прасіў заможных наследваць за ім. Па прадстаўленню дэпутацыі забеспячэння загадала скарбоваму дэпартаменту залічыць 250 зл. для афіцэраў, двух маёра, і паручнікаў з батальёна стралкоў за суправаджэнне транспарту артылерыі. Загадала скарбоваму дэпартаменту выплаціць аб.Івашкевічу 77 зл.месячнага заробку за выслугу месца капітана пікінераў. Дала рэзалюцыю на жаданне Петрыкоўскага, што за сведчаннем генерала Казаноўскага конь яму, занятаму вайсковай службай, будзе дастаўлены па рэквізіцыі генерала.

17 чэрвеня. Атрымала з аддз. бяспекі ННР універсал адносна сялянскіх павіннасцяў і экспедыцыю аб насількоўскіх сялянах, якія адаслала ў дэпутацыю бяспекі. На атрыманую рэквізіцыю генерал-лейтэнанта, аб.Хлявінскага дэлягавала ў абоз сярод іншых камісараў

аб.Яленскага, каб ён пастараўся задаволіць жаданне генерала аб дастаўцы патрэбнага войску харча і такім шляхам, атрымаўшы ад загадчыка фуражовым камісарыятам аб.Капыцкага рэквізіцыю, засведчыла поўную сатысфакцыю ў сваёй рэзалюцыі. Займалася чытаннем прысланых Нарадовай радай розных універсалаў, пасля чаго, прыступіўшы да іх рэалізацыі, загадала раздрукаваць універсал аб паспалітым рушанні, каб дэпутацыя забеспячэння прыгатавала рапарт у Нарадовую раду аб колькасці наяўных рэкрутаў, папрасіла генерала аб.Ельскага хутчэй паведаміць аб тым, ці маюцца афіцэры для агляду спамянутых рэкрутаў. Паслала са свайго кола аб.Эйсманта, гродскага суддзю, Барэцкага, гродскага суддзю, Феліцыянта Пачобута, Міхаіла Адахоўскага, Былянскага, ксяндза Эйсманта, суддзю Боуфала для экзамінавання шляхты ў паспалітае рушанне. Па прапанове дэпутацыі забеспячэння асігнавала 182 зл. за дастаўленых Волмерам 28 галоў з наказам скарбоваму дэпартаменту залічыць па 15 грошаў платы за кожны дзень з 17 чэрвеня да 1 ліпеня з падаткавых сум. З належнай удзячнасцю прыняла ахвяру маршалка Гродзенскага павета, аб.Волмера ў выглядзе здачы на службу Рэчы Паспалітай свайго сына з абмундзіраванымі уласным яго коштам 28 стралкамі-рэкрутамі, што загадала памясціць у пратакол ахвяр. Дала адказ на зварот адносна прыцягвання татар на абарону края, павінных са сваёй зямлі стаць у паспалітае рушанне, які камісія адаслала за рэзалюцыяй да генерала камандуючага.

Загадала камісарыяту выдаць ксяндзам камедулам непрыгодную для карыстання маладую клячу. У адпаведнасці з пажаданнямі звароту Хлявінскага, асігнавала 2000 зл. для куплі ў камісарыят 600 косаў. Згодна з універсалам Вышэйшага начальніка аб устанаўленні дазораў і цаны паншчыны, вызначыла дэпутацыю ў асобах падкаморага Юндзіла, суддзяў

Гансеўскага і Андрэйковіча, камісараў Лахніцкага і Сакалоўскага з тым, каб дэлягаваныя ягомосці ўлажылі даручаныя сабе думкі ў прыстойны праект і як хутчэй прыслалі на рашэнне камісіі.

18 чэрвеня. З аддзелу харча ЦД ВКЛ атрыманы выданыя 13 чэрвеня ўніверсалы аб харчу, аб забароне вывазу збожжа за граніцу і каб камісіі рапартавалі аб колькасці збожжа ў абывацеляў. Для поспеху загада палкоўніка аб.Азулевіча ротмістру аб.Талкоўскаму аб дастаўцы ў Гродна накідак для шаранговых, калі той ротмістр не мае грошаў на куплю сукна, парадкавая камісія Гродзенскага павета загадала скарбовай дэпутацыі запісаць на загадзе і за квітам Талкоўскага 8000 зл. з касы павятовых падаткаў. А калі ён не верне ў касу чакаемых грошаў, то скарбоваму дэпартаменту пры разліках цяперашніх паступленняў перавесці належныя грошы на полк Азулевіча па персанальнаму квіту Талкоўскага і таксама абавязала скарбовы дэпартамент дабівацца заліку тых сум у кошт падарожных і звароту ў касу рэштак.

Выдала рэзалюцыю на мемарыял Стэфана Казлоўскага, Данііеля і Стэфана Дзедькавых, Лукаша Варашэўскага ў іх жаданні распараджацца маёнткамі асуджаных і арыштаваных абывацеляў, у чым разбярэцца па сваёй інструкцыі аб.Даўнаровіч. Загадала скарбоваму дэпартаменту дабіцца здачы калькуляцыі ад тыхураднікаў, якія ў мінулую рэвалюцыю пабралі грошы за перавоз архіваў. Гэтак жа каб па сіле канстытуцыі 3 мая было выбрана з падымнага падатку з дыма па срэбнаму грошу для аплаты каморнікаў з часу назначэння іх у нармальны суд павятовай канцыляры для размежавання абывацеляў, што выносіць пры адной роце ад гэтага назначэння да 10 тыс. (зл.). А паколькі той нармальны суд з-за рэвалюцыі не быў разлічаны і суму неаблічанага пабору належыць вярнуць павету, то скарбоваму дэпартаменту трэба

даведацца, хто займаўся ў той час паборам і ад таго дабіцца калькуляцыі, па атрыманні якой здаць рапарт на пленуме.

Атрымала ўніверсалы з ЦД ВКЛ і займалася іх чытаннем.

Задавальняючы пахвальныя намаганні абываценя (*неразборліва—Я.А.*) прадпрынятыя дзеля агульнай патрэбы, выдала асігнацыю на 600 зл.маскоўскай манетай, якія скарбовая дэпутацыя абавязала выплаціць з публічных падаткаў. Атрымала паведамленне з аддзелу справядлівасці ЦД ВКЛ аб палонных і іх стане, якое аддала ў аддзел бяспекі. Склала дэлегаванаму ў абоз Хлявінскага аб.Яленскаму інструкцыю, якім спосабам разлічвацца з абываценямі за пастаўку фуражу ў войска. Атрымала з аддзелу бяспекі ЦД ВКЛ учынены экзамен аб.Пяткевіча і да таго экзамена падала рэзалюцыю ў аддзел бяспекі. Дэлягавала аб.Ігнація Лахніцкага, камісара, да генерала Вяльгорскага даведацца, якое разумеецца паспалітае рушанне з Гродзенскага павета.

Дала рэзалюцыю на мемарыял Грабоўскага ў тым, што акрамя штотыднёвай аплаты не абавязана даваць на 80 галоў жыўнасці казарм, ідучых на войска, больш чым па 15 зл. у месяц. Дазволіла аб.Завадскаму прадаць валоў каму-небудзь ў краёвым камісарыяце, а яго жыта, затрыманае з дазволу камісіі ў гродзенскім магазіне, не можа быць ужыта на яго патрэбы.

Дня 19 чэрвеня. Зрабіла зварот у аддзел ЦД аб дастаўцы жадаемых вайсковых рэквізітаў аб.Трубіцкаму, палкоўніку стральцоў Гродзенскага павета. На мемарыял аб.Грабоўскага адказала, што будзе старацца даставіць да абозу Хлявінскага пажаданыя шэрыя палаткі. Дала рэзалюцыю на мемарыял індурскага млынара Яна Готліба ў тым, каб аб.Новамейскі ўстрымаў экзекуцыю над тым жа млынаром і таксама даў у камісію тлумачэнне прычыненай яго людзьмі таму

крыўдзе. Дазволіла аб.Сцыпіёну адабраць на харчаванне його воласці склад жыта, размешчаны у ксяндза Куржанецкага. Рашыла выдаць са складкі абывацельскіх ахвераванняў на 2 харугвы аб.Ельскага, генерал-маёра міліцыі Гродзенскага павета. Атрымала мемарыял ад найсвятлейшага Яна Каліноўскага, жыхара вёскі Камаржэнічы, аб дазволе пераезду з аднаго ў другое месца. На тым жа мемарыяле распарадзілася паведаміць той мемарыял Медушэўскаму, пасэсару Камаржэніч.

Дня 20 чэрвеня. Парадкавая камісія Гродзенскага павета, па адкрыцці на пленуме сваёй сесіі, займалася чытаннем універсалаў Найвышэйшай рады, якія прысланыя наступныя.

1. Патрабаванне аддзела харчу ННР, каб камісія Гродзенскага павета забрала пад свой дазор розныя прускія склады і грошовыя касы.

2. Загад НР парадкавым камісіям абвясціць абывацелям аб дастаўцы коней па рэквізіцыі поштмайстраў.

3. Наказ парадкавым камісіям ваяводстваў, каб тыя, унікнуўшы у чыннасці крымінальных судоў, аддалі прагледжаныя пратаколы тых судоў новастворaным судам.

4. Зварот НР да усякіх паштамптаў, каб не давалі бясплатна коней праезджым кур'ерам.

5. Універсал ЧНР аб падатках і паборах.

6. Адозва НР да вялікапольскіх абывацеляў, гвалтам забраных у кардон прускага краю.

7. Арджананс НН Тадэвуша Касцюшкі да ўсіх камендантаў, маючых напасці на непрыяцельскія краі.

8. Арджананс крымінальным судам пра набліжэнне належнай экзекуцыі вышэйшых універсалаў, якія загадала раздрукаваць усе, акрамя прысланага з аддзелу харчу патрабавання аб заборы прускіх складоў.

Для поспеху наказа аддзела харчу аб заняцці ўсіх

прускіх складоў і касаў, занялася пошукам такіх складоў і тым парадкам загадала аб.Лявіцкаму, дазорцу цэсарскіх складоў, скласці бягучага 22 дня квіты апошняй аплаты ў цэсарскі скарб. Дэлягаваныя для канваіравання гармат камісары адрапартавалі, што гэтая артылерыя ў цэласці стала ў Рольніцкай станцыі, пра што сведчыць пададзены у камісію квіт мярэцкага камісара. На зварот аб.Казаноўскага, генерал-маёра Гродзенскага павета і палкоўніка збройнай сілы, атрымала адказ на свае пытанні ад генерала камандуючага і тымчасова асігнавала 11 тыс.польскіх зл. у скарбовую дэпутацыю на жалаванне палка таго Казаноўскага.

Дня 21 чэрвеня. Парадкавая камісія Гродзенскага павета на пленуме паведаміла аб.Хлявінскаму аб дастаўцы ў Гродна арыштантаў і замоўленых патронаў і шатроў. Дала рэзалюцыю на мемарыял ксяндзоў дамініканаў ражанастоцкіх аб нерушы кубкаў і пэўнай часткі срэбра дзеля немінучай патрэбы набажэнству. Адказала на 2 звароты аб.Ельскага аб аплаце Берасневічу, занятаму муштрой рэкрутаў, і канцылярыстам, пры ім будучых. Такі адказ запісала на тых зваротах.

Прыняўшы з найпрыстойнейшай падзякай ахвераванне аб. (*неразборліва – Я.А.)* і Антона Адамовіча, якое яны самі сябе прысвяцілі на абарону Айчыны праз самаўзбраенне за свой кошт, загадала ўсё занесці ў пратакол. Па атрыманні выдадзенага генерал-маёрам сведчання камісія пераканалася ва ўзорным натхненні аб.Юзафа Юндзіла і Андрэя Благажэўскага да служэння краю і ў падзяку за такую хвалебную абарону Айчыны выстаралася паволі ад віцэ-адміністратара эканоміі вызвалення іх ад шарваркаў. Атрымала ад рады рэзалюцыю на сваё пытанне аб паспалітым рушанні. Чытала наступныя, прысланыя сённяшнім днём з НР, універсалы.

1.Універсал скарбовага аддзела НР аб спосабе пабору, які для набліжэння поспеху адаслала ў свой аддзел.

2.Зварот НР да парадкавых камісій, каб тыя распарадзіліся адносна дарог і мастоў у кожным месцы, а таксама паставілі на трактах ганцоў. Гэты зварот адаслала да дэпутацыі бяспекі для паскарэння поспеху.

3. Універсал, патрабуючы перапісу фабрык, рамёстваў і рукадзелля ў краі, служачых на патрэбы войска.

Вырашыла, што вытрымкі рэзалюцый з пратаколаў будуць выходзіць за подпісам аднаго з старшыняў праз асігнацыю грошаў. Адказала рэзалюцыяй на 2 мемарыялы, паданыя аб.Новамейскім супраць індурскіх жыдоў і млынароў на Шуберта. Выдала асігнацыю на 10141 польс. зл. 26 грошаў для рачкоўскіх жыдоў за ўзятае ў камісарыят сукно. Выдала пастанову, каб плябаны розных абрадкаў як мага хутчэй апісалі і прыслалі спецыфікацыю ўсіх месцаў, мястэчак і вёсак.

Дня 22 чэрвеня. Пасля зачытання ўніверсала аддзела вайсковых патрэб ЦД, сённяшнім днём пададзенага, адносна пастаўкі на патрэбы войска прыдатных з віленскіх фабрык розных матэрыялаў, наказала камісіі для яго поспеху раздрукаваць і выдаць загад інтэндантам. Атрыманы ад той жа ЦД другі ўніверсал аб адачы англійскага волава і венгерскай медзі як па старой, так і па новай цане, загадала таксама раздрукаваць. Атрымала з ЦД рэзалюцыю НН на рапарт, з Вільна пісаны, аб прускіх межах. Загадала ўпісаць у пратакол сваёй канцылярыі атрыманы ад аб.Хлявінскага, генерал-лейтэнанта, штат пешых ваяводскіх міліцый з часовай платай афіцэрам. Аб.Лявіцкі склаў ў камісіі довады і рэестры ўтрымання салянога гандлю з абывацелямі цэсарскага краю, з чаго відаць, што прускі гандаль не мае ўплыву.

Дня 23 чэрвеня. Атрымала і загадала ўпісаць у пратакол рэзалюцыю генерал-маёра Гродзенскага павета аб.Ельскага аб выдачы ротмістрамі пабраных у шляхты

коней. Камісія атрымала мемарыял ад ідучай на паспалітае рушанне шляхты у тым, каб было пастаноўлена вызваліць ад падатку пакінутыя ў адзіноцтве іх дамы з жонкамі і яе, не маючай іншага спосабу жыцця, у чым належыць адрасавацца да рады. Загадала ўпісаць у пратакол атрыманую інструкцыю ад генерал-маёра Ельскага для ротмістраў паспалітага рушання. На зробленае камісарыятам данясенне аб узятым аб. Растоўскім сукне пастанавіла вярнуць гэтае сукно гаспадару. Атрымала прадстаўленне ад аб.Цэхановіча, маёра 5 пяхотнага палка, аб дастаўцы на 1183 асоб правіянту і фуражу ў лазарэтны камісарыят. Адказала на мемарыяле, што гэтую рэквізіцыю задаволіць аб.Яленскі, дэлягаваны ў абоз для патэнтавання.

Атрымаўшы мемарыял аб.Генеўцаў аб памяшчэнні ў зямянскія кнігі з прычыны іхняй выправы ў паспалітае рушанне, пастанавіла, што на наступнай сесіі не ўпусціць даць сведчанне аб стараннасці тых абывацеляў. Атрымаўшы прадстаўленне аб.Завадскага аб пасяховай дастаўцы жыта ў занемунскі магазін з люстрацыі янаўскага і скідзельскага ключоў на 5-дымовых рэкрутаў, пастанавіла на мемарыяле, што тое жыта вольна ўжыць тым канцом толькі ў такой прапорцыі, якая будзе выпадаць на правіянт рэкрутаў. Атрымала мемарыял жыда Алькона Лейбовіча, крынскага ўпраўніка, аб вызваленні яго ад заплаты 342 зл., адасланых ім у касу тытунёвага магазіна і казакамі гвалтоўна адабраных. Адказала на мемарыяле, што мусіць шукаць узнагароды сваіх шкод разам з усім народам у помсце нарадовай над непрыяцелямі Айчыны. Узяла абавязацельства даць пажаданую аб.*(не разборліва – Я.А.)* рэкамендацыю, перад гэтым служыўшаму ў войску Рэчы Паспалітай і зараз ідучаму ў паспалітае рушанне. Атрымала мемарыял аб.Замойскага і запэўніла яго рэзалюцыяй аб перадачы жаданняў таго абывацеля ў НР. Выдала асігнацыю на двух

трубачоў і аднаго ката. Па хадайніцтву генерала загадала выплаціць кожнаму прызначанае месячнае жалаванне па 15 зл.(у суме 45 зл.) з абывацельскіх ахвяраванняў. Атрымала 2 мемарыялы аб.Занеўскага і Эйсманта, стольніка Гродзенскага павета, пададзеныя ў адной акалічнасці, менавіта аб градабою і іншых шкодах, учыненых перунамі ў фальварку Гліневуцы і ключах яго каралеўскай мосці Раганіцкім і Сакольскім, а для люстрацыі тых месцаў выслала са свайго кола ягомосцяў у асобах Скродскага і Міхаэліса. З думкі, паднесенай дэпутацыяй забеспячэння, выдала асігнацыю на аплату фуражу для 25 коней і столькі ж людзям штотыднёвага жалавання 150 зл., а тое па хадайніцтву генерал-маёра Ельскага загадала выплаціць скарбовай дэпутацыі ў прапорцыі з абывацельскіх ахвяраванняў.

Дня 24 чэрвеня. На хадайніцтва сялян в.Канюхі, размешчанай пад такой назвай у гродзенскай парафіі, просячых назначыць люстрацыю той вёскі з прычыны вынішчэння рознага пасеву разаральным градабоем, вызначыла люстрацыю ў асобе аб.Філіпа Міхаэліса. Быў зачытаны мемарыял аб.Бульчынскага, дырэктара гродзенскай мануфактуры, прасіўшага аб вызваленні мануфактурных хат ад дачы людзей у паспалітае рушанне. Парадкавая камісія Гродзенскага павета адказала на мемарыяле, што не мае моцы нікога зволіць ад залежнасці распараджэнням начальніка, але разумее, што раз асоб рамеснікаў немагчыма адарваць ад рамяства і належыць ахаваць, то на ўтрыманне іх можа мануфактура выстарыцца заступнікаў або зрабіць грашовую складку, у чым камісія пакінула абодвум бакам справу згоднага паразумення з муніцыпальнасцю. На мемарыяле аб.Шацюкоў, упершыню ідучых у паспалітае рушанне і просячых утрымаць іх прывілеі на засяленне часткі сталовых добраў, дала адпаведную да іх просьбы рэзалюцыю на тую заяву. На пададзеныя аб.Ельскім, генерал-маёрам Гродзенскага павета, 2 прадстаўленні аб вызначэнні дапамогі ўбогай шляхце,

не маючай да маршу ў паспалітае рушанне, на ўтрыманне якіх вызначыла 10 тыс.зл. з абывацельскіх ахвераванняў скарбовай дэпутацыі, а пры недахопе такога фундушу выплаціць тым часам з публічных падаткаў. Выдала рэзалюцыю як адносна рэквізітаў на полк аб.Казаноўскага, так і капітана стральцоў, аб.Дыскура у тым, каб гэтым занялася дэпутацыя забеспячэння. Адказала аб.Ельскаму, генералу, не маючага моцы прыцягнуць скарбовых афіцыялістаў да паспалітага рушання, каб у тым падаўся да скарбовага аддзелу ЦД ВКЛ.

Дня 25 чэрвеня. Парадкавая камісія Гродзенскага павета, сабраная на пленуме, асігнавала за чэрвень месяц жалавання капітану пікінераў 70 зл. Аб.Флеберману, мерацкаму камісару, адказала, што ён можа быць вызвалены ад выканання выдадзеных гродзенскай камісіяй патрабаванняў з прычыны сваёй спадчыннай пасэсіі пад назвай Шэйнішкі, у Гродзенскім павеце будучай. Адаслала ў аддзел забеспячэння за думкай датаваныя днём 22 чэрвеня дзве просьбы генерал-лейтэнанта, аб.Хлявінскага. Прачытаны рапарт інтэнданта камянецкай парафіі, адасланы у аддзел бяспекі за атрыманнем на яго рэзалюцыі. Два прадстаўленні аддзела вайсковых патрэб ЦД ВКЛ — адно аб рэквізітах на абмундзіраванне, другое аб канях — адасланы ў аддзел забеспячэння. Парадкавая камісія Гродзенскага павета адказала на мемарыял Урублеўскіх ад імя аб.Пузыны, каб дазволіў аплату 50-дымовага рэкрута квітам віленскай камісіі. Атрымала данясенне з аддзела вайсковых патрэб ЦД, што аб.Трубіцкі атрымаў з віленскага магазіна патрэбнае на фарміруемы полк стральцоў. Гэтае ж данясенне загадала ўпісаць у акты канцылярыі.

Атрымаўшы рапарт інтэнданта мастоўскай парафіі аб прысяге абывацеляў на вернасць народу з далучанымі рэестрамі як абывацеляў так і жыдоў, загадала ў камплекце скласці ў сваёй канцылярыі. Рапарт жа аб

наяўнасці палатна, жалеза і солі адасланы ў аддзел забеспячэння для ведама. Атрымала ўніверсал аддзела харчу ЦД, якім даносіць, што аддзел ужо разаслаў фактараў закупляць збожжа з патрабаваннем дапамогі ад абывацеляў. Гэты ўніверсал вырашана памясціць у канцылярыі. Атрымала зварот аддзела справядлівасці ЦД у тым, каб парадкавая камісія абрэвізавала акты крымінальных судоў, які загадала ўнесці ў свае акты.

Дня 26 чэрвеня. Атрымаўшы зварот аб.Міхаіла Трубіцкага, палкоўніка батальёна стральцоў, аб вызначэнні са свайго кола дэлегацыі для люстрацыі ўжо наяўнага батальёна, а затым для разліку кожнаму сапраўды наяўнаму ў камплекце лінейнага войска жаўнеру па 15 зл. жалавання на кожны дзень загадала выдаць такое ўтрыманне вылучаным аб.Яну Каменскаму і Яну Гінету, загадаўшы ім прадставіць сваё рашэнне пасля люстрацыі. Па рэкамендацыі аб.Канстанціна Ельскага, генерал-маёра Гродзенскага павета, атрыманай сённяшнім днём праз аб.Юзафа Нарвойшу, ротмістра сілы нарадовай збройнай палка Казаноўскага, парадкавая камісія Гродзенскага павета запэўненая тым, што аб.Нарвойша ў меру сваёй стараннасці для Айчыны заслугоўвае прызнанне грамадства і нашчадкаў, загадала ўсе згодныя з шчаслівым паўстаннем народа чыннасці аб.Нарвойшы запісаць у кнігу славы. Камісія асігнавала ў скарбовую дэпутацыю суму ў 6 тыс.зл. на вайсковыя патрэбы камісарыята з абавязкам калькуляцыі праз дэпутацыю забеспячэння.

Ад дэлягаваных у ННР ад сябе камісараў аб.Булгарына, Скарбека і Маткевіча атрымала рэзалюцыю той жа рады на сваё запытанне, што змяшчае ў сваёй канцылярыі. Атрымала з аддзелу вайсковых патрэб ННР прадстаўленне аб дамоўленым з фабрыкай гродзенскай мануфактуры сукне з далучэннем кантракта, дзеля гэтага заключаным з камісарыятам збройнай сілы, і з далучанымі пробамі сукна рознага

колеру, якое разам з кантрактам і пробамі аддае сваёй дэпутацыі забеспячэння і загадвае пазначыць у пратаколе сваёй канцылярыі. Атрымаўшы ад Мерацкай парадкавай камісіі перасцярогу адносна находу ў наш край прускай солі, загадала свайму аддзелу бяспекі прадпрыняць у гэтым пункце патрэбныя сродкі, аб чым данесла ЦД ВКЛ і парадкавым камісіям.

Дня 27 чэрвеня. Ад дэлегата да калоны генерала Хлявінскага атрымала рапарт і прадстаўленне, што адаслала ў дэпутацыю забеспячэння. Падала ў Цэнтральную раду запытанне аб намесніках у паспалітае рушанне, што абаюднасці тычыцца. Праз рэзалюцыю на мемарыял аб.Мар'яны Бугідавай загадала разабрацца аб.Марозу. Вызваліла аб.Лахніцкага, камісара Гродзенскага павета, ад экзекуцыі з погляду на непастаўку намесніка ў паспалітае рушанне да часу атрымання рэзалюцыі на запытанне, адрасаванае Цэнтральнай радзе. Вызначыла аб.Сакалоўскага для адбору 50-дымовага рэкрута і пастанавіла тэрмін таму адбору на 15 ліпеня бягучага года. Запатрабавала у аб.Бадзені скласці эканамічны інвентар усялякіх даходаў, належачых з розных крыніц гродзенскай эканоміі. Выдала на агульную суму ў 7891 зл. 20 грош. асігнацыю для палка стральцоў каманды аб.Трубіцкага. Прыняўшы думку дэпутацыі забеспячэння аб належных 10 польск. зл.жыду Янкелю Камянінавічу за выраб двух пячатак, распара-дзілася аб выплаце згодна з тым квітам.

На запытанне гродзенскага магістрата камісія дэкляравала, што жыды, як жыхары края, павінны даваць са свайго народу рэкрутаў супольна з іншымі жыхарамі, аб чым загадала распарадзіцца гродзенскаму магістрату. Звярнулася да Мерацкай і Віленскай камісіяў аб пастаўцы коней камандзіраванаму афіцэру. Чытала ноту аб.Анзельма Эйсманта, быўшага канцылярыста мясцовай гродзенскай канфедэрацыі, забараняю-

чую прабачанне 65 тыс.руб., належных па асігнацыях Ігельстрома выплаціць Гродзенскаму павету за правіянт і фураж маскоўскім казакам, што для ўчынення такога кроку загадала тую ноту занесці ў пратакол. Камісія зачытала адказ таго ж аб.Анзельма Эйсманта на паведамленую ім калькуляцыю суму, узятую за перавоз актаў, што загадала ўпісаць у пратакол падобным чынам. На мемарыял бераставіцкіх жыдоў па думцы дэпутацыі забеспячэння пастанавіла, каб адміністратар Бераставіцкага графства палічыў належныя жыдам 950 зл. 28 грош. з іх арэнды. Па думцы дэпутацыі забеспячэння камісія пастанавіла, каб камісарыят выплаціў сакольскім гарбарам належныя 990 зл. за ўзятыя скуры.

Дня 28 чэрвеня. Дэлягавала ад сябе аб.Анзельма Эйсманта і Іпаліта Ваўкавіцкага да аб.Казаноўскага, генерал-маёра Гродзенскага павета з напамінам таму генералу разаслаць апошніх кантаністаў у свае парафіі згодна з рашэннем вышэйшай улады. Атрымала з ЧНР устанаўленне аб ужыцці кос і пік з загадам адаслаць яго камендантам узброенага люду. Атрымала працяг данясення аб штодзённых працах НР. Атрыманую кніжку ў 4-х экземплярах аб піках і косах аддала аб.генералу Казаноўскаму з прадпісаннем пераслаць адну да аб.Ельскага. Ад дэлягаваных аб.Эйсманта і Ваўкавіцкага атрымала рэляцыю з запэўненнем, што аб.генерал Казаноўскі зрабіў шпаркую арганізацыю рэкрутаў у батальёны і рассылку тых рэкрутаў па парафіях.

Са свайго кола выслала аб.Ксаверыя Крывіцкага для разгляду крыўд, якія могуць узнікнуць ад рэкрутаў. Згодна з універсалам НР ад цяперашняга 6-га дня, вызначыла кожнаму асобна кантаністу па 15 грош. на месяц. Адпаведна з думкай дэпутацыі забеспячэння аб забранні скур у скідзельскіх татар і яўрэяў, пастанавіла вылічыць заплату з належачых да скарбу падаткаў ад

тых жа скідзельскіх жыхароў. Адказала на мемарыял месца Заблудаў і прызначыла ў парадку надзвычайнага здарэння люстрацыю ў асобе аб.Ксаверыя Крывіцкага. Пастанавіўшы дастаўку конных рэкрутаў з 50 дымоў, на выпадак адсутнасці фундуша ў пастаўшчыкоў на ўтрыманне коней учыніла рэквізіцыю і загадала вызначыць 30 моргаў пашы на пасьбу ў вярцельскім ключы эканоміі яго каралеўскай мосці. На падставе думкі дэпутацыі забеспячэння ў адрас аб.Серакоўскага, капітана пікінераў, камісія асігнавала да скарбовай дэпутацыі 70 польс.зл. на ліпень месяц.

Звярнулася да аб.Тамашэўскага, намесніка ў НР, і Храптовіча, камісара Гродзенскага павета, каб яны рачылі данесці, калі парадкавая камісія мусіць адасла́ць грошы за вартасць срэбра, пастаўленага у ліцейню. Загадала камісарыяту выдаць аб.Казаноўскаму пажаданыя рэквізіты: 91 локцяў сукна, 7 штук палашоў, 8 шт. карабінаў, пару пісталетаў і 2 капы паперы. Камісія пастанавіла перадаць кіраўніцтву эканоміі яго каралеўскай мосці мемарыял в.Багатыры, пададзены ў скарзе на ўціск. На зварот аб.Казаноўскага з нагоды выхаду каманды да Рачкаў, дала адказ, які відаць з вялізнага пратаколу. Звярнулася да аб.Гінета і Кінштэта з тым, каб яны, падзяліўшы пікінераў на батальёны, прадставілі сваю думку аб здольнасцях і колькасці прысутных пры іх афіцэрах для адсылкі рапарта з камісіі ў ННР.

Дня 29 чэрвеня. Мемарыял ксяндза Хацяноўскага, які па сутнасці датычыцца да аддзела бяспекі, адаслала ў тую дэпутацыю. Дазволіла камісарыяту атаксаваць каня аб.Лапінскага, жадаючага замяніць яго на іншага. Адказала на жаданне аб.Казаноўскага, генерал-маёра, мець фураж на 183 коней і наказала яму пакінуць на пашы 25 коней, а астатніх адправіць па пасьбу, якую камісія пастанавіла ўчыніць праз зварот да эканоміі яго каралеўскай мосці. На пададзены мемарыял ксяндза

Касецкага, прабошча луненскага, у яго жаданні вызваліцца ад паспалітага рушання, камісія не зволіла яго ад краёвай паслугі згодна з універсалам НР. На рапарт аб.Дзевятковіча, інтэнданта мастоўскай парафіі, упэўнена адказала і загадала выканаць ардананс аб.генерала Хлявінскага аб спагнанні маставога, а для сплаву розных дроў паставіць такі мост. Што ж да выбару рэкрутаў, то дазволіла ўжыць войска, стаячае ў Мастах, калі рэкрутаў не даставяць з мастоўскага ключа на працягу 3-х дзён.

Даручыла свайму камісарыяту паставіць 4-х коней пад здатныя гарматы, а калі іх не мае, то купіць за прыстойную цану. Пастанавіла таксама па звароту генерала аб.Казаноўскага даставіць адну стапу паперы, пяць замкоў, бочку гароху і два муштукі. Ад генерала камандуючага збройнай сілай аб.Вяльгорскага атрымала адказ, які загадала даслоўна занесці ў пратакол сваёй канцылярыі. На атрыманую экспедыцыю ад імя генерала літоўскай артылерыі, князя Францішкі Сапегі праз губернатара дзярэчынскага графства аб.Фелікса Сабанскага, датаваную бягучым 27 днём, да генерал-маёра Гродзенскага павета аб.Ельскага аб немагчымасці дастаўкі коннага рэкрута і правіянту, у якой аб.Сабанскі рэкамендуе парадкавай камісіі разабрацца, з-за адсутнасці яго дала рэзалюцыю ў тым, што абавязаная выконваць пастановы НН і Найвышэйшай рады будзе пілнавацца іх рашэння. Атрымала люстрацыю парадкавага камісара Міхаэліса шкодам, прычыненых навальніцай, дажджом і градам у фальварках аб.Занеўскага і эканоміі, якую памясціла ў сваёй канцылярыі з мэтай перасылкі ў ННР разам з меркаваннем.

Атрымную адозву ННР да абывацеляў у Вялікапольскай правінцыі адаслала да генерал-маёра павета аб.Ельскага і дэкляравала, выбіўшы больш экзэмпляраў на нямецкай мове, пераслаць для ведама ў Прусію. На

ўчынены зварот да адміністрацыі яго каралеўскай мосці аб 60 моргах лугоў для пасьбы коней палка генерал-маёра Гродзенскага павета аб.Казаноўскага атрымала рапарт, што тыя лугі знойдзены багністымі і іх было б лепш высушыць, чымсці скарыстаць па прызначэнню. На такі адказ камісія пастанавіла адвесці коней палка Казаноўскага да індурскага і галынскага магазінаў на часовае памяшканне, вызначыла на кожнага каня па 14 фунтаў сена, па аднаму гарцу жыта і два гарцы сечкі пры недахопе аўса, пастанавіла таксама, каб жаўнеры самі жалі сечку, а таксама пастанавіла, каб камісарыят абавязаў пісароў пры магазінах спраўна весці траты як на выбываючых, так і прыбываючых коней. Адаслала ў камісарыят выпрашаны зварот аб.Казаноўскага.

Дня 30 чэрвеня. Атрымала бягучым днём два прадпісанні ад аддзелу ЦД Літоўскай, адно патрабуючае рамонт прынцыповых гасцінцаў, другое загадваючае перасылаць розныя экспедыцыі па парафіях крэсамі, з якіх пакінуўшы арыгіналы у сваёй канцылярыі, астатнія загадала дэпутацыі бяспекі зараз жа разаслаць па парафіях. Паўторна атрыманы зварот вайсковага аддзела аб законнасці вайсковай пякарні пад Ласосна зараз жа адаслала магістрату, маючаму ведамасць такога складу. Адаслала на выпрашэнне дэпутацыі забеспячэння пададзеную аб. Ельскім рэквізіцыю аб прысылцы 8 ,жыдоў і 8 хірургаў. На мемарыял абываццеляў месца Перарось адказала вярнуць з гарбарняў скуры тым абывацелям. Мемарыял ад капітана пікінераў, аб.Дэбоні аб дачы тлумачэння на змешчаныя ў ім скаргі перадала ўпраўляючаму добрамі Бераставіца і губернатару Волькі аб.Даўнаровічу. Атрымаўшы скаргу аб.Іяхіма Скродскага, аселага ў Лідскім павеце, аб грабяжы яго гродзенскай шляхтай, ідучай у паспалітае рушанне, а асабліва з каманды ротмістра, аб. Волмера, на ўсю скаргу дала мемарыял аб.Ельскаму аб належным задавальненні аб.Скродскага генерал-маёрам Гродзенскага павета.

Прысланую люстрацыю згарэлага мястэчка Лейпуны, выкананую на месцы камісарам аб.Шумкоўскім, прадпісала сваёй канцылярыі для ведама такога здарэння памясціць у ведамасці да ННР. Пададзены аб.Марозам мемарыял аб.Лаўсевіча са скаргай на захоп кантаністамі яго чалавека аддала ў дэпутацыю бяспекі. Маючы данясенне сумесна дэлягаваных ад сябе камісараў для люстрацыі камянецкай парафіі, як і ад часовага каменданта каменскай плебаніі ксяндза Лаўрыновіча аб тым, што яе воласць занята аб.Мярэкам па арэнднаму праву і няма на гадавую паслугу свабодных людзей, пастанавіла ўтрымаць зносіны праз ягомосць Мярэку. Гэтая пастанова шырэй відаць з пратакола. На мемарыял абывацелек Міхайлавай-Чэхілоўскай, Аўдоцці Кірманавай і Мар'яны Марыноўскай, жадаючых вызвалення ад далейшай краёвай паслугі з-за знаходжання іх мужоў у вайсковай службе, адказала, што іх мужы бяруць плату са службы, а яны самі абавязаны публічнай паслугай са сваіх дамоў. З прычыны скаргі шаноўнай Кацярыны Любашэвічавай на цяжар рэкруцкай складкі, звярнулася да гродзенскага магістрата з просьбай паведаміць аб спосабе вызначэння той складкі на месца Гродна. Двум прыбыўшым у Гродна з-за прускай мяжы фельшарам, Раману Мікалаевічу і Кліменцію Герасімовічу, па пашпарту выдадзенаму інтэндантам паліцыі Міхаілам Шабуневічам, загадала аддзелу бяспекі выдаць пашпарт пад датай паднясення меркавання дэпутацыі забеспячэння. Выдала загад на 54 зл. у месяц кожнаму з трох фельшараў, або ўтрымання.

Выдала асігнацыю на 394 польс.зл. для 39 галоў па табелі, пададзенай генерал-маёрам аб.Казаноўскім. Па ўчыненай дэпутацыяй забеспячэння думцы вырашыла выплаціць жыдам месца Дуброва належнасць за

забраныя ў тых жыдоў скуры, а тое зрабіць з належнага ад іх публічнага падатку. Адаслала ў аддзел бяспекі ноту гродзенскага стольніка і віцэ-адміністратара гродзенскай эканоміі аб.Эйсманта. У адказ на мемарыял капітана пікінераў аб.Берасневіча абавязала са свайго кола аб.Андрэйковіча ўнікнуць ва ўмовы рахункаў, пададзеных у камісію вышэйзгаданым афіцэрам. Атрыманы ад ксяндза Віктара Лаўрыновіча мемарыял і думку дэлегатаў у парафіі адносна выказанага ў тым мемарыяле інтарэса, адаслала разам да афіцыяла з далучэннем разважання над станам убогіх, не здольных далей утрымліваць пры парафіяльным касцёле ксяндза Лаўрыновіча. На мемарыял сухеніцкага эканома адказала загадам камісарыяту выканаць аблік з тым жа эканомам у прэтэнзіях яго да генерал-маёра аб.Казаноўскага. Асігнавала 2880 польс.зл. з публічных падаткаў за сукно, узятае з гродзенскай фабрыкі.

Такі рапарт за подпісамі адсылаецца ад парадкавай камісіі Гродзенскага павета ў Цэнтральную дэпутацыю. Даны на сесіі 1794 года ліпеня 1 дня.

Ігнацi Лахніцкі, камісар, прэзідэнт
Міхаіл Барэцкі, земскі суддзя, камісар
Мацей Корн, гродзенскі абат, камісар
Тэадор Віслоцкі, супрасльскі абат, камісар
Антон Занеўскі, камісар Гродз. павета
Юзаф Зялінскі, камісар
Мікалай Міткевіч, камісар
Згодна з дыярушам *Леапольд Ліпніцкі*, сакратар парад.кам. Гродз.пав.
За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.509—520.

№ 70. 4 ліпеня. Пастанова гродзенскай камісіі аб фінансаванні выправы К.Ельскага ў бельскую зямлю

Адбылося на сесіі ў Гродна ў замку дня 4 ліпеня 1794 г.

Парадкавая камісія Гродзенскага павета мае гонар паведаміць найсвятлейшай ЦД ВКЛ прысланую генералам аб.Ельскім адозву разам з экспедыцыяй да генерал-лейтэнанта Вяльгорскага мемарыяла аб.Юндзіла, якому за прывезены прыклад аб.генерала Ельскага ў няўдалай выправе на бельскую зямлю, дадзены ў рэзалюцыі адказ, што камісія залічыла на тую выправу аб.Ельскага 10 тыс.польс.зл., з чаго кожнаму наменіку выпадае атрымаць ад абываценяў па 128 зл. і што з такім авансам генерал аб.Ельскі ў стане выканаць прыстойныя 10 міляў першага кроку на мяжы.

Датавана вышэй.

Ігнаці Лахніцкі, камісар старшынствуючы
Мацей Корн, гродзенскі абат і камісар
Іпаліт Вайкавіцкі, земскі суддзя і парадкавы камісар
Тэадор Віслоцкі, ксёндз супрасльскі, камісар
Францішак Юндзіл, парад. камісар
Андрэй Мальчэўскі, камісар

Згодна з пратаколам *Леапольд Ліпніцкі*, сакратар парад.кам. Гр. пав.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.486.

№ 71. 4 ліпеня. Паведамленне гродзенскай камісіі аб гатоўнасці выканаць Паланецкі ўніверсал Т.Касцюшкі

Рабілася ў Гродна на сесіі ў ніжнім замку дня 4 месяца сёмага 1794 г.

Парадкавая камісія Гродзенскага павета, выконваючы універсал НН аб абвяшчэнні вольнасці для сялян і

вызваленні іх ад часткі рабочых павіннасцяў, мае гонар выслаць на ўвагу ЦД ВКЛ універсал, складзены з належнай увагай да збору жніва і апрацоўкі ралля, а таксама згодна са звычаямі гэтага краю, апярэджваючы магчымае ўзнікненне спрэчак паміж наймальнікамі і наймітамі, пытаецца, ці можна распарадзіцца аб яго публікацыі?

Дата вышэй. *Ігнацій Лахніцкі, камісар, старшыня.*

Згодна з пратаколам *Леапольд Ліпніцкі*, сакратар пар. кам. Грод. пав.

БПАНК, с.1090, л.487

№ 72. 4 ліпеня. Праект найма сялян Гродзенскай парадкавай камісіі

Адбылося ў Гродна на сесіі ў ніжнім замку 1794 г. дня 4 ліпеня.

Выконваючы універсал НН, выдадзены у дзень 7 чэрвеня бягучага года, які дазваляе прыстойна памеркавацца і прадпісвае палегчыць працы і зямельныя павіннасці дзеля поспеху апекі над земляробчым людам і вольнасці пераходу ад аднаго ўласніка да другога, калі, па словах пункта 9 таго ўніверсала, узаемна за справядлівасць і прыязнасць ўрада вясковы люд павінен старанна адбываць пакінутыя на паншчыну дні, быць паслухмяным свайму начальству, пілнаваць гаспадарку, раллю добра апрацоўваць і засяваць, а калі такая палёгка сялянам учынена для ратунку Айчыны і ўласнікі ахвотна ўспрымуць яе з любві да той Айчыны, з чаго сяляне не могуць адмовіцца ад патрэбнага фальваркам найму за прыстойную плату і застаецца ўмеркаваць правілы уласнікаў з сялянамі адносна істотнай патрэбы края ў поўным захаванні земляробства, то парадкавая камісія Гродзенскага павета, жадаючы дагадзіць гэтак важнай

мэце краёвай патрэбы згодна з воляй НН, а пры тым жадаючы папярэдзіць магчымыя паміж уласнікамі і сялянамі спрэчкі аб найме на збор і засевы, наважылася абвясціць наступнае распараджэнне.

Кожны уласнік мае права патрабаваць ад селяніна працоўнага найма ў прапорцыі саступленых яму дзён, ад чаго селянін адмовіцца не можа. У месцах, дзе была 6-дзённая паншчына і дзе па універсалу вясковаму люду адпушчана два дні, там уласнік не можа прэтэндаваць на 6 дзён для найму, хіба толькі за добравольнай згодай селяніна.

Згодна з дзеючымі ў Гродзенскім павеце звычаямі, вызначаецца наступная цана наёмных дзён. Дзень вупражны з сахой — 1 зл. 6 грош., дзень з канём, возам або бараной — 1 зл., касару — 1 зл., малацьбіту — 18 грош., жнейцы — 15 гр., палоць — 10 гр., кожнаму пешшу ўжытаму мужчыне 18 гр. Там, дзе ўласнікі маюць памераныя грунты, прадпісваецца наступная прапорцыя: араць адзін морг — 2 сахі, барану адну на морг, на жніво ад 5 да 7 жнеек, малацьбіт на малацьбу 30 снапоў жыта, або 50 ці 60 снапоў ярыны, 2 касцы выкасіць за дзень морг сенажаці.

Там жа, дзе ўласнікамі не здзейснена вымярэнне грунтоў, там памер працы не можа быць разлічаны. У норму землекарыстання трэба пакласці людское абыходжанне ўласнікаў, каб схіліць земляробаў дакладна і неляніва адбываць паншчыну. Уласнікам належыць адразу ж аплочваць наёмны дзень гатовымі грашыма. Гэтак жа прапарцыянальна належыць паставіць правіла вывазу ў гарады і парты: чатыры мілі з цяжарам і шэсць міляў без цяжару лічыць за адзін дзень. Цяжар можа разумецца так: жыта пяць чвэрцяў бочкі, яравога зерня — 6 чвэрцяў. Такі вываз можна залічыць у дні паншчыны селяніну толькі пры далечыні 12 міляў ад месца да месца, а калі выязджае з хаты ў дальнюю дарогу без харчу і без дастатковага забеспячэння каня фуражом,

з чаго мусіць зносіць падвоеныя траты, то едучаму з цяжарам (і па прыняцці яго) далей 12 міляў за кожны дзень паншчыны належны уласнік павінен даплаціць яму 3 зл. з трымаемай ім зямлі, або за адну мілю — дзень паншчыны, а за тры мілі — па аднаму злотаму (усяго 3 зл.). Трэба залічыць за дзень паншчыны кожны дзень на зварот селяніна з месца порту, калі гэта перавышае палову *(адлегласці — Я.А.)*. Калі жа месца далей 12 міляў ад пункту яго выезда, то, акрамя залічанага ў паншчыну дня, уласнік даплоціць за такі дзень 1 зл.15 грош. Болей не прадпісваецца адносна практыкі адбыцця падарошчыны дзеля захавання даўніх уставаў і ўмоў паміж уласнікамі, іх баярамі і чыншавікамі, а таксама не павялічваюцца іншыя павіннасці, не адмененыя ўніверсалам начальніка.

А паколькі і зараз у земляробстве, акрамя апрацоўкі грунтоў, існуе пастаянная патрэба ў новых работах аднолькава на будоўлях фальваркаў, вёсак і гарадоў, іх рамонт, гэтак жа на распрацоўку новых грунтоў і асад, на выкопванне рвоў і іх ачыстку, а забеспячэнне падобных работ патрабуе ўтрымліваць у фальварках памочнікаў або гадавых ці месячных парабкаў, то затым парадкавая камісія Гродзенскага павета, прыняўшы пад увагу такія гаспадарчыя патрэбы, прыступае найперш да ўстанаўлення цаны ўсім патрэбам і патрэбнаму ўзяць з воласці на фальваркавую службу з улікам мясцовасці павета, лягчэйшага дасягнення справядлівасці і прадухілення ўсякіх спрэчак.

Плата за слугу-найміта з воласці на яго асабістым хлебе — 15 зл. на месяц, або 3 зл. у месяц на ўсю адзежу таго ж. Гэта пастаноўленая цана не перашкаджае абодвум бакам дабравольна дамаўляцца браць замест 15 злотых іх частку або прыняць частку стала найміта квітам, а замест месячных 3 зл. на адзежу аддаць натурай. Плата жа найму жаночай асобы стасуецца з яе самазабяспечаннем на месяц 10 зл., з дадаткам 2 зл. штомесяц на ўсю адзежу. У такім пастанаўленні

патрэбнага разліку цаны гадавога або месячнага найміта, уласнік можа займаць аднаго найміта з 10 цяглых, або пяці баярскіх ці чыншавых хат.

Акрамя таго, кожны фальварак можа ўжыць да паслугі з воласці цівуна, гаспадыню, пастуха і пастушку за плату, адпаведную мясцовым звычаям. Уласнік, не маючы пры сваім фальварку дзесяці сялянскіх хат, можа выклікаць гадавога або месячнага найміта з хат, у якіх знаходзяцца тры здольныя да працы мужчынскія асобы ад 15 да 55 гадоў.

Звыш таго, гродзенская парадкавая камісія, палічыўшы, з аднаго боку, што дасканалы і своечасовы збор плёну ралля ёсць адзіная крыніца нарадовых багаццяў і перш за ўсё ўтрымання гэтак шматлікага войска, а з другога боку, паколькі выбар ахвотніка ў войска, павятовыя міліцыі і паспалітае рушанне частай аддачай з шляхецкіх дымоў на агульную паслугу адрывае ад ралля вясковыя рукі, што вымушае шукаць сродкаў замены і дапамогі на ўтрыманне земляробства ў добрым стане, то згодна з выдадзеным 14 чэрвеня універсалам Найвышэйшай рады аб ужыцці да карыснай краю працы жабракоў, валацугаў і лёзных людзей, чыніць наступнае распараджэнне. А менавіта, усе гультаі, захожыя і валацугі без службы, а таксама жыды абодвуга пола, без усялякага выключэння людзі, не трымаючыя ніводнага кавалка зямлі, акрамя толькі самых дасканалых рамеснікаў і купцоў, занятых значным гандлем як у месцы Гродна, так і па іншых мястэчках і вёсках ва ўсім Гродзенскім павеце, будуць ужыты на найм да ўсякіх палявых панскіх работ па любому даносу на час наступных 4-х месяцаў, гэта значыць з першага дня ліпеня да апошняга кастрычніка, чаго абавязваецца пільна даглядаць па месцах гарадскі ўрад, а там, дзе яго няма — начальства фальваркаў. У тым вызначаным часе кожная бяздзейная асоба, выяўленая кім-небудзь у месцы або вёсцы, адразу здаецца

бліжэйшаму начальству, а яно пасля экзамену аддасць на бясплатную патрэбу таму, кім знойдзена, на ўвесь вызначаны час з абавязкам прадастаўлення належнага пракармлення той ужытай на гаспадарскую працу асобе.

Для неадкладнага выканання такога распараджэння кожнае гарадское начальства ў месцах, а ксяндзы плябаны ў мястэчках і вёсках, усе абавязваюцца пад суровейшай адказнасцю на працягу аднаго тыдня ад даты атрымання такі цяперашні загад дакладна перапісаць і адаслаць у парадкавыя камісіі для перапісу таго бяздзейнага люда.

Дата вышэй. *Ігнацы Лахніцкі, камісар, прэзідэнт.*

Мацей Карп, абат гродзенскі, камісар.

Іпаліт Вайкавіцкі, земскі суддзя і парадкавы камісар.

Дамінік Маткевіч, камісар Гродзенскага павета.

(Ксаверы) Ліпніцкі, камісар Гродз. павета

Згодна з пратаколам *Леапольд Ліпніцкі*, сакратар парад.камісіі Гродзенскага павета.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.488—489 адв.
Таксама л. 496—497 адв.

№ 73. 7 ліпеня. Рапарт гродзенскай камісіі аб розным К.Ельскага

Копія рапарта ад 7 ліпеня 1794 года.

Святлейшая камісія на пленуме адсылае назад пану Бухавецкаму ўзятага шляхтай Мікалая Будзілоўскага.

1. Паслаў лісты тых абываццеляў, якія з чуласці і міласці аддалі заступцаў. Бачыла камісія, што без пардону з кожнага дыма выганяў убогую шляхту і вызваляў толькі там, дзе калекі і старыя. І ўсё-такі больш 800 з усяго павета іх выбраць не ўдалося. Відаць не належыць здзіўляцца, што магнатам і арыстакратам не спагадае экзекуцыя, якая прыпала на юндзілаўскія фальваркі і тое таму, што гэтыя паненкі, маючы з усіх

абываценяў найбольшы маёнтак у Гродзенскім павеце, да сённяшняга дня не далі заступцаў. Пан Казаноўскі павінен засаромецца сваёй недобрасумленнацю, бо даў слова, што выдадзеныя з майго дазволу квіты могуць служыць толькі да 18-га. Ён жа кінуўся да свайго намеру зараз жа раздаваць квіты, а калі яму так вольна імчаць і патураць, то мне належыць трымацца праўды. Юндзіл быў у мяне 28-га дня з просьбай, каб экзекуцыя не спадала на яго, а сёння паказаў квіт ад 18-га. Ці згаджаецца гэта з тым, хто пачціўы, а хто добры, хто не здраднік Айчыны?

2. Відаць дарэмна камісія забрала мой арданaнс, высланы для рэалізацыі Рыхліцкаму, бо я прасіў камісію распаўсюдзіць свае кары на непаслухмяных як толькі авангард пакіне Гродна. А так Рыхліцкі мусіць чыніць па майму арданансу датуль, пакуль я яго не выведу, а яго не скрану, пакуль не атрымаю заступцаў або не загадае выйсці камандуючы генерал-лейтэнант. Цалкам бачу рух адпраўленага генерала бельскай зямлі Карвоўскага: з ім ідзе палова грамады вёсак, люд вольных месцаў, 1 тысяча ўбранай паветам кавалерыі. І як паведамляе кур'ер, які вярнуўся ад яго да мяне, камісія ўсюды — і на пашах і магазінах — дастаткова забяспечыла яго фуражом. Я іду без фуражу з галодным людам, а што рэдка маю дастатак, ужо паведамляю камісіі.

3. Пісаў, што абозу неабходны цырульнікі, шпікі, кавалі, канавалы, вартаўнікі, а камісія дагэтуль ніводнай рэчы не задаволіла. Прашу камісію зараз заняцца тым.

4. Няхай камісія парачыць нагадаць вольным месцам універсал аб гатоўнасці да выхаду і каб усе абываценi як мага хутчэй узброілі палову грамад вёсак косамі і пікамі, бо я бачу, што мы робім не з такім прыкладным і прыстойным натхненнем, як бельская зямля.Я жа не здолею шмат даказаць з такой мізэрнай колькасцю людзей і голымі рукамі.

5. Я прасіў у камісіі з камісарыята 50 пар ботаў, але яна дагэтулъ не дала сваёй рэзалюцыі і таго не выканала. Калі генерал валанцёраў, пан Казаноўскі, забярэ заступцаў, то з чым я пайду і за што мне, абранаму генераламі, перашкаджаюць атрымаць шанц славы? Калі б я меў усіх дастаўленых заступцаў, добра забяспечаны люд, то з адной неахвоты дагадзіць завушнікам не рушыў бы палову грамады люду з вашых валасцей. Аднак калі вы раздаеце на бакі заступцаў і корміце іх у сваім павеце без карысці, то, відаць, самі бачыце, што прымушаеце рухаць палову сялянскіх грамад. У мяне ёсць іншыя вялікія матывы дамагацца заступнікаў і скардзіцца на камісараў, якія не могуць раздаваць 15 коп. на тых, каго маюць, хаця іх трэба скараціць да 21 чал. Калі б усіх тых выключаных камісарамі пасадзіць на коней і мець пры сабе, то не меней галоў прыбыло б. З заступцаў, раздадзеных на бок камісарамі і ўласнікамі, пры мне застаецца ўсяго некалькі дзясяткаў асоб, з-за чаго мне крыўдна робіцца, але зусім відавочна аслабленне краёвай збройнай сілы.

Рапартую камісіі, што забяспечыў поспех уварвання у Прусію 400 людзей у авангардзе пад камандай палкоўніка Нарвойшы лепшымі выбранцамі і пасылкай гармат. Сам жа пайду за ім крок у крок як толькі упэўнюся, дзе можна прайсці з простымі абывацелямі без а́ніякай зброі, каб толькі не панесці яўных страт пры адначасовым нападзе. Прашу святлейшую камісію паслаць сваю дыспазыцыю ў дом *(неразборліва—Я.А.)* судзіца Ежы, які сам знаходзіцца у паспалітым рушанні, з тым, каб Мацей і Войцех *(неразборaліва—Я.А.)* не крыўдзілі пакінутую ім жонку і каб вярнулі ёй забранага ў яе парабка. Пасля выйсця свайго мужа ў паспалітае рушанне, яна жыве ў ваколіцы Седзіневічах эйсмонтаўскай парафіі.

Сардэчна прашу праз падпалкоўніка Улінскага як мага хутчэй надрукаваць адозву да прусакаў з

учыненымі мною папраўкамі. Калі ў парадкавай камісіі з'явяцца ящчэ недаразуменні ў выглядзе запытання — каму належаць заступнікі, то адказваю, што я паказаў два арданансы Ясінскага і генерал-лейтэнанта Вяльгорскага аб назначэнні мяне да паспалітага рушання. А калі сялянскіх грамад дагэтуль не рушыў, то рабіў гэта па загаду святлейшай парадкавай камісіі Гродзенскага павета з мэтай утрымання эканомікі і радаснага чакання па аднаму заступцы ад кожнага абываценя з кожнага фальварка. Гэтая павольнасць прывяла да ўзаемнага запытання цэнтральнай камісіі і святлейшая парадкавая камісія Гродзенскага павета вельмі памылілася ў разліку на адсутнасць якога-небудзь загаду. Таму я, згодна з намерамі Найвышэйшай рады, апісанымі ўніверсалам ад 6 чэрвеня, выдаю адозву і патрабую ад абываценяў з паловай сваіх грамад явіцца ў Аўгустаў, Ястрэмбль і іншыя месцы, дзе будзе знаходзіцца мой авангард для прыняцця ўзброеных косамі і пікамі сялян і суправаджэння іх у маю каманду. Калі я буду абарачацца ў Прусіі, то загадаю там надрукаваць мой універсал да абываценяў, копію якога пасылаю ў святлейшую камісію, чым здымаецца ўся фальш пытання.

У таго данясення з абозу пад Каменнай 1794 года месяца ліпеня 3-га дня ёсць Канстанцін Ельскі, генерал-маёр Гродзенскага павета.

Згодна з арыгіналам *Пётр Манюшка*, рэгент парад. каміс. Гродз. павета.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.494—495 адв.

№ 74. 8 ліпеня. Водгук аддзела Цэнтральнай дэпутацыі на праект прымусовага найма гродзенскай камісіі

Аддзел харчавання Цэнтральнай дэпутацыі ВКЛ дае наступнае меркаванне на ўніверсал парадкавай камісіі Гродзенскага павета аб улажэнні наёмных дзён і іншых прац паміж пасэсарамі добраў і сялянамі таго павета, прысланы учора з ЦД у аддзел харчавання.

Гродзенскі павет скрозь палявы і без пушчаў, а таму не мае іншай карысці, як толькі ад збажыны. Ад скарачэння паншчыны шмат фальварквавых грунтоў застанецца ў аблогах, а збор плонаў у фальварках будзе непадобны, калі б сяляне не захацелі наймацца, або завялі спрэчкі аб найме або цане найму. Здаецца, што ўніверсал парадкавай камісіі Гродзенскага павета спраектаваны адносна пазіцыі і натуры таго павета, а паколькі ЦД ВКЛ ёсць выканаўца, то, выходзіць, ёй было б неўласціва прапаноўваць Найвышэйшай радзе тэрміновую патрэбу на дазвол парадкавым камісіям устанаўляць цану за наем сялян.

Рабілася на сесіі аддзела харчавання 1794 г. 8 ліпеня.

Ф.Ельскі, старшыня, намеснік.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.485.

№ 75. 8 ліпеня. Рапарт гродзенскай камісіі аб тыднёвай дзейнасці

Рапарт штодзённых чыннасцяў парадкавай камісіі Гродзенскага павета ад дня 1 ліпеня, як дня папярэдне пасланага рапарта ў ЦД ВКЛ, да дня 8-га таго ж месяца, на пленуме.

Дня 1 ліпеня 1794 года парадкавая камісія Гродзенскага павета загадала дэпутацыі забеспячэння не адмаўляць у належнай суме на выраб косаў па данясенню камендантаў касінераў. Рапарт сувальскага інтэнданта адасланы у дэпутацыю бяспекі. Для люстрацыі і пабору касцельнага срэбра ў гродзенскай парафіі ў таварыства гродзенскага прабошча, ксяндза аб.Юрэвіча замест аб.Абрамовіча назначаны аб.Ксаверы Ліпніцкі. Па даносу аб.Маткевіча ў тым, што 5-дымовыя рэкруты з яго вёскі выдадзены і што сярод іх апынуліся земляробы, названыя дэзерцірамі, парадкавая камісія загадала аб.Сакалоўскаму і Шаняўскаму выехаць у названую вёску і праверыць, ці сапраўды гэтыя кантаністы вярнуліся ў вёску з уцёкаў з каманды, і калі гэта акажацца так, то каб зараз жа загадалі дэзерціраў вярнуць і даставіць да каманды і забаранілі надалей пастаўляць такіх уцекачоў. Маючы ад палкоўніка міліцыі аб.Рыхліцкага складзены вопіс абывацеляў, якія асабіста самі або праз сваіх заступцаў выступілі ў паспалітае рушанне пад каманду генерал-маёра Ельскага, з далучэннем хадайніцтва скаргі абывацеляў з паспалітага рушання, якія ні самі, ні праз заступцаў да таго не падпісваліся, абавязала аб.Канопку і Занеўскага як мага хутчэй скласці з пададзенага імі спіса і павятовага тарыфа рээстр ці вопіс абывацеляў, не ідучых, або не даючых заступцаў у паспалітае рушанне, а ў складзе таго вопіса трэба памясціць і квіты генерал-маёра аб.Казаноўскага.

Была зачытана і прынята рэзалюцыя ў аддзел вайсковых патрэб Вышэйшай рады. Падпісана асігнацыя на 1773 зл. 3 грош. 2 шэлягі для афіцэраў палка аб.Кінштэта. У той жа дзень атрымала з ЦД ВКЛ зварот з патрабаваннем штотыднёвай прысылкі рапартоў чыннасцяў кожнай камісіі. Што да выдачы коннага і пешага рэкрута з дыма гаспадыні ліцейні Кацярыны Лукашэвічавай, то з увагі на ўжытак яе мужа

на віленскай ліцейні загадана магістрату заспакоіць яе як мага без уцяжлівасці. На зварот генерал-маёра аб.Ельскага аб вызначэнні камісараў для прыёма конных заступцаў камісія абавязала камісараў аб.Сакалоўскага, Занеўскага і Барэцкага, земскага суддзю, падаць думку дэпутацыі бяспекі. Прынесены мемарыял аб.Рафановіча з думкай дэпутацыі бяспекі, на якія камісія пастанавіла, што ў цяперашні час можа быць выдадзены пашпарт прускаму аб.Канопцы, жадаючаму выехаць у Прусію, пад заручэнне аб.Рафановіча.

Дня 2-га ліпеня. Камісія атрымала рапарт магістрата месца Гродна з данясеннем, што адзін з тутэйшых пекараў спрабуе адшукаць ужо два гады закапаныя жалезныя рэчы. Маючы мемарыял скідзельскіх жыдоў і татар аб тым, што ім па думцы дэпутацыі забеспячэння і па асігнацыі камісіяй 1369 зл. з-за невыдачы экстракта пленума камісіі гэтая асігнацыя не аплочана, камісія рашыла выплаціць тую суму з перасцярогай касіра ўнікнуць паўторнай уплаты. Маючы прадстаўлены трокскай ваяводзінай, аб.Ядзвігай Агінскай мемарыял, у якім яна сведчыць пра смутную сітуацыю сваіх добраў *(неразборліва — Я.А.)*, ляжачых у Ашмянскім павеце, з-за шматкратных грабяжоў, захопу ў няволю эканома, а таксама да рэшту знішчаных ад бесперапынных праходаў непрыяцельскіх каманд, і дзе дэкляруе аб жада́нні даць у бліжэйшую да тых ужо не падуладных добраў камісію і па магчымасці іх 4-х узброеных вернікаў, а дакладней па 400 зл. за кожнага, на патрэбы інтарэсаў Айчыны, камісія не ўхіляецца прыняць і пастанавіла данесці як у ЦД, так і ў Ашмянскую парадкавую камісію гэты прыклад стараннасці, прадэманстраваным у такім выпадку згаданай абывацельскай.

Атрымаўшы ад генерала аб.Казаноўскага данясенне, што ў яго маюцца весткі, патрабуючыя прысутнасці тут галоўных каманд літоўскага войска, аб чым праз кур'ера

праінфармавана і НР, а таксама, што сучаснае становішча безумоўна патрабуе мецъ шпікоў для вышэйзгаданай тэрміновай экспедыцыі, камісія загадала касіру выдаць 2 тыс.зл. на ўтрыманне шпікоў па квітанцыі генерала аб. Казаноўскага. Мемарыял земляроба Стэфана Казлоўскага з вёскі Багатыры, належачай да літоўскага канюшаства, разгледзіла з загадам эканамічным уладам літоўскага канюшаства паступіць з належнай да таго земляроба думкай аб неабцяжарванні яго падвоеным рэкрутцтвам. Зараз заносяцца ў дыяруш пастаноўленыя ўчора і запісаныя ў пратакол асігнацый адну асігнацыю на 503 зл. 28 грош. для палкоўніка стралецкага палка аб.Трубіцкага, а другую для генерал-маёра аб. Ельскага на двух кур'ераў – на аднаго 488 зл., а на другога 320 зл. Паколькі кожны уласнік ужо даў на адзін месяц утрыманне дастаўленым рэкрутам і паколькі той месяц мінуў і застаецца цяперашні, то, паскараючы наколькі гэта магчыма збор рэкрутаў свайго павета, камісія ў адпаведнасці з воляй Начальніка прысудзіла ўтрымаць тых рэкрутаў з публічнага скарба па 15 зл. на асобу, аб чым пастанавіла данесці ЦД ВКЛ. Камісія адзначае поспех у вышуку арыгінальнай асігнацыі для скідзельскіх жыдоў і татар на 1369 зл.

На пададзены гродзенскім падкаморым аб.Юндзілам мемарыял у тым, што ён распарадзіўся аб выдачы са сваіх добраў запатрабаваных генерал-маёрам Ельскім заступцаў, пастанавіла ўчыніць загад таму генерал-маёру Ельскаму аб вызваленні добраў аб.Юндзіла ад экзекуцыі да той пары, пакуль таму камісіяй не будзе прадстаўлены спіс выданым заступцам. Камісія ўзялася паведаміць генералу аб.Ельскаму такі ж мемарыял аб.Бухавецкаму разам з квітам, выдадзеным за дастаўку ягоных заступцаў. Учыніла адозву да Бельскай парадкавай камісіі, даносячы свае ведамасці і жадаючы ўзаемных. У прыведзены аб.Ельскім абоз паспалітага рушання вызначыла дэлегацыю з двух асоб, або аб.Ігнацыя

Шаняўскага і Антона Ігнатовіча, якім папрасіла ў генерал-лейтэнанта, камандуючага аб.Вяльгорскага паўнамоцтвы браць скаргі як ад абывацеляў, ідучых у паспалітае рушанне, так і ад замежных абывацеляў. Атрымала ўніверсал скарбовага аддзелу ЦД ВКЛ ад 24-га дня чэрвеня адносна пабору падаткаў з далучэннем узораў квітаў. Да абозу генерала Вяльгорскага, камандуючага дывізіямі войск, з просьбай аб вышэйзгаданым ардынансе камісія дэлягавала са свайго кола аб.Кулікоўскага.

Камісія загадала выплаціць *(неразборліва — Я.А.)* злотых 27 грош. належных па квіту і рэестру на медыцыну для людзей палка генерала аб.Казаноўскага згодна з думкай дэпутацыі забеспячэння. Па звароту скарбовага аддзела ЦД ВКЛ камісія звярнулася да аб.Сарноцкіх з запытаннем, дзе знаходзіцца аб.Высоцкі, які не толькі не даў справаздачы аб паборы за сакавік 1794 г. з Ковенскага павета, але і вывез з сабой тарыф.

Дня 3 ліпеня. Атрымала з Віжан рапарт інтэнданта Краскоўскага, які адаслаў ў дэпутацыю бяспекі. Мемарыял жыхара Гродна Іовеля Шломавіча перадала на рэзалюцыю генерал-маёра Гродзенскага павета аб.Казаноўскага. Дала рэзалюцыю на два пункты мемарыялу аб.Дыбоўскага. На першы адказала, што загадала скарбовай дэпутацыі прыняць падатак дзесятага гроша і працэнты з паезуіцкіх сумаў. Што да другога, адносна ражна ў маскоўскай каморы, то рэкамендавала аб.Дыбоўскаму звязацца з камісарам, аб.Ельскім, дэлягаваным да абозу спытацца, ці патрэбны ён войску, і калі не патрэбны, то аб.Дыбоўскаму вольна будзе паступіць па патрэбе і волі. Паведамленне камісіі Прэнскага павета аб выданні быццам бы гродзенскай камісіяй пашпарта пад №1036 без подпісу яўрэю Юдзелю Нахімовічу, як неактуальнае адаслала ў дэпутацыю бяспекі. Прынята і заверана меркаванне дэпутацыі забеспячэння аб тым, што па падпісаных

квітах трэба прыняць жыдам мястэчка Сухая воля за скуры 518 зл. 25 грош. Па скарзе аб. Пятра Юндзіла аб выпашы лугавіны і збіцці замкоў у фальварку Каралін праходзячай камандай паспалітага рушання, вызначыла агляд і на яго разам з камісарам паслала аб.Маеўскага. На атрыманы ад камісара аб.Яленскага, дэлегаванага ў абоз генерал-лейтэнанта Хлявінскага, данос у тым, што аб.Шыман Забела схаваў частку аблюстраванага і войску патрэбнага збожжа, адмовіўся даць скаціну па квітанцыі аб.Яленскага, дала адпаведны тым данясенням адказ: гэта праціўна паўстанню спрабаваць з пагардай трактаваць прысланую сабе каманду. Абывацелю Станіславу Кулікоўскаму, высланаму са свайго кола ў складзе дэлегацыі да абозу генерала камандуючага аб Вяльгорскага, асігнавала 300 польс.зл. на дарожныя траты, якія аплоціць скарбовая дэпутацыя з фундуша публічных пабораў. На пададзены жыдом Іавелем Шломавічам мемарыял адказала, каб належныя жыды неадкладна падаліся ў абоз генерал-маёра Ельскага, у месца сабе назначанае. Выдала рэзалюцыю на ноту генерал-маёра Гродзенскага павета аб.Ельскага, якая цалкам відаць з пратакола.

Дня 4 ліпеня. Склала мемарыял аб найму паншчыны для апрацоўкі і збору з ралля, на вываз і г.д., які аддала пад увагу ЦД. Згодна з думкай камісара парадкавай камісіі аб.Александровіча, капітан аб.Берасневіч выканаў прысягу на сапраўднасць выплаты кантаністам сумаў з належных яму грошаў. На адозву генерал-маёра Гродзенскага павета аб. Ельскага з той жа нагоды, камісія рашыла адрасаваць да ЦД і генерал-лейтэнанта Вяльгорскага з памяшчэннем адозвы ў пратаколах. Загадала павятоваму камісарыяту выдаць каня аб.Петрыкаўскаму, узятаму у полк генерал-маёра аб.Казаноўскага. На патрабаванне палкоўніка корпуса

стральцоў аб.Трубіцкага аб дастаўцы 12 стралкоў здатных з васількаўскай воласці, загадала начальству васількаўскага двара зараз жа паставіць іх у корпус палкоўніка аб.Трубіцкага з ужыццем вайсковай каманды.

Дня 5 ліпеня. Атрымала наступныя экспедыцыі. 1. Ад ЦД аб выбары асоб у склад парадкавай камісіі і крымінальнага суда Гродзенскага павета. 2. Універсал ЦД аб перапісу жыўнасці па гарадах і вёсках. 3. Абвяшчэнне ЦД аб пяці і 25-ці дымовых рэкрутах. 4. Універсал ЦД аб заснаванні магазінаў апісанай жыўнасці. 5. Пастанову ЦД скарбовым заручэнням. 6.Універсал ЦД, пастанаўляючы спосаб ужыцця скарбовых заручэнняў. 7. Дэтэрмінацыю ЦД адносна паспалітага рушання. 8. Рэзалюцыю скарбовага аддзела ННР, які не вызваліў ад падаткаў ідучую на паспалітае рушанне шляхту па запыту парадкавай камісіі Гродзенскага павета. 9. Аб'яву скарбовага аддзела ННР пра абарачэнне галандскіх альберцінскіх талераў. 10. Універсал ННР аб вопісу вупражу, возных статкаў і г.д. 11. Арганізацыю Вышэйшага крымінальнага суда. 12. Дэкларацыю НР з вызначэннем камплекту крыміналь-нага суда. 13. Універсал НР аб жабраках, валацугах, лёзных людзях з далучэннем схемы іх перапісу. 14. Рэзалюцыю ННР адносна кантаністаў. 15. Рэзалюцыю НР з загадам ЦД і парадкавым камісіям дапамагаць камісарам харчавання. 16. Узнаўленне ННР грэка-неуніяцкай кансісторыі. 17. Адрас аддзела парадку ННР, каб розныя матэрыі адсылаліся да належнага аддзела. 18. Акт паўстання Кракаўскага ваяводства. 19. Універсал НН да польскага, грэка-неўніяцкага духавенства ўсходняй арыентацыі. 20. Абвяшчэнне аддзела інструкцый ННР каморам добраў і сумаў адукацыйных аб аплаце працэнта ў касу

адукацыйнага фундуша. 21. Рэзалюцыю ННР, дазваляючую адкрыць акты ўсіх мясцовых зямянскіх і гродскіх (судоў). Гэтыя ўніверсалы і звароты канцылярыя парадкавай камісіі аддала ў належныя дэпутацыі, каб патрэбныя разаслаць па касцёлах для публікацыі.

Абвясціла асобам, вызначаным ЦД у склад парадкавай камісіі і крымінальнага суда, каб яны прыбылі ў Гродна на працягу тыдня для выканання сваіх абавязкаў. На пададзены палкоўнікам корпуса стральцоў аб.Трубіцкім аб патрэбе трохтыднёвага правіянту на стральцоў свайго корпуса, загадала павятоваму камісарыяту без адвалокі задаволіць жаданне аб.Трубіцкага. Вызначыла са свайго кола аб. Лабецкага на вышук бляхаў для вырабу бутэлек. Згодна з прадстаўленнем аб.Гінета волі афіцэраў над пікінерамі, вызначыла тым 1650 зл. месячнага жалавання. Па думцы дэпутацыі забеспячэння дазволіла камісарыяту ўзяць 4 тыс.зл. з сумы за зложаную ў камісарыяце абывацелямі ссыпку правіянтаў, а скарбоваму дэпартаменту загадала аддаць 4 тыс. зл. у камісарыят з падатковых грошаў. Дала рэзалюцыю муніцыпальнасці вольнага месца Гродна, што сем жыдоў з коньмі ідуць шпікамі ў абоз генерал-маёра аб.Ельскага замест конных рэкрутаў з 350 дымоў гродзенскіх яўрэяў, аднак з умовай, што пасля вяртання паспалітага рушання або гэтыя жыды будуць ужыты за конных рэкрутаў, або жыды іншых дадуць. Вырашыла, што са злучаных у 50 дымоў абывацельскіх пасэсій той абывацель абавязаны выставіць коннага рэкрута з узбраеннем, хто мае больш дымоў, а іншыя павінны даць з кожнага злучанага дыма па 9 зл. Адказала на мемарыял трокскага падваяводы аб.Ромера, што згодна з універсаламі НР аб назначэнні паспалітага рушання, не можа ніводнага абывацеля зволіць ад ускладзеных абавязкаў. На данясенне аб.Казаноўскага адказала, што аб пастаўцы абывацелямі конных рэкрутаў на дрэнных канях павінен ва ўсім

разабрацца дэлягаваны камісар аб.Сакалоўскі для выбару такіх рэкрутаў згодна з прадпісаннем універсалаў аб конных рэкрутах.

Дня 6 ліпеня. На запыт гродзенскага экзактара аб.Даўнаровіча — ці можа быць фураж з берастаўіцкага графства пастаўлены у абоз генерал-лейтэнанта аб.Хлявінскага напалову натурай, а другая палова грашыма, адказала, што фураж трэба паставіць да абозу натурай, а грошы трэба аддаць па квіту пісара крынскага магазіна. Камісар аб.Мікалай Маткевіч здаў сваю візітацыю пасэсіі Каралін, аб.Пятра Юндзіла, генерал-ад'ютанта, якую паведаміла генерал-маёру Гродзенскага павета аб.Ельскаму з надзеяй, што ён пажадае справядлівасці з асобамі, нарабіўшымі шкоду аб.Юндзілу, і аб тым паведаміць камісіі. Учыненую праз аб.Нікадзіма Вансовіча прапанову генерал-ад'ютанта аб.Пятра Юндзілы адносна ўзятых з пасэсіі Лінок на фураж падвоеных квітаў, адаслала ў дэпутацыю забеспячэння за рэзалюцыяй. На зварот генерал-маёра Гродзенскага павета аб.Ельскага аб звальненні ад падаткаў пакрочыўшай у паспалітае рушанне шляхты і ўзяцці пад апеку дымоў пайшоўшай шляхты, адказала, што шляхта не вольная ад падатку згодна з рэзалюцыяй HP, а асобы з пакінутых дамоў у сваіх крыўдах і скаргах мусяць падавацца да камісіі.

Дня 7 ліпеня. Камісія сваёй рэзалюцыяй пастаўленую гродзенскім магістратам рэкруцкую камісію, каб яна складку жыдоў места Гродна, складзеную з дымоў на 50-дымовага рэкрута, вярнула тым жа жыдам, а тое таму, што жыды даюць сем пасланцаў са сваіх дымоў у абоз генерал-маёра аб.Ельскага.

Такі рапарт штотыднёвых чыннасцяў парадкавай камісіі за подпісам даны у Гродна месяца 8 ліпеня 1794 г.

Павел Булгарын, падкаморы ВКЛ, парадкавы камісар Гродз. павета

Юзаф Міцкевіч, камісар
Феліцыян Адланіцкі Пачобут, камісар
Тэадор Вісłоцкі, апат супрасльскі, камісар
П.Пастальскі, камісар
Адам Эйсмант, камісар
Антон Занеўскі, гродзенскі камісар
Іпаліт Ваўкавіцкі, земскі суддзя, парадкавы камісар
Згодна з дыярушам *Пётр Манюшка*, рэгент парад. кам. Гродз. павета
За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.502—505 адв.

№ 76. 9 ліпеня. Сведчанне гродзенскай камісіі аб стане узбраення павета

Рабілася ў Гродна на сесіі ў ніжнім замку дня 9 ліпеня 1794 года.

Парадкавая камісія Гродзенскага павета, маючы данясенне, што Масква, уварваўшыся ў Лідскі павет, прычыніла шмат шкод абывацельству і Гродзенскі павет пад небяспекай непрыяцеля, чыніла і чыніць усё магчымае дзеля абароны: у збройную сілу з Гродзенскага павета выбрана значная колькасць здольных рэкрутаў, аднак без броні, якой няма ў Гродзенскім павеце, а забраныя ў палкі рэкруты састаяць слабымі, хворымі і пры вялікай нястачы броні, з чаго звяртаецца у ЦД ВКЛ за атрыманнем не менш 2 тыс.штук броні з амуніцыяй як мага ў карацейшы час.

Дата вышэй. *Ф(ранцішак) Боуфал, камісар, старшыня*

Згодна з пратаколам *Пётр Манюшка*, рэгент парад.кам.Гродз.павета
За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.490.

№ 77. 10 ліпеня. Адрачэнне Т.Клавы ад урада прэзідэнта г.Гродна

Пазваны ў 1792 годзе на вольнай элекцыі абываценяў месца Гродна на ўрад прэзідэнта, я правіў яго кароткі час і мусіў пазбавіцца з находам непрыяцельскіх войскаў. Калі толькі ў час нарадовага паўстання ўсе ураднікі з элекцыі канстытуцыі (3 мая) 1791 года былі заклікaны да сваіх урадавых абавязкаў, то і я, выконваючы гэта, заняў месца свайго ўрадавання, ад якога не магу зволіцца, хаця за 2-гадовы час пасля выбару так абцяжараны слабасцю здароў'я і завалены вялікай працай, што не магу працаваць колькі вымагаюць патрэба і энергія ў сучасных абставінах. Затым аддаю гэтае мае сведчанне ў рукі люда і Вышэйшай рады з гатоўнасцю ў любы момант даць справаздачу аб дакладных дзеяннях свайго прызвання.Такое мае адрачэнне на суд люда падпісваю ўласным подпісам, 1794 года,10 ліпеня дня, Тадэвуш Клава, прэзідэнт вольнага месца Гродна.

БПАНК, с.1090, л.387.

№ 78. 12 ліпеня. Рапарт Ф.Бауфала аб выкананні сваёй дазорскай дзейнасці

Найсвятлейшая Цэнтральная дэпутацыя ВКЛ!

Назначаны дэтэрмінацыяй ЦД ВКЛ дазорцам для выканання даручанай мне ад ННР інструкцыі, маю гонар паведаміць у святлейшую ЦД ВКЛ аб сваей дзейнасці з самага пачатку, г.зн. з адкрыцця парадкавай камісіі Гродзенскага павета ў новым складзе.

Абраная па дэкларацыі Вышэйшай рады Цэнтральнай дэпутацыяй ВКЛ і сабраная сягоння, парадкавая камісія

Гродзенскага павета пасля здачы на пленуме дыяруша дзеянняў, пратакола рэзалюцый і пратакола асігнацый мінулай камісіі, у парадку безумоўнасці сваіх чыннасцяў выканала прысягу на прадпісаныя ў арганізацыі камісіі камісарскія абавязкі і спісаўшых усіх прысутных асоб па ўзросту для прадпісанага арганізацыяй прэзідыума, даверыла прэзідэнства па таму ж старшынству на першы тыдзень супрасльскаму апату, ксяндзу бызыліянаў Т.Віслоцкаму, які выканаў прысягу перад камісарам аб.Юзафам Зялінскім. А затым жадаючы захаваць для парадку чыннасцяў камісіі такі ж парадак прэзідыума, апісала прагрэсію таго прэзідыума па старшынству ўзроста наступным спосабам: 1.Ксёндз Тэадор Віслоцкі, абат супрасльскі. 2.Юзаф Зялінскі. 3.Якуб Гауман. 4.Ксёндз Тадэвуш Юрэвіч. 5.Тадэвуш Андрэйковіч. 6.Ксёндз Юзаф Свяжынскі. 7.Юзаф Лабецкі. 8.Ян Ясінскі. 9.Віктар Шумкоўскі. 10.Ксёндз Мацей Корн, абат гродзенскі. 11.Ігнацій Лахніцкі.12.Францішак Гансеўскі. 13.Станіслаў Гоувальт. 14.Францішак Мучынскі. 15.Дамінік Маткевіч. 16.Ян Сакалоўскі. 17.Ксёндз Антон Эйсмант. 18.Філіп Міхалкевіч. 19.Феліцыян Пачобут. 20.Міхаіл Эрэнкрэйц. 21.Ян Канопка.

Па спісанні прэзідыума, парадкавая камісія Гродзенскага павета згодна з парадкам арганізацыі НР аддзелаў у сваім складзе з мэтай падзелу належных прац, сярод сябе наступны учыніла выбар. 1. У аддзел парадку суддзю Тадэвуша Александровіча, гродзенскага абата ксяндза Мацея Корна, Юзафа Зялінскага. 2. У аддзел бяспекі Францішка Мучынскага, суддзю, Станіслава Гоувальта, Якуба Гаусмана. 3. У аддзел справядлівасці Францішка Гансеўскага, ксяндза Антона Эйсманта, Юзафа Лабецкага. 4.У аддзел скарбу супрасльскага абата ксяндза Тэадора Віслоцкага, Віктара Шумкоўскага, Яна

Канопку. 5.У аддзел харчу ксяндза Юзафа Свяжынскага, Дамініка Маткевіча, Філіпа Міхалкевіча. 6. У аддзел вайсковых патрэб Ігнація Лахніцкага, Міхаіла Эрэнкрэйца, Яна Сакалоўскага. 7. У аддзел інструкцый ксяндза Тэадора Юрэвіча, Феліцыяна Пачобута і Яна Ясінскага назначыла.

Наступныя чыннасці парадкавай камісіі тая будзе штотыднёва рапартаваць у ЦД. Я жа, не маючы дагэтуль інструкцыі, буду займацца назіраннем, каб парадкавая камісія даводзіла да выніку ўсе распараджэнні начальніка, ННР і ЦД.

Рабілася ў Гродна 1794 г. месяца 12 ліпеня. *Францішак Боуфал.*

БПАНК, с.1090, л. 478—479, 480.

№ 79. 17 ліпеня. Апраўданні гродзенскай камісіі на сваю несубардынацыю

Рабілася ў Гродна на сесіі 1794 г. 17 ліпеня.

Парадкавая камісія Гродзенскага павета мае гонар адказаць на адозву ЦД ВКЛ ад даты 8 ліпеня бягучага года, што ў даўнейшым і цяперашнім складзе заўжды старалася стасаваць свае справы да прызначэння і ўрадавых загадаў, упэўненая, што раней Тымчасовая рада літоўская, а зараз Цэнтральная дэпутацыя, мела і мае на першую ўвагу распараджэнні Вышэйшага начальніка. Якія на свой запыт аб павятовых даходах ад таго ж начальніка мае вызначаныя правілы, тое з абавязку мусіць паведамляць ЦД. Наказ НН выразна прыста-саваны да Гродзенскага павета адносна дапамогі запланаваньм палкам аб.Казаноўскага і Трубіцкага, а таксама жалавання сабраным конна і пеша рэкрутам і, натуральна, згодна з цяперашнім станам края, патрабуе

падтрымкі ўсіх вайсковых наказаў НН і прыказаў іншых камендантаў, не ўхіляцца ад тых рэквізіцый і не дапушчаць іх адкладання. Парадкавая камісія разлічвае на апрабацыю ў ЦД чэсна апісаных падстаў сваіх учынкаў.

Дата вышэй. *Тэадор Вісłоцкі, абат супрасльскі, старшыня.*

Згодна з пратаколам *Пётр Манюшка*, рэгент парад. кам. Гродз. павета

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л. 469.

№ 80. 19 ліпеня. Данясенне гродзенскай камісіі аб устанаўленні дазораў у павеце

Адбылося ў Гродна на сесіі у новым замку дня 19 ліпеня 1794 г.

Парадкавая камісія Гродзенскага павета, сабраўшыся на пленум для рэалізацыі распараджэнняў, абвешчаных у сваім павеце ўніверсаламі ННР і святлейшай ЦД ВКЛ, устанавіла загаданыя дазоры і, выбраўшы на дазорства асоб, склала інструкцыю, абмысленую для часовага выканання іх абавязку, якую адсылае ў найсвятлейшую дэпутацыю для атрымання апрабацыі. Парадкавая камісія таксама напамінае аб рэзалюцыі на прадстаўлены праект найма людзей і цаны паншчыны, які ў мінаючым часе паншчыны надта патрэбны для агульнага дабра. Дата вышэй.

Тэадор Вісłоцкі, абат супрасльскі, старшыня.

Згодна з пратаколам *Пётр Манюшка*, рэгенг пар. кам. Гродз. павета.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.468.

№ 81. Справаздача гродзенскай камісіі аб сваёй дзейнасці паміж 12 і 19 ліпеня

Штотыднёвы рапарт штодзённых чыннасцяў парадкавай камісіі Гродзенскага павета ад дня 12 да дня 19-га месяца ліпеня 1794 года ў Цэнтральную дэпутацыю Вялікага княства Літоўскага.

Года 1794, месяца 12 ліпеня дня. Па прачытанні следства камісара аб. Яленскага, пасланага дня 8 бягучага ў абоз генерала Хлявінскага, знайшла генерал-лейтэнанта літоўскіх войск аб.Шымана Забелу нявінным па даўняму абвінавачванню таго ж аб.Яленскага і настойліва загадала выдаць таму пашпарт на паездку ў Прэнскі павет. Камісія звярнулася ў НР з тым, каб грошы, выбітыя са здададзенага ў мяніцу срэбра ахвераванняў Гродзенскага павета, былі выданы на патрэбы Гродзенскага павета. Атрымала з НР наступныя друкі. 1. Рэзалюцыю аб тым, што жонкі і дзеці, зараз узятых у войска рэкрутаў, узяты ва ўрадавую апеку. 2. Абвяшчэнне НР, каб абывацелі слухаліся распараджэнняў аб.Яна Гараіна, назначанага намеснікам упаўнаважанага. 3. Акт паўстання абывацеляў Курляндскага княства. 4. Адозву НР да абывацеляў Курляндскага княства, Семігаліі і Пілтынскага павета. 5. Атрыманы ад аб.Залескага і Хлявінскага вынік следства ў фальварку Заячкава аб смерці Кайчынскага, учыненага на быўшага каменданта Ігнація Гіняўскага і падпалкоўніка Яна Котку, аддала ў аддзел справядлівасці, а прысланых інтэндантам Акуневічам арыштаваных асоб пастанавіла пасадзіць пад арышт. На мемарыял сялянкі з в.Стральцы, удавы Яны Навумовічавай, жадаючай вызваліцца ад складкі і падатку, камісія загадала задаволіць намер віцэ-адміністратара і пасэсара в.Стральцы кампенсаваць недахоп сялян па ягонай жа рэзалюцыі.

Дня 13 ліпеня. Атрымала зварот генерал-лейтэнанта літоўскіх войск Хлявінскага з паведамленнем аб

непрыяцельскіх абаротах і камунікацыяй у гэтым з камісіяй Бельскай зямлі, на што дала адпаведны адказ і адрас да бельскай камісіі. Атрымала схопленых і прысланых у Гродна двух дызерціраў з Берастаўіцкага графства, якіх адаслала да генерал-маёра Казаноўскага для атрымання санкцыі прапісанага пакарання. Мемарыял аб.Ахотніцкіх запэўніла адказам, што генерал-маёр Ельскі не можа асуджаць абываценяў за няяўку ў паспалітае рушанне без выданага папярэдне дазволу парадкавай камісіі. Абывацелю Сарноцкаму адказала, што пры пасланай праз крэсы пісьмовай экспедыцыі не атрымала згаданых у той экспедыцыі ні тарыфаў, ні рэестраў. Паведаміла генерал-маёру Ельскаму і Казаноўскаму вестку ад абывацеляў з-пад прускай мяжы. У адказ на мемарыял аб.Сільвестровіча са скаргай на непаслухмянасць падданых па нацкоўванню Шавельскага, абавязала камісара крымінальнага суда Адама Гоппу з'ехаць на грунт і ўсё, што спамянута ў мемарыяле, даследваць і паведаміць камісіі.

Дня 14 ліпеня. Сесія ранняя, у прысутнасці аб.камісараў, старшыні супрасльскага абата ксяндза Віслоцкага, дазорцы Боўфала, ксяндза Корна, Зялінскага, рэктара гродзенскіх школ ксяндза Юрэвіча, пробашча кс.Эйсманта, Гансеўскага, Канопкі, Мучынскага, Сакалоўскага, Пачобута, Шумскага, Александровіча і Міхалкевіча.

Адказала на мемарыял начальніка мытных стральцоў, харунжага аб. Тадэвуша Бабецкага у двух пунктах. 1. Камісія вызваліла ад абавязку і экзекуцыі бацьку падаўшага мемарыял, які даў сведчанне каменданта аб здачы кантаніста ў мытныя стралкі. 2. Калі камісія прачытала ў мемарыяле вышэйзгаданага аб службе двух братоў *(неразборліва—Я.А.)* — аднаго стралком, другога валанцёрам у калоне начальніка, то з гэтай прычыны і па сталасці гадоў вызваліла іх бацьку, аб.Бабецкага, ад паспалітага рушання. У адказ на мемаыял аб.Філіповіча,

які скардзіцца на невыкананне пісьмовай умовы паміж згаданымі абывацелямі з аднаго і ксяндзом аб.Пузынай з другога боку, паведаміла ксяндзу аб.Пузыне аб прынятым рашэнні і назначыла разбіральніцтва на дзень 20 бягучы.

Прыбыў абывацель кс.Свяжынскі, выканаўшы прадпісаную тэкстам прысягу на камісарства. У адказ на пададзены аб.Завадскім мемарыял са скаргай на кантрыбуцыйную дэпутацыю, звярнулася ў гродзенскі магістрат з загадам прадставіць разбіральніцтва. Загадала надрукаваць універсал генерал-маёра аб.Ельскага, які загадаў усім пасэсарам сачыцъ за нашэсцем непрыяцельскіх войскаў і для гэтага паліць слупы і ставіць грамады на месцы панікі пад страхам смяротнага пакарання ў крымінальных судах. Адаслала на рэзалюцыю дэпутацыі бяспекі мемарыял аб.Рагозы, які скардзіцца на непаслухмянасць васількаўскай валасці, а таксама рапарт камісара аб.Міхаэліса, высланага камісіяй высветліць слушнасць скаргі аб.Рагозы. Ад дырэктара гродзенскіх фабрык аб.Бульчынскага атрымала ліст з жаданнем, каб камісія адабрала сукно і скуры і за ўсё тое выплаціла належнасць згодна з кантрактам паміж мануфактурай і вайсковым камісарыятам абодвух народаў. Такое пажаданне адаслала ў дэпартамент вайсковых патрэб на выкананне. У адказ на ноту генерала аб.Казаноўскага аб дызерцірах, паведаміла выдадзены дня 7 бягучага ўніверсал, які інфарміруе абывацеляў аб тых жа дызерцірах і як з імі абыходзіцца.

Аддала ў аддзел парадку рапарт інтэнданта заблудаўскай парафіі аб.Роберсона. Прысягу заступцаў у паспалітае рушанне, пададзеную палкоўнікам таго ж паспалітага рушання аб.Рыхліцкім, перадала дэлегаваным адбіраць 50-дымовых рэкрутаў аб.Канопцы, Сакалоўскаму для інфармацыі наконт чакаемай ад іх справаздачы. Скаргу адстаўнога маскоўскага афіцэра

Вібельмана, з прыхільнасці да ахвотнага жадання таго пайсці на службу, адаслала генералу Казаноўскаму, а аб.Дамброўскага адхіліла ад далейшага суправаджэння згаданага афіцэра. Ад генерал-маёра свайго павета аб.Ельскага атрымала рэзалюцыю ў тым, што весткі аб нашэсці прускага войска апынуліся хлуслівымі пасля насылкі патруля да самых прускіх граніц з Герасімовіч 14 ліпеня 1794 г. генерал-маёрам свайго павета аб.Ельскім. Адаслала за рэзалюцыяй у аддзел бяспекі мемарыял аб.Дабравольскага, які скардзіцца на ананімнага эканома. Камандуючы цэлай збройнай сілай літоўскай, генерал-лейтэнант аб.Вялъгорскі прэзентаваў ліст да генерал-маёра Казаноўскага, у якім апошнім пунктам загадвае браць 50-дымовага рэкрута ў полк Казаноўскага. Згаданы ліст пісаны з Паўлава дня 10 ліпеня 1794 г.

Ухваліўшы аблігацыю генерал-маёра аб.Елъскага аб дызерцірах з паспалітага рушання (Адаме Ігнатовічу з крынскай парафіі, Марціне Старжынскім з язерскай), абавязала палкоўніка аб.Рыхліцкага распарадзіцца аб расправе з паказанымі дызерцірамі і даставіць іх у каманду. Звярнулася ў Віленскую парадкавую камісію, каб тая выдала з віленскага арсенала адну гарматку пад асігнацыю генерал-лейтэнанта Вяльгорскага ад дня II бягучага і рашыла адасланць порах дзеля эканоміі абывацельскіх тратаў. Генерал-маёру аб.Ельскаму, занепакоенаму пра гарматны порах , адказала, што аб тым напісала ў Віленскую парадкавую камісію. Што да ўцёкшых з каманды шляхцічах Старжынскім і Ігнатовічу, то абавязала палкоўніка Рыхліцкага паслаць за тымі на расправу. Атрымала засведчанае лістом данясенне літоўскага падканюшага аб. Булгарына, ідучага з 20 коньмі валанцёрам у вайсковую каманду генерал-лейтэнанта Хлявінскага. Тое сведчанне загадала ўпісаць у пратакол канцылярыі і выслухала тэкст прысягі тых людзей. Выдала асігнацыю на 376 зл. 20 грош. для асоб, пералічаных у асігнарыюшы генерал-

маёра Гродзенскага павета аб.Казаноўскага. Рэквізіцыю палкоўніка стральцоў аб.Трубіцкага адносна дызерціраў аддала на сатысфакцыю аддзела вайсковых патрэб. Адказала на мемарыял аб.Філіповіча са скаргай на генерал-маёра аб.Ельскага у двух пунктах: першым жадае тлумачэння генерала, другім пастанавіла вярнуць забраных 50-дымовых рэкрутаў, як не належачых да паспалітага рушання, і такую рэзалюцыю паведаміла аб.Ельскаму.

Дня 15 ліпеня. Сесія ранняя ў прысутнасці абываццеляў камісараў супрасльскага павета кс.Віслоцкага, старшыні, гродзенскага дэкана кс. Свяжынскага, гродзенскага абата кс.Корна, Шумскага, Зялінскага, Эрэнкрэйца, рэктара гродзенскіх публічных нарадовых школ кс.Юрэвіча, Канопкі, Андрэйковіча, Пачобута, Міхайлоўскага, Гансеўскага, Ясінскага, Сакалоўскага, Дамініка Маткевіча, Станіслава Гоўвальта. Парадкавая камісія Гродзенскага павета атрымала рэзалюцыі ў адказ на жаданне генерала аб.Казаноўскага з запэўненнем, што жаданая аб.Казаноўскім бронь для новастворанага палка дастаўлена з арсенала па рэквізіцыі аддзела вайсковых патрэб, аб чым паведаміла аб.Казаноўскаму. Атрымала схему спажывання жыўнасці і збожжавага фуражу звыш хатняй патрэбы ў месце і г.д. з НР і тую схему адаслала ў дэпутацыю харчавання. Па меркаванню аддзела бяспекі выдала ў скарбовы аддзел асігнацыю для выплаты 84 зл. па квіту для чатырох арыштантаў, або Быкоўскага, Хацяноўскага, Шэйбака і Лучкоўскага. Прысланага генералам аб.Ельскім прускага дызерціра адаслала на экзамен у дэпартамент бяспекі. Загадала дэпартаменту бяспекі прыспешыць экзамен арыштаваных Быкоўскага, Хацяноўскага, Шэйбака і Лучкоўскага з тым, каб пасля следства тых адаслаць куды належыць.

Адаслала ў аддзел вайсковых патрэб ахвераванне медзі ў сохах, сошніках, брычках і г.д. генерал-маёра

Гродзенскага павета аб.Ельскага з далучэннем асігнацыі гродзенскаму эканому для выдачы той медзі. Адказала на два пункты мемарыяла інтэнданта гродзенскай каробкі Калінскага: па-першае, каб павятовы камісарыят аплаціў харчовы падатак, па-другое, абавязала генерала аб.Казаноўскага ў вайсковай дапамозе для выбару гродзенскай каробкі. Адаслала за рэзалюцыяй віцэ-адміністрацыі эканоміі мемарыял янаўскіх жыдоў. Туды ж адаслала мемарыял гродзенскага мешчаніна Томаша Лук`яновіча. У адказ на мемарыял маркграфа Гродзенскага палаца Гіблера, адаслала яго па рэзалюцыю ў скарбовы аддзел, якая павінна паследваць згодна з рэзалюцыяй ННР. У адказ на мемарыял Антона Кіляноўскага са скаргай у розных пунктах на суседзяў прызнала немагчымым даць пазітыўную рэзалюцыю з-за адсутнасці судаўнічых паўнамоцтваў. У адказ маёру Дабравольскаму адаслала ягоны мемарыял да вышэйшай каманды з выказанымі ў тым мемарыяле сумненнямі. Сялян в.Літаўка запэўніла на мемарыяле, то іх не належыць прымушаць паншчынай звыш (вызначэння) апошняга ўніверсала НР.

Далей да таго. Сесія па палудні, у прысутнасці абывацелў камісараў старшыні, супрасльскага абата кс.Віслоцкага, гродзенскага абата кс. Мацея Корна, рэктара гродзенскіх нарадовых школ кс.Тадэвуша Юрэвіча, Віктара Шумкоўскага, Феліцыяна Адланіцкага Пачобута, Юзафа Зяліскага, Станіслава Гоўвальта, Яна Канопкі, Філіпа Міхалкевіча, Даміціка Маткевіча. Атрымала экспедыцыю бельскай камісіі з данясеннем аб абаротах непрыяцельскіх войскаў, якую ў копіі камунікавала генералу аб. Хлявінскаму і ваўкавыскай камісіі. Ноту ад аб.Дуйкевіча са скаргай на непаслушэнства адэльскіх мяшчан адаслала ў аддзел бяспекі. Абывацель Эйсмант, стольнік Гродзенскага павета і віцэ-адміністратар добраў каралеўскай эканоміі, прадставіў дзве рэзалюцыі. Адна з ННР ад дня 26 месяца чэрвеня

1794 года, загадваючая скарбоваму аддзелу разам з эканамічнай камісіяй яго каралеўскай мосці ўчыніць аблік ухваленых пабораў у сувязі з расходам пабора, прызначанага на патрэбы яго карал. мосці. Другая патрабуе ад аб.Эйсманта выплаціць 63034 зл. 25 грош. гродзенскай фабрыцы з даходаў літоўскіх эканомій яго карал. мосці. А тое на падставе ўмовы, учыненай аддзелам скарбу у НР, загадала ўпісаць у пратакол канцылярыі і рашыла выдаць віцэ-адміністрацыі. Дазволіла аб.Пачобуту выехаць у вёску і там да 20 забавіцца.

Дня 16 ліпеня. Сесія ранняя. Парадкавая камііія пад старшынствам супрасльскага абата кс.Т.Віслоцкага пачала сесію ў прысутнасці абывацеляў кс.Корна, Ясінскага, Гансеўскага, Эрэнкрэйца, Зялінскага, Сакалоўскага, Канопкі, Андрэйковіча і Свяжынскага. Атрымала такую экспедыцыю з аддзела скарбу ЦД.

1. Каб парадкавая камісія сама сваіх асігнацый не выдавала і скарбовых даходаў без ведама ЦД не ўжывала, акрамя абывацельскіх ахвераванняў, якія вызначаны на агульныя патрэбы павета.

2. Дэкларацыю адносна прагрэсіі працэнтаў на генеральны пабор з кляштараў.

3. Папярэджванне парадкавым камісарам, каб усе экстранныя пытанні аб падатку дасылаліся ў аддзел скарбу ЦД.

4. Спецыфікацыя суммаў і аблігаў розных, узятых са скарбу ВКЛ па санкцыях Таргавіцкай канфедэрацыі і правасуджэння Гродзенскага з'езда.

5. Спецыфікацыя таргавіцкіх пенсій, вернутых у генеральную касу літоўскага скарба, якую аддала ў свой скарбовы аддзел.

6. Рэзалюцыю скарбовага аддзела ў выглядзе 2-х экзэмпляраў Часовай літоўскай рады аб дамовах паміж прускімі і польскімі абывацелямі аб вырабу грунтоў.

Атрымала рапарт інтэнданта мастоўскай парафіі

аб.Дзеятковіча аб тым, што маскоўскае войска спынілася ў Дзярэчыне. Атрымала данясенне бельскай камісіі, што маскоўскае войска з Брэста рушыла ў Шарашова. Атрымала паведамленне з мерацкай камісіі, што маскоўскае войска з Ліды і Дварышча выйшла на Альшаны. На моцы рэзалюцыі скарбовага аддзела ЦД загадала інтэнданту вярболаўскаму аб.Здзітавецкаму вярнуць прускім падданым быдла, будучае на пашах польскіх сялян, задаволіць крыўды і таксама паслала экзэмпляр рэзалюцыі ЦД прускаму генералу. На мемарыял аб.Пачобута адказала, што адносна брата ў паспалітым рушанні генерал-маёр аб.Ельскі дасць адпаведна са справядлівасцю рэзалюцыю. Новадворскаму ксяндзу плябану адказала, што месца Новы двор, маючы шмат двароў, абавязана даць 50-дымовага рэкрута, а кс. плябан са сваіх дымоў — пэўную плату.

Сесія паабедзенная. Парадкавая какмісія пад старшынствам супрасльскага абата, абываценя кс.Т.Віслоцкага пачала сесію ў прысутнасці абываценяў Мучынскага, Ясінскага, Гансеўскага, Зялінскага, Сакалоўскага, Андрэйковіча, Шумкоўскага, Канопкі, кс.Юрэвіча, кс.Корна. Ад бельскай камісіі атрымала выпіску атрыманага данясення аб тым, што расійскае войска з Брэста выйшла паходам адной часткі на Пінск, а другой — да Палесся на Уладзімір, аб чым генерал Серакоўскі вельмі засцерагае бельскую камісію. Атрыманую з скарбовага аддзела ЦД рэквізіцыю з напамінам прэору гродзенсіх ксяндзоў дамініканаў, кс.Сівіцкаму аб узятай ім са скарбу суме для літоўскай асэсорыі, адаслала ў аддзел скарбу. Ведамасць бельскай камісіі аб абаротах непрыяцеля тут жа камунікавала генерал-лейтэнанту Хлявінскаму. Прыняла сфарміраваны уклад цыркуляў і кожнаму асобна дэлягаванаму са свайго кола дазорцу назначыла. Звярнулася ў скарбовы аддзел, каб той па думцы дэпутцыі забеспячэння ад дня 11 ліпеня залічыў 4 тыс.зл. на нязменныя

патрэбы ў вайсковы камісарыят. У скарбовы аддзел асігнавала 166 зл. 20 грош. за мяса капітану пікінераў Нямеры. Прыняла ад аб. Ясінскага рахункі паезуіцкай друкарні з спецыфікацыяй друкаваных лістоў аб акалічнасцях нарадовага паўстання і асігнавала з павятовых ахвераванняў ў скарбовы аддзел належныя 1944 зл.13 гр. на абедзве друкарні.

Дня 17 ліпеня. Сесія ранняя. Парадкавая камісія Гродзенскага павета пад старшынствам супрасльскага абата, абываделя кс.Т.Віслоцкага пачала сесію ў прысутнасці абываделяў кс.Юрэвіча і гродзенскага абата кс.Корна, Мучынскага, Гансеўскага, Андрэйковіча, Зялінскага, Эрэнкрэйца, Канопкі, Ясінскага, Міхайлоўскага, Маткевіча, Гоувальта. Атрымала экспедыцыю генерала аб.Хлявінскага аб рабунках стральцоў аб. Трубіцкага з пажаданнем адказу, пры якой і ліст да генерала аб.Вяльгорскага эстафетай адаслала ў абоз. Прывезенае з абозу генерала аб.Хлявінскага срэбра ахвераванняў адаслала для прыёму у скарбовы аддзел. Адпісала ў ЦД на адозву, учыненую ў камісію 8 ліпеня аб выдаткаванні грошаў з публічных даходаў з данясеннем у тым волі НН, і копію яе паслала ў тую ж ЦД. На пытанне бераставіцкага радцы аб. Даўнаровіча адказала, што цалкам абмундзіраваных рэкрутаў трэба адасланць у Гродна, а рэшткі трэба старацца даўкамплектаваць і выканаць у адпаведнасці з прадпісаннем універсалаў.

Дзве ноты шэфа літоўскай коннай гвардыі аб.Яна Грынеўскага, прысланыя імем ротмістра аб.Радавіцкага на аб.Боуфала, які прыняў збеглага чалавека па імені Стэфана, камунікавала таму чашніку і зямянскаму суддзі Гродзенскага павета аб.Юзафу Боуфалу з пажаданнем тлумачэння на абедзве. Мемарыял маёра пікінераў аб.Дабравольскага, які скардзіцца на выдачу з магазіна гнілых сухароў, адаслала ў дэпутацыю жыўнасці.

Сесія паабедзенная. Парадкавая камісія Гродзенскага павета пад старшынствам супрасльскага абата

абываценя кс.Т.Вісноцкага пачала сесію ў прысутнасці кс.Корна, Ясінскага, Сакалоўскага, Маткевіча, Міхайлоўскага, Гансеўскага, кс.Юрэвіча. Выдала да абываценяў свайго павета ўніверсал, каб узамен за квіты, выдадзеныя за пастаўлены фураж, як мага хутчэй і пад экзекуцыяй паставілі пяць 50-дымовых рэкрутаў. На мемарыял гродзенскага кагала, які тлумачыць, што пад час няшчаснай выплаты кантрыбуцыі маскоўскаму у месцы Гродна войску з пагалоўнага выдаткавана 2 тыс.зл., а таму просіць адтэрмінаваць час належнага ўнясення пагалоўнага падатку, дала на тым жа мемарыяле рэзалюцыю у тым, што паколькі з кагала належыць больш 10 тыс.зл.пагалоўнага, а 2 тыс.забраны пад час яго уплаты, то нельга спыніць унясенне таго пагалоўнага і таму загадала гродзенскаму кагалу аплаціць патрэбнае ад яго пагалоўнае ў касу на працягу 6 тыдняў экзекуцыяй. Выдала ў скарбовы аддзел асігнацыю, каб ён за квітамі выдаў 126 зл. з абывацельскіх ахвераванняў на вядзенне кніг канцы-лярыі, а 86 зл. 25 гр. — на памешчанага аб.Макоўскім канцылярыста.

На ноту генерал-маёра Гродзенскага павета аб.Казаноўскага аб выплаце па асігнацыі генерала, камандуючага літоўскім войскам аб. Вяльгорскага 500 чырвоных зл. для літоўскай коннай гвардыі, камісія адказала, што не маючы ў павятовай касе ніводнага злотага, а толькі адну маскоўскую манету, не можа задаволіць асігнацыю генерала камандуючага аб.Вяльгорскага інакш, як толькі выплатай маскоўскай манетай з разліку 18 зл.у адным чырвоным злотым згодна з апошнім краёвым курсам, што ўчыніць 9 тыс.зл., якія і рашыла выплаціць неадкладна. Камісар аб.Гоувальт з дазволу камісіі ад'ехаў з Гродна ў свой фальварак да дня 20 бягучага. На мемарыяле аб.Янкеля Лейзаровіча аб тым, што здадзеныя камісіяй у гродзенскі кагал асобы ухіляюцца ад працы, загадала кагалу пад карай у крымінальным судзе не вызваляць тых асоб ад агульнай працы.

Дня 18 ліпеня. Сесія ранняя. Парадкавая камісія Гродзенскага павета пад старшынствам абываценя кс.Т.Віслоцкага, супрасльскага абата, пачала сесію ў прысутнасці аб. Шумкоўскага, Зялінскага, Маткевіча, Сакалоўскага, кс. Юрэв іча, Ясінскага, Канопкі, кс. Корна, Гансеўскага, Эрэнкрэйца і Свяжынскага. Прадпісала сваім, абраным па парафіях, дазорцам інструкцыю з 13 пунктаў. Атрымала данясенне генерал-маёра Гродз. павета аб.Ельскага аб тым, што яго абоз пад Ганёндзам на Падляшшы. Ад каменданта корпуса валанцёраў аб.Булгарына даведалася, што ён стаў пад Крынкамі.

Да таго ж паабедзенная сесія. Парадкавая камісія Гродзенскага павета пад старшынствам супрасльскага абата абываценя кс.Т.Віслоцкага пачала сесію ў прысутнасці аб. кс.Корна, кс.Юрэвіча, Гоувальта, Зялінскага, Андрэйковіча, Маткевіча, Гансеўскага, Канопкі, кс.Свяжынскага, Міхайлоўскага. Паважаючы прапанову генерал-маёра Гродз.павета аб.Ельскага, канчаткова згадзілася да генерала камандуючага войскам ВКЛ аб.Вяльгорскага выслаць кур'ера, якому на дарожныя траты загадала скарбоваму аддзелу аплаціць 300 зл. з даходаў скарбу Рэчы Паспалітай. Генерал-маёру Гродз.павета аб.Ельскаму адказала, што асігнаваных на дарожныя траты кур'ера 300 зл. дастаткова поўнасцю, а адсюль, каб аб.Ельскі больш не высылаў кур'ера, якога камісія не можа ўтрымліваць, паколькі скарбовы аддзел ЦД ВКЛ не дазваляе чапаць без яго ведама касу з тлумачэннем, што правоз экспедыцый кур'ерамі або праз крэсы будзе ўтрымлівацца камісіяй. Каменданту корпуса валанцёраў аб.Булгарыну выказала падзяку за паведамленне аб сваіх абаротах.

На экспедыцыю аб.Шабуневіча адказала, па-першае, што прысланую спецыфікацыю не хапаючых на абывацельскія патрэбы прадуктаў аддала ў аддзел жыўнасці, па-другое, што грамады паспалітага рушання

трэба размясціць на 3 мілі ў глыб польскага края ад прускай мяжы, па-трэцяе, што абывацелі абавязаны даваць як хутчэй 50-дымовых рэкрутаў у Гродна на камісію, у чацвертых, далучыла тэкст прысягі стражнікаў паліцыі. На ноту віцэ-адміністратара гродзенскай, яго каралеўскай мосці эканоміі аб.Мацея Эйсманта, які скардзіцца, што мяшчане магдэбургскіх мястэчак не жадаюць выконваць патрэбныя павіннасці, адказала, што не бачыць гэтай матэрыі ў сваей юрысдыкцыі і таму не пастанаўляе ніякай рэзалюцыі, але адсылае ў адміністрацыю эканоміі, дзе ён можа шукаць адказ на адпаведную скаргу.

Тэадор Вісłоцкі, супрасльскі абат. старшыня.

Згодна з дыярушам *Пётр Манюшка*, рэгент парад. кам. Гродз. павета .

БПАНК, с. 1090, л. 472—476 адв.

№ 82. 20 ліпеня. Хадайніцтва Ф.Боуфала аб паскарэнні рэалізацыі праекта прымусовага найма

Следам за адсылкай на адабрэнне найсвятлейшай ЦД ВКЛ інструкцыі парадкавай камісіі Гродзенскага павета аб цыркульных дазорцах, маю гонар па абавязку майго ўрада далучыць сваю з тым, каб найсвятлейшая ЦД зрабіла ласку падаць сваё рашэнне як аб гэтым, так і аб на пасланае той камісіяй устанаўленне адносна найма работніка. Мой абавязак назірання за хуткім перапісам насельніцтва і сфарміраваннем збройнай сілы пасля выхаду грамад, не меней як і клопат над сялянамі, што церпяць крыўды ад сваіх пасэсараў і націскаюць камісію сваімі скаргамі, прымушаюць мяне прасіць аб паскарэнні рашэння найсвятлейшай дэпутацыі. Пра абароты непрыяцельскага войска не магу данесці нічога выразнага, бо з розных бакоў даходзяць супрацьлеглыя весткі, аднак адно магу паведаміць, што генерал-

лейтэнант аб.Хлявінскі са сваёй камандай стаіць пад Мсцібавам і Свіслаччу, а яго лазарэт учора стаў пад Гродна ў Кохана ве.

Даны у Гродна 1794 г. 20 ліпеня дня. *Францішак Боуфал, упаўнаважаны Найвышшай рады ў Гродзенскім павеце.*

БПАНК, с. 1090, л. 459.

№ 83 . Дыярыуш чыннасцяў Гродзенскай парадкавай камісіі з 19 да 26 ліпеня

Рапарт штодзённых чыннасцяў парадкавай камісіі Гродзенскага павета ад дня 19 да дня 26 месяца ліпеня ў Цэнтральную дэпутацыю Вялікага княства Літоўскага.

1794 года дня 19-га. Ранняя сесія. Парадкавая камісія Гродзенскага павета пад старшынствам абываццеля кс.Тэадора Віслоцкага, абата супрасльскага, пачала сесію ў прысутнасці абываццеляў Міхалкевіча, Ясінскага, Зялінскага, кс. Юрэвіча, Эрэнкрайца, Гансеўскага, Шумкоўскага, Канопкі і кс.Свяжыскага. Атрымала сёння наступную экспедыцыю. 1. Пастанову ННР адносна няяўкі ў паспалітае рушанне. 2. Вызаў у найвышэйшы каронны крымінальны суд Станіслава Счэсны Патоцкага, Францішка Ксаверыя Браніцкага, Севярына Ржэвускага, Ежы Вяльгорскага, Антона Златніцкага, Адама Масчынскага, Яна Загорскага, Яна Сухаржэўскага, Міхаіла Кабялецкага, Яна Швыкоўскага, Францішка Гулевіча. 3. Рэквізыцыю аддзела вайсковых патрэб у ННР аб прысылцы належнага з гродзенскай фабрыкі сукна і скураў, якую аддала на рэзалюцыю аддзела вайсковых патрэб свайго павета. 4. Рэзалюцыю скарбовага аддзела ЦД аб паборы у адпаведнасці з прагрэсіяй, якую ўручыла скарбоваму аддзелу. 5.Паведамленне аддзела бяспекі літоўскай ЦД аб

удзельніках таргавіцкай змовы і ўцекачах, якое загадала рашыць свайму аддзелу бяспекі.

На мемарыяле жыда Арона Шломавіча ў тым, што ён не можа атрымаць справядлівасці ад віцэ-адміністрацыі эканоміі ад дзяржаўцы кумяльскага ключа і Мейкі Карыцінскага за арэнду кабака, дала адказ, што не мае моцы ўдавацца ў расправу і вырашэнне такога тыпу скаргаў і ўставаў і адаслала яе туды, дзе рашэнне належыць па праву. На мемарыял сялян баганіцкага ключа са скаргай на невызваленне іх ад павіннасцяў у запісанай рэзалюцыі загадала баганіцкаму двару, каб ён, згодна з выдадзенымі універсаламі, дамагаўся ад сялян меншай паншчыны, інакш будзе адказваць за перавышэнне. Камісія атрымала па адным экзэмпляры нумары 13, 14 і 15 урадавых газет. На мемарыял Стэфана Альшэўскага з в.Сопліца, пасэсіі аб.Клімовіча, з просьбай аб поўным вызваленні ад паншчыны, дала на мемарыяле рэзалюцыю, што згодна з апошнімі ўніверсаламі, не можа цалкам звольніць яго ад грунтовай павіннасці. Паведаміла ў ЦД ВКЛ інструкцыю для дазорцаў, загадаўшы тым часова спраўляцца разам з напамінам аб рэзалюцыі на свой праект найма людзей і цаны паншчыны, даўно пасланы у дэпутацыю.

Атрыманы ад аб.Высоцкага, які ў Ковенскім павеце зрабіў тарыф і рэестр выбару падаткаў за сакавік бягучага года, пераслала ў скарбовы аддзел ЦД разам з эксплікацыяй аб.Яна Сарноцкага. Загадала свайму аддзелу вайсковых патрэб наняць фурманаў пад транспарт сукна і скур да Варшавы, а патрэбныя расходы камісія сама асігнуе. Устанавіла пенсіі 1060 зл.штомесяц афіцыялістам сваіх аддзелаў і крымінальнага суда, якія загадала свайму скарбоваму аддзелу выплаціць з шэлегавага фундушу.

Да таго ж паабедзенная сесія. Парадкавая камісія пад старшынствам супрасльскага абата, абываценя кс.Тэадора Віслоцкага пачала сесію ў прысутнасці аб.

кс. Корна, Ясінскага, Шумкоўскага, Андрэйковіча, Зялінскага, Гансеўскага, кс.Юрэвіча і Канопкі. Атрымала ад генерала камандуючага ў Літве аб.Вяльгорскага экспедыцыю, пісаную з-пад Воранава, поўную непакою стратай прыкрыцця Гродзенскага павета і з жаданнем даведацца аб колькасці і колеры наяўнага сукна ў магазінах. Выканаць гэтае пажаданне загадала аддзелу вайсковых патрэб. Ад інтэнданта яленеўскай парафіі аб.Міхневіча прыняла вопіс збожжа і іншых абывацельскіх прадуктаў, які аддала ў аддзел жыўнасці. З нагоды мемарыяла, пададзенага 15 дня бягучага многімі жыдамі са скаргай у тым, што прадстаўленыя імі грошы на аплату кантрыбуцыі, ускладзенай 5 мая непрыяцелем на Гродна, ім яшчэ не вернутыя, загадала магістрату места Гродна вярнуць уласнікам авансаваныя многімі абывацелямі грошы ў кантрыбуцыйную дэпутацыю. Камісія прадпісала схему інструктажу для пастаўленых у цыркулях дазорцаў. Па данясенні аб.Скродскага, што яму нязручна спраўляць функцыі дазорцы ў індурскім цыркулі, камісія перамясціла яго ў цыркуль Вялікая Бераставіца, а аб.Мроўскага адпаведна назначыла на дазорскую функцыю індурскага цыркуля. Абывацелі Станіслаў Залескі, Якуб Скродскі, Міхаіл (...), выканалі вызначаныя за ўвядзенне ў дазорцы цыркуляр прысягі, а камісія падпісала для іх інструкцыі.

Дня 20 ліпеня. Сесія паабедзенная. Парадкавая камісія Гродзенскага павета пад старшынствам аб.Юзафа Зялінскага пачала сесію ў прысутнасці абывацеляў, абата кс.Віслоцкага, Андрэйковіча, Мучынскага, Маткевіча, Гаусмана, Сакалоўскага. На зварот камісіі бельскай зямлі адказала, што не праміне ўзаемна паведаміць вартыя данясення ведамасці. Ад дэлягаванага да генерал-лейтэнанта Хлівінскага Яленскага атрымала рапарт аб асігнаваннях правіянту, фуражу і фурманак гродзенскімі абывацелямі па той прычыне, што абоз генерала Хлявінскага праблізіўся да гродзенскіх граніц.

Дазволіла супрасльскаму абату, абывацелю кс.Віслоцкаму выехаць на 2 тыдні да сваёй хаты. Парадкавая камісія дала асігнацыю на пенсіі сваім афіцыялістам з фундушу шэляговага, выбранага на тыя пенсіі з дазволу скарбовага аддзела ЦД. Зараз з-за пярэчання скарбовага аддзела павета камісія загадала таму на наступны месяц выплаціць пенсію афіцыялістам з публічных даходаў, а адпаведную квоту узяць з унесенага шэляговага. Паколькі існуе пастаянная патрэба ў рамесніках, даўно нанятых да розных прац, то для задавальнення тых рамеснікаў парадкавая камісія загадала свайму скарбоваму аддзелу выплаціць з скарбовых даходаў 5 тыс.зл. па квіту свайго аддзела вайсковых патрэб. У адказ на мемарыял сялян в.Блуды яго каралеўскай мосці, якія просяць аб люстрацыі градабою і разам скардзяцца на прычыненыя пераборы, запісала ў сваёй рэзалюцыі загад дазорцу 9-га цыркуля аб.Гушчы разгледзіць скаргу сялян, аблюстраваць выпадак градабою, а аб вынайдзеных пераборах і шкодах паведаміць камісіі.

Дня 21 ліпеня, сесія ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Юзафа Зялінскага пачала сесію ў прысутнасці абывацеляў кс.Юзафа Свяжынскага, Даметка Маткевіча, кс.Тадэвуша Юрэвіча, Францішка Мучынскага, Станіслава Гоувальта, Філіпа Міхалкевіча, Ясінскага, Гансеўскага, Шумкоўскага, кс.Мацея Корна, гродзенскага абата Пачобута. Атрымала з ЦД загад з многіх пунктаў у тым, каб парадкавыя камісіі прысылалі ў ЦД штодзённыя рапарты, а аддзелы асобна такія ж рапарты. Атрыманае з скарбовага аддзела Цэнтральнай рады азначэнне следства аб арэндзе ў бераставіцкіх маёнтках, быццам бы гвалтам навязанай жыдам Касакоўскімі, аддала ў скарбовы аддзел. Атрыманую спецыфікацыю рухомай і нерухомай маёмасці, узятых і збеглых з загадам парадкавым камісіям распарадзіцца з такімі добрамі ў сваіх ваяводствах і паветах паведаміла

скарбоваму аддзелу. Атрымануюз скарбовага аддзела ЦД спецыфікацыю сумаў, забраных з літоўскага скарбу па пастановах таргавіцкай канфедэрацыі і з права гродзенскага з'езда, аддала у скарбовы аддзел. Атрымала разасланы Цэнтральнай радай усім парадкавым камісіям ВКЛ адказ на запытанне дэлегата упіцкай камісіі аб паспалітым рушанні ў тым, каб яны цвярдзей трымаліся пры надобных выпадках сумнення. Выслухала прысягі на парадкавае камісарства аб. Ігнація Лахніцкага і палкоўніка Юзафа Лабецкага.

З нагоды непрыстойнага арышту Котвіча завілейскім генерал-маёрам атрымала рэзалюцыю аддзела бяспекі ЦД да ўсіх парадкавых камісій у тым, каб з гэтага часу парадкавыя камісіі высылалі каманды генерал-маёрам для арыштаў пры вызначэнні віны або за пэўным подпісам дэлегацыі. Парадкавая камісія абавязала аддзел справядлівасці ўнікаць у розныя скаргі сялян на ўласнікаў і пасэсараў і наўзаем разбіраць іх. На мемарыял гродзенскіх жыдоў у іх жаданні мець пастанову камісіі аб мястэчках з забаронай тым прынімаць хворых, адказала, каб гродзенскія жыды падалі сведчанне доктара медыцыны аб колькасці хворых, іх хваробах і дэкляравалі месца, якое б зараз жа вызначала свае адносіны да жадання гродзенскіх жыдоў. Загадала аддзелу жыўнасці сваей камісіі як мага хутчэй рапартаваць аб усіх артыкулах наяўнага ў магазінах харчу, складзеных грошах за фураж і таксама паказаць у справаздачы залеглы фураж.

Да таго ж, паабедзенная сесія. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Юзафа Зялінскага пачала сесію ў прысутнасці аб.Ігнація Лахніцкага, кс.Мацея Корна, абата гродзенскага,Тадэвуша Александровіча, кс.Тадэвуша Юрэвіча, Францішка Мучынскага, Віктара Шумкоўскага, Яна Канопкі, Феліцыяна Адланіцкага Пачобута. Атрымала скаргу адміністратара Берастовіцкага графства аб.Даўнаровіча на каменданта

паспалітага рушання аб.Сегена, які пры стаянні ў бераставіцкіх добрах прыціскаў іх звыш магчымага, вымагаючы розныя патрэбы для паспалітага рушання Ваўкавыскага павета. Гэтую скаргу вырашана паведаміць у першую чаргу генералу аб.Хлявінскаму з патрабаваннем, каб генерал камандуючы стрымаў такі ўціск. Затрымала аб.Яленскага ў якасці дэлегата пры калоне войска пад камандай генерала Хлявінскага з пацвярджэннем таму делегату інструкцыі ад 18 чэрвеня, якую загадала шчыльна прытрымлівацца. Адпісала на прысланую аб.Даўнаровічам экспедыцыю і адаслала сваю да генерала Хлявінскага. Рапарт мастоўскага інтэнданта аб уварванні казакоў у Масты адаслала ў аддзел бяспекі.

Дня 22 ліпеня ранняя сесія. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Юзафа Зялінскага пачала сесію ў прысутнасці абывацеляў кс.Мацея Корна, гродзенскага абата, Францішка Мучынскага, Дамініка Маткевіча, Віктара Шумкоўскага, Міхаіла Эрэнкрэйца, Яна Канопкі, Феліцыяна Адланіцкага Пачобута. Атрымала рэзалюцыю крымінальнага суда Мазавецкага княства на пададзеную ноту аб суджэнні асоб таргавіцкага спіса і належачых да гродзенскага з'езда. На пытанне ЦД ВКЛ —ці павінны застаўныя пасэсары, арандатары, дзяржаўцы каралеўскіх у сталовых добраў стаць у паспалітае рушанне, ННР пастанавіла, што ўсе яны абавязаны явіцца ў паспалітае рушанне. Атрымала рэзалюцыю ННР на прапановы аб.Боуфала адносна памяшчэння асоб у гродзенскую парадкавую камісію замест адасланых у крымінальны суд ЦД ВКЛ. На зварот Гродзенскай парадкавай какмісіі ў Найвышэйшую Варшаўскую раду аб наборы ахвераванняў атрымала адказ скарбовага аддзела Найвышэйшай рады, які загадвае скарбоваму аддзелу ЦД ВКЛ асігнаваць на патрэбы Гродзенскага павета суму прапарцыянальна з пастаўленым срэбрам з абавязкам здачы калькуляцыі.

Атрымала заключэнне аддзела вайсковых патрэб ННР аб транспартаванні сукна з гродзенскай фабрыкі з тым, каб ён не апынуўся лупам непрыяцеля, якое аддала ў аддзел вайсковых патрэб. Атрымала прадстаўленне аддзела жыўнасці ЦД ВКЛ аб паскарэнні дастаўкі правіянту згодна з універсалам ННР ад 6 чэрвеня 1794 г. і патрабаваннем ад парадкавых камісій штотыднёвых рапартоў аб стане магазінаў для генеральнага ўладкавання ўсіх калон вайсковым забеспячэннем, што аддала ў аддзел жыўнасці. Атрымала ад ННР пракламацыю да народу аб пачварным здарэнні ў Варшаве 28 чэрвеня 1794 г. Атрыманы з НР для паведамлення два рапарты Ковенскай парадкавай камісіі з данясеннем чыннасцяў адносна збройнай сілы Ковенскага павета. Учыніла да генералаў Вяльгорскага і Хлявінскага адозвы аб абаротах непрыяцельскіх войскаў з далучэннем першаму з іх рапарта пра высылку ў Варшаву сукна і скураў, а таксама рэштак срэбра, забранага у камісію з касцёлаў. Атрымала ўрадавыя газеты над №№ 16—18. Копію дыспазіцыі віцэ-адміністратара гродзенскай эканоміі аб.Эйсманта лясным афіцыялістам ад дня 21 бягучага, на моцы загаду генерала Ясінскага, прадстаўленую на пленум камісіі, аддала ў аддзел вайсковых патрэб.

Сюды сесія паабедзенная. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Ю.Зялінскага пачала сесію ў прысутнасці абывацеляў камісараў кс. Мацея Корна, гродзенскага абата, Т.Андрэйковіча, кс.Т.Юрэвіча, В.Шумкоўскага, Міхаіла Эрэнкрэйца, кс.Антона Эйсманта, Францішка Гансеўскага, Ф.Адланіцкага Пачобута, Яна Ясінскага, Ф.Мучынскага. Мемарыял аб. Мальчэўскага, жадаючага здаць справаздачу аб атрыманні ад абывацеляў 25-дымовых рэкрутаў разам з грашыма, адаслала за плёнам яго жадання ў скарбовы аддзел, а 1600 зл.трокскай ваяводзіны аб.Агінскай аддала ў той жа аддзел для адпаведнай рэзалюцыі ЦД.

Прыняла ў выглядзе 20 штук ручной зброі ахвераванне аб.Леанарда Волмера з умовай аддачы яе стральцам, адданым у службу Рэчы Паспалітай родзічамі вышыэйзгаданага абываценя з рэкруцкага набору. Камісія загадала запісаць у пратакол канцылярыі сведчанне падзякі аб.Волмеру за такое ахвераванне, а зброю адаслала ў аддзел вайсковых патрэб з загадам таму аддзелу выканаць умовы пажаданняў ахвяравальніка.

Дня 23 ліпеня, ранняя сесія. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Ю.Зялінскага, пачала сесію ў прысутнасці абывацеляў камісараў кс.Юзафа Свяжынскага, Т.Андрэйковіча, Ф.Гансеўскага, Д.Маткевіча, кс. А.Эйсманта, Ф.Мучынскага, Ф.Пачобута, В.Шумкоўскага, С.Гоувальта, Ігнація Лахніцкага, Я.Канопкі. Парадкавая камісія атрымала прадпісаную сабе ардынацыю ў 12 пунктах, якую абавязалася выконваць у сваіх чыннасцях. Зволіла ад абавязкаў дазорцы парафіі або цыркуля адэльскага аб.Адама Эйсманта па яго ўласным жаданні, а на тое месца і на функцыю дазорцы у адэльскі цыркуль паставіла жадаючага аб.Міхаіла Круповіча, выслухала ад таго аб.Круповіча прысягу на выкананне абавязкаў дазорцы і пастанавіла выдаць яму свой інструктаж. Праз аб.Іяхіма Храптовіча камісія атрымала ліст Гакмана з манетнага двара Варшавы аб колькасці складзенага ў тым двары павятовага срэбра, выбітага ў грошах на суму ***(неразборліва — Я.А.)*** чырвоных. Не маючы пленума для абмеркавання матэрый у адпаведнасці з улажэннем ардынацыі, парадкавая камісія адклала сваю сесію на 8 гадзін наступнага дня.

Сесія надзвычайная паабедзенная. Парадкавая камісія Гродзенскага павета пад старшынствам Ю.Зялінскага пачала сесію ў прысутнасці камісараў Лахніцкага, Гансеўскага, Шумкоўскага, Эйсманта, Свяжынскага, Маткевіча, кс.Корна, Эрэнкрэйца, Андрэйковіча. На

запыт аддзела вайсковых патрэб аб вызначэнні кошту пад транспарт, нанятаму аддзелам НР на звоз у Варшаву сукна і скур, асігнавала на такі транспарт 2 тыс.зл. з упэўненасці, што па атрыманні НР той кошт верне ў літоўскі скарб. Па сведчанню смаленскага земскага суддзі аб.Базыля Гансеўскага ў тым, што яму нязручна выконваць абавязкі дазорцы госкага цыркуля, камісія назначыла таго абываценя Гансеўскага ў дазорцы ліпскага цыркуля, а на яго месца у госкім цыркуле паставіла каморніка аб.Ігнатовіча. Выслухала прысягу аб.Базыля Гансеўскага на ўрад дазорцы і падпісала інструкцыю. Адаслала ў аддзел вайсковых патрэб мемарыял аб. Навамейскага аб звоExternal 25-дымовых кантаністах з тым, каб мець іх абмундзіраванымі або атрымаць узамен у той лік 50-дымовых коннікаў.

Дня 24 ліпеня ранняя сесія. Парадкавая камісія пад старшынствам аб. Ю.Зялінскага, пачала сесію ў прысутнасці абываценяў камісараў Свяжынскага, Лахніцкага, Андрэйковіча, кс. Юрэвіча, Гоувальта, Шумкоўскага, Гансеўскага, Маткевіча, Гаусмана, Пачобута і Мучынскага. Атрымала рэзалюцыю на свой мемарыял адносна паспалітага рушання, пасланы дня 10 бягучага ў НР. Атрымала адказ на свой зварот да генерала Хлявінскага адносна аб.Сегена, які, укрочыўшы ў Гродзенскі павет з паспалітым рушаннем Ваўкавыскага павета, стаў цяжарам для Гродзенскага павета. Па прысланым паведамленні аб абаротах непрыяцельскага войска аб. генерал Хлявінскі даносіць парадкавай камісіі, што князь Цыцыянаў з-пад Слоніма пайшоў навагрудскім трактам. Камісія заспакоілася ад небяспекі ўварвання непрыяцеля з таго боку, а асабліва, калі той жа генерал, як ён адзначае, паслаў значны патруль у ваколіцы Беліцы. Што да запыту камісіі аб забранні солі, жалеза і селядца з мастоўскіх магазінаў маёрам, камандуючым лазарэтам Цехановічам, то генерал аб. Хлявінскі адказаў, што калі тыя артыкулы,

забраныя на войска, не будуць патрэбныя, то будуць вернутыя ўласнікам.

Камісія прыняла думку аддзела бяспекі адносна арыштаваных асобаў кс.Юзафа Хацяноўскага, быўшага эканома Міхаіла Лінкоўскага і аб.Абуховічавай. Адаслала ў аддзел бяспекі і парадку рапарт інтэнданта паліцыі на прускай мяжы Дзізмы Крыўкоўскага. Выслухала прысягу аб.Якуба Клімашэўскага, дазорцы пунскага цыркуля, і выдала на тое інструктаж. Аддала ў аддзел справядлівасці мемарыял жыда Лейзара Давідовіча, арандатара каралінскага, са скаргай на аб.Глінскага. Выдала асігнацыю на 31 зл., выдаткаваных аб.Забеле, з экспедыцыямі да генерала Хлявінскага. Атрымала экспедыцыю, прысланую з аддзела бяспекі ННР 16 ліпеня ў камісію праз віленскую пошту. Гродзенская камісія адаслала ў аддзел бяспекі ННР арыгінальны экстракт галасавання ўдзельнікаў гродзенскага з'езда. Загадала гродзенскаму магістрату, каб ён давёў да выніку універсал ННР ад 14 чэрвеня адносна валацугаў і г.д. Атрымала ад Мерацкай парадкавай камісіі апісанне акцыі абываццеляў месца Вільна з непрыяцельскім войскам, якое загадала раздрукаваць для ведама абываццеляў свайго павета.

Да таго ж надзвычайная паабедзенная сесія.

Парадкавая камісія пад старшынствам Ю.Зялінскага пачала сесію ў прысутнасці абываццеляў камісараў кс.М.Корна, Лахніцкага, Канопкі, Гаусмана, Гансеўскага, Мучынскага, кс.Юрэвіча, Шумкоўскага, Пачобута. Вярнуўся пасланы кур'ерам да аб.Вяльгорскага аб.Антон Сільвестровіч з адказам на адозву парадкавай камісіі, які таксама прывёз экспедыцыю генерала аб.Вяльгорскага да генерала Хлявінскага, тэрмінова адасланую праз кур'ера. Дэкляравала запісаць у пратакол чыннасцяў падзяку аб.Антону Сільвестровічу за прынясце клопатаў за свой кошт. Звярнулася да

аб.Яленскага, будучага пры калоне войск каманды генерала Хлявінскага, з патрабаваннем напомніць аб.генералу стрымаць падначаленых за гвалтоўныя і бязладныя вымаганні ў абываццеляў вайсковых патрэб. Выдала кур'еру, пасланаму з экспедыцыяй генерала аб. Вяльгорскага да генерала Хлявінскага, асігнацыю на 30 зл. Адаслала ў аддзел бяспекі ННР эстафетай рэквізыцыю аб галасаванні ўдзельнікаў гродзенскага з'езда ў 30 штуках.

Дня 25 ліпеня, ранняя сесія. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Ю.Зялінскага пачала сесію ў прысутнасці абываццеляў камісараў Ігнація Лахніцкага, Францішка Мучынскага, Францішка Гансеўскага, Ф.Пачобута, кс. Т.Юрэвіча, М. Эрэнкрэйца, В.Шумкоўскага, кс. М. Корна, гродзенскага абата. Атрымала з ЦД ВКЛ рэквізіцыю аб заснаванні ў Гродна магазіна з наборам у яго фуражу з кожнага дыма на 30 фунтаў сухароў, на 2 гарцы крупаў, па 8 гарцаў аўса, сена па адным камяні і тое для выніку аддала ў аддзел жыўнасці.Туды ж аддала зварот ЦД ВКЛ адносна пастаўкі фуражу для войска каманды генерала аб.Хлявінскага. Атрымала экспедыцыю НН з патрабаваннем выплаціць суму, наложную на жалаванне корпуса генерала Казаноўскага, таксама на шпікоў і іншыя неадкладныя патрэбы войска, што загадала запісаць у свой пратакол. Звярнулася да экзактара Гродзенскага павета аб.Ланеўскага з тым, каб той, выканаўшы у парадкавай камісіі прысягу на функцыю экзактара, зараз жа прыступіў да дзейнасці. Паўторна звярнулася да аб.Яленскага з загадам прапанаваць генералу аб.Хлявінскаму стрымаць падначаленых пры выбары фуражу ў абываццеляў, а таксама далучыла копію паведамлення ЦД аб.Хлявінскаму адносна фуражу і магазінаў разам з дыспазіцыяй ***(неразборліва—Я.А.)*** да фальваркаў аб фуражы.

Скарбовы аддзел мясцовай камісіі паведаміў на пленуме, што не мае паступленняў на пенсіі з даходаў таргавіцкіх канцылярыстаў і г.д. з прычыны неўнясення падаткаў у публічную касу ў адпаведнасці з тарыфам. Атрымала паведамленне мерацкай камісіі аб уварванні прусакоў у вярбілаўскую камору і захопе там грошаў на некалькі тысяч. Выдала асігнацыю на 3 зл. для пісара з аддзела вайсковых патрэб. Загадала сваёй канцылярыі раздрукаваць інструкцыю для дазорцаў цыркуляў. На мемарыял прадмяшчан грунтовых в.Адамовічы, жадаючых агляду пяці пагарэлых двароў, паслала аб.Гоппу з наказам аблюстраваць гэты выпадак. Прызначыла 30 зл. месячнага жалавання інтэнданту гродзенскага маста з фундуша павятовых ахвераванняў і на тое загадала выдаць асігнацыю.

Юзаф Зялінскі, камісар, старшыня.

Згодна з дзённікам, *Пётр Манюшка*, рэгент парад.кам. Гродз. павета.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л. 460—467.

№ 84. 1 жніўня. Рашэнне гродзенскай камісіі аб секвестры маёнткаў удзельнікаў таргавіцкай канфедэрацыі

Рабілася ў Гродна на сесіі ў ніжнім замку дня 1 жніўня 1794 г.

Парадкавая камісія Гродзенскага павета, будучы на моцы наказаў ННР і ЦД ВКЛ абавязанай вышукваць усякія фундушы, узятыя са скарбу Рэчы Паспалітай асобамі таргавіцкай канфедэрацыі і гродзенскага з'езда, пасля таго, як некаторыя з іх, адпаведна з выдадзенымі камісіяй універсаламі, ужо склалі ўзятыя пенсіі і прэзенты, а іншыя дагэтуль не ўнеслі, то камісія, прыступіўшы да заняцця ў секвестр добраў такіх асобаў і знаходзячы некаторых з іх у сваім павеце без усякіх

пасэсій або трымаючых добры сумесна з родзічамі і няздольных самастойна ўнесці грошы, таму парадкавая камісія мае гонар запытаць у ЦД ВКЛ як паступіць з такімі асобамі. Дата вышэй.

Якуб Гаўсман, камісар, старшыня.

Згодна з пратаколам *П.Манюшка*, рэгент парад. кам. Гродз. павета.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.492.

№ 85. Дыяруш дзейнасці гродзенскай камісіі з 3 да 9 жніўня

Вытрымка з дыяруша штотыднёвых чыннасцяў аддзела забеспячэння парадкавай камісіі Гродзенскага ад дня 3 месяца жніўня да дня 9 таго ж месяца 1794г. у аддзел жыўнасці ЦД ВКЛ.

Дзень 3 жніўня. Пленум пастанавіў аплаціць асігнацыю з правіянцкай касы па мемарыялу стольніка Гродзенскага павета аб.Эйсманта аб аплаце 927 камянёў сена, узятых на гвалтоўныя патрэбы магазіна Верцілішскага ключа. Загадала дазорцу янаўскага аддзела аб.Дзяржынскаму ужыць бліжэйшую воласць для хутчэйшага тушэння палаючых пушчы і лугоў.

Дзень 4 жніўня. Зволіла ад экзекуцыі аб.Палубінскую з маёнтка Бабры за яўку квітоў на аплату пастаўленага правіянту. Гэтак жа вызваліла ад экзекуцыі аб.Ключэўскага з Галякоў за сплатай рэштак правіянту. Да таго ж адказана пісару індурскага магазіна Абухоўскаму на 9 пунктаў ягонага мемарыялу. Таму пісару загадана пад сваім дазорам справадзіць у Гродна сена, пакінутае маскалямі ў ваколіцы Пачобуты, дзеля чаго аддзелу парадку загадана выдаць квіт на 30 фурманак. У правіянцкую касу дадзена асігнацыя на аплату за жнівень месяц 100 зл. усяго закантрактаванага пісарам

індурскага магазіна Абуховічам. Адпраўленаму ў мастоўсі ключ афіцэру загадана абследваць усё, што толькі змешчана ў наказе. Зволены ад экзекуцыі аб.Такаржэўскі за аплатай правіянту з фальварка Кудраўка.

Дзень 5 жніўня. Пісару сакольскага магазіна загадана явіцца ў цяперашні аддзел асабіста з усёй сваёй рэгістратурай, паколькі не мае ад таго пісара ні рапартоў, ні паведамлення аб пабраным у магазін ад абывацеляў. Супрасльскія ксяндзы базыліяне вызвалены ад экзекуцыі за аплату правіянту і фуражу з 277 дымоў і з 6 дымоў у сяле Кузніцы. Затрымана экзекуцыя з дзяржаўцы крынскага ключа аб.Навамейскага за дастаўку належнага правіянту з 231 дымоў. Гэтак жа вызвалены ад экзекуцыі 2 шляхецкія дымы ў ваколіцы Кушняры за здачу рэштак правіянту. Аб.Халецкі з фальв.Лайгаболаў застаецца без экзекуцыі за здачу правіянту з I дыма, а за аддачу належнага правіянту скасавана экзекуцыя 9 дымоў у фальв. Белы Бераг. 42 дымы ў фальварках Цецераўка і Мастаўляны аб.Булгарына вольныя ад экзекуцыі з-за здачы фуражу ў магазін. Паколькі аддзел жыўнасці мае недахоп правіянту і фуражу ў сваіх магазінах з-за няяўкі іх насуперак сваіх наказаў, то ён вымушаны выдаць ротмістру коннай гвардыі аб.Губе квіт на фальв. Зарослаўка паненак бернардынак і Русота, гродзенскага прабошства, для выбары з тых фальваркаў належнага правіянту і фуражу на сваю кампанію.У аддзел парадку ўчынена рэквізіцыя аб квіце на фурманкі пад транспарт магазіна са Скідзеля. Генерал-маёру Гродзенскага павета аб.Казаноўскаму загадана па прадпісанню аддзела парадку камандзіраваць двух жаўнераў для экскарту фурманак.

Дня 6 жніўня. Аб.Ваўкавіцкі з маёнтка Волька зволены ад экзекуцыі за дастаўку ў магазін рэштак правіянту з 51 дымоў. Гэтак жа вольныя 2 шляхецкія дымы з ваколіцы Абуховічы за дастаўку правіянту.

Інтэндант Калінскі запэўнены, што належны у публічны скарб кансумпцыйны падатак з рэзі бydla будзе аплочаны ў правіянцкі магазін у наступным часе. Аб.Вайткевіч вызвалены ад экзекуцыі за дастаўку правіянту з 2 дымоў у ваколіцы Тарасевічы, гэтак жа, як і 6 дымоў у вак.Абуховічы і 8 дымоў у вак.Эйсманты. Атрыманыя ад шляхты мемарыялы запэўнілі пленум, што ваколічная шляхта выйшла на паспалітае рушанне, а пакінутыя жонкі не могуць даставіць правіянт, бо самі без спосабу ўтрымання жыцця. Капітану Дэбоні загадана ўстрымаць сваю экзекуцыю тых ваколіц аж да рэзалюцыі НР. Выданы 2 загады духоўным уладанням і натарыусам, якія не аддалі правіянт па першаму ўніверсалу.

Дзень 7 жніўня. Ад экзекуцыі зволены кс.Ян Карвоўскі за дастаўку па загаду цяперашняга аддзела правіянту з I дыма у фальв.Калубішкі язерскай парафіі.Ян Гакінскі з вак.Эйсманты вызвалены ад экзекуцыі за пастаўку правіянта па патрабаванні. Гэтак жа і аб.Аржахоўскі з фальв. Свяцк зволены. Ад экзекуцыі вызвалены таксама за дастаўку правіянта 145 дымоў аб.Брастоўскай у краснаборскай парафіі і 5 дымоў тутэйшай плебаніі, I5 дымоў харошскіх ксяндзоў дамініканаў. Утрымана экзекуцыя з 1 дыма фальв. Кадыш па задавальненні правіянту. Цяперашні аддзел загадаў унесці ў канцылярскія кнігі аблік прэвальскага магазіна, зроблены тамтэйшым пісарам аб.Адамам Плоцкім. Таму ж аб. Плоцкаму асігнавана 20 польскіх зл. на выплату рэштак дамоўленасці за ліпень месяц. Цяперашні аддзел запісаў у свае кнігі таксу бydla, узятага стольнікам Гродзенскага павета аб.Эйсмантам у рэзнікаў на гвалтоўныя патрэбы магазіна з запэўніваннем, што тая будзе залічана ў праграсію публічных падаткаў.

Дзень 8 жніўня. Цяперашні аддзел выдаў 6 чырвоных 15 грош. і 21 польскіх зл. пад асігнацыю ў правіянцкую

касу на заплату аўса, узятага за рэверсам пісара Бярвінскага з торгу на гвалтоўныя патрэбы. На падставе рэзалюцыі пленума камісіі ад дня 7 гэтага месяца, уся шляхта вак.Станевічы, што выйшла на паспалітае рушанне, вызвалена ад экзекуцыі за непастаўлены правіянт згодна загаду. У адпаведнасці з рэзалюцыяй аддзелаў забеспячэння і вайсковых патрэб, у правіянцкую касу выдана асігнацыя на двудзённае жалаванне (8 і 9 жніўня) палка пікінераў каманды Гінета, або па 12 грош. на асобу ў дзень, а ўсяго 1356 зл. 24 грош. з-за недахопу ў магазіне правіянту ў тыя дні. У адказ на мемарыял мастоўскага прыкагалка з прадстаўленнем квітаў пабранага (у таго) рознымі камандамі правіянту і фуражу, цяперашні аддзел паводле ўніверсала ННР ад 12 чэрвеня мяркуе, што таксацыя ўсяго пазначанага ў квітах у суме 443 зл. 2 грош. будзе прынята ў палову праграсіі публічных падаткаў. У правіянцкую касу пададзена асігнацыя на аплату абумоўленых 40 поль.зл. пісару занемунскага магазіна Багдановічу за жнівень месяц. У правіянцкую касу выдана асігнацыя на аплату 106 зл.20 грош. аб.Бонару за 80 камянёў сена, узятых у магазін па рэверсу пісара Бярвінскага. Выдадзены загад тым парафіям, якія не даставілі належнага правіянту ў адпаведнасці з універсаламі ад 22 мая і 25 чэрвеня разам з прадпісаннем камандам выканаць загаданае.

Дзень 9 жніўня. На мемарыял суддзі і камісара Гродзенскага павета аб.Андрэйковіча з прадастаўленымі квітамі ад розных каманд за узятыя ў войска Рэчы Паспалітай правіянт, фураж і быдла ў адпаведнасці з універсалам ННР ад 12 чэрвеня, цяперашні аддзел адказаў з такой думкай, што суму ў 2 тыс.зл. усяго, ахопленага квітамі, трэба прыняць у палову прагрэсіі публічных падаткаў. На мемарыял ксяндзоў венгерскіх камедулаў з прадастаўленымі квітамі ад розных краёвых каманд за пабраны правіянт, фураж і коней згодна з універсалам НР ад 12 чэрвеня, аддзел даў адказ з

меркаваннем, што ўсю суму ў 2301 зл. 26,5 грош., ахопленую квітамі, належыць залічыць у палову прагрэсіі публічных падаткаў. Асочнікам берштынскага лясніцтва, кватэры яго каралеўскай мосці Бабранскага, адказала, што прадукты, узятыя там стаяўшай камандай генерал-маёра Лідскага павета аб.Сцыпіёнам на правіянт, будуць прыняты на агавораных згодна з універсалам ад 25 ліпеня, а што да скаргі іх на крыўды ад тае каманды і на не вызваленне ад паншчыны, то папершаму зроблены зварот да генерал-маёра, а па другому адасланы да дазорцы таго цыркуля. На мемарыял аб.Старжын-скага разам з квітамі ад розных каманд краёвага войска ўзятай жыўнасці і быдла, аддзел у адпаведнасці з універсалам НР ад 12 чэрвеня адказаў, што ўсё атаксаванае быдла і харч у суме 638 зл. 22,5 грош. будзе прынята ў палове публічных падаткаў. Пісарам магазінаў загадана як мага хутчэй прадставіць спецыфікацыю пабранай жыўнасці на 5-дымовага рэкрута дзеля завяршэння справаздачы. Аддзелу парадку загадана выдаць квіты на 80 фурманак для перавозу магазіна, які зараз закладзены у Саколках.

Дамінік Маткевіч, камісар аддзела харчу, старшыня.

Згодна з дыярушам *Ваўрынец Бронц.*

БПАНК, с. 1090, л. 498—500.

№ 86. Справаздача аддзела харчавання гродзенскай камісіі з 10 да 16 жніўня

Экстракт штотыднёвых чыннасцяў з дыяруша ад дня 10 да дня 16 жніўня 1794 года выпісаны і перасланы з аддзела жыўнасці парадкавай камісіі Гродзенскага павета ў аддзел харчавання ЦД ВКЛ.

Дзень 10 жніўня. Два апрацаваныя даклады аб правіянце і фуражу, непастаўленых згодна з універсаламі дня 22 мая і 23 чэрвеня (адзін — з эканамічных ключоў,

другі — са староствaў) адасланы генерал-маёру разам з загадам разаслаць іх там абывацелям. Абмысліўшы справу аб залеглым правіянце аб.Канстанціна Абуховіча з ваколіцы Абуховічы язерскай парафіі, вызваліла яго ад экзекуцыі за аплату рэштак. Вызваліла аб.Ракоўскага ад экзекуцыі за пастаўку правіянта і фуражу з фальв.Барысаўшчына па выдадзенаму загаду. З дымы у ваколіцы Абуховічы вызвалены ад экзекуцыі за дастаўку правіянту і фуража згодна з прадпісаннем. Аддзел харчу, маючы квіты аб дастаўцы правіянту і фуражу як па універсалу дня 25 ліпеня, так і за квітамі розных каманд ад вілейскага старасты аб.Паца з уладанняў Даспуда і Рэчкі, выказаў думку, што згодна з вышэйцытаваным універсалам НР ад дня 12 чэрвеня справядліва належыць прыняць экзекуцыю забраных прадуктаў у палове прагрэсіі, ці за 2189 польс.зл. з ацэнкі тых квітаў. Утрымана экзекуцыя з 32 дымоў сяла Ражан стала ксяндзоў дамінікан за дастаўку правіянту і фуража.

Дзень 11 жніўня. Абмеркаваны універсал ад (?) ліпеня, які загадвае прынімаць правіянт і фураж у палове прагрэсіі, за якую прадпісвае ўстанавіць дастатковую цану на пленуме камісіі. У адказ на просьбу генерал-маёра Гродзенскага павета аб.Казаноўскага аб пастаўцы фуражу да ягонай праходзячай каманды, загадаў магазінавым пісарам прадастаўляць такі пры набліжэнні каманды ці па квіту або звароту камандуючага афіцэра. Загадаў абывацелям усюды даваць фураж па квітах камандуючага экскортам, які праводзіць маскоўскіх палонных у Гродна, якія будуць прынімацца ў магазінах персанальна. З-за недахопу ў магазінах, выдаў квіт дзяржаўцу каменскага ключа аб.Ахоцкаму, каб для каманды 6-га палка (54 чал. і 60 коней) у экскорце пры генерале Хлявінскім быў штодзённы правіянт і фураж, або ад дня сягоннящняга да дня 18 бягучага 12 фунтаў сухароў сена 136 камянёў і 20

фунтаў. Загадаў пісару гродзенскага магазіна выдаць соль асігнаваную аддзелам вайсковых патрэб. Асігнаваў з правіянцкай касы на 6 дзён належныя 4010 польс.зл.12 грош. для 1696 чал. пікінераў. Звярнуўся да генерал-маёра Гродзенскага павета аб.Казаноўскага аб прыняцці звароту Сейненскай, Пунскай і Віжанскай парафій і пры тым патрабаваў выбрацъ належны правіянт па црад'яўленых адрасах. Аддзел харчу, пераканаы як квітамі ад магазінаў, так і касіраў магазінаў, што з 5 шляхецкіх дымоў у ваколіцы Абуховічы язерскай парафіі, з 2 дымоў астравецкага ключа, з 346 дымоў аб.Адамовіча ў гоцкай парафіі правіянт у магазін дастаўлены поўнасцю, зволіў тых ад наспеўшай экзекуцыі.

Дзень 12 жніўня. Аддзел харчу вызваліў фальварак Ясенева ад экзекуцыі, пераканаўшыся з мемарыяла аб.Седніка, што ён не можа даставіць у магазін нічога, што выдадзена пасланымі для люстрацыі камісарамі. Той жа аддзел вырашыў саступіць адміністратару зканамічных ключоў, аб.Любастанскаму, які з-за змены мінулага пасэсара яшчэ не можа выканаць распараджэнняў па выдадзеных квітанцыях. Загадаў пісарам галынскага, індурскага, сакольскага і крынскага магазінаў, каб усе аздобы, якія толькі маюцца ў магазінах, таксама грошы за правіянт, як мага хутчэй транспартавалі ў гродзенскі магазін на фурманках, па дамове з мястэчкамі і фальваркамі. Цяперашні аддзел выдаў належны харч на маршрут 86 чал.з лазарэта да абозу першай каманды генерал-лейтэнанта ВКЛ аб.Хлявінскага. На мемарыял скарбовых афіцыялістаў, якія узгадваюць пра заплату за перамер гарэлкі, адказаў, што паколькі гарэлка пастаўлена абаронцам краю перамераная, то і не захочуць дамагацца заплаты за перамер яе і з надзеі на стараннае імкненне сваіх абаронцаў засланіць яго ад непрыяцеляў сваімі грудзьмі.

Цяжерашні аддзел вызваліў ад экзекуцыі Францішка Стэцкага з квасаўскай парафіі, 7 дымоў аб.Кахціцкага ў ваколіцы Хлістанічы за дастаўлены у магазін правіянт. Цяперашні аддзел мяркуе, што пабраныя ў добрах Эльяшэвічы аб.Забелавай і адданыя за квітамі розных каманд да абозу аб.Хлявінскага розныя матэрыі, трэба прыняць да экзекуцыі ў палове праграсіі на суму 23 поль. зл. 10 грош. Да гэтага ж. Падаў думку аб экзекуцыі на суму ў 381 поль. зл. 14 гр. за матэрыі пабранага ў курняльскім ключы аб.Драгоўскага за квітамі розных каманд. Сюды ж. Аб.Старжынскі атрымаў дазвол на экзекуцыю 602 поль.зл. 22,5 гр., пабраных з фальв.Губінкі і Смоганаўшчына і прадстаўленых за квітамі розных каманд у цяперашні аддзел. Кс.Радзішэўскі з рачкоўскай плебаніі атрымаў сатысфакцыю на 60 поль.зл. за дастаўку правіянту ў галынскі магазін згодна з універсалам ад 25 ліпеня. Аддзел харчу згадзіўся на экзекуцыю для янаўскага плябана кс.Глінскага за дастаўлены у галынскі магазін правіянт.

Дзень 13 жніўня. Аддзел харчу засведчыў скарбоваму аддзелу, што асігнаваныя 4 тыс.зл. залічаны ў правіянцкую касу. Той жа аддзел, згодна з рэзалюцыяй пленума камісіі Гродзенскага павета, заручыўся не зносіць экзекуцыі з аб.Дымінскай, жывучай у вакол.Панятовічы, за недастаўку правіянту і фуража. Цяперашні аддзел выдаў заручэнне ваколічнай шляхце Цесікаў, Паляновіч, Сецяневіч, Попкаў і Талочкі, што ўстрымае экзекуцыю да часу прызначанай пастаўкі правіянту. Абавязаў палкоўніка пікінераў Гінета прызначыць 4-х пікінераў для пасьбы магазінавага быдла замест менш здатных пастухоў, якіх аддзел харчу мог бы утрымліваць. Той жа аддзел на мемарыял квасаўскага эканома аб.Грабоўскага аб звальненні ад пастаўкі правіянту 79 дымоў, толькі што адлучаных з эканоміі, пастанавіў, што адлучаныя 79 дымоў падлягаюць пабору ў адпаведнасці з выкананым

тарыфам люстрацыі. Аддзел харчу вызваліў ад экзекуцыі за дастаўку правіянта ў магазін 5 дымоў ваколічнай шляхты ў Абуховічах, 3 дымы ў Бульчыцах, 8 дымоў у Цыдзіках, 3 двары ў Вялікіх Эйсмантах, 1 двор у Каралёве язерскай парафіі, двор аб.Самуэля Раманоўскага ў фальв. Дзям'янаўка індурскай парафіі.

Дзень 14 жніўня. Аддзел жыўнасці, перакананы мемарыялам, што аб.Пянкоўская не можа даставіць не толькі замоўленых у магазін патрэбаў, аб чым робіцца люстрацыя дэлягаванымі камісарамі, але і належнага правіянту згодна з універсаламі, то пастанавіў адступіцца ад далейшага выканання экзекуцыі. Цяперашні аддзел зволіў ад экзекуцыі дазорцу аб.Равінскага за такі выпадак, як хуткая дастаўка ў магазін дабраахвотнага ахвеавання ў выглядзе 2 кароў, 3 падцёлак. Выдаў дазорцу кс.Пузыне пасведчанне, што ўсякія забраныя войскам прадукты будуць залічаны ў палову прагрэсіі прадстаўленых квітаў. Асігнаваў у правіянцкую касу 154 поль.зл. 4 гр., якія касір Вінскі павінен выплаціць па квіту аб.Бонараву за 256 камянёў і 36 фунтаў сена.

Аддзел жыўнасці знайшоў, што па розных выдадзеных камандамі квітах, ксяндзам францышканам чарлёнскім належыць 96 поль.зл. Паненкі гродзенскія бернардынкі на прынесеныя 10 квітаў аб забраных камандамі Рэчы Паспалітай рэчах у фальв. Заслаўка атрымалі сатысфакцыю ў 448 поль. зл. Абывацель Завадскі за забраныя розныя рэчы ў янаўскім і астроўскім ключах па квітах ад розных каманд атрымаў у аддзеле жыўнасці сатысфакцыі на 1892 поль.зл. Па данясеннях вызвалены ад экзекуцыі 123 дымы з каменскага ключа ў дзяржаве аб.Сахоцкага, 4 дымы аб.Ігнатовіча ў фальв. Гоцк, 6 дымоў аб.Шабуневіча ў фальв. Козеў, 3 дымы шляхты у ваколіцы Бульчыцы, 72 дымы у фальв. Янішкі аб.Міхайлоўскага, 154 дымоў у добрах аб.Валовіча, 6 дымоў аб.Былеўскага у фальв. Узнаш.

Дзень 15 жніўня. Паколькі ў адпаведнасці з мінулымі універсаламі аб паборах правіянт атрыманы, як сведчаць прадстаўленыя квіты, то аддзел харчу вызваліў ад экзекуцыі 2 дымы з фальв. Няроўны аб.Варанецкай, дым у вакол. Быльчыцы, 20 шляхецкіх дымоў у вак.Абуховічы *(неразборліва—Я.А.)* дымоў у фальв. Белае Балота аб.Мароза, 3 дымы аб. Дарэўскага ў фальв. Няроўны. Загадаў запісаць у кнігі сваёй канцылярыі пасведчанне маёра 5-га пяхотнага палка ВКЛ аб.Ціхановіча аб дастаўцы солі ў гродзенскі магазін, падпісанае пісарам гродз.магазіна аб.Бярвінскім. Звярнуўся да начальства двара сакольскіх ключоў за вызначэннем месца пад патрэбы магазіна.

Дзень 16 жніўня. Аддзел жыўнасці выдаў пaборцу 5-дымовага рэкрута аб.Яну Макоўскаму пасведчанне ў тым, што пасля поўнага разліку квітоў упраўляючага вынайдзены лішак, а таму кніжка была вернутая, а належачыя паперы былі прынятыя у канцылярыю.У сувязі з дастаўкай правіянту ў магазін, аддзел зволіў ад экзекуцыі цалкам дым у фальв. Бабры аб.Пятра Камінскага, *(неразборліва—Я.А.)* у фальв.Дабосна. Цяперашні аддзел загадаў занесці ў кнігі сваёй канцылярыі квіты абывацеляў, пакладзеныя за дастаўку правіянту і фуража адпаведна з універсалам ад 25 ліпеня, пад зарукай, што яны будуць залічаны у палову прагрэсіі. Ксяндзы дамінікане клімаўскага закону атрымалі сатысфакцыі на 138 зл. па 2-х квітах афіцэраў Рэчы Паспалітай. Аддзел папрасіў ксяндзоў венгерскіх кармелітаў і начальства фальв.Пралейкі дазволіць памясціць у фальварках начынне галынскага магазіна.

Дамінік Маткевіч, камісар аддзела жыўнасці павета.

Узята згодна з кнігамі і дыярушам *Мацвей Бронц.*

БПАНК, с.1090, л.481—484.

№ 87. Рапарт гродзенскай камісіі аб пленарнай дзейнасці з 4 да 17 жніўня

Рапарт тыднёвы штодзённых чыннасцяў парадкавай камісіі Гродзенскага павета ад дня 10 месяца жніўня да дня 17 бягучага, адрасаваны у ЦД ВКЛ.

1794 года дня 4 жніўня. Парадкавая камісія пад старшынствам гродскага суддзі аб.Тадэвуша Андрэйковіча пачала сесію ў прысутнасці камісараў аб.ксяндза Корна, кс.Свяжынскага, кс.Віслоцкага, Сакалоўскага, Гансеўскага, Яснеўскага, Эрэнкрэйца, Зялінскага, Мацкевіча, Мучынскага, Гоувальта, Канопкі, кс. Тадэвуша Юрэвіча. Атрымаўшы зварот бельскай камісіі аб заснаванні крэсаў у Заблудаўшчыне і добрах супрасльскіх ксяндзоў-базыльянаў, загадала свайму аддзелу парадна задаволіць той зварот. Атрымала данясенне літоўскага падкаморага аб. Паўла Булгарына аб чыннасцях яго каманды з маскоўскім войскам і для таго, каб слаўныя дзеянні каманды сталі вядомымі ў наступныя часы, загадала занесці іх у пратаколы сваёй канцылярыі. Аддала ў свой аддзел бяспекі данясенне мерацкай камісіі аб абаротах маскоўскага войска і назіранні аранскага поштмайстра Керсноўскага. Дазволіла камісару кс.Юзафу Свяжынскаму адлучыцца па тэрміновых інтарэсах на 3 дні з Гродна да сваей карыцінскай плебаніі.

Да таго ж сесія папалудні. Парадкавая камісія пад старшнствам аб.Тадэвуша Андрэйковіча пачала сесію ў прысутнасці камісараў аб. кс.Т.Віслоцкага, абата супрасльскага, кс.Т.Юрэвіча, кс.Мацея Корна, Фраціпка Гансеўскага, Юзафа Зялінскага, Яна Канопкі, Францішка Мучынскага, Феліцыяна Адланіцкага Пачобута, Яна Ясінскага. Адказала аб. П.Булгарыну на ягоны рапарт камісіі аб сутычках пад Слонімам і рашыла запісаць у кнігу славы імёны вылучных асоб з яго каманды. На зварот аб.Карозінскай, якая просіць аб звальненні платы

за 2 гады адказала, што запісаны у тарыфе дым не можа быць вызвалены ад платы без новай на тое люстрацыі.

Сесія ранняя дня 11 месяца жнiўня. Парадкавая камісія пад старшынствам Т.Андрэйковіча пачала сесію ў прысутнасці камісараў аб. кс.Т.Віслоцкага, супрасльскага абата, Фр.Мучынскага, Ю.Зялінскага, Я.Ясінскага, Міхаіла Эрэнкрэйца, Ф.Пачобута, Д.Мацкевіча, Я.Канопкі, Я.Сакалоўскага. Камісія атрымала экспедыцыю НН у якой ён даносіць аб адрасаваным аб.Ясінскаму даручэнні асцерагацца находу непрыяцеля ў краі Рэчы Паспалітай, а таксама загадвае камісіі падпарадкоўвацца распараджэнням аб.Ясінскага.Тую экспедыцыю зложыла ў сваёй канцы-лярыі. Атрымала з аддзелу парадка ЦД напамін аб выкананні ўніверсала ЦД аб дастаўцы брычак, які аддала ў свой аддзел парадку. Ухваліла меркаванне свайго аддзела вайсковых патрэб аб дызерцірах. Выдала інструкцыю з 8 пунктаў аб.Абрамовічу, суправаджаючаму касцельнае срэбра да Варшавы. Выправіла да Варшавы са срэбрам абываселя Казіміра Абрамовіча, з якім данесла ў скарбовы аддзел ННР, што з Гродзенскага павета срэбра ў 7 скрынях, золата ацэнена ў 230 чырвоных галандскіх, 14 флорынтаў за 6,16 флор.за 48 зл., срэбра рознай пробы1941 грывен і 5 лотаў. Згодна з двума рэестрамі, срэбра з Ваўкавыскага павета не аддадзена, але апячатана пячаткамі таго павета.

З Лідскага павета срэбра ў адной скрыні не адпраўлена, апячатана пячаткамі таго павета. Срэбра з ахвераваннаў 84 грыўны, за якія камісія папрасіла той скарбовы аддзел ННР вярнуць не менш 600 зл. за дарогу Абрамовічу, а рэштак аплаціць належны фурманам кантракт. Выдала аб.Абрамовічу асігнацыю на 600 зл. на транспарт срэбра касцёлаў да Варшавы з абавязкам атрымаць такую суму з скарбовага аддзела ННР. На

мемарыял аб.Тэрэзы Гутковай адказала, што ахвотнікі ў войску Рэчы Паспалітай ніякімі ўніверсаламі не вызвалены ад дачы фурманак і падаткаў, а таму скаржніца мусіць падпарадкоўвацца прадпісанням універсалаў. Звярнулася ў ННР і ЦД з адным артыкулам жадання аб узгадненні процілеглых дыспазіцыях тых уладаў і з просьбай аб правілах для наступных учынкаў. У адказ на мемарыял кузніцкіх мяшчан адаслала іх скаргу на дзяржаўцу за плёнам у віцэ-адміністрацыю. На мемарыял аб.Казаноўскага са скаргай на непаслушэнства мяшчан двару адказала ў адпаведнасці з думкай ад 18 ліпеня ў віцэ-адміністрацыю і абяцала звярнуцца ў ННР з такім гатункам спраў.

Да гэтага ж, сесія папалудні. Парадкавая камісія пад старшынствам Т.Андрэйковіча пачала сесію ў прысутнасці камісараў аб. кс.Т.Вíслоцкага, абата супрасльскага, кс.Мацея Корна, абата гродзенскага, Францішкі Адланіцкага Пачобута, Я.Ясінскага, Ф.Мучынскага, Я.Канопкі, Дамініка Мацкевіча. Праз тытунёвага пісара аб.Міхальскага атрымала з скарбовага аддзела ННР 134 тыс.зл. з загадам адаслаць тую суму з усякаю асцярожнасцю да ЦД або камандуючага генерала, узяўшы за тое квіты, аб чым хутка паведамляе ў скарбовы аддзел ННР. Парадкавая камісія, атрымаўшы заяву за подпісам пастаўленага ў Саколках дазорцы, якая цалкам выкрывае гвалты згаданай калоны на райгародскага старасту аб.Рыдзеўскага, загадала свайму аддзелу бяспекі запісаць у пратакол чыннасцяў таго аддзела абазначаны вынік усёй акцыі паміж прусакамі, пікінерамі і паспалітым рушаннем у Райгорадзе для ўчынення сатысфакцыі аб.Рыдзеўскаму, жадаючаму атрымаць выпіс данясення сакольскага дазорцы з пратакола чыннасцяў аддзела бяспекі нашай камісіі.

Вобыск аб.Гушчы аб акалічнасцях выпаўшага ў в.Бліндах градабою падала ў сваю канцылярыю для адозвы той вёсцы. Аддала на захаванне сваёй камісіі сведчанні выкананай прысягі на дазорства цыркуля, складзенага з рачкоўскай, бакалажаўскай, янавіцкай і філіпаўскай парафій, абываценяў кс.Паўла Рыдзеўскага і аб.Юзафа Гушчы. Камісія аддала на захаванне сваёй канцылярыі сведчанне прысягі, выкананай на дазорства цыркуля дубраўскай парафіі, прынесенай дубраўскім падпробашчам, абываценем кс.Пажароўскім абываценю Яну Казлоўскаму.

Сесія дня 12 жніўня, ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Т.Андрэйковіча пачала сваю сесію ў прысутнасці камісараў аб.кс. Т.Віслоцкага, абата супрасльскага, кс.Т.Юрэвіча, Дамініка Свяжынскага, Францішка Гансеўскага, Юзафа Зялінскага, Міхаіла Эрэнкрэйца, Я.Ясінскага, Ф.А.Пачобута. Атрымала з аддзелу парадку ННР і зламжыла ў сваёй канцылярыі ўрадавыя газеты пад № 36—38. Аддала ў свой скарбовы аддзел за сатысфакцыяй зварот генерала Вяльгорскага, каб з усяе сумы, пасланай у НР, сабе пакінуць 61 поль.зл., а астатнія 73 тыс.зл. аддаць у Вільна вайсковаму касіру аб.Корсаку і ад таго атрымаць квіт. З аддзела вайсковых патрэб ННР атрымала рэзалюцыю аб атрыманым у Варшаве транспарце сукна з Гродзенскай фабрыкі ў наступных пунктах. 1.Прыспешыць належны да кантракта транспарт. 2. Хутчэй даць з гродзенскай мануфактуры паводле пробы і кандыцый наяўнае і гатовае сукно. 3. Што да адпраўкі скур, то калі б яны былі па высокай цане, малой вагі, нязгоднай з тутэйшай, то скарбовы аддзел ННР забараняе іх транспарціроўку. 4. Што да закантрактаванага з Гродзенскай фабрыкі сукна, то аддзел вайсковых патрэб не праміне выстарацца ў скарбовым аддзеле ННР наступны уклад, падобна з папярэднім. 5. Сам НН запэўняе, што мадэлі кажухоў

нарадовага войска будуць прысланыя парадкавым камісіям. 6. Паколькі ў сваёй дзейнасці склад Гродзенскай парадкавай камісіі асабліва дбае аб публічным дабры, то аддзел вайсковых патрэб ННР урачыста абяцае прыняць згаданыя пункты камісіяй. Такую рэквізіцыю адаслала ў свой аддзел вайсковых патрэб. Атрымала і аддала ў свой аддзел бяспекі загад аддзела парадку ННР ад 7 жніўня 1794 г. аб забароне друку лістоў парадкавых камісій .

Атрымала пісьмовае паведамленне аб прыняцці стольнікам аб.Барэцкім абавязкаў дазорцы, якое аддала ў сваю канцылярыю. Атрымала і адаслала ў свой аддзел парадку устанаўленне скарбовым білетам ННР, а у сваёй канцылярыі пакінула экзэмпляр аблігацыі для разсылкі па павету паведамлення абывацелям. Аддала ў свой аддзел вайсковых патрэб пісьмовае данясенне крынскага дазорцы Пятра Шумінскага аб дэзерцірах, а таксама аб.Абрамовіча пра карабіны, узятыя па загаду аддзела вайсковых патрэб нашай камісіі. Атрымала ноту абывацелкі Пузынавай са скаргай на аб.Куяўскага, якую разам з тлумачэннем таго ж Куяўскага і іншым суправаджэннем адаслала за меркаваннем у свой аддзел справядлівасці. Атрымала рапарт дазорцы адэльскага цыркуля аб пастаўленых на станцыях крэсах згодна з вызначэннем універсала аддзела парадку нашай камісіі і пры тым рапарце скаргу на адэльскіх мяшчан у розных пазіцыях на адной паперы. Таму, зрабіўшы копіі, адзін экземпляр таго ж рапарта рашыла памясціць у сваёй канцылярыі, а другую загадала аддаць у свой аддзел парадку. Дэлягавала аб.Ежы Ліпніцкага з аб.Янам Ясінскім на высвятленне скаргі адэльскіх мяшчан супраць дзяржаўцы адэльскага ключа і, ўзаемна, супраць дазорцы адэльскага цыркуля, дзеля чаго аддала дэлегатам служачыя паперы, менавіта два мемарыялы адэльскіх мяшчан, скаргу дазорцы на адэльскіх мяшчан і скаргу дзяржаўцы на тых жа мяшчан.

Па хадайнщтву генерала аб.Вяльгорскага камісія праз аб.Хлявінскага адаслала атрыманыя з скарбовага аддзелу ННР 134 тыс.зл. у віленскую вайсковую касу з умовай атрымання квіта ад вайсковага касіра Корсака на гэтую колькасць і паведамлення аб тым у ЦД. Камісія аддала на захаванне сваёй канцылярыі прысягу на функцыю дазорцы аб.Маеўскага, выкананую па сведчанню кс.Палякоўскага ў касцёле янаўскай парафіі. Асігнавала 300 зл. аб.Хлявінскаму пад звоз грошаў да Вільна. Прыняла думку свайго аддзела справядлівасці па справе бакалажаўскіх мяшчан з аб.Хлявінскім, ухваліўшы меркаванне дазорцы аб. Гушчы аб пагадненні паміж спамянутымі бакамі.

Да гэтага ж, сесія папалудні. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Т.Андрэйковіча пачала сесію ў прысутнасці камісараў аб.кс.Т. Віслоцкага, супрасльскага абата, гродзенскага абата кс.М.Корна, Юзафа Зялінскага, кс.Т.Юрэвіча, Я.Канопкі, Фр.Гансеўскага, Фр.Адланіцкага Пачобута, Д.Маткевіча. Атрыманы ліст ад генерала Сцыпіёна ад 11 бягучага з-пад Берштаў з данясеннем звестак аб знаходжанні Масквы у розных месцах. Ад аб.Сцыпіёна атрымала адказ з выражэннем падзякі за атрыманы дазвол аддзела жыўнасці на пабор фуражу. Па прадстаўленню свайго аддзела вайсковых патрэб асігнавала на аплату генералу аб. Казаноўскаму наступны разлік: на трохмесячнае жалаванне 302 зл. 9 грош., на шпікоў 400 зл., на 12 чал. як прыбылых, так і для аплаты ім паказаных, таварышаў 360 зл., на шаранговых 14 чал.- 210 зл., усяго 1272 зл.9 гр., якія загадала выплаціць свайму скарбоваму аддзелу.

Адаслала ў свой аддзел бяспекі рапарт інтэнданта калетніцкай парафіі Шаумана аб яго няспынных намаганнях у пошуку схаваных у пушчы стральцоў. Мемарыял пагарэлай шляхты з ваколіцы Казловічы са скаргай на экзекуцыю за непастаўлены фураж адаслала за выніковай сатысфакцыяй у свой аддзел жыўнасці.

Абавязала сакратара свайго аддзела парадку, аб.Вінцэнта Садлуцкага, забраць грошы у тых абываценяў, якія абавязаны дадаваць грашовую квоту да брычак, але толькі да часу вызначанага ўніверсалам, пасля якога загадала аб.Садлуцкаму рапартаваць у камісію пра лагодныя адносіны з абывацелямі. Атрымала тлумачэнне дырэкцыі гродзенскай фабрыкі на сваю рэквізіцыю аб звароце звезеных у Варшаву 2634 чырвоных 15 гр., якое адаслала ў свой аддзел вайсковых патрэб з гэтай перасылкі ў аддзел вайск.патрэб ННР. Мемарыял аб.Валовіча, жадаючага звароту 600 зл.за 25 рэкрутаў, разам з двума квітамі аб.Мальчэўскага адаслала за вынікам у свой скарбовы аддзел.

Сесія ранняя дня 13 жніўня. Парадкавая камісія пад старшынствам Т.Андрэйковіча пачала сесію ў прысутнасці абываценяў камісараў кс. Т.Віслоцкага, супрасльскага абата.кс.М.Корна, абата гродзенскага, кс. Т.Юрэвіча, Д.Мацкевіча, Фр.Адланіцкага Пачобута, Я.Канопкі. Экстракт аб следстве ў аддзеле справядлівасці над скаргай крынскіх мяшчан адаслала за сатысфакцыяй да таго ж аддзелу. Рапарт пісара сакольскага магазіна Мацвея Антановіча на зварот аддзела жыўнасці адаслала да таго ж аддзела. На ноту эканома добраў Гарбачы Караля Венярскага, жадаючага імем свайго мецэната прадоўжыць да восені час для ўнясення публічных падаткаў, адказала, што не мае моцы нічым спрыяць такому жаданню, а таму не можа расцягнуць час для здачы публічных падаткаў. На запыт аб.Бухавецкага адносна належнай здачы дадатковых грошаў за брычкі адказала, што аб.Бухавецкаму трэба звярнуцца за сатысфакцыяй свайго жадання да аб.Вінцэнта Садлуцкага, назначанага разабрацца з тым аб'ектам. Скаргу аб.Антона Талочкі на захоп аб.Паўлам Старжынскім апошняй нівы і зямель адаслала на следства свайго аддзела бяспекі. На жаданне аб.Дымінскай вызваліцца ад дачы з яе дыма падаткаў і фуражу,

камісія адказала, што не можа задаволіць такому імкненню, паколькі абавязана ў цэлым выконваць усе ўніверсалы, выдадзеныя з гэтай мэты, а што да здачы фуражу, то адаслала ў свой аддзел харчу. Дала рэзалюцыю на кожны пункт рапарта дазорцы 3-га цыркуля аб.Гансеўскага: 1.Што па скарзе на ліпскіх мяшчан камісія затрымлівае дакрэт дазорцы да часу атрымання адозвы ці рэзалюцыі ННР у той акалічнасці. 2. Што да збеглых 8 дызерціраў, якія па вёсках у сховах, то тое адаслала ў свой аддзел вайсковых патрэб. 3. Што да памяшчэння пісара жытніцы. 4. Што да жадання дасылаць універсалы ў першую чаргу дазорцам, паколькі плябаны менш чулыя на падобныя прадпісанні, а таму ўрадавыя ўставы вельмі позна даходзяць да ведама абывацеляў — гэта адаслала ў свой аддзел парадку.

Абавязала абываценя кс.Т.Юрэвіча напісаць адозву да ННР адносна магдэбургскіх і не магдэбургскіх каралеўскіх месцаў, якія адмаўляюцца выконваць існуючыя звычайныя павіннасці. Адаслала за меркаваннем свайго аддзела справядлівасці скаргу ліпскага прыкагалка, які пацярпеў уціск ад таго месца Ліпска. На падставе меркавання свайго аддзела вайсковых патрэб, камісія дазволіла таму ж аддзелу узяць жалеза 100 цэнтнераў з жалезнага складу літоўскага канцлера аб.Храптовіча па абумоўленай цане і з належным дазорам над тым складам.У адказ на мемарыял княгіні Любецкай са скаргай на непаслухмянасць і іншыя бясчынствы мяшчан віжанскіх і сяйвейскіх, абавязала дазорцаў з'ехацца да належных да іх месцаў, апісаць занесеныя на спамянутых мяшчан скаргі і найхутчэй паведаміць камісіі, дзеля чаго загадала сваёй канцыляры адаслаць дазорцам мемарыял абываценкі княгіні Любецкай. Дала рэзалюцыю на мемарыял аб.Пузыны са скаргай на дазорцу Куяўскага.

Сесія папалудні дня 13 жніўня. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Т.Андрэйковіча пачала сесію ў

прысутнасці камісараў аб.супрасльскага абата кс.Т.Віслоцкага, гродзенскага абата кс.М.Корна, кс.Т.Юрэвіча, Фр.Гансеўскага, Фр.Мучынскага, Яна Сакалоўскага, Д.Маткевіча, Я.Канопкі, Ю.Зялінскага, Ф.А.Пачобута. Атрымала пасведчанне заблудаўскага плябана кс.Яна Пілкевіча выкананай у касцёле заблудаўскай парафіі прысягі аб.Геранімам Барэцкім на пасад дазорцы, якое аддала ў сваю канцылярыю. Атрымала змястоўна складзены рапарт дазорцы заблудаўскага цыркуля, а таксама значныя пратаколы, патрэбныя для рэгулярнасці ў дзейнасці дазорцы цыркуля. На што камісія пастанавіла адпісаць аб.Барэцкаму сведчанне падзякі за гэтак регулярную дзейнасць у сваіх чыннасцях і такі рапарт адаслала ў сваю канцылярыю. Камісія атрымала прынесеную з аддзела парадку інструкцыю з 29 пунктаў, складзеную для *(неразборліва — Я.А.)*, наглядальніка над брычкамі і прыстаўленымі да іх коньмі, якую загадала выканаць аддзелу парадку. Пасля чытання адаслала ў аддзел справядлівасці рапарт чыннасцяў дазорцы гродзенскага цыркуля аб.Адама Эйсманта. Мемарыял аб. Грабоўскага са скаргай на данос за непастаўку фуражу з адлучоных ад пасэсарскай улады 63 дымоў адаслала за вынікам у аддзел харчу.

Сесія ў ранак дня 14 жніўня. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Т.Андрэйковіча пачала сесію ў прысутнасці камісараў аб.супрасльскага абата кс.Т.Віслоцкага, гродзенскага абата кс.М.Корна, Фр.Гансеўскага, Д.Маткевіча, Ю.Зялінскага, кс.Т.Юрэвіча, М.Эрэнкрэйца, Ф.А.Пачобута. Атрымала пісьмовае данясенне дазорцы мастоўскага ключа аб непрыяцельскіх абаротах пад Дзявяткамі. Камісія, схіліўшыся да жадання абываценкі Пянкоўскай, падаўшай у мемарыяле просьбу вызваліць яе ад дачы фуражу і выканання іншых цяжараў з-за поўнага знішчэння фальварка прускімі войскамі, загадала аддзелу жыўнасці

не спаганяць з абываделкі Пянкоўскай фураж. Атрымала і аддала ў сваю канцылярыю сведчанне кс.Эйсманта аб выкананай аб.Лявонам Камінскім прысяге на пасад дазорцы 13-га цыркуля эйсмантоўскай парафіі. Атрымала і аддала сваей канцылярыі рапарт дазорцы 13-га цыркуля эйсмантоўскай парафіі. Атрымала ліст інтэнданта яленеўскай парафіі з пералікам схопленых дызерціраў, якія адасланы у камісію, менавіта — Паўла Камароўскага, Паўла Размыстоўскага. Такі ліст аддадзены у аддзел вайсковых патрэб. У аддзел вайсковых патрэб адасланы рапарт дазорцы краснаполаўскай парафіі Равінскага аб схопленым дызерціры Гязендзе, са стральцоў Сахоцкага. Мемарыял аб.Брыгіды Карвоўскай, якая з-за выхаду мужа ў паспалітае рушанне просіць вызваліць яе ад эканамічнай платы і здачы фуражу, адаслала за выніковай сатысфакцыяй у аддзел харчу. Памясціла ў сваю канцылярыю рапарт аб.Ксаверыя Крывіцкага, дэлягаванага апісаць выпадак пажару ў месцы Заблудаў. На мемарыял заблудаўскіх мяшчан адказала, што выкананую аб.Крывіцкім люстрацыю здарэнняў з-за перуновага агню і іншых страт як у месцы, так і па вёсках, адсылае на нагляд ЦД ВКЛ.

На мемарыял аб.Бухавецкага і Ключэўскага, пададзены з адной мэтай увільнуць ад загаданага рамонту грэблі, камісія адказала, што згаданы рамонт можа быць прыпынены да наступнай пары, аднак загадала, каб вышэй памянутыя абываделі імкнуліся як мага хутчэй паставіць новы мост на р.Бабры. Рапарт дазорцы калітніцкай парафіі Шаумана аб дызерцірах аддала аддзелу вайсковых патрэб. Атрымала з скарбовага аддзелу ННР прадпісанне, каб прысланыя бельскай камісіяй 66 тыс.зл. былі перавезены у Вільна бяспечным трактам. Па думцы аддзела вайсковых патрэб пастанавіла выплаціць на розныя патрэбы войска 10 тыс.зл. у поўным разліку. Паведаміла прысутнаму

ў Гродна літоўскаму ўпаўнаважанаму аб рашэнні скарбовага аддзела ННР прысланьь 60 тыс. зл. і прадставіла экспедыцыю таго аддзела ў ЦД. Упаўнаважаны аб.Коцел параіў камісіі ўсё тое затрымаць у Гродна, што камісія і прыняла з погляду на Вільна. З-за віленскіх абставін камісія выслала аб. Хлявінскаму указ аб вяртанні яго ў Гродна з Аліты з грашыма.

Да таго ж, сесія апоўдні. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Т.Андрэйковіча пачала сесію ў прысутнасці абываценяў камісараў супрасльскага абата кс.Т.Віслоцкага, кс.Т.Юрэвіча, гродзенскага абата кс.М.Корна, Я.Канопкі, Я.Сакалоўскага, М.Эрэнкрэйца, Ф.А.Пачобута, Ю.Зялінскага. Загадала сваёй канцылярыі захаваць сведчанне генерала і аб.Казаноўскага аб выплаце публічнага падатку з добраў Заблудава не гледзячы на пажар памянутых добраў. Аддала ў аддзел вайсковых патрэб мемарыял селяніна шаберскага ключа Якуба Навумовіча, жадаючага вызваліць свайго сына ад узяцця ў войска. Адаслала ў аддзел бяспекі багаж безпашпартнага валацугі, прысланы дазорцам рачкаўскага цыркуля Юзафам Гушчам. У адказ на мемарыял Юзафа Сінілы і Андрэя Благашэўскага, якія просяць вызваліць іх ад публічных плат за палову зямяншчыны валодаемай імі зямлі па прычыне здачы згаданымі сялянамі, у войска Рэчы Паспалітай поўнасцю экіпіраваных людзей, камісія прызнала, што паколькі спамянутае ахвераванне запісана ў кнізе падзяк, то яна не ў моцы зрабіць большае, а тое жаданне сялян адаслала ў віцэ-адміністрацыю для умеркавання зямяншчыны згодна з іх намерам.

Адказала на мемарыял селяніна Цеўля з янаўскай губерні яго каралеўскай мосці. Выслала кур'ера да аб.Хлявінскага для павароту яго крэсамі ў Коўна, а па сіле прысланага генералам аб.Вяльгорскім указа аддаць грошы праз гродзенскага падстарасту аб.Боўфала касіру Корсаку. У выпадку ж адсутнасці яго ў Коўна —

ковенскай парадкавай камісіі у адказ на мемарыял гродзенскага кагала дазволіла даць на той час належную з жыдоўскага гміну складку для забеспячэння фурманаў з абавязкам здачы рахунку такой складкі на нумары брычак у камісію. Данесла бельскай камісіі і ННР аб заняцці Вільна непрыяцельскім войскам. Па загаду генерала аб.Вяльгорскага і на моцы перасланага бельскай камісіяй указу скарбовага аддзела ННР, загадала скарбоваму аддзелу выплаціць 66 тыс.зл. па квіту маёра коннай гвардыі аб.Міхалчэўскага. Па ўказу генерала аб.Вяльгорскага загадала аддзелу жыўнасці паставіць у Гродна 300 фурманак, або 100 пад лазарэт, 100 для палка аб.Казаноўскага, 100 пад розныя вайсковыя рэквізіты і акты камісіі.

Сесія дня 15 жніўня. Парадкавая камісія пад старшынствам Т.Андрэйковіча пачала сесію ў прысутнасці абываценляў камісараў супрасльскага абата кс.Т.Вісլоцкага, кс.Т.Юрэвіча, Ю.Зялінскага, Гансеўскага, Канопкі, Ясінскага, Сакалоўскага, Гаусмана, Эрэнкрэйца. Паведаміла ў ЦД, што прывезеныя з Бельска 66 тыс.зл. выданы па ўказу прысутнага ў Гродна генерала камандуючага аб.Вяльгорскага на калону генерал-лейтэнанта Макраноўскага і пры там далучыла экспедыцыю, якую атрымала са скарбовага аддзела ННР. Па меркаванню аддзела парадку камісія загадала скарбоваму аддзелу выплаціць 36 поль.зл. за брычку пад вываз грошаў да калоны генерала аб.Макраноўскага і за 6 брычак, патрэбных канцылярыі, з дадаткам асігнацыі 22 зл. на паклажу. Атрымаўшы гэтым днём пад самы вечар загад генерала камандуючага аб.Вяльгорскага вывезці ўсе, якія толькі маюцца, грошы у Коўна па квіту генеральнага вайсковага касіра аб.Корсака, камісія позняй парой занялася тым транспартам і назначыла сесію наступнага па парадку дня на 8 гадзін раніцы.

Дня 16 месяца жніўня. Сесія ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Т.Андрэйковіча пачала сесію ў прысутнасці абываццеляў камісараў супрасльскага абата кс.Т.Віслоцкага, гродзенскага абата кс.М.Корна, кс.Т.Юрэвіча, Т.Мучынскага, Ф.Гансеўскага, Ф.А.Пачо-бута, Я. Ясінскага, Ю.Зялінскага, Канопкі, Д.Маткевіча. Прыняла сведчанне генерал-маёра Юзафа Беляка, дадзенае з абозу пад Рынямі ад 7 чэрвеня 1794 г. капітану міліцыі Гродзенскага павета аб.Юзафу Шындзеру, які справадзіў да корпуса пад камандай князя Францішка Сапегі адну 12-фунтавую гармату з адным возам амуніцыі, адну 8-фунтавую гарматку з возам амуніцыі і дзве 6-фунтавых з двума амунічнымі вазамі, якое сведчанне загадала захаваць сваёй канцылярыі. Прыняла і загадала запісаць у пратакол імкненне аб.Савіцкага адвесці ў Коўна грошы адпаведна з указам генерала аб.Вяльгорскага. Мемарыял Зузаны Залескай, якая скардзіцца на нежаданне аб.Кліманскага заплаціць за аказаныя заслугі, адаслала за сатысфакцыяй у аддзел справядлівасці. Адаслала ў аддзел справядлівасці мемарыял Мартына Ясінкеля, Яна Рапніцкага і іншых сялян, якія скардзяцца на нетрыманне аб.Пузынай 6-гадовай вольнасці для асядаючых на пустых землях. Будучы ў крытычных абставінах, камісія загадала аддзелам скарбу і вайсковых патрэб спакаваць усе свае рэчы на выпадак выхаду і астаўлення Гродна.

Адаслала ў аддзел парадку рапарт дазорцы гошскага цыркуля аб. Яна Інатовіча, які на мінулым тыдні паведаміў аб нерэгулярнасці пастаўленых крэсаў. Камісія асігнавала ў скарбовы аддзел і загадала таму выплаціць 986 зл. па загаду генерала аб.Вяльгорскага і па квітам, належных палкоўніку аб.Трубіцкаму. Мемарыял маёра войскаў Рэчы Паспалітай аб.Цэхановіча, які просіць камісію прыняць некаторыя вайсковыя

рэчы, адаслала прысутнаму тут генералу Вяльгорскаму для задавальнення таго жадання, а асабліва за ягонай дыспазіцыяй, якія рэчы пакінуць у Гродна, а якія аб.маёр Цэхановіч павінен узяць з сабой. На ноту дазорцы гродзенскага мыта аб.Калінскага, які просіць загадаць скарбоваму аддзелу прыняць 3698 зл. 27 грош., пастанавіла абавязаць скарбовы аддзел прыняць згаданую суму для вывазу яе ў Коўна разам з іншымі грашыма. Дала аблігацыю аб.Антону Савіцкаму на транспарт грошаў у Коўна, што той з ахвотай узяўся выканаць. Абавязала скарбовы аддзел выдаць інструкцыю пасланаму вывезці грошы ў Коўна. Мемарыял аб.Любамірскага, які прыносіць скаргу на жаўнераў, напаўшых і абрабаваўшых яго, передала генералу Казаноўскаму з просьбай разабрацца з памянутымі жаўнерамі і ўчыніцъ пакрыўджанаму адпаведную сатысфакцыю.

Да таго ж сесія апоўдні. Парадкавая камісія пад старшынствам аб. Т.Андрэйковіч пачала сесію ў прысутнасці абывацеляў камісараў кс. Т.Юрэвіча, Ф.Гансеўскага, С.Гоувальта, Ю.Зялінскага, Ф.А.Пачобута, Я. Ясінскага, Д.Маткевіча, Я.Канопкі, дазволіла свайму калеге аб.Маткевічу выехаць на дзень дадому ва ўласных інтарэсах. Атрымала і аддала на захаванне сваёй канцылярыі сведчанне абывацеля кс.Пялчынскага, выдадзенае аб.Крывіцкаму аб выкананай тым прысяге на пасад дазорцы крынскага цыркуля. Аддала ў аддзел вайсковых патрэб ноту падпалкоўніка стральцоў аб.Корсака, жадаючага, каб збеглыя стралкі былі вернуты ў корпус асабіста, а не ў выглядзе заступцаў. На рэквізіцыю генерала аб.Вяльгорскага асігнавала на 42 чал. 626 зл. з публічных падаткаў скарбовага аддзела і за квітам ротмістра коннай кароннай гвардыі аб.Губы. На просьбу аддзела інструкцый сваёй камісіі прыняць грошы пад дазор камісіі, адказала, што пастанаўляе памясціць у павятовую касу грошы адукацыйнага

фундушу, аднак паколькі з-за цяперашняга стану рэчаў не бачыць бяспекі ў Гродна, то таму па загаду генерала камандуючага аб.Вяльгорскага павятовыя грошы зараз жа высылаюцца ў нарадовае войска, чаму і тыя грошы разам з павятовымі трапляюць пад вайсковы транспарт.

Папрасіла Ковенскую парадкавую камісію аказаць належную дапамогу аб.Савіцкаму ў трансарціроўцы грошаў на выпадак адсутнасці ў Коўна генеральнага вайсковага камісара Корсака, а па гэтай прычыне і ў далейшым вывазе грошаў туды, дзе знаходзіцца згаданы Корсак. Асігнавала 400 зл. аб.Антону Савіцкаму з публічных даходаў скарбовага аддзела пад транспарт грошаў. Па просьбе крымінальнага суда асігнавала на ідучы месяц 80 зл., а з 19 ліпеня да 19 жніўня загадала скарбоваму аддзелу выдаць па квіту даверанага таго крымінальнага суда Бенедыкта Пуцілоўскага. На пытанне аб.Дзевятковіча — ці можна яму ўнікаць у спрэчкі паміж абывацелямі, адказала, што паколькі інструкцыя дазорцам ускладвае на іх абавязкі, якія належыць выконваць, то дазорца не абавязаны паступаць звыш прадпісанага. Па жаданню маркграфа гродзенскага замка аб.Готліба дала ў скарбовы аддзел асігнацыю на выплату таму маркграфу 596 зл. квартальнай пенсіі, яшчэ 500 зл. за тры гады разам з поўнымі працэнтамі, — усяго 1096 зл. Скарбовы аддзел паведаміў пленуму камісіі наступную спецыфікацыю пасланых у Коўна грошаў.

1. З Бельска ў запячатанай бочцы прывезена 61 тыс.зл, па рэестру і за подпісам аб.Гансеўскага.

2. Згодна з подпісам па спецыфікацыі аб.Антона Занеўскага аб.Тызенгаўзам на адукацыйны фундуш памешчана 13786 зл. 16 гр.

3. Па спецыфікацыі дазорцы аб.Калінскага з касы гродзенскай каморы — 3698 зл. 27 гр., а ўсяго 78485 зл.13 гр.

Такі рапарт гродзенскай парадкавай камісіі да дня 17 жніўня 1794 г. падпісаны *Тадэвушам Андрэйковічам*, камісарам, старшынёй.

Згодна з дыярушам *Пётр Манюшка*, рэгент пар. кам. Гродз. павета.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.526—532 аб.

№ 88. Справаздача аддзела харчу гродзенскай камісіі аб дзейнасці з 16 да 23 жніўня

Рапарт аб штодзённнх чыннасцях з дзённіка аддзела жыўнасці Гродзенскай парадкавай камісіі ад дня 16 жніўня да дня 23 таго ж месяца 1794 года, адасланы у аддзел харчу ЦД ВКЛ.

Дзень 17 жніўня. Па сведчанні квітаў ад камісараў магазінаў аб здачы правіянту у належны магазін аддзел харчу вызваліў ад экзекукуцыі 2 дымы шляхты у ваколіцы Каралёва, 20 дымоў вак.Юрэвічы, 5 дымоў у Жуках. Цяперашні аддзел мяркуе задаволіць на суму 138 поль.зл ксяндзоў дамініканаў клімавіцкага закону па прадстаўленні квітоў ад розных каманд узятаму правіянту. Аддзел харчу загадаў сваёй канцылярыі выдаць выпіс агульнага палажэння ад дня 7 жніўня ваколічнай шляхце з ваколіцы Стацэлі ў яе скарзе на экзекуцыю за не адданы фураж.

Дзень 18 жніўня. Аддзел харчу, па прынясенні асігнацыі аддзела вайсковых патрэб, абавязаў гродзенскі ключ у дзяржаве аб.Эйсманта выдаць правіянт бліжэйшай камандзе палка Азулевіча.У адказ на мемарыял шляхты ваколіцы Кулікі са скаргай на афіцэра, які выбраў некалькі срэбра з дыма, адказаў, што вызваляе яе разам з іншымі ваколіцамі ад правіянту. Што да паборцы, то паколькі вуснае паведамленне не можа быць ніякім доказам скаргі, тады адказу не дае,

асабліва калі цяперашні аддзел не дазваляў браць нічога. Аддзел харчу абавязаў правіянцкага касіра выплаціць 81 поль.зл.22,5 грош.пекарам хлеба па іх жа квітах. Аддзел харчу вызваліў ад экзекуцыі маршалка гродзенскага аб.Волмера за дастаўку у гродзенскі магазін правіянту з 93 дымоў у фальв.Галенаў берніцкай парафіі. Аддзелам харчу вызвалены ад экзекуцыі за дастаўку у магазін правіянту аб.Мееравай з 104 дымоў Прэвальскага староства, аб.Варанецкім з 70 дымоў Яблонаўскага староства, аб.Адахоўскім, паручнікам ВКЛ, з 2-х дымоў.

Дня 19 жніўня. Аддзел харчу выдаў асігнацыю для каманды пры лазарэце на 20 камянёў сена, пастаўленых па асігнацыі аддзела вайсковых патрэб у індурскі магазін. Аддзел выдаў асігнацыю ў індурскі магазін на штодзённы правіянт, аж да апошняга дня таго месяца, для 1145 чал. наяўных з усіх 1652 чал. па штату ў палку пікінераў пад камандай палкоўніка Кінштэта. Аддзел даў асігнацыю ў правіянцкую касу для каманды пры паклажах палка Азулевіча. Цяперашні аддзел выдаў месячнае ўтрыманне з гродзенскага магазіна, а на наступныя месяцы — з галынскага для аб.Пілецкай, асірацелай пасля выхаду яе мужа ў паспалітае рушанне.Назіраючы за справядлівасцю для абывацеляў у кожным здарэнні, якія дачыняюцца да абавязкаў аддзела харчу, выплаціў 46 зл.10 грош. за пабор сена і мяса па квітах з кумяльскага ключа ў дзяржаве Сахоцкага, палкоўніка батальёна стральцоў. Абавязаў пасэсара в.Лайгаболаў не марудзячы выдаць правіянт з 10 дымоў, адлучаных ад тарыфа ўсяе масы каменскага ключа.

Дзень 20 жніўня. Загадаў пісару галынскага магазіна аб.Цярлецкаму не крыўдзіць абывацеляў перашкодам мерыць прывозімы імі правіянт на вазах. Загадаў пісару гродзенскага магазіна Бярвінскаму выдаць 24 камяні сена, 13 фунтаў аўса генеральнаму літоўскаму

правіянцкаму касіру аб.Кучэўскму за ўнясенне ў павятовую касу 64 поль.зл. Асігнаваў з павятовай касы 248 поль.зл. 8 гр. на каманду маёра Цэхановіча і 300 чал. лазарэта. Прадпісаў аб.Макоўскаму, вядомаму сваёй стараннасцю, для закупкі быдла на таргах прыняць падрад, на які правіянцкая каса будзе дастаўляць грошы ў поўным разліку.

Дзень 21 жніўня. Аддзел харчу рашыў прызначыць аб.Абрамовічу суму у 114 поль.зл. і залічыць яе ў палову прагрэсіі пры выбары пастаўленага ім правіянту, згодна з таксай універсала ад 25 ліпеня. На падставе прынесеных квітаў як за здачу правіянта ў магазін згодна з універсалам 25 ліпеня, так і выдадзеных праходзячымі камандамі за пабраныя рэчы па цане, ухваленай пленумам парадкавай камісіі Гродзенскага павета, вырашыў залічыць 1263 зл. з аб.Пузыны ў палову прагрэсіі пабаровай сумы. Аддзел вызваліў ад экзекуцыі за належную дастаўку правіянта ў магазін 21 дымы фальварка Русоты і 59 дымоў станіслававоўскага ключа аб.Кланіцкай, 26 дымоў у фальв. Красіцкім аб. Заманскаму, дым у фальв.Бярозкі аб . Каласоўскай, дым у фальв. Грабенеў аб. Ягадзінскага.

Дзень 22 жніўня. Аддзел харчу паслаў услед за маршыруючымі палкамі аб. Станіслава Кулікоўскага, прадпісаўшы яму ў інструкцыі выбіраць па дварах як залеглы правіянт і фураж, так і нанава пры гвалтоўнай патрэбе, абяцаючы абываццелям, што ўсе даказаныя білетамі і квітамі пастаўкі правіянту будуць залічаны камісіяй у падаткі. Аддзел па звароту аб.Андрэйковіча не толькі луненскі ключ, але і іншыя вызваліў ад экзекуцыі, загадаўшы ім слухацца загадаў аб.Кулікоўскага, дэлегаванаму ў абоз аб.Казаноўскага. З індурскага магазіна асігнаваў правіянт і фураж на каманду з 44 чал. і 48 коней ротмістра коннай гвардыі ВКЛ аб.Губы з наказам пісару таго ж магазіна выдаць належнасць за квітам атрымальніка. Вызначыў да

пабору 260 зл, за пастаўлены аб.Булгарынам правіянт і фураж у крынскі магазін. Адказаў аб.Дзевятковічу, дазорцы 16-га цыркуля, што першымі дастаўляць правіянт абавязаны абывацелі, не даўшыя яго з-за сваёй нечуласці.

Дзень 23 жніўня. З нагоды спазнення і дагэтуль не прысланых рапартоў, аддзел харчу загадаў пісарам галынскага і індурскага магазінаў як мага хутчэй прыбыць для тлумачэння ў аддзел. Асігнаваў у галынскі магазін для каманды пры лазарэце пры калоне шаноўнага аб. Серакоўскага, зараз прысутнага ў Гродна, 97 камянёў і 27 фунтаў сена для тыднёвага правіянта 87 коней. Загадаў правіянцкаму касіру вярнуць 7 поль.зл. аб.Бярвінскаму за куплены тым воз сена на рынку на гвалтоўныя патрэбы войска. З-за сканчэння тэрміну наказанага ўніверсалам ад 22 мая да 23 чэрвеня і з нагоды прадстаўлення пісара магазіна і правіянцкага касіра аб поўным заспакаенні квітаў у магазіне,аддзел харчу вызваліў ад экзекуцыі 28 дымоў у фальв.Віла-жэўшчына берніцкай парафіі аб.Волмера, 4 дымы янаўскага пробаства плябана кс.Лапачэўскага, шляхецкі дым у фальв.Баранавічы аб.Барталамея Яскевіча. Абывацелю Жыневу за дастаўку 506 гарцаў гарэлкі камісійнай меры па білетам цяперашняга аддзела прызнаў таму па агульнай таксе, суму у 1416 поль.зл. 24 гр., якую рашыў залічыць у палову прагрэсіі паборавага падатку, згодна з універсалам Найвышэйшай рады і ЦД.

Па звароту аддзела парадку Гродзенскага павета асігнаваў бочку аўса, 20 камянёў сена пад фурманскіх коней, а аплату фуражу вызначыў з калькуляцыі сумы складак. З-за сканчэння тэрміна, абазначанага ўніверсалам 25 ліпеня, выдаў білеты на 24 дымы у фальв. Каралін аб.Юндзіла, 23 дымы у фальв. Капцэўшчына аб.Волмера, 29 двароў у фальв. Каўбасін аб.Волмера і ксяндзоў дамініканаў гродзенскіх, 48 двароў у фальв. Бяла аб.Дзяконскага, 26 дымоў таго ж у Еўстахіеве, 20

дымоў таго ж у Каўбасках, 48 дымоў у Свяцку аб.Валовіча, 21 дымы таго ж у Тасудах, 22 дымы яго ж у Шумкаве, 28 дымоў яго ж у Васілевічах, 19 дымоў таго ж у Сяневічах і 19 — у Ванцэвічах, за выключэннем 6 дымоў у Сухой Волі, таго ж аб.Валовіча, належачых да пастаўкі патрэбных правіянта і фуражу, што і загадана выканаць камандзе як мага хутчэй. Загадаў стаячай тут камандзе паслаць экспедыцыі з вышэйзгаданымі білетамі да пазначаных пасэсараў з тым, каб тыя як мага хутчэй даставілі належны правіянт.

Такі рапарт аддзела жыўнасці парадкавай камісіі Гродзенскага павета адсылаецца ў ЦД ВКЛ за подпісам: *Дамінік Маткевіч, камісар аддзелу жыўнасці.*

Даны у Гродне месяца жніўня дня 24.

За пячаткай.

БПАНК, с. 1090, л.455-458.

№ 89. 22 жніўня. Перасцярогі Цэнтральнай дэпутацыі адносна раздваення сваей улады з-за самадзейнасці А.Тызенгаўза

Центральная дэпутацыя літоўская яшчэ ўчора загадала дэпутату аддзела парадку аб.Тызенгаўзу прыбыць з Коўна ў Гродна для працы у дэпутацыі і аддзеле парадку і спыніць свае чыннасці ў Коўна як нелегальныя па-за склад пераехаўшай камісіі і парушаючыя ўсякі парадак. Зараз жа праз аб.Агінскага атрымана экспедыцыя таго аб.Тызенгаўза у тым, што ён збіраецца замест ЦД доўга не спыняць у Коўна розныя чыннасці і апісвае іх у дыярушы. Таму дэпутацыя паспяшае прадпісаць яму, што па інструкцыі і распіcанню сваёй арганізацыі ЦД павінна дзейнічаць у адным месцы са складам дэпутатаў, а пры іх адсутнасці існаваць у коле выкліканых заступцаў, і што немагчымая ніякая раздзельнасць або стварэнне заступства, дзеючага асобна імем усёй дэпутацыі, тым

больш без дазволу на тое складаць сесіі і называць іх сесіямі ЦД, высылаць экспедыцыі да камісій. Гэтыя чыннасці ствараюць выразнае аддзяленне і замест непадзельнага існавання і супольнасці ў даручаных аддзелам прац узнікае жаданне стварыць нейкую новую магістратуру, або, лепш кажучы, другую дэпутацыю. Такі учынак, не толькі не зможа ўзвысіць астужаную энергію ў краі, але ўвогуле нясе пагаршэнне правінцыі і абывацелям. За тым дэпутацыя чакае тэрміновай яўкі аб.Тызенгауза ў Гродна, і маючы поўны камплект з заступцамі ў адных аддзелах і адсутнасць двух аддзелаў (парадку і інструкцый), церпіць замінанне ўласцівых да іх чыннасцяў і экспедыцый, а, значыць, і поспеху агульнай дзейнасці і звароту ім трывалага бегу, з чаго чакае хутчэйшага выканання свайго звароту.

Даны у Гродна на сесіі 22 жніўня 1794 года.
Бенедыкт Марыконі, старшыня.
За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.538-538 адв.

№ 90. 23 жніўня. Пастанова Цэнтральнай дэпутацыі адносна праціўнікаў паўстання па звароту Ф.Боуфала

Цэнтральная літоўская дэпутацыя адказвае на пытанні ўпаўнаважанага Гродзенскага павета аб.Боуфала.

На 1. Няхай камісія выкарыстае дзейсныя спосабы для атрымання такога фуражу на працягу 12 дзён хаця б і з ужыццем мясцовай каманды для прымусу такіх абывацеляў, заадно пазваўшы іх у крымінальны суд як непаслухмяных загадам НН і Рады ды праціўных паўстанню.

На 2. Няхай камісія аддасць пабор рознай належнасці з таргавічан скарбоваму аддзелу для высвятлення сапраўднай немагчымасці заплаціць кожнаму, а той,

маючы з адабрэння камісіі выгадную адтэрміноўку часу, хутчэй верне скарбовую належнасць. На 3. Адносна рэзалюцыі ННР, адасланай 16 ліпеня ў ЦД ВКЛ, згаджаецца з жаданнем і прапановай гродзенскай парадкавай камісіі дапоўніць склад камісараў і чакае ад яе спіс асоб, годных на ўрадаванне ў камісіі і якія будуць выбраны дэпутацыяй. На 4. Камісія сама можа распарадзіцца аб дровах, як знойдзе гэта карысным для абываццеляў і ўласных карысцяў, у чым няхай звяжацца з упаўнаважаным дазорцам. На 5. Паколькі ў распараджэнні Нарадовай рады аб прэзентах, узятых кімнебудзь у час гродзенскага з'езду і атрыманых якімнебудзь спосабам ад залежных двароў, няма ніякага выключэння, то ніхто не вольны ад звароту такіх прэзентаў. На 6. Паколькі ў арганізацыі крымінальных судоў старшынства прывязана да сталасці ўзроста і таго прытрымліваюцца ва ўсіх крымінальных судах, то і гродзенскі крымінальны суд павінен дзейнічаць такім жа спосабам. На 7. Аддзел справядлівасці кожнай камісіі па арганізацыі сваіх абавязкаў павінен ва ўсім сачыць за прыстойным адпраўленнем і найхутчэйшым вырашэннем спраў у крымінальных судах.

Рабілася ў Гродна дня 23 жніўня 1794 года.

Бенедыкт Марыконі, старшыня.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.522—522 адв.

№ 91. 24 жніўня. Тлумачэнне Цэнтральнай дэпутацыі свайго непакою ад пагрозы двоеўладдзя ў паўстанні ВКЛ

ЦД ВКЛ са здзіўленнем даведалася з экспедыцыі Нарадовай рады, атрыманай гэтым днём, што ўпаўнаважаны той рады аб.Прозар даносіць, што пасля захопу Вільна ён разаслаў па розных трактах кур'ераў у пошуках дэпутацый, тады як дэпутацыя выехала толькі

шляхам агульнай рэцірады і падалася проста ў Коўна, у месца заўжды вызначанае на рэцірацу ў выпадку няшчасця Вільна. Сам жа ўпаўнаважаны абывацель выехаў з Вільна тым жа, а не іншым шляхам, а шукаючы усюды дэпутацыю праз сваіх пасланцаў, не трапіў, аднак, у Коўна, бо сама дэпутацыя, не маючы у той час шмат кур'ераў, першай адгукнулася аб сваім побыце праз кур'ераў у Чабішках. Не менш здзіўляе ЦД, што пад вокам упаўнаважанага абывацеля ў Коўна дэпутацыі процістаўляецца нейкая сфарміраваная толькі з асоб у двух аддзелах юрысдыкцыя, якая насуперак наказаў Рады і НН, супраць цэлай арганізацыі адважваецца нават без скарбовага аддзелу выдаваць прадпісанні парадкавым камісіям, экзактарам, інтэндантам і розным скарбовым афіцыялістам на прадстаўленне касаў у Коўна без погляду на іншыя калоны і шматлікія патрэбы края, асабліва калі усякія аб грошах асігнацыі былі спачатку пакінуты скарбоваму аддзелу, а потым генералу, камандуючаму ўсёй збройнай сілай літоўскай, і калі Рада толькі што загадала срэбра і каштоўнасці вайсковых магазінаў адвесці з Коўна ў Варшаву. Гэтак жа і зварот у лідскую камісію дазваляе рашаць усё аднаму толькі камісару, тады як лідская камісія інакш пыталася, менавіта, ці могуць 7 асоб з розных аддзелаў пастанаўляць пры адсутнасці камісараў аддзела вайсковых патрэб. У гэтым пераліку разыходжанняў ЦД бачыць горшую блытаніну для края і парадкавых камісій, якія пры дваякіх спрэчных пастановах не разумеюць каго слухаць і як ім пастулаць. ЦД ведае, што будзе пачута ў тым упаўнаважаным абывацелем, які ад таго адвернецца.

Рабілася на сесіі ЦД 1794 года дня 24 жніўня.
Бенедыкт Марыконі, старшыня.

За пячаткай.

БПАНК,с.1090, л.534.

№ 92. 25 жніўня. Зварот гродзенскай камісіі ў Цэнтральную дэпутацыю з просьбай аб павелічэнні платы камісарам

Адбылося ў Гродна ў ніжнім замку на сесіі 1794 г. дня 25 месяца жніўня.

Парадкавая камісія Гродзенскага павета, згодна з прадпісанай Нарадовай радай арганізацыяй, устанавіла патрэбных афіцыялістаў як для пленума, так і кожнага аддзела, якія з руплівасцю да публічнага дабра бясплатна выконвалі сваю працу да дня 12 ліпеня. Паколькі ж не кожнаму жаданню адпавядае магчымасць далей існаваць на сваім хлебе, то камісія знаходзіць патрэбным вызначыцъ ім дастаткова ўмераныя пенсіі, бо перакананa, што фундуша шэлягавага, які вызначаны на плату камісіі, пры прапарцыянальнасці колькасці асоб і мернасці пенсій будзе хапаць толькі на адзін харч і пасылку лістоў у найсвятлейшую дэпутацыю і да афіцыялістаў. Калі ж і так памяркоўная плата пры іншых выдатках на канцылярыю перавысіла неспадзеўна агульныя паступленні шалезнага, то парадкавая камісія Гродзенскага павета ў сваім справядлівым клопаце над цэласцю і нагляднасцю за публічным скарбам знаходзіць прычыну спытаць ЦД ВКЛ: як ёй трэба разумець свае крокі адносна ўжо ўжытых публічных расходаў на аплату афіцыялістаў і ці можа яна далей траціць публічныя даходы на патрэбную тым афіыялістам даплату, або не? У вырашэнні пытання паміж патрэбай утрымання тых афіцыялістаў і недахопу на іх фундушаў камісія давяраецца пасрэдніцтву Цэнтральнай літоўскай дэпутацыі, а да часу атрымання рашэння камісія вымушана ўтрымліваць тых так, колькі ад начальнай магістратуры патрабуецца нагляду над дазорам публічнага скарбу і бяспекі самой камісіі.

Дата вышэй. *Віктар Шумкоўскі, камісар, старшыня.* Згодна з пратаколам *Пётр Манюшка*, регент парад.кам. Гродзен. павета.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.535.

№ 93. 26 жніўня. Зварот гродзенскай камісіі ў Цэнтральную дэпутацыю з пытаннем аб суднах і рускіх палонных

Рабілася ў Гродна на сесіі дня 26 месяца жніўня 1794 года.

Аддзел бяспекі парадкавай камісіі Гродзенскага павета, імкнучыся ўчыніць належныя парадкі для задавальнення дадатковых сваіх абавязкаў, падае на рэзалюцыю святлейшай ЦД ВКЛ наступныя пытанні. 1. Па вяртанні з Кралеўца абывацельскія віціны падлягаюць шчыльнай рэвізіі з мэтай пакупкі на іх магчымага пораху, волава і жалеза.. Пасля такой рэвізіі памянутыя віціны вяртаюцца ў захоплены Масквой край, прынамсі, віціны належачыя віленскаму ваяводзе, князю аб.Радзівілу, і калі іх адпушчацъ на свае месца, то разам з людзьмі па пашпартах? Гэта першы пункт на рэзалюцыю. 2-е пытанне. Аддзел бяспекі імкнуўся забяспечыць харчаваннем некалькі дзесяткаў рускіх палонных, як афіцэраў, так і радавых, прысланых з калон у Гродна, як мага танней для захавання скарбу, аднак паколькі акрамя харчавання камісіі патрэбна шукаць таннейшага спосабу на далейшыя патрэбы палонных, які б адпавядаў і належнаму абыходжанню з палонным і эканомнасці скарба, то з гэтага погляду аддзел мяркуе, што выплата афіцэру жалавання, па належнаму яму рангу, задаволіла б і палонных і шляхетнасць польскага

народа.. А таму капітан Собалеў з сваім чалавекам, паручнік Кастраміцінаў, Гільдэбрант і харунжы Есіпаў, у патрулі быўшы, прызначаны мецъ месячную плату разам з 15 грош.. на дзень для простых радавых. Якую ж плату даваць і далей штаб-афіцэрам і іншым ваеннапалонным, няхай святлейшая ЦД ВКЛ рачыць падаць сваё рашэнне. Важкасць абставін не толькі задаволіць цікаўнасць какансіі, але прычыніцца да неадкладнай рэзалюцыі, па якой яна сама разбярэцца, колькі належыць рэчы ў жаданнях абываценяў і клопату камісіі.

Якуб Гаусман, камісар аддзела харчу парадкавай камісіі.

Станіслаў Гоўвальт, камісар Гродз. павета з аддз. бяспекі.

Згодна з пратаколам *Дыянісі Рагуза*, сакратар аддз. бяспекі.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.454.

№ 94. 26 жніўня. Загад Цэнтральнай дэпутацыі ўсім парадкавым камісіям аб здачы усіх рахункаў у генеральную касу ВКЛ

Рабілася ў Гродна на сесіі скарбовага аддзела ЦД 1794 года дня 26 жніўня.

Скарбовы аддзел Цэнтральнай літоўскай дэпутацыі пад начальствам Тадэвуша Касцюшкі, жадаючы, каб усякія грошы у касах парадкавых камісій не падлеглі небяспецы ад нападаў і рабункаў непрыяцеля, загадвае ўсім парадкавым камісіям ВКЛ з атрыманнем гэтай дыспазіцыі без адвалокі адаслаць розную наяўнасць з

якіх бы то ні было крыніц і даходаў у генеральную касу ў Гродна, абмысліўшы як унікнуць ад усякіх выпадкаў пры транспарціроўцы ў сучаснай небяспецы, у чым давяраецца стараннасці і кемліваці парадкавых камісій.

Дата вышэй. *Юзаф Несялоўскі, навагрудскі ваявода, старшыня.*

Згодна з арыгіналам *М.Падалецкі*, камісар.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.540.

№ 95. 26 жніўня. Хадайніцтва ваўкавыскіх таргавічан да ўпаўнаважанага Т. Касцюшкі аб вызваленні на парукі

Абывацель упаўнаважаны !

Мы, ніжэй падпісаныя, кранутыя горам тыднёвага арышту, не бачым канца свайму зняволенню па прычыне адсутнасці камісіі крымінальнага суда Ваўкавыскага павета, куды былі адасланыя. Падаемся да справядлівых і поўных людскасці сентыментаў асобы пана дабрадзея, каб ён з увагі на наша доўгае зняволенне рачыў ужыць усю моц уплыва свайго характару для вызвалення нас на парукі, калі ўжо не маем суда, які б уважыў нашу нявіннасць па абавязку і калі з-за гэтага недахопу не паходзіць нашая віна. Спадзяемся, што ягомосць пан дабрадзей пажадае так разгледзіць непарадак справядлівасці, што мы яго далей не панясем, а краёвы урад будзе ўсяляк упэўнены. Наш арышт не паходзіць ні з даносу абывацеляў, ні з прадстаўлення знойдзеных довадаў, а толькі таго, што ў пачатку нарадовага паўстання, калі яшчэ не было пэўных правілаў урадавання, адзін погляд або падазрэнне прывялі да затрымання нашых асоб пад следства. Знішчэнне такой думкі ў нашых уласных інтарэсах,

дагэтуль не абскарджаных ніякай нотай, а значыць, і ўласная патрэба і вера паручыцеляў прымусяць нас стаць у суд у найпершы патрэбны момант. Малая наша затрымка не стварае ніякай прычыны для далейшага зняволення і ў любы час пабуджае шукаць спачування ў сэрцы ягомосць пана дабрадзея, кіруемага літасцю і справядлівасцю.

Фердынанд Кантрым, міласцівага пана, *Ян (неразборліва—**Я.А.**)*

Пададзены дня 26 месяца жніўня 1794 года.

За пячаткай.

БПАНК, с. 1090, л. 539 адв.

№ 96. 27 жніўня. Адозва Цэнтральнай дэпутацыі на пагрозу двоеўладдзя

Рабілася ў Гродна дня 27 жніўня 1794 года.

Цэнтральная дэпутацыя, атрымаўшы ліст прэзідэнта месца Вільна аб.Тызенгаўза аб дэпутацкіх чыннасцях у месцы Коўна 17 і 18 бягучага, лічыць, што тыя чыннасці выкананы без камплекту і гвалтоўнай патрэбы, тады як разважаць аб такой патрэбе належала б мясцовай парадкавай камісіі і па прадпісанай ей ЦД арганізацыі, якая не можа мець іншай постаці, як толькі ў складзе 5 дэпутаваных асобаў, а пры іх адсутнасці — выклікaных заступцаў. Калі ж аб.Тызенгауз, дэлягаваны аддзелам парадку, з-за надта шчуплай колькасці заступцаў ніякім шляхам не мог стварыць у месцы Коўна легальнага камплекту 5 асоб апрача папярэдняй дэпутацыі, то 6-ы заступца дэпутат аддзелу парадку аб.Карп у адсутнасць аб.Тызенгауза даслаў у ННР ліст аб тым, што тая дэпутацыя пераносіцца ў месца Гродна, не гледзячы на сапраўдную дэпутацыю займаецца

рэзалюцыямі і разглядам указаў як Нарадовай рады, так і вярхоўнай каманды быццам бы ад імя дэпутацыі, блытаючы уласцівы і трывалы парадак праз такую чыннасць экспедыцыямі ад пленума і ў цэлым адносна аддзела даходаў. Таму Цэнтральная літоўская дэпутацыя заклікае дэпутата аддзела парадку аб.Тызенгауза да хутчэйшага супрацоўніцтва па прадпісанай арганізацыі, бо іх раздзельнасць не толькі не пазітыўная, але нават праціўная таму ўкладу, які ўстаноўлены ЦД. ЦД спадзяецца, што аб.Тызенгауз пакіне Коўна, а астатнія асобы з пакінутага месца прыбудуць на працу ў Гродна і што тая ж дэпутацыя прымусіць іх яшчэ мацней трымацца прызначаных ім думак і інструкцый аддзела парадку Нарадовай рады.

Бенедыкт Марыконі, старшыня.

За пячаткай.

БПАНК, с .1090, л.537.

№ 97. 28 жніўня. Напамін гродзенскай камісіі пра свой праект прымусовай паншчыны ў Вышэйшую раду

Рабілася ў Гродна на сесіі дня 28 жніўня 1794 года.

'Аддзел харчу парадкавай камісіі Гродзенскага павета, маючы уладнае прадпісанне ўніверсала Нарадовай рады ад 16 жніўня аб выкананні ўсякіх указаў той рады, мусіць з абуджанага клопату прадставіць, што нічога не упусціў як адносна наказаў, так і патрэбных у сваім павеце укладаў. Нарэшце, паколькі каля 8 тыс.чал. было адарвана ад працы у войска, а двудзённая паншчына скарацілася напалову, то прадухіляючы спазненне рабочага часу пры значных ураджаях фальваркаў, была складзена і адаслана ў НР такса найму да розных работ.

Сучасны аддзел, не маючы дагэтуль апрабацыі таму ўстанаўленню, мае гонар прасіць святлейшую ЦД паскорыць з вынікам. Дата вышэй.

Ксёндз Юзаф Свяжынскі, камісар, старшыня.

Дамінік Маткевіч, камісар.

Згодна з пратаколам *Мартын Бронц*, сакратар аддзела жыўнасці

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.543.

№ 98. 29 жніўня. Адозва гродзенскай камісіі да абывацеляў павета з нагоды нарыхтоўкі вайсковага правіянту

Рабілася на сесіі ў гродзенскім ніжнім замку 29 жніўня 1794.

Аддзел жыўнасці парадкавай камісіі Гродзнскага павета, находзячы па патрабаванню ЦД ВКЛ неадкладную патрэбу ў заснаванні магазінаў жыўнасці і фуражу для бліжэй кватэруючага войска, для павелічэння запасаў, звыш дастаўленага па ўніверсалах, заклікае да дапамогі і дбайнасці тых толькі абывацеляў свайго павета, якія, маючы прадукты звыш хатняй патрэбы, дагэтуль аддавалі іх на замежны сплаў і каб яны згаданыя прадукты, асабліва збожжа, крупы, сухары, сена і быдла аддавалі ў павятовыя магазіны ніжэй пастаноўленай цаны.

Абывацелі !

Не трэба вам тлумачыць пабудак такога кроку. Самі бачыце ў памежных паветах, што робіць непрыяцель з належнымі прадуктамі — тое дарэшту забірае пад суровейшай экзекуцыяй і нічога не плоціць, бачыце мэту харчавання нарадовага войска, якое колькі можна засланяе ад непрыяцеля нарадовае існаванне. Ці не

лепш тады дапамагчы краю дастаўкай харчу для войска, атрымаць за яго ўзнагароду ўласных братоў, дагадзіць ім, а не здольнасці непрыяцеля, чымсці страціць усё без надзеі на заплату. Ясная рэч, што розум кожнаму падказвае. Дзеля гэтага аддзел жыўнасці парадкавай камісіі Гродзенскага павета заклікае кожнага абывацеля свайго павета, згоднага на продаж патрэбных збожжа і рэчаў, і просіць кожнага, маючага прадукты, дастаўляць у павятовыя магазіны жыта, авёс, ячмень, сена, крупы, сухары, мяса, быдла.

Сучасны аддзел тут жа вызначае заплату за разавую дастаўку: бочку жыта — 60 зл., ячменю — 40 зл., ячменевых круп — 80 зл., аўса — 30 зл., за камень сена — 1 зл., фунт тлушчу *(неразборліва—Я.А.)* грош. Сухары прапарцыянальна цане жыта. Быдлу цана па дамоўле-насці пры дастаўцы. Звыш таго, сучасны аддзел будзе старацца дастаўляць памянутыя прадукты скарбовымі фурманкамі, або ахвяруючымі іх, памяншаць плату за транспарт. Калі ж абывацельская здача патрэбных скарбу прадуктаў робіцца з надзеяй на давер іх абавязку, то не можа атрымацца так, што сярод іх знойдуцца ў тым павеце такія, якія б з уласнага інтарэсу схаваўшы свае прадукты ад патрэб краёвага ўрада, тым самым апынуліся б прычынай нястачы ў войску. Аддзел жыўнасці не разлічвае на такую схованку прадуктаў па вядомай дбайнасці абывацеляў свайго павета. Разам з тым, калі такое здарыцца, то будзе сарамаціць нечулага абывацеля лёсам братоў, церпячых нястачу і засланяючых жыццём менш удзячных сародзічаў. Дата вышэй.

Ксёндз Юзаф Свяжынскі, камісар, старшыня.

Дамінік Маткевіч, камісар.

Згодна з пратаколам *Мартын Бронц*, аддзел жыўнасці

БПАНК, с. 1090, л.452—453.

№ 99. 30 жніўня. Тлумачэнне аддзела гродзенскай камісіі сваёй кампетэнцыі на прыкладзе пакражы каня яўрэя І.Шломавіча

Рабілася на сесіі ў Гродна дня 30 месяца жніўня 1794 года.

Аддзел бяспекі парадкавай камісіі Гродзенскага павета, як заўжды чулы ў выкананні сваіх абавязкаў і захаванні прадпісанага парадку, атрымаўшы пісьмовую скаргу старазаконнага Ісака Шломавіча з тлумачэннем, што шляхціч па прозвішчу Алендскі з ваколіцы Казловічы не выдае згаданаму жыду скрадзенага каня, не можа паступіць інакш, як толькі згодна з ардынацыяй крымінальнага суда і арганізацыяй камісій, з якіх вынікае, што калі ў сваёй арганізацыі не апынецца чаго падпадаючага пад следства аддзела, а наадварот, у ардынацыі ў арт.2 пункце 3 над № 4 выразна запісана, што справа аб пакражы належыць расправе крымінальнага суда, ды й арт.4 пункта 1 выразна пераконвае, што падобныя справы па пісьмоваму даносу можна проста адпраўляць у суд з пасведчаннем, а таму, паколькі жыд-скаржнік, будучы актарак справы, прадстаўляе істоту данасіцеля і тым самым прэтэндуе на падтрымку сваёй прэтэнзіі і скаргі, пры перадачы справы ў суд навінен зляжыць довады і не трэбаваць заключэння аддзела, то аддзел бяспекі адсылае бакі ў крымінальны суд згодна з памянутымі прадпісаннямі.

Крымінальнаму суду трэба зразумець, што аддзел даў рэзалюцыю на скаргу па патрабаванню аддзела следстваў і, запісаўшы сваё разуменне на мемарыяле, адаслаў на расследванне рэчаў у аддзел бяспекі. З другога боку, аддзел рашыў выканаць распачатае, але забаяўся сваёй дбайнасцю зламаць парадак, калі б толькі гаворка ішла пра разуменне аддзела, а тлумачэнне крымінальнага суда было б дастаткова перадаць кожнаму баку на іх уласны нагляд. Але калі гэта тлумачэнне праціўнага,

трэццяга, боку, тады аддзел бяспекі парадкавай камісіі Гродзенскага павета ў клопаце аб выкананні сваіх павіннасцяў і ў імкненні пазбегнуць падобных здарэнняў, пры якіх адна частка юрысдыкцыі перакладам на другую сваіх абавязкаў спыняе і мяшае прадпісаны парадак, мае прычыну таму аддаць гэтую справу у ЦД, для чаго далучае мемарыял згаданага жыда і запісаныя на ім дзве супрацьлеглыя рэзалюцыі. Адказ дэпутацыі і ўзгадненне супраціўных думак вельмі неабходна, бо ад яе залежыцъ паскарэнне справядлівасці для скаржніка і простага разумення абавязкаў, прадпісаных вышэй як аддзелу, так і крымінальнаму суду.

Якуб Гаусман, камісар аддзела бяспекі, старшыня.

Станіслаў Гоувальт, камісар парадкавы з аддз. бяспекі.

Згодна з пратаколам *Дыянісі Рагуза*, сакратар аддз. бяспекі Гродз.

За пячаткай.За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.450—450 адв.

№100. Рапарт аддзела харчу гродзенскай камісіі аб сваей дзейнасці паміж 24 і 31 жніўня

Рапарт аб штодзённых чыннасцях аддзела жыўнасці парадкавай камісіі Гродзенскага павета, выпісаны з дзённіка ад дня 24 да 31 месяца жніўня 1794 года ў аддзел жыўнасці ЦД ВКЛ.

Дзень 24 жніўня. З-за адсутнасці ў гродзенскім магазіне 12 поль. зл., аддзел загадаў павятовай касе аплаціць 2 вазы сена, купленыя на рынку палкоўнікам батальёна стральцоў аб.Трубіцкім. Рашыў зволіць па рэзалюцыі пленума ад экзекуцыі і дачы правіянта шляхту, якая скардзіцца на немагчымасць пастаўкі загаданага ўніверсалам правіянту па прычыне знішчальнага пажару. За пастаўку ў прадпісаны магазін правіянту, вызваліў ад экзекуцыі 5 дымоў у фальв.Пяс-

чанка аб.Паўлоўскай, 11 шляхецкіх двароў у ваколіцы Пясчанка, 5 дымоў ваколіц Грыневічы і Жолаб, 25 дымы у фальв. Новы двор эйсмонтскай парафіі аб.Юндзіла, 83 дымоў у фальв.Алекшыцы таго ж Юндзіла.

Дзень 25 жніўня. Аддзел вызваліў ад экзекуцыі 3 дымы вакол. Сарашыцы аб.Эйсманта, 2 дымы аб.Лучаўскай, 29 дымоў у Міцкевічах, што належыць да месца Гродна, упэўнены па квітах пісароў магазінаў у дастаўцы правіянта па выдадзенаму звароту. Праз прысутную тут ЦД ВКЛ, задаволіў жаданне свайго калегі аб.Міхалкевіча вызваліцца ад абавязкаў камісара з-за працяглай хваробы, і назначыў на яго месца заступцу з кола камісараў аддзела. Асігнаваў на 51 чал.і 66 коней каманды палка Азулевіча, прыбыўшай з экскортам багажу да сакольскага магазіна, правіянт і фураж і загадаў пісару выдаць іх па квіту атрымальніка. Той жа камандзе з-за адсутнасці ў сакольскім магазіне мяса, асігнаваў у вылічанай прапорцыі за фунт мяса 4 грош. — усяго 36 зл. Аддзел загадаў пісару сакольскага магазіна, аб.Цярлецкаму ужыць фурманкі таго мястэчка на правоз у магазін 10 кавалкаў саланіны і 8 штук сала. З нагоды частых скаргаў абывацеляў на непрыстойнасці пісара галынскага магазіна, учыніў рэквізіцыю з 8 пунктаў дазорцы цыркуля аб.Гансеўскаму, каб ён з'ехаў на месца і аб вынайдзеным рапартаваў аддзелу. Распарадзіўся імем парадкавай камісіі Гродзенскага павета аб фурманках на правоз усяго галынскага магазіна. За поўную дастаўку ў магазін правіянту, аддзел вызваліў ад экзекуцыі па надыходзячаму тэрміну 36 земляробскіх дымоў у фальв.Астроўка гродзенскай парафіі аб.Волмера, 2 шляхецкія дымы ў вакол.Сахнова вяйсейскай парафіі. Абывацель Вянгерскі атрымаў згоду на прагрэсію ў 1501 зл. па прадстаўленні квітоў на забраныя камандамі рэчы і за дастаўку правіянту ў крынскі магазін. Уніяцкаму плябану ялаўскай парафіі кс.Кавалеўскаму за дастаўку правіянта, згодна з

універсалам ад 25 ліпеня, па прадстаўленаму квіту рашыў выдаць 6 зл. з па-датковага набору.

Дня 26 жніўня. Аддзел харчу вызваліў ад экзекуцыі 30 дымоў фальварка Астроўка гродзенскай парафіі аб.Волмера, 2 дымы ваколіцы Сахнова вяйсейскай парафіі за яўкай пісарамі магазінаў квітаў на дастаўку належных правіянту і фуражу. Загадаў пісару галынскага магазіна перавезці розныя рэчы магазіна ў генеральны гродзенскі магазін і перадаў таму выдадзеныя аддзелам парадку білеты на 200 фурманак транспарту з абавязкам, каб правозчык пастаянна быў пры вывазе.

Дня 27 жніўня. Аддзел харчу загадаў пісару галынскага магазіна аб.Цярлецкаму прыняць на рахунак магазіна квіты каманды маёра аб.Цэхановіча за выбраны правіянт і фураж у фальварку аб.Бабінскага згодна з апошнім універсалам. На пытанне аб.Кулікоўскага, дэлягаванага да вайсковай калоны, стаячай у Жыдамлі пад камандай аб. Трубіцкага, ці аплочваць да апошняга дня бягучага месяца батальён стралкоў з палка каманды Казаноўскага, аддзел харчу згодна з воляй ЦД ВКЛ адказаў, што вайсковы камісарыят выдасць правіянт і фураж па загаду дэлегата, калі камендант пажадае ўтрымаць з жалавання аплочаныя дні. Што да мяса, то сучасны аддзел дазволіў абілечваць тых абывацеляў, якія маюць быдла звыш хатняй патрэбы.

За дастаўку правіянта аддзел вызваліў ад экзекуцыі 5 земляробскіх двароў у фальв.Ялава ліпскай парафіі аб.Петрашкевіча, з вёскі Баранава гродзенскай парафіі дым Паўла Казіміравіча, 8 дымоў эйсмонскай парафіі, 23 дымы в.Адамавічы і 49 дымоў в.Баранавічы гродзенскай парафіі, дым у вак.Суцік луненскай парафіі. Дзяржаўцы даўгапольскаму аб.Тышкевічу па прынесеных квітах аб дастаўцы у магазін правіянту і фуражу залічыў у прагрэсію 989 зл.9 грош. Па квіту палкоўніка

батальёна стральцоў аб.Сахоцкага, паданаму пісару склада са сведчаннем аб поўнай здачы з фальв.Плябанцы, згодна з універсалам ад 25 ліпеня, правіянту і фуражу, аддзел залічыў да пабору прагрэсіўнага падатку 316 поль.зл.5 гр. Таго ж дня аб.Дашкевіч падаў у канцылярыю аддзела квіт ад пісара магазіна са сведчаннем аб поўнай пастаўцы з фальв. Дзямідаў правіянту як па ранейшаму універсалу, так і па наступных. Аддзел спыніў экзекуцыю за першымі квітамі,а за астатні правіянт загадаў правіянцкай касе аплаціць асігнацыямі на суму 30 зл.

Дня 28 жніўня. Агульную суму ў 257 зл.26 гр.па квітах, прынесеных пісарам галынскага магазіна, аб цалкам дастаўленым аб.Шумкоўскім правіянце, згодна з універсалам ад 25 ліпеня, аддзел загадаў прыняць у прагрэсію пабору. Абывацель Гоувальт, пасля поўнага разліку за дастаўлены з фальв.Рашаў правіянт і розныя рэчы, атрымаў у палову прагрэсіі паборавага падатку 349 зл. 3 гр. Абывацель Сахоцкі вызвалены ад экзекуцыі за даказаную квітамі поўную дастаўку фуражу згодна з першымі ўніверсаламі. Сучасны аддзел, не маючы дасюль падцверджання ЦД ВКЛ на распараджэнне ў сваім павеце праекта найма людзей на паншчыну, папрасіў ЦД ВКЛ прыспешыць з такім заключэннем. На мемарыял аб.Кінштэтавай, палкоўніцы палка пікінераў са скаргай на пабор для коней фуражу, замоўленага асігнацыяй і падцвярджальнай рэзалюцыяй генерал-лейтэнанта войск ВКЛ аб.Ясінскага, адказаў, што фураж для коней аб.Кінштэта быў асігнаваны тады, калі ён не браў належных яму грошаў, а таму фураж можна браць зараз для задавальнення платы таму палкоўніку і самой асігнацыі. Загадаў канцылярыі свайго аддзела як мага хутчэй разаслаць крэсамі да дазорцаў 24 цыркуляў, 24 схемы вопісу розных рэчаў і

24 штук універсалаў ад 20 жніўня пра розныя чыннасці існуючых дазорстваў. Для ўчынення агульнага рапарта і рэгістрацыі ў кнігах канцылярыі, аддаў 5 рапартоў пісароў сваіх магазінаў са сведчаннем колькасці наяўнага правіянту і фуражу.

Дня 29 жніўня. На зварот пісара галоўнага гродзенскага магазіна аб.Бярвінскага аб замене дазорцы занемунскага магазіна Багдановіча з повада пераносу такога магазіна ў Гродна, дазволіў прыняць такое жаданне пад адказнасцю за пакрыўджанне публічнасці якой-небудзь памылкай. Па рэквізіцыі аб.Цэхановіча асігнаваў 8 чырв.у галынскі магазін на 200 камянёў сена для каманды пры лазарэце з калоны шаноўнага аб.Серакоўскага. Зволіў ад экзекуцыі за даказаную квітамі дастаўку правіянта з 9 двароў фальв.Брозаўка карыцінскай парафіі аб.Скоцкага, 23 двароў у фальв.Чэхава гродзенскай парафіі аб.Данкевіча. Абывацель Панцэржынскі, даўшы з 64 дымоў у фальв. Хмелеўшчына і Узнаш правіянт і фураж па ўніверсалу 25 лінеия з пацвярджальнымі аб тым квітамі, задаволены аддзелам на суму у 384 поль.зл. Аддзел атрымаў загад аддзела жыўнасці ЦД ВКЛ узяць з плывучых віцін з 100 бочак солі 26, з 10 бочак селядцу 1 бочку па дамоўленай з уласнікамі цане і аб тым рапартаваць ЦД для заплаты забраных рэчаў. Склаў праект падрада з абывацелямі, вызначыўшы цану рознага збожжа такім чынам: бочка жыта — 60 зл., ячменю — 40 зл., ячменных круп — 88 зл., аўса — 30 зл., камень сена — 1 зл., фунт тлушчу — 20 гр. Цану жа быдла не вызначыў як з-за роўнасці яго стану і гатунку, так і пры даверу абывацелям, якія не прамінуць паставіць пазахатнюю патрэбу за умоўленую цану на рэквізіцыі аддзела харчу.

Дзень 30 жніўня. Аддзел зволіў ад экзекуцыі за даказаную дастаўку ў правіянцкі магазін 4 земляробскія двары у фальв.Солаў гродзенскай парафіі аб.князя Радзівіла. На просьбу грошаў аб.Куліко҇ўскім, пасланага купляць быдла для абозу, загадаў выдаць з правіянцкай касы 1 тыс.зл. у палове грашыма і палову асігнацыямі. Загадаў выдаць з цяперашняга гродзенскага магазіна 2 бочкі солі па рэквізіцыі аб.Куліко҇ўскага, дэлягаванага ў абоз аб.Трубіцкага. Папрасіў кіраўніцтва каменскага ключа выдаць 20 вазоў саломы для лазарэта ў Панемуні пры калоне шаноўнага аб.Серакоўскага з патрабаваннем, каб тое начальства прасачыла за рэшткамі 180 вазоў, ахвераваных аб.Дзяконскім. Выдаў асігнацыю на тыднёвы фураж для 6 коней пры вайсковым камісарыяце ЦД ВКЛ. Аддзел жыўнасці, заўсёды заклапочаны сваімі абавязкамі мець найлепшае кіраванне магазінамі свайго павета, дэлягаваў са свайго кола аб. Дамініка Маткевіча для распараджэння і рэвізіі іх. Па данясенні дэлягаванага аб.Куліко҇ўскага аб набліжэнні 1 верасня — дня звычайнай выдачы жалавання — з запытаннем, ці выдаваць жалаванне з гэтага дня правіянтам, аддзел харчу адказаў, што правіянт і фураж для пікінераў і касінераў прыйдзе ў назначаны час, а што да палкоў, якія атрымліваюць жалаванне грашыма, то правіянт належыць выдаваць не раней, чым аддзел вайсковых патрэб утрымае 8 зл. з 15 поль.зл.

Згодна з дзённікам. *Ксёндз Юзаф Свяжынскі, камісар, старшыня. Мартын Бронц, сакратар аддзела харчу.*

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.545—548.

№ 101. Рапарт аб пленарных пасяджэннях гродзенскай камісіі з 24 да 31 жніўня

Тыднёвы рапарт штодзённых чыннасцяў парадкавай камісіі Гродзенскага павета ад дня 24 да дня 31 месяца жніўня 1794 года ў святлейшую ЦД ВКЛ пасланы1794 года, месяца жніўня, 24 дня.

Сесія апоўдні. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Віктара Шумкоўскага (па прычыне моцнай хваробы аб.Лабенскага і адсутнасці ў Гродна аб.Ясінскага, паехаўшага па загаду сваёй камісіі на рэвізію месца Адэльск) пачала сесію наступаючага тыдня ў прысутнасці камісараў абывацеляў ксяндза Т.Віслоцкага, супрасльскага абата, кс.М. Корна, гродзенскага абата, кс. Ю. Свяжынскага, С.Гоувальта, Я.Канопкі, М.Эрэнкрэйца, Я.Сакалоўскага, Ф.Гансеўскага, Ф.А.Пачобута. Атрымала загад аддзела парадку ННР знесціся з гродзенскім камендантам аб пастаўцы не меней 20 чал. у Беласток для канвою ў Коўна вайсковага транспарту. Камісія дала ў аддзел парадку загад аб такім канвоі аб.Трубіцкаму. З скарбовага аддзелу ННР атрымала адказ на пытанне — па чыіх рэквізіцыях ёй трэба выдаваць грошы ў выпадку здарэнняў, менавіта ад каманд? Скарбовы аддзел ННР тлумачыць, што згодна з нядаўнім наказам НН у скарбовы аддзел ЦД розныя сумы на войска трэба плаціць толькі па рэквізіцыях аб.Макраноўскага. Асобна той скарбовы аддзел жадае даведацца, ці перасланы ў ЦД у наяўнасці іншыя сумы, прысланыя ў Гродна: адна на 134 тыс.зл. праз аб.Міхальскага, другая на 66 тыс.зл. з Бельскай камісіі. Аддала ў аддзел вайсковых патрэб загад ННР аб пастаўцы кашуль і сярмяг.

Атрымала зварот палкоўніка аб.Трубіцкага, які жадае 1 тыс.зл.на шпікоў, і на яго адказала, што на моцы толькі

што атрыманай рэзалюцыі ННР, сама камісія мусіць плаціць грошы толькі з дазволу аб.Макраноўскага, зачым адаслала зварот Трубіцкага у ЦД за вынікам. Атрымала загад Цэнтральнай літоўскай дэпутацыі, каб высланыя крэсамі з Коўна экспедыцыі як мага хутчэй перадаваліся ў канцылярыю ЦД. Такі загад аддала ў аддзел парадку. Запыталася ў ЦД наконт пагарэльцаў, жадаючых меркавання камісіі. Пры тым адаслала ўсе люстрацыі, выкананыя камісіяй у гэтых мэтах. Мемарыял аб.Халецкай са скаргай на эканома Каменскага за пабор вазоў з в.Лейгаболы Камянкоўскага ключа, аддала па належнасці ў аддзел парадку. Рэалізуючы наказ ЦД, загадала аб.Цэхановічу выслаць патруль са сваёй каманды пад *(не разборліва—Я.А.)* для высвятлення абаротаў непрыяцельскіх войскаў і аб тым паведаміць камісіі. Па загаду скарбовага аддзела ЦД звярнулася да таго абывацеля распарадзіцца з грашыма, прысланымі з Варшавы і ад Бельскай камісіі згодна з воляй таго ж скарбовага аддзела ННР.

Дня 25 жніўня. Сесія з ранку. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.В.Шумкоўскага пачала сесію ў прысутнасці абывацеляў камісараў супрасльскага абата кс.Т.Віслоцкага, гродзенскага абата кс.М.Корна, кс.Т.Юрэвіча, Д.Мацкевіча, Ф.Гансеўскага, Я.Канопкі, Ф.А.Пачобута.

Мемарыял эканома в.Шчэберы і Горная з супольнай скаргай на намеснікаў палка аб.Казаноўскага, якія парабілі гвалты ў карчме і вёсцы, адрасавала аб.Казаноўскаму або замяняючаму яго камандзіру з патрабаваннем учыніць скаржнікам сатысфакцыю. Атрымала з ННР устанаўленне скарбовых білетаў і ўніверсал да парадкавых камісій аб ажыццяўленні такой уставы аб білетах. Абодва ўніверсалы загадала раздрукаваць сваёй канцылярыі. Весткі, прысланыя з прускай мяжы аб.Шабуневічам, аддала ў аддзел бяспекі з абавязкам паведамлення іх у ЦД. Выразны загад ЦД аб выплаце

1 тыс.зл. палкоўніку аб.Трубіцкаму передала ў скарбовы аддзел з прадпісаннем выплаціць тое па першаму дамаганню.

Да таго ж сесія апоўдні. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.В.Шумкоўскага пачала сесію ў прысутнасці камісараў абываццеляў супрасльскага абата кс.Т.Віслоцкага, кс.Ю.Свяжынскага, С.Гоувальта, Ф.Гансеўскага, Ю.Зялінскага, Я.Гаусмана, Ф.А.Пачобута, кс.М.Корна, гродзенскага абата. Атрымала з ЦД ВКЛ урадавыя газеты пад №№ 45—49, якія аддала на захаванне сваёй канцылярыі. Звярнулася ў ЦД з запытаннем аб плаце афіцыялістам, якая перавышае прызначаную на тое колькасць шалезнага. Аддала ў аддзел харчу мемарыял ваколіцы Ягнева са скаргай на пабор фуража, ужо здадзенага ў Мерацкі павет па рэквізіцыі тамтэйшай камісіі.Аддала ў аддзел бяспекі прысланую рэзалюцыю аддзела бяспекі ЦД аб арыштаваным Шэйбаху. На мемарыял Адама Віслоцкага адказала, што адаслала ў ЦД належны універсал скарбовай дэпутацыі Часовай літоўскай рады ад 1 чэрвеня бягучага года. Аддала ў аддзел харчу мемарыял сялян в.Каменкі аб іх жаданні вызваліцца ад фуражу. Аддала ў сваю канцылярыю рапарт дазорцы 13-га цыркуля аб.Лявона Камінскага, датаваны бягучым 13 днём. Атрымала з скарбовага аддзелу ЦД рэзалюцыю на сваё пытанне адносна выпадкаў градабою ў тым, што ЦД не будучы ў моцы распарадзіцца аб такіх здарэннях, апелявала да ННР, рэзалюцыю якой не заміне паведаміць камісіі. Такі адказ аддала на захаванне сваёй канцылярыі.

Дзень 26 жніўня. Сесія ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.В.Шумкоўскага пачала сесію ў прысутнасці абываццеляў камісараў супрасльскага абата кс.Т.Віслоцкага, Ф.Гансеўскага, Ю.Зялінскага, Ф.А.Пачобута, кс.М.Корна, абата гродзенскага, кс.Ю.Свяжынскага, Д.Маткевіча. Атрымала ўніверсал аддзела жыўнасці

ННР загадваючы выканаць ужо выдадзеныя распараджэнні. Адзін экзэмпляр яго аддала сваей канцылярыі, а астатнія — у аддзел харчу. З аддзела парадку ННР атрымала наказ да ўсіх у цэлым краі парадкавых камісій, каб тыя запісывалі дзень і час атрымання праз крэсы і станцыі ўрадавых экспедыцый — тое аддала ў аддзел парадку. Рапарт дазорцы 4-га цыркуля аб.Яна Казлоўскага аб адсутнасці запатрабаванага аддзелам вайсковых патрэб сукна передала ў той жа аддзел. Рапарт дазорцы аб.Скродскага аддала ў аддз. вайск. патрэб. Адаслала ў гродзенскі магазін рапарт дазорцы аб.Казлоўскага наконт кажухоў.

Ноту адміністрацыі сталовых добраў яго каралеўскай мосці са скаргай на бясчынствы кантрыбуцыйнай дэпутацыі адаслала ў памянутую дэпутацыю за рэзалюцыяй і перавырашэння справы кантрыбуцыі ў ЦД ВКЛ Мемарыял капітаншы аб.Фроліховай, якая скардзіцца на палкоўніка *(неразборліва—А.Я.)* у незадавальненні тых тэстаментаў яе мужа, паведаміла назад з абяцаннем даць выпіску на працягу тыдня. Аддала ў аддзел вайсковых патрэб скаргу жыхароў мястэчка Кузніца на экзекуцыю за непастаўку 50-дымовых кантаністаў. Адаслала на рэзалюцыю ЦД ВКЛ лісты асоб, якімі трэба дапоўніць камісіі. Адаслала на рэзалюцыю аддзела бяспекі скаргу аб.Яна Дваракоўскага на сваю жонку. Ноту аб.Яна Бульчынскага са скаргай на кантрыбуцыйную дэпутацыю ад імя мануфактуры адаслала за сатысфакцыяй адзначанай дэпутацыі і на следства чыннасцяў той дэпутацыі ў ЦД. На ноту дазорцы 3-га цыркуля дала адказ прама на ноце.

Сюды ж сесія апоўдні. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.В. Шумкоўскага пачала сесію ў прысутнасці абывацеляў камісараў кс.Свяжынскага, кс.Віслоцкага, абата супрасльскага, Зялінскага, Пачобута, Корна, Канопкі, Гансеўскага, Гоувальта, Маткевіча.

Абывацель упаўнаважаны падаў нашай камісіі адказ ЦД літоўскай у наступных пунктах.На 1.* Атрымала адказ ЦД літоўскай на свае пытанні ў тым, што прапанову камісіі замяніць не хапаючых на аплату афіцыялістаў камісіі і крымінальнага суда 1180 поль.зл. шалезнага з публічных падаткаў, ЦД палічыла слушнай і дазволіла заспакоіць такі недахоп з публічнага падатку. Камісія прызнала неналежачай да сябе рэччу адказ аб.Жынева на мемарыял кс.Бачкоўскага аб выплаце працэнтаў аб.Капцеўскаму суму ў 4 тыс.зл. з фундуша памерлага віленскага біскупа Масальскага. Атрымала загад скарбовага аддзела ЦД адаслаць усе падаткі на схову ў цэнтральную гродзенскую касу. Дазволіла свайму калегу, аб.Пачобуту, выехаць па ўласных інтарэсах дамоў на 4 дні.

Дня 27 жніўня, сесія ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам В.Шумкоўскага пачала сесію ў прысутнасці абывацеляў камісараў Свяжынскага, Зялінскага, Гансеўскага, супрасльскага абата Віслоцкага, Юрэвіча, Канопкі, Гоувальта. Адаслала на рашэнне сваіх аддзелаў вайсковых патрэб і скарбу прапанову аб.Станіслава Кулікоўскага аб дастаўцы фуражу ў абоз пад Жыдамлем. На мемарыял жыда Моўшы Хаймовіча, які просіць ухваліць дакрэт дазорцы 4-га цыркуля аб.Казлоўскага, дала рэзалюцыю ў тым, што паколькі дзяржаўца галінскага ключа аб.Мікалай Лавіцкі аспрэчыў згаданы дакрэт, але без яўкі доказаў сваёй апеляцыі, то камісія пры паведамленні таго мемарыялу аб. Лавіцкаму загадала або падтрымаць апеляцыю, або адмовіцца ад яе. Адаслала на рашэнне свайму скарбоваму аддзелу рэзалюцыю ЦД літоўскай, каб камісія прыняла ў падаткі 400 зл., прынесеных біржанскім старастай аб.Жыневым за 4-х рэкрутаў 25-дымовых. Павятовы аддзел бяспекі пытаецца ў сваей камісіі, як ЦД ставіцца да дазволу выпушчаць віціны у заняты Масквой край і да ўтрымання расійскіх палонных.

---

*Гл. дакумент № 89.

Памясціла ў сваей канцылярыі сведчанне аб прысязе абываценя кс. Метазы Ціхоцкага на выкананне сваіх абавязкаў у касцёле святой Марыі Магдаліны ў Віграх. Аб. Куяўскі, дазорца 10-га цыркуля, прадставіў зробленую ім люстрацыю людзей у краснапольскай, віграўскай і яленеўскай парафіях, якую памясціла ў сваёй канцылярыі. На пытанне дазорцы 10-га цыркуля аб.Куяўскага — да каго належаць новастворaныя сяйвейская і калетніцкая парафіі, дала рэзалюцыю, што па першаму падзелу цыркуляў — да яго, а па апошняй рэзалюцыі НР камісія не прыступала да новага падзелу камісій, пакінуўшы нагляд за тымі ж самымі дазорцамі. На просьбу янаўскага кагала аб палёгцы ў раскладзе на пастаўку фурманаў адказала, што паколькі расклад фурманаў залежыць ад колькасці галоў усяго кагала з прыкагалкамі, то янаўскі кагал не можа вызваліцца ад выканання патрабаванняў камісіі. На мемарыяле аб.Занеўскага, які просіць стрымаць экзекуцыю з фальв.Глінішча, адказала, што паколькі пытанне ЦД аб градабоі па розных месцах вырашана рэзалюцыяй НР, то аддзел харчу мусіць затрымаць тую экзекуцыю.

Да таго ж сесія апоўдні. Парадкавая камісія пад старшынствам В. Шумоўскага пачала сесію ў прысутнасці абываценяў камісараў Гоувальта, гродзенскага абата Корна, кс. Свяжынскага, Гаусмана, Канопкі, супрасльскага абата Віслоцкага, Гансеўскага. Ад аб.Казіміра Абрамовіча, делягаванага да вывазу ў Варшаву срэбра, атрымала наступнае сведчанне, выданае 18 дня бягучага з манетнага двара. З Гродзенскага павета касцельнага срэбра з жалезным брудам і паяннем узважана 1593 грыўны калонскай вагі. Паколькі ж тое срэбра правезена, то адыходзіць 26 грывен і 5 лотаў. Затым застаецца 1566 гр. II лотаў, што вытварае фейну або чыстага срэбра 857 грывен, 5 лотаў, 7 гранаў, калі лічыць кожную грыўну па 83,5 зл. Гэтак жа касцельнага золата 3 грыўны,15 лотаў стварае

фейну 2 грыўны,7 лотаў, 14 гранаў. Калі лічыцъ кожную грыўну фейну па 64,3 зл., то выходзіць 159 чырвоных зл. 16 поль. зл. і 27 грош. Асобна з Гродзенскага павета зложана ахвераванага срэбра 69 грывен, 4 лотаў, якога пасля плаўкі чыстым аказалася 36 гр.1 лот, 1 гран.

З Лідската павета срэбра шчучынскага касцёла разам з ятвяскай філіяй ксяндзоў піяраў выдадзена калонскай вагой 60 грывен,7 лотаў, а пасля плаўкі адыходзіць 10 лотаў, застаецца 59 гр.13 лот., што стварае 24 гр. 14 лот. 13 гран, калі лічыць кожную грыўну па 83,5 зл. З гродзенскага касцёла калонскай вагі 28 гр. 2 лот. Пасля плаўкі адыходзіць *(неразборліва—Я.А.)* лотаў, застаецца, такім чынам, 27 гр. і 13 лот., што выдае фейну або чыстага срэбра II гр. 9 лот., 7 гран, калі лічыць грыўну ў 83,5 зл. Ксяндзоў кармелітаў лідскіх — грывен вагі калонскай 45,7 лот Пасля плаўкі зыходзіць 6 лот., застаецца, значыць, 45 гр.,1 лот, што дае фейну 18 гр, *(неразборліва—Я.А.)* лот., 7 гран, калі лічыць кожную грыўну ў 83,5 зл. З касцёла рускага абраду уніяцкага грывен вагі калонскай 15, пасля плаўкі зыходзіць I гр., застаеща 14 гр. ,4 лот., што дае фейну 5 гр., 15 лот, калі лічыць кожную грыўну па 83,5 зл. З касцёла жалудокскіх ксяндзоў кармелітаў грывен калонскай вагі 19,13 лот., застаецца пасля плаўкі 19 гр.,11 лот., што дае фейну або чыстага срэбра 8 гр., 3 лот і 4 гран., калі лічыць грыўну па 83,5 зл. З касцёла роскага грывен калонскай вагі 22, лот.12. Пасля плаўкі адыходзіць 2 лот., засталося 22 гр., 9 лот., што дае фейну або чыстага срэбра 9 гр.7 гран., калі лічыць грыўну па 83,5 зл. Ксяндзоў піяраў лідскіх грывен калонскай вагі 12, пасля плаўкі адыходзіць 1 лот, застаецца 11 гр., 15 лот., што дае фейну або чыстага срэбра 4 гр. 10 гран., калі лічыць грыўну па 83,5 зл. З лідскага касцёла грывен калонскай вагі 30, лот. 4. Пасля плаўкі адыходзіць 15 лот., застаецца 19 гр., 15 лот., што ўчыняе 12 гр., 7 лот., калі лічыць грыўну па 83,5 зл.

З Ваўкавыскага павета срэбра ахвераванага аб.Біспінкавай узважана грывен калонскай вагі 102, лотаў 6. Пасля плаўкі адыходзіць 1 гр., 6 лот., застаецца 101 гр., што учыняе чыстага срэбра 67 гр., 5 лот., 6 гранаў. Асобна срэбра касцельнага грывен калонскай вагі 138, лот.15. Пасля плаўкі адыходзіць 15 лот., застаецца, значыць,138 гр., што выдае чыстым срэбрам *(неразборліва—Я.А.)* грывен, 13 лот., калі лічыць грыўну па 83,5 зл. Асобна з ахвераванняў таго павета наступныя здадзены рэчы.Табакерка з чыстага золата з купалам у сапфіры, брыльянтавы напёрстак з апраўленай ружай, табакерка малая круглая, падарунак з чыстага золата, шпілька дыяментамі і рантам асаджоная, 2 пярсцёнкі з каменьчыкамі: адзін з вылупленым каменьчыкам і з 2 дыяментамі, а другі ў каменай аправе.

Такое вышэйзгаданае пасведчанне выдана таму аб.Абрамовічу з рэзалюцыяй скарбовага аддзела ННР у тым, што калі камісія праз аб.Абрамовіча прышле асобна абывацельскія заручэнні на тое, што срэбра з ахвераванняў прывезена да ліцейні на агульную патрэбу павета, тады атрымае асігнацыю на атрыманне належных грошаў.Усе гэтыя паперы камісія аддала свайму скарбоваму аддзелу. На мемарыял аб.Пятра Такачэўскага і Францішка Мразоўскага з просьбай вызваліць іх ад дазорскіх абавязкаў, дала рэзалюцыю, што хутка для іх будуць створаны новыя цыркулі, а памянутыя аб.дазорцы абавязаны тым часам выконваць свае публічныя абавязкі міласцю дабра. Згодна з прапановай свайго аддзела парадку аб утрыманні надзвычайных выдаткаў на патрэбныя паперы, лучыны і свечкі, выдала скарбоваму аддзелу асігнацыю на 50 зл., якія таму належыць выплаціць з фундушу шэлягавага.

Дня 28 жніўня. Сесія ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.В.Шумкоўскага пачала сесію ў прысутнасці абывацеляў камісараў Эрэнкрэйца, кс.Свяжынскага, кс.Юрэвіча, Гансеўскага, Гоувальта,

Андрэйковіча, Канопкі, супрасльскага абата кс.Віслоцкага, Сакалоўскага, Маткевіча, кс.Корна, гродзенскага абата, Зялінскага. Атрымала рапарт дазорцы 8-га цыркуля аб.Гераніма Барэцкага аб яго штодзённых чыннасцях. Адаслала за рэзалюцыяй свайго скарбовага аддзела мемарыял аб. Матэвуша Карозы з просьбай аб садзеянні поспеху дакрэта, заключанага праз дазорцу 7-га цыркуля Ігнація Барэцкага паміж васількаўскім дваром і сялянамі таго ж староства. Аддала свайму аддз. справядлівасці рапарт дазорцы рачкоўскага цыркуля аб.Гушчы, які паведамляе, што аб.Куяўскі нічога не робіць без апеляцыі сатысфакцыі на дакрэт, заключаны паміж ім і селянінам Шыманам Вярбіцкім. Камісія, маючы з святлейшай ЦД лісты прадстаўленым камісарам, менавіта, аб.Міхаіла Барэцкага, Юліяна Сільвятровіча, Яна Камінскага, Мартына Хлявінскага, Тадэвуша Сухадольца, Пятра Жылевіча і Андрэя Мільчэўскага, якім калегам належыць найперш прысутнічаць усім у Гродна, загадала тым прыбыць у Гродна на дзень 30 бягучага года для выканання сваіх абавязкаў. А паколькі тая ж ЦД замест аб.Паўла Булгарына, які сышоў на сапраўдную вайсковую службу, назначыла ў крымінальны суд Гродзенскага павета аб.Ваўрынца Табалеўскага, то камісія папрасіла апошняга прыступіць да выканання свайго ўрада.

Маючы ад аб.Філіпа Міхалкевіча адрачэнне ад парадкавага камісарства, паколькі яго здароўе з пачатку камісіі дагэтуль не палепшылася, камісія звярнулася ў ЦД за дазволам выбраць аднаго камісара з кола прэтэндэнтаў, менавіта, аб.Антона Савіцкага, Ігнація Сабалеўскага, Міхаіла Дашкевіча і Тэадора Касцялкоўскага. Атрымала рапарт аб чыннасцях дазорцы 7-га цыркуля аб. Ігнація Барэцкага з выражэннем патрэбы ўвядзення дазорцы харошскай парафіі. Загадала тое свайму аддзелу бяспекі. Перапісала два сведчанні ў тым, што эканамічная каса (гродзенская) яго каралеўскай

мосці для поспеху ўклада паміж аддзелам вайсковых патрэб ЦД і каморай яго карал.мосці другі раз выплаціла 63034 зл.15 гр. гродзенскай мануфактуры за ўзятыя сукно і скуры.

Да таго ж сесія апоўдні. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.В.Шумкоўскага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў Зялінскага, Гансеўскага, Андрэйковіча, Канопкі, супрасльскага абата кс.Віслоцкага, Гоувальта. Атрымала ад Найвышэйшага ўпаўнаважанага ВКЛ аб.Караля Прозара дзве рэквізіцыі. 1. Каб як мага хутчэй выконваліся распараджэнні ЦД. 2.Усе ўніверсалы з ковенскай ЦД зараз жа друкаваць у Гродна і высылаць крэсамі ў Коўна. Пры тым універсал Найвышэйшага ўпаўнаважанага да войска за подпісам аб.Тызенгаўза паведаміла ў ЦД, якая прысутнічае ў Гродна, і якая абавязалася яго раздрукаваць і разаслаць па паветах. Данесла парадкавым камісіям — лідскай і ваўкавыскай, — што мае квіты на срэбра, высланае з тых паветаў у ліцейню, якія гатова выдаць ім па зваротах. На мемарыяле жыдоў мястэчка Карыцін, якія просяць вызваліць іх ад дастаўкі фурманак, адказала, што нікога не можа вызваліць ад таго абавязку згодна з наказамі НР.

Дня 29 жнiўня. Сесія ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.В.Шумкоўскага пачала сесію ў прысутнасці абывацеляў камісараў Андрэйковіча, гродзенскага абата кс.Корна, Гоувальта, Гансеўскага, Канопкі, Эрэнкрэйца, кс.Юрэвіча, кс.супрасльскага абата Т.Віслоцкага, кс.Свяжынскага, Зялінскага, Лахніцкага. Прадпісала абывацелям месца Гродна, жывучых або ва ўласных дамах, або пакаморніцкі ў нанятых будынках, або прыязджаючых у месца адразу даносіць дазорцам цыркуляў, а інтэнданты абавязаны штодзень рапартаваць у магістрат. Магістрат жа павінен даваць іх у аддзел бяспекі. Атрымаўшы данясенне дазорцы 7-га цыркуля аб.Барэцкага, што васілеўскія сяляне не

слухаюцца дакрэту таго дазорцы, дала рэзалюцыю, што яшчэ ўчора загадала цалкам выканаць дакрэт дазорцы, а пры супраціўленні чакае хуткага паведамлення для пасылкі вайсковай дапамогі. З увагі на стан шляхты Гродзенскага павета, якая сапраўды знаходзіцца ў паспалітым рушанні і дзеля яе ўласнага дабра, камісія абавязала генерал-маёра Гродзенскага павета аб.Ельскага прыслаць прысягі шляхты, якая сапраўды у паспалітым рушанні пад яго камандай разам з заступцамі, так і тым, хто, падмануўшы народны давер, пакінулі месца абаронцаў Айчыны і як парушальнікі народнага права, на думку камісіі, не могуць знайсці месца верных абаронцаў дабра Айчыны. Атрымала ад ЦД у Коўна дзве рэквізіцыі. 1. Каб камісіі трымаліся ўніверсала ад дня 17 бягучага адносна паспалітага рушання з 5 або 10 дымоў. 2. Каб камісія загадала сваёй канцылярыі раздрукаваць некалькі сот экземпляраў універсала дэпутацыі ад дня 20 бягучага і прыслала ў Коуна ў канцылярыю той дэпутацыі. Пры той экспедыцыі камісія не мела прысланага ўніверсала.

Адаслала на рэзалюцыю свайго аддзела вайсковых патрэб просьбу Мар'яны Казловай аб звальненні яе сына ад жаўнерства. Атрымала ад палкоўніцы аб.Клары Трубіцкай тлумачэнне, з якога бачыць, што спрэчка пра спадчыну паміж бакамі ёсць рэч не належная да яе рэзалюцыі. Ухваліла атрыманы ад павятовага аддзела харчу ўніверсал аб дастаўках у магазіны і ўстанавіла цану на згаданы падрад. Звярнулася да генерала камандуючага цэлай збройнай сілай Літоўскай правінцыі аб.Макраноўскага з тым, каб вайсковыя камісарыяты пры паборы прадуктаў, фуражу і быдла выдавалі квіты з паказам колькасці ўзятага і цаны адпаведнага гатунку.

Да таго ж сесія апоўдні. Парадкавая камісія пад старшынствам аб. В.Шумкоўскага пачала сесію ў прысутнасці абывацеляў камісараў кс. Юрэвіча,

кс.Свяжынскага, Гансеўскага, Канопкі, Віслоцкага, супрасльскага абата, Лахніцкага, Маткевіча, Андрэйковіча, Зялінскага. Гэтым днём атрымала апрабацыю ЦД на свой уклад найма на вясковыя працы з рашэннем ад 4 ліпеня аб яго публікацыі, а таму даручыла сваёй канцылярыі надрукаваць публікацыю з амвонаў і загадала выканаць дазорцам.

Дня 30 жніўня. Сесія ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.В.Шумкоўскага, пачала сесію ў прысутнасці абывацеляў камісараў Андрэйковіча, кс. Свяжынскага, Эрэнкрэйца, Гансеўскага, Сакалоўскага, супрасльскага абата Віслоцкага, Канопкі, Мацкевіча, кс.Юрэвіча, Зялінскага, Лахніцкага. Атрымала з аддзела парадку ННР урадавыя газеты пад №№ 51—53. Атрымала рэзалюцыю ННР на сваю прапанову адносна эканамічных мястэчак, ад якіх пасэсары вымагаюць павіннасці, а менавіта ў тым, што ў эканамічных добрах яго каралеўскай мосці выкананне павіннасцяў прапісана канстытуцыйным сеймам 30 чэрвеня 1791 года і гэта стасуецца з універсалам НН ад 7 мая бягучага года. Цяперашняя камісія загадала абывацелям на працягу тыдня даставіць у магазіны па 2 камяні добра выпечаных сухароў з дыма, паводле рэквізіцыі аддзела жыўнасці ЦД пад датай 25 дня бягучага. З улікам жа цяжкасці пры рэалізацыі таго наказу і па прапанове камісіі дэлягавала ў той аддзел сваіх камісараў аб.Т.Андрэйковіча і Маткевіча. Аб.Тадэвуш Сухадолец і Павел Жылевіч выканалі прысягу на пасад камісара. Пастанавіла надрукаваць і разаслаць для публікацыі адозву ННР да абывацеляў аб дастаўцы яшчэ не выдадзеных кантаністаў. Адаслала ў свой аддз. вайск. патрэб просьбы земляроба з в.Гуцэвічы Стэфана Шанюты і Рэгіны Надзейкаўны з лясніцтва аб замене іх сыноў другімі асобамі. Аб.Мацей Мальчэўскі і Мартын Хлявінскі выканалі прысягу на камісарскі пасад.

Пакінула ў сваёй канцылярыі ноту дазорцы адэльскага цыркуля аб.Кружовіча на скаргу месца Адэльск, бо дэлягаваныя ў Адэльск на следства аб.Ясінскі і Цеханскі яшчэ не вярнуліся.

Адаслала ў свой аддз. вайск. патрэб просьбу Эльжбеты Родзевай і Мар'яны Гедройцавай аб звальненні іх мужоў ад вайсковай службы. Выдала да абываццеляў універсал з напамінам аб неадкладнай пастаўцы брычак і фурманак і папярэдзіла, што на тое 6 верасня выйдзе вайсковая экзекуцыя. Маючы ад сваіх пасланцаў паведамленне, што аддзел харчу ЦД скасоўвае сваю рэквізіцыю аб пастаўцы з кожнага дыма па 2 камяні сухароў і калі спатрэбіцца, то учыніць іншую, камісія спыніла абвяшчэнне гэтага наказу і запісала сваім дэлегатам камісарам падзяку за адмысловыя высілкі.

Выслухала прысягу на парадкавае камісарства аб.Яна Бульчынскага, узятага замест зволенага аб.Філіпа Міхалкевіча. Каб зрабіць сённяшні дзень прадукцыйным за прыбыццём новых камісараў з ЦД, з якіх многія выканалі прысягу, то ў патрэбе хуткага выканання даручаных аддзелам наказаў, нават пры адсутнасці іншых камісараў, камісія наступным чынам размеркавала асоб па аддзелах.

1. У аддз. парадку аб. Яна Камінскага. 2. У аддз. бяспекі Андрэя Мальчэўскага. 3. У аддзел справядлівасці Міхаіла Барэцкага. 4. У аддз. скарбу Яна Бульчынскага. 5.У адд. жыўнасці Мартына Хлявінскага і Пятра Жылевіча. 6. У аддз. вайс. патрэб Тадэвуша Сухадольца. 7. У аддз. інструкцый Юліяна Сільвестровіча.

Усіх іх абавязуе выконваць свае абавязкі міласцю публічнага дабра. А паколькі па арганізацыі ННР старшынства на пленумах камісіі прывязана да ўзроста і па завяршэнні старшынства раней выбранымі асобамі, камісія вызначае кола старшыняў з наступных асоб.

1.Аб.Міхаіл Барэцкі. 2. Юліян Сільвястровіч. 3. Тадэвуш Сухадолец. 4. Ян Бульчынскі. 5. Пётр Жылевіч.7. Ян Камінскі. 8. Андрэй Мальчэўскі.

Па завяршэнні гэтай чаргі прэзідэнства, згодна з прадпісаннем, новая чарга прэзідэнства павінна наступіць з кола раней выбраных і навададаных асоб у такім парадку.

1.Супрасльскі абат Т.Віслоцкі. 2. Ю.Зялінскі. 3. Е.Гаусман. 4. М.Барэцкі. 5. Ксёндз Т.Юрэвіч. 6. Т.Андрэйковіч.7. Ксёндз Ю.Свяжынскі. 8. Ю.Сільвястровіч. 9. Юзаф Лабенскі. 10. Я.Ясінскі. 11. Т.Сухадолец. 12. В.Шумкоўскі. 13.Гродзенскі абат М.Корн 14. Лахніцкі. І5. Я.Бульчынскі. 16. Фр. Гансеўскі. 17. С. Гоувальт. 18. П.Жылевіч. 19. Фр.Мучынскі. 20. Д.Маткевіч, 21. Я.Сакалоўскі. 22. Антон Эйсмант. 23. Ф.А.Пачобут. 24. М.Эрэнкрэйц. 25. М.Хлявінскі. 26. Ян Камінскі. 27. Я.Канопка. 28. А.Мальчэўскі.

Віктар Шумкоўскі, камісар, прэзідэнт.

Згодна з дыярушам *Пётр Манюшка*, рэгент парад. кам. Гродз. павета.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.550—556 адв.

№ 102. 2 верасня. Зварот Цэнтральнай дэпутацыі да абывацеляў з аб'явай аб разліку скарбовымі білетамі за харчовыя рэквізіцыі

У адпаведнасці з універсаламі ННР, першым ад 12 чэрвеня, які загадаў прынімаць ад абывацеляў прадукты у палове пабора жыўнасці, другім ад 21 ліпеня, які вызначыў правіянт і фураж з Гродзенскага, Ковенскага, Мерацкага і Прэнскага паветаў, пры тым, што, апрача таго, належыць справядліва аплаціць квіты астаўленыя ў абывацеляў за паборы ў абывацеляў прадуктаў пры

пераходах розных краевых войск ва ўсіх паветах княства Літоўскага,то ЦД паведамляе усім абываделям, што ўсе такія паборы жыўнасці, не залічаныя ў палову прагрэсіі пабора, будуць аплочаны скарбовымі білетамі, дзеля чаго кожная парадкавая камісія павінна абвясціць абывацелям свайго павета, каб яны даставілі ў свае камісіі квіты або іншыя доказы аб сапраўднасці такой пастаўкі, а парадкавым камісіям пад адказнасцю справядліва ўнікнуць у слушнасць прадстаўленых лістоў, справядлівыя прыняць, неслушныя адвергнуць і як мага хутчэй адаслаць завершаную справу ў ЦД. Тыя ж камісіі атрымаюць выпадаючыя на свой павет сумы, падзеляць іх паміж абывацелямі і зараз жа затрыманыя ў сябе абывацельскія квіты адашлюць у скабовы аддзел ЦД разам з справай сваёй адказнасці.

Даны у Гродна на сесіі дня 2 верасня 1794 года.

Антон Лахніцкі, старшыня.

За пячаткай.

БПАНК,с.1090, л.521.

№ 103. Рапарт аб дзеяннях аддзела харчу гродзенскай камісіі з 1 па 7 верасня

Рапарт аб штодзённых чыннасцях з 1 па 7 дня верасня 1794 г. аддзела жыўнасці парадкавай камісіі Гродзенскага павета ў аддзел жыўнасці ЦД ВКЛ.

Дзень 1 верасня. Па прынесенаму аб.Ваўкавіцкім квіце аб дастаўцы у магазін і каманду правіянту і фуражу, выдадзеных па апошніх універсалах з фальв. Вольна, Галавачы, Дубрава і Котры, падаў думку на 1054 зл. 10 грош., а аб.Завістоўскаму за дастаўлены у магазін правіянт і фураж за квітам пісара пагадзіўся на 234 зл. у палове прагрэсіі. Зрабіў спецыфікацыю з мытнай рэвізіі солі і селядца, прывезеных на віцінах купцамі з Кралеўца, і паслаў аб.Юзафа Тавянскага за атрыманнем

у гродзенскім магазіне прапорцыі па прадпісанню ЦД. Звярнуўся да віленскага генерал-маёра Корсака аб прадстаўленні 6 жаўнераў у дапамогу аб.Тавянскаму. Звярнуўся ў аддз. парадку за брычкай з парай коней для аб.Тавянскага, пасланага забраць соль з віцін. Да рэзалюцыі НР даў каманду ўстрымаць экзекуцыю фуража з фальв. Глінішчы у пасэсіі аб.Занеўскага згодна з рэзалюцыяй пленума камісіі ад 27 жніўня. Такую ж спецыфікацыю солі і селядцу даў пісару гродзенскага магазіна аб.Бярвінскаму па наказу ЦД. Звярнуўся ў аддз. парадку за фурманкамі для вывазу рэштак саломы, якую кіраўніцтва фальв. Котры ахверавала на 180 вазах. Атрымаў рэзалюцыю аддз.харчу ЦД на сваю ноту ад 30 жніўня адносна асігнавання 10 тыс. поль.зл. для аплаты абывацельскіх квітаў за пабраную жыўнасць і аб павелічэнні служачых канцылярыі з далучэннем пытання — ці мае ўжо аддзел надзейных падрадчыкаў для закупак, на што, апошняе, даў адказ. Гэтак жа на зварот генерала аб.Хлявінскага ў тым, каб з прычыны набліжэння да Гродна войск багаж правіянту быў у гатоўнасці, наказаў дзяржаўцам добраў эканоміі яго карал. мосці прыспешыць з правіянтам і фуражом.

Загадаў пісару галынскага магазіна аб.Цярлецкаму хутчэй змалоць 58 бочак жыта па сіле папярэдняга патрабавання і распарадзіцца аб выпечцы з той мукі сухароў, а аб выніку таго хутчэй паведаміць. Атрымаў следства аб.Гансеўскага аб скаргах абывацеляў — прывозчыкаў правіянта ў галынскі магазін — на пісара таго магазіна аб.Цярлецкага, што перадаў у сваю канцылярыю для распараджэння. Атрымаў з аддз.харчу ЦД асігнацыю на 10 тыс.зл. у трох частках — асігнацыямі, а чацвертую наяўнасцю і загадаў тую суму запісаць касіру аб.Вінскаму.

У адпаведнасці з наказам аддзела вайсковых патрэб асігнаваў у сакольскі магазін на каманду з 53 чал. і 59

коней палка Азулевіча, стаячую там, а таксама выдаў асігнацыю ў 56 зл. на мяса той жа камандзе са сваёй касы. Папрасіў палкоўніка аб.Трубіцкага даць жаўнераў для вывазу саломы на 20 фурманках з каўшоўскага ключа і 20 — з катранскага ключа. Разгледзіў скаргу сялян канюшаства ВКЛ аб немагчымасці выдачы правіянта з-за выпадку градабою і каб мытны дазорца палічыў гэта за слушную прычыну, аб чым праінфармаваў аддзел. Зрабіў спецыфікацыю прывезенай на віцінах з Кралеўца ў Гродна солі і селядца і даручыў пісару гродзенскага магазіна аб.Бервінскаму атрымаць прадукты у пастаноўленай ЦД прапорцыі.

Дня 2 верасня. Звярнуўся да пленума парадкавай камісіі, каб.аддз. парадку разаслаў у ключы эканоміі яго карал.мосці загад аб правіянце і фуражу. Тое ж учыніў у аддз. парадку адносна 2 брычак пад касу і канцылярыю свайго аддзела. Загадаў свайму касіру аб.Вінскаму выдаць за верасень 60 зл. пісару крынскага магазіна аб.Кеўлічу, а 40 зл. — упраўляючаму таго магазіна па квіту. Прызначыў адвакатам свайго аддзела Якуба Гембарскага і выслухаў ад яго прадпісаную прысягу, а таксама увёў у канцылярысты Антона Дзяконскага. Хадайнічаў перад аддз.парадку аб дастаўцы 10 фурманак паракконных, патрэбных для паслугаў магазіна. Атрымаў з ЦД ВКЛ данясенне, што абываці, згодна з апошнімі ўніверсаламі, прынамсі ад 21 ліпеня бягучага года, павінны даць квіты на правіянт і фураж, дастаўлены у магазіны, або пабраны праходзячымі камандамі, на што рашыў паведаміць у ЦД колькасць такіх квітоў пасля падсумавання. На мемарыяле пісара гродзенскага магазіна аб.Бервінскага аб павелічэнні пенсіі адказаў, што не адважваецца на вызначэнні квоты без прадпісання стаўкі камісарыятам і параіў звярнуцца туды, куды належыць. На мемарыял аб.Кеўліча аб больш шырокім месцы пад магазін адказаў, што аб.Маткевіч, дэлегаваны для канчатковага

агляду магазінаў, задаволіць тую патрэбу, а што да ўтрымання коней на скарбовым фуражы, то звярнуўся за наказам камісарыята Гродзенскага павета і з настаўленнем аб вырашэнні сваіх наспелых пытанняў.

Выдаў квіт аб.Боуфалу на пастаўку з 36 дымоў фальв.Кустын 27 камянёў сухароў, 4 асьмін круп, 2 бочак аўса і 36 камянёў сена. Асігнаваў з магазіна 2 капы кулевай саломы для 1616 чал.корпуса пікінераў пад камандай палкоўніка аб.Гінета. Выдаў асігнацыю касіру свайго аддзела аб.Вінскаму, каб ён за квітамі выплаціў пісару гродз. магазіна аб.Бервінскау 60 зл. утрымання за месяц верасень, адвакату аб.Гембарскаму — 60 зл., тром наглядальнікам магазінаў — 120 зл., пратакалісту магазіна — 40 зл. і вартаўнікам магазіна — 16 поль.зл. Разгледзіўшы прысланы на пленум камісіі мемарыял аб.Сільвестровіча, адказаў, што сялян у сваіх дварах трэба задаволіць асобна, а фальварак гэтак жа асобна распарадзіцца аб сваіх дварах. Выдаў квіт аб.ксяндзам базіліянам сіняльскім за пастаўку правіянту і фуражу розным праходзячым камандам 10 бочак і 12 гарцаў аўса, 1523 камянёў 30 фунтаў сена, 3 асьміны 4 гарцы круп, 17 камянёў 39 фунт.хлеба, 5 гарцаў 4 кварты солі, камень саланіны, а таксама за ўзятыя гатовымі грашыма 10 зл. 20 грошаў. Выдаў квіт кс.базіліянам кузніцкім за дастаўку ідучым 4,5 камянёў сухароў. *(неразборліва — Я.А.)* гарцаў ячменных круп, 2 асьмін 12 гарц. аўса і 6 камян.сена. Па звароту палкоўніка аб.Рымінскага, адрасаваўся да аддз.вайск.патрэб з тлумачэннем, каб правіянт і фураж быў выдадзены па асігнацыі галынскага магазіна.

Дзень 3 верасня. Загадаў касіру свайго аддзела аб.Вінскаму выдаць за квітам аб.Станіславу Гоувальту за дастаўлены правіянт і фураж рэштак не складаючай роўную колькасць да прагрэсіі ў *(неразборліва — Я.А.)* зл. польскіх асігнацыямі і 105 поль.зл. наяўнасцю. Звярнуўся да пленума камісіі Гродзенскага павета з

пытаннем — гэтым днём прывезены правіянт і фураж трэба аддаць у мясцовы магазін ці вярнуць назад, а таксама, ці трэба пераносіць гродз.магазін на новае месца. На што атрымаў рэзалюцыю, што галынскі магазін трэба перавезці ў Саколку, а тутэйшы застаецца да далейшага загаду. Атрымаў рапарт дазорцы 7-га цыркуля аб.Барэцкага, які даносіць, што выканаў даручанае сваім аддзелам. Выдаў гродз. стольніку аб.Эйсманту пасведчанне на пастаўку правіянта і фуража па рэквізіцыі аб.Рымінскага, стаячага з камандай пры багажу калоны генерала аб.Рыхліцкага, з абяцаннем аплаты згодна з наказам ЦД ад (?) бягучага месяца. Атрымаў з аддзела жыўнасці ЦД загад у тым, што раз з 15 віцін у Гродна і 3-х у Мастах і адной у Янаве ўласнікі тых віцін ахвяравалі ў публічны скарб з кожнай віціны па 9 бочак солі і адной — селядцу, то гэтым і вырашана, аб чым неадкладна паведамлена ў Гродна Бервінскаму, а ў Мастах — аб.Юзафу Тавянскаму.

На зварот Цэхановіча, камандуючага галоўным лазарэтам пры калоне генерала аб.Серакоўскага, даць да Саколкі правіянт на 300 чал. і фураж на 84 коней, аддзел загадаў дазорцам індурскага і сакольскага магазінаў даставіць тое за квітам. Атрымаў рапарт пісара галынскага магазіна аб.Цярлецкага у тым, што згодна з папярэдняй рэзалюцыяй паслаў правіянт і фураж у Гродна, аднак з-за перамены гэтага рашэння ЦД накіраваў фурманкі ў Саколку з просьбай пісара Антановіча прыняць іх у свой магазін. Аб. Цярлецкаму загадана рэшткі ад багажу Хлявінскага везці не ў Гродна, з-за кепскасці ўсяго правіянту, а ў Саколку і выпячы сухары у Малым Куце. Загадаў свайму касіру аб.Вінскаму заплаціць пекару Тамашу Міцкевічу 4 поль. зл. згодна з кантрактам за выпечку хлеба з адной бочкі мукі. Загадаў пісару сакольскага магазіна аб.Антановічу выдаць ад дня 5 верасня на 14 дзён для 41 чал. і 48 коней палка коннай літоўскай гвардыі правіянт і фураж,

а таксама грашыма на 324 фунтаў мяса для 41 чал. Выдаў 43 зл. 22 грош. асігнацыю свайму касіру аб.Вінскаму. На пару коней, прызначаных з аддз. парадку пад транспарт канцылярыі, загадаў пісару магазіна аб.Бервінскаму выдаць за квітамі аб.Бронца на кожнага каня 2 гарцы аўса і 13 фунтаў сена.

Дня 4 верасня. Атрымаў дазвол аддз.жыўнасці ЦД ВКЛ на дамоўлены падрад аб закупцы прадуктаў з той, аднак, заўвагай, каб аддз.харчу гродзенскай камісіі ў гэтым пункце паступіў зручнейшым чынам для хуткага атрымання жыўнасці. Паслаў у аддз. жыўнасці ЦД рапарт аб правіянце і фуражу ў магазінах. Выдаў па асігнацыі аддз.жыўнасці ЦД загад 10 купцам, што прыбылі віцінамі з Кралеўца ў Гродна, здаць у магазіны 135 бочак солі і 15 бочак селядцу. Загадаў аб.Юзафу Тавянскаму закантрактаваць берагам здатнае судна з статкам пад вываз солі і селядцу і тое аплаціць у Гродна. Папрасіў генерала аб.Корсака прыдаць яшчэ 6 жаўнераў для дапамогі аб.Тавянскаму забраць соль. На мемарыяле язерскіх мяшчан напісаў рэзалюцыю, што дазорца агледзіў спамянуты недахоп і аб тым далажыў у аддз.харчу. Загадаў пісару гродзенскага магазіна аб.Бервінскаму даць 8 камянёў сена для коней скарбовага аддз.ЦД з аплатай кожнага камяню па 1 поль.зл. Загадаў аддз.вайсковых патрэб выдаць 2 крытыя брычкі пад канцылярыю. Атрымаў рапарт пісара індурскага магазіна аб.Абухоўскага, якому вызначыў 60 зл. месячнай пенсіі, а ***(неразборліва – Я.А.)*** асігнаваў на месяц з касы 40 зл.

Загадаў аб.Бервінскаму зараз жа выканаць рэквізіцыю аддз. вайсковых патрэб аб выдачы сена на кожнага каня, якія выбіраюцца з 200 дымоў пад брычкі. Выдаў генералу, князю і аб.Чартарыжскаму квіт на тое, што па наказу ЦД ВКЛ у якасці ахвеpавання ўзята ў магазін з 2 віцін 20 бочак солі. Пераслаў аб.Юзафу Тавянскаму, пасланаму забіраць соль, дыспазіцыю аб тым, каб ён

кампенсаваў за гарэлку з віцін, якую купцы дадуць па дамоўленасці паміж сабой. Адаслаў да дазорцы аб.Казлоўскага мемарыял аб.Якуба Петрашэўскага для высвятлення таго, ці мае спамянуты Петрашэўскі сапраўды дым з агародам. Адаслаў да мясцовага дазорцы 2 мемарыялы: адзін янаўскіх жыдоў, а другі арандатараў кузніцкага ключа для следства і падачы думак. На мемарыял дазорцы Станіслава Аржахоўскага, пададзе-нага ад імя Бжастоўскіх, адказаў, што не займаўся паборам фуражу з іх і прапанаваў адрасавацца ў належную камнцылярыю. Атрымаў рапарт дазорцы Лявона Камінскага на пленум камісіі, на які даў адказ па ўсіх пытаннях, а рэзалюцыю адаслаў крэсамі.

Дзень 5 верасня. Атрымаў рапарты пісара крынскага магазіна аб.Кеўліча і пісара гродзенскага магазіна аб.Бервінскага аб стане іх магазінаў. Усё прысланае абагуліў і аддаў генералу Грабоўскаму з запытаннем, як пастуніць з правіянтам і фуражом у выпадку падыходу непрыяцеля. Выдаў квіт аб.Антону Савіцкаму на дастаўлены у магазін фураж з 11 дымоў з дзяржавы фальварка Шастакі згодна з універсалам ЦД ад 25 ліпеня бяг.года. На мемарыяле шляхты з вак.Білняны рэкамендаваў дазорцу адказаць толькі той шляхце, якая сядзіць на агародах. Мемарыял сялян кумяльскага ключа і карыцінскіх мяшчан адаслаў да тамтэйшага дазорцы для выніковай рэзалюцыі. Па наказу генерала камандуючага аб.Ежы Грабоўскага загадаў пісарам крынскага і індурскага магазінаў выдаць правіянт і фураж па білетах прадстаўніка аддз. парадку гродзенскай камісіі аб.Мальскага (?) і па квітах генерал-маёра Паўла Грабоўскага. Загадаў пісарам сакольскага і галынскага магазінаў штотыднёвыя рапарты аб магазінах прысылаць рэгулярна крэсамі. Выдаў квіт камісару аб.Станіславу Кулікоўскаму, пасланаму ў абоз аб.Трубіцкага пад Жыдамлю, на прыняцце рэштак правіянту і фуражу, якія засталіся па-за патрэбай абоза.

Дзень 6 верасня. Адрасаваў у аддз.жыўнасці ЦД прапанову, каб пры заключэнні кантрактаў з абывацелямі на неадкладныя патрэбы войскаў генеральны касір аб.Дучэўскі выдаў на коней пры скарбовай касе 10 камянёў сена з аплатай кожнага каменю па I зл. Загадаў дазорцы 22-га цыркуля аб.Міхаэлісу паведаміць аб.кузніцкай парафіі, што з нагоды павелічэння магазіна правіянт і фураж трэба адвозіць у сакольскі магазін. Загадаў пісару гродзенскага магазіна аб.Бервінскаму прыняць з герасімоўскага ключа 91 камянёў і 18 фунтаў сена, а па наказу свайго аддзела ад 14 жніўня — яшчэ 152 камяні. Атрымаў дзве рэквізіцыі — адну ад палкоўніка стральцоў аб.Трубіцкага, стаячага ў Жыдамлі з камандай міліцыі Лідскага павета, другую ад палкоўніка корпуса стральцоў Лідскага павета аб.Нарбута, стаячага ў Скідзелі, з просьбай выдаць правіянт і фураж, для задавальнення чаго загадаў прадстаўніку парадкавай камісіі Гродзенскага павета аб.Кулікоўскаму аддаць за квітамі спамянутым камандам рэшткі правіянту і фуража, што засталіся ў Жыдамлі. Па рэквізіцыі палкоўніка аб.Рымінскага, які маецца пры калоне і багажах генерала Хлявінскага, выдаў квіты на правіянт і фураж з сакольскага магазіна. Пастанавіў неадкладна ажыццявіць наказ ЦД аб заснаванні магазіна ў Лунным і куды належыць прынімаць правіянт і фураж з бліжэйшых Ваўкавыскага і Лідскага паветаў. Паслаў загад пісарам галынскага, крынскага, сакольскага, індурскага і гродзенскага магазінаў зрабіць рэестры непастаўленым у магазіны правіянце і фуражу і тое зараз жа прыслаць у аддзел для справаздачы.

Павел Жылевіч.

За пячаткай.

БПАНК, с.1030, л.560—564.

№ 104. Справаздача гродзенскай камісіі з 1 па 7 верасня

Рапарт штотыднёвы штодзённых чыннасцяў парадкавай Камісіі Гродзенскага павета ад дня І да дня 7 месяца верасня 1794 года, пасланы ў ЦД ВКЛ.

1794 года 31 месяца жніўня сесія не адбылася з-за адсутнасці матэрый у той святочны дзень.

Дня І верасня, сесія ранняя. **Парадкавая камісія пад старшынствам гродзенскага абата аб.кс.Мацея Корна пачала сесію ў прысутнасці абывацеляў камісараў кс.Тадэвуша Віслоцкага, супрасльскага абата, кс. Юзафа Свяжынскага, кс.Тадэвуша Юрэвіча, Францішка Гансеўскага, Яна Канопкі, Ігнація Лахніцкага, Віктара Шумкоўскага, Юзафа Зялінскага, Феліцыяна Адланіцкага Пачобута. Аб.Ян Каменскі прысягнуў на пасад камісара. На сваю прапанову аб заснаванні камісарыятаў у карпусах атрымала адказ генерала Макраноўскага у тым, што ён гатовы садзейнічаць гэтаму, бо ведае слушнасць повадаў такой рэквізіцыі і абы толькі яны выдавалі білеты адпаведна з універсалам НН і ННР ад 12 чэрвеня. Гэты адказ аддала ў сваю канцылярыю. Адаслала за рэзалюцыяй аддз.бяспекі пісьмовую просьбу інтэнданта васількаўскай парафіі. Адаслала на выкананне аддз.жыўнасці і парадка зварот аб.Хлявінскага́, датаваны 30 жніўня бяг. года з-пад Цыганава. Прысланага Машэўскім з мерацкай камісіі Селяву з пашпартам і выпіскай з экзамену таго схопленага Селявы адаслала ў аддз.бяспекі. Адаслала ў віцэадміністрацыю скаргу кумяльскіх мяшчан на неадпавядаючы валоданню зямлі расклад фуража. Адаслала ў аддз.вайсковых патрэб скаргу маркграфа палаца Мараўскага Каржанеўскага на адміністрацыю лазарэта таго палаца. Адаслала за рэзалюцыяй таго ж аддзела мемарыял аб.Ключэўскага, які жадае вярнуць 25-дымовых рэкрутаў. Адаслала туды мемарыял Глінскай,**

жадаючай вызваліцца ад дачы рэкрутаў. Адаслала ў аддз.харчу мемарыял сялян літоўскага канюшаства, жадаючых вызваліцца ад дачы фуража. Мемарыял Русціцкай, якая скардзіцца на сейненскіх дамініканаў за невыкананне дамовы з яе мужам, адаслаў у аддз. справядлівасці разам з тлумачэннем дазорцы цыркуля сейненскай парафіі. На мемарыяле Янушкевіча, жадаючага памясціцца ў якое-небудзь месца, адказала, што камісія не можа задаволіць такому жаданню з-за адсутнасці такога месца. Адаслала ў аддз. вайсковых патрэб за вынікам просьбу аб.Навіцкага аб звальненні яго з паспалітага рушання.

Да таго ж сесія апоўдні. Парадкавая камісія пад старшынствам гродзенскага абата кс.М.Корна пачала сесію ў прысутнасці абываценяў камісараў супрасльскага абата Т.Віслоцкага, Т.Юрэвіча, В.Шумкоўскага, Ф.Гансеўскага, Яна Камінскага, Ю.Зялінскага, Я.Канопкі, Ф.Пачобута. У сувязі з заявай занемунскага каменданта аб.і кс.Лаўрыновіча папрасіла аб. і кс.Свяжынскага, як гродзенскага дэкана, уважыць мізэрнасць утрымання таго пры канцылярыі і дабіцца ад пасэсара аб.Марэцы адпаведнай даплаты. Са скарбовага аддз. ЦД ВКЛ атрымала наказ аб падрыхтоўцы фурманак з 200 дымоў пад акты канцылярыі, які адаслала на выкананне ў аддз.парадку. На мемарыяле седляра Камінскага са скаргай на захоп каня Іванскім адказала, што такая скарга не належыць да камісіі і таму была адаслана ў адпаведны суд. Адаслала на рэзалюцыю аддз. справядлівасці выпіску з пісьмовай скаргі аб.Багуслава Стрыенскага. Аддала на рэзалюцыю аддз.жыўнасці такі ж мемарыял аб. Сільвестровіча, які жадае вызваліць свой двор ад дачы фуража замест падданых з-за абрабавання двара непрыяцелем і немагчымасці, таму, сапраўднай выдачы фуражу.

Дня 2 верасня. Сесія ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам гродзенскага абата, аб.кс.М.Корна пачала

сесію ў прысутнасці аб.камісараў Ю.Свяжынскага, Т.Вісလоцкага, кс.Т.Юрэвіча, Ю.Зялінскага, Я.Канопкі, Ф.А.Пачобута, Ф.Гансеўскага, Т.Андрэйковіча, Мартына Хлявінскага, Яна Бульчынскага, С.Гоўвальта, Якуба Гаўсмана, В.Шумкоўскага, Андрэя Маткевіча. Камісія выдала асігнацыю ў скарбовы аддзел на 1 тыс.зл. на ўтрыманне палонных па звароту аддз.бяспекі. Адаслала на разалюцыю аддз.вайск. патрэб мемарыял аб.Данкевіча адносна вайсковых матэрый. Аддала на поўную сатысфакцыю аддз.жыўнасці атрыманую дыспазіцыю літоўскай ЦД адносна ўніверсалаў: першага з ННР ад 12 ліпеня, які загадвае прынімаць прадукты ад абываццеляў у палову прагрэсіі жыўнасці, другога — ад 21 ліпеня, каб прадукты, узятыя пры вайсковых пераходах за квітамі падначаленых, былі аплочаны ў прагрэсіі і каб камісіі такія квіты абываццеляў адсылалі ў ЦД. Паведаміла НН аб выпадаючых на край Літоўскай правінцыі крытычных абставінах. Мемарыял кузніцкіх жыдоў, жадаючых дапамогі пры выбары фурманоў з жыдоў, якія жывуць у прыватнікаў і належаць да кузніцкага прыкагалка, адаслала за пажаданай дапамогай дазорцу кузніцкага цыркуля. Мемарыял віцэадміністратара каралеўскіх добраў аб.Эйсманта са скаргай на празмернае абцяжарванне эканамічных добраў правіянтам адаслала за думкай у аддз.харчу.

Сюды ж сесія апоўдні. Парадкавая камісія пад старшынствам гродзенскага абата кс.М.Корна пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў кс. Свяжынскага, Ясінскага, Зялінскага, Андрэйковіча, Мальчэўскага, Камінскага, Бульчынскага, Пачобута, кс.Юрэвіча, Сакалоўскага, супрасльскага абата Т.Вісလоцкага, Ф.Гансеўскага, Канопкі. Падпісала асігнацыю на 96 зл. за эстафету да НН, якую скарбовы аддзел павінен выплаціць, за квітам сакратара з даходаў публічных падаткаў. Паведаміла намесніку брыгады Стржэніцкаму аб нежаданні служыць у яго Базыля Вардымакава.

Дазволіла выехаць дамоў аб.Шумкоўскаму. Адаслала на рэзалюцыю аддз.вайсковых патрэб мемарыял аб.Рогавай з паведамленнем аб прыпыненні выдачы рэкрутаў. Аддз.бяспекі паведаміў на пленуме рапарт аб.Хлявінс-кага, генерал-лейтэнанта, што непрыяцель забраў у Аліце дэташмент на ўзнаўленне маста.

Дня 3 верасня. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.гродзенскага абата кс.М.Корна пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў супрасльскага абата кс.Т.Віслоцкага, Свяжынскага, кс.Т.Юрэвіча, Я.Бульчынскага, ФА.Пачобута, П.Жылевіча, Ю.Зялінскага, Ф.Гансеўскага. На запытанне аддз.жыўнасці пастанавіла вярнуць прыбыўшыя з Галынкі фурманкі, а што да гродзенскага правіянта, то рашыла дачакацца генерала Грабоўскага. Адаслала ў аддз.справядлівасці на ягонае заключэнне рапарт дазорцы 7-га цыркуля аб.Барэцкага са скаргай на непаслушэнства васількоўскіх сялян і мяшчан, не слухаючых ухваленага аддз. справядлівасці дакрэта дазорцы. На рашэнне аддзела бяспекі аддала прадстаўлены наменнікам пінскай брыгады аб.Стамецкім мемарыял. Выдала пасведчанне эканамічнай касе яго карал.мосці, што на падставе заручэння дырэктара суконнай мануфактуры аб.Бульчынскага яна выплаціла 15870 зл. і 6 грош., а рэшткі ўзяла з гродз.мануфактуры краёвай манетай.

Дня 4 верасня. Сесія ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.гродзенскага абата кс.М.Корна пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў супрасльскага абата Т.Віслоцкага, кс.Свяжынскага, кс.Т.Юрэвіча, Ф.А.Пачобута, Я.Сакалоўскага, Ф.Гансеўскага. Адаслала ў аддз.жыўнасці рапарт дазорцы пунскага цыркуля аб.Клімашэўскага аб размяшчэнні казарм, а з гэтага на немагчымасць завершыць начаты перапіс насельнікаў. Па хадайніцтву генерала Хлявінскага, які асабіста аб тым прасіў, занатавала ў дыярушы наступныя арданансы 1.Тадэвуш Касцюшка, Найвышэйшы

начальнік нарадовай збройнай сілы, загадваю генерал-лейтэнанту Хлявінскаму па атрыманні гэтага ардананса зараз жа паехаць і ўзяць пад сваю каманду прызначаную яму дывізію. Даны у абозе пад Мокатавам, дня 7 жніўня 1794 г. Тад.Касцюшка. Гэтае сведчанне, напісанае рукой генерала Грабоўскага, у якасці вышэйшага загада перасланa генералу Хлявінскаму ад дня 4 верасня на распараджэнне генерала Грабоўскага. 2.Ардананс генерала Вяльгорскага з загадам усім камендантам карпусоў літоўскага войска дакладваць генерал-лейтэнанту Макраноўскаму, датаваны у Гродна II жніўня 1794 г. 3.Ардананс генерала Вяльгорскага генерал-маёру Паўлу Грабоўскаму адносна маршаў і транспартаў літоўскіх войскаў, датаваны 20 жніўня 1794 г. у Гродна. 4. Ардананс генерала Макраноўскага даны у абозе пад Бярозай I жніўня. 1794 г. у якім той вызначае розныя абароты літоўскаму войску. 5. Ардананс генерала Макраноўскага з Беластоку дня 30 жніўня 1794 г. якім ён загадвае генералу Хлявінскаму здаць каманду над усім корпусам генералу Меену. Запісала і ўхваліла дакрэт дазорцы аб.Лавіцкага на мемарыял Моўшы Хаймовіча, які аддала на выкананне дазорцы. Атрымала і памясціла ў сваей канцылярыі сведчанне квасаўскага плябана кс.Антона Алузінскага аб выкананні аб.Юзафам Сезянеўскім прысягі на пасад дазорцы 11-га цыркуля. Адаслала на рэзалюцыю аддз. жыўнасці мемарыял язерскіх мяшчан, якія адмаўляюцца даваць фураж з-за недахопу зямлі пад пасевы. Загадала аддз.скарбу выдаць за квітам аб.Сабалеўскага 780 зл., узятыя гродзенскай поштай за розныя эстафеты і пасылкі. Атрымала загад скарбовага аддзела ННР залічыць на публічную карысць рознае срэбра і золата касцёлаў, пакінуўшы тое толькі тым касцёлам, якія служаць па абраду рэлігіі, а таксама, каб парадкавая камісія са згодай месца Гродна ўзяла ў скарб Рэчы

Паспалітай грошы Брандшата. Адаслала на сатысфакцыю літоўскай ЦД думку аддз. вайсковых патрэб адносна выплаты жалавання афіцэрам пікінераў.

Да таго ж сесія апоўдні. Парадкавая камісія Гродзенскага павета пад старшынствам гродзенскага абата аб.кс. М.Корна пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў Я.Бульчынскага, супрасльскага абата Т.Віслоцкага, Андрэйковіча, Я.Камінскага, М.Хлявінскага, кс. Ю. Свяжынскага, кс.Т.Юрэвіча, рэктара. На пытанне каменданта генерал-лейтэнанта аб. Грабоўскага адказала, што па загаду ННР плату афіцэрам пікінераў трэба выдаваць выключна па ўказам генерал-лейтэнанта аб.Макраноўскага. Камісія, атрымаўшы дырэктыву НР забраць рэшткі срэбра з касцёлаў, пакінуўшы толькі патрэбнае па абрадам рэлігіі, вызначыла на гэты пабор падпалкоўніка, прадстаўніка НН аб.Улінскага, а ў дапамогу яму дэлягавала сваіх камісараў — афіцыяла кс.Кадлубоўскага, дэкана кс. Седлікоўскага, Андрэя Мальчэўскага і Яна Камінскага. Атрымала адрас крымінальнага суда Гродз.павета аб заплаце за друк галасоў па справе публічнага абвінавачвання падскарбія аб.Дзяконскага і берніцкага старасты аб.Жынева.

Дня 5 верасня, сесія ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.кс.супрасльскага абата Т.Віслоцкага пачала сесію ў прысутнасці камісараў кс.Т.Юрэвіча, Ф.Гансеўскага, Я.Бульчынскага, Ю.Зялінскага, Ф.Пачобута, Т.Андрэйковіча, Я.Ясінскага, Мартына Хлявінскага, М.Корна. На свой зварот у літоўскую ЦД з пытаннем — ці можна аплочваць вайсковыя патрэбы па рэквізіцыях генерала Грабоўскага, тады як камісіі прадпісана рабіць гэта выключна на загадах генерал-лейтэнанта Макраноўскага, ЦД адказала, што паколькі генерал-лейтэнант Грабоўскі сапраўды атрымаў на гэта дазвол генерала Макраноўскага, то ягоныя рэквізіцыі маюць сілу, і такі адказ аддала на захаванне сваёй

канцылярыі. Па звароту каменданта аб.Грабоўскага выдала на месяц верасень асігнацыю палкоўніку пікінераў Гінету і падначаленым яму афіцэрам на 2191 зл. 20 грош., а палкоўніку *(неразборліва—Я.А.)* і яго афіцэрам пікінераў 2500 зл.23 грош., што загадала выплаціць з публічнага скарба па квітах тых палкоўнікаў свайму скарбоваму аддзелу. На выніковую рэзалюцыю аддз.вайсковых патрэб аддала мемарыял Ежы Янулевіча са скаргай на свайго дзяржаўцу за затрымку грошаў.

Адаслала ў аддз. жыўнасці за рэзалюцыяй мемарыял месца Карыцін сялян кумяльскага ключа са скаргай на свайго дзяржаўцу, які прымусіў аддаваць яму ўвесну сабранае збожжа, чым і робіць гэтых людзей нястачлівымі восенню і зімой. Дазволіла свайму калеге аб.Пачобуту выехаць з Гродна. Адаслала на рэзалюцыю аддз.жыўнасці мемарыял шляхцічаў Більмінаў, жадаючых вызваліцца ад дачы фуража. Па звароту скарбовага аддзела адносна прэтэнзіі злотніка аб.Даўмана, які па загаду аддзела значны час займаўся ўзвешваннем срэбра, камісія згадзілася ўзнагародзіць таго абываценя 200 зл. і загадала выплаціць іх па асігнацыі. Вызначыла сваёй канцылярыі двайную пенсію з прычыны намечанага астаўлення Гродна, што вырашана выканаць пад час надзвычайнай паездкі. Адаслала на рэзалюцыю аддз. вайсковых патрэб мемарыял Яна Максімовіча, пікінера з Чарлёнскага ключа. Адказала на мемарыяле адэльскіх мяшчан, што паколькі тарыф прадпісвае паставіць брычкі ў месца Адэльск, то тое месца павінна звярнуцца ў адэльскі двор за сатысфакцыяй, якую яна сама не ў моцы задаволіць.

Да таго ж сесія апоўдні. Парадкавая камісія пад старшынствам гродзенскага абата аб.кс. М.Корна пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў кс.Ю.Свяжынскага, А.Мальчэўскага, Яна Камінскага, Ю.Зялінскага,

Я.Бульчынскага, Сакалоўскага, Ф.Пачобута. Звярнулася ў аддзел жыўнасці за вынікам на зварот каменданта генерал-лейтэнанта аб. Грабоўскага аб дастаўцы фуража з крынскага і індурскага магазінаў для калоны войска пад камандай генерал-маёра Паўла Грабоўскага. Згодна з прапановай ЦД, камісія прадставіла каменданту літоўскага войска генералу аб.Грабоўскаму, што магазіны належыць запаўняць з памежных паветаў, прынамсі, індурскі праз Лідскі павет, а крынскі — Ваўкавыскі. Абавязала аб.Бложа Мальскага ўзяць на сябе абавязак абілечвання выдачы фуража з крынскага і індурскага магазінаў для калоны войска пад камандай Паўла Грабоўскага і таму ж аб.прапісала інструкцыяй ягоныя чыннасці. Рапарт дазорцы 4-га цыркуля аддала на выніковую рэзалюцыю аддзелам адпаведна з матэрыямі, якія іх тычацца, а зроблены па схеме перапіс жыхароў аддала ў аддз.жыўнасці. Дэлягавала кс. Юзафа Свяжынскага і аб.Камінскага зрабіць справаздачу аб рэштках срэбра ў паненак брыгітак. Мемарыял аб.Тхарніцкага са скаргай на гродзенскага купца, жыда Баярскага, узяўшага асігнацыі, передала таму купцу з загадам падаць выпіску на ранняй сесіі наступнага дня.

Дня 6 верасня, сесія ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам гродзенскага абата, кс.аб.М.Корна пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў кс.Свяжынскага, Сухадольца, Сакалоўскага, Ясінскага, Эрэнкрэйца, Канопкі, кс.Вісłоцкага, супрасльскага абата, Гансеўскага, Зялінскага, кс.Юрэвіча, Камінскага, Бульчынскага. Атрымала ўрадавыя газеты пад №№ 54-60. Дазволіла камісару аб.Тадэвушу Сухадольцу аддаліцца на 4 дні па ўласных інтарэсах. Загадала свайму аддз.парадку выканаць рэквізіцыю аддз.парадка ННР аб прысылцы штотыднёвых рапартоў згодна з схемай атрыманых экспедыцый. Загадала свайму аддз. інструкцый задаволіць наказ аддз.парадку НР, які патрабуе

паведаміць аб колькасці касцёлаў, плебаній і кляштараў у кожным дазоры разам з іх назвай і веравызнаннем. Атрымала з аддз. парадку НР загад, каб камісія распарадзілася як можна прыстойней і регулярней паведамляць аб выкананні розных распараджэнняў і ўніверсалаў сваімі аддзеламі. Заклікала аб. і камісара Яна Камінскага займацца даручанай справай у імя міласці да Айчыны. Для прадстаўлення поўнай інфармацыі аб чыннасцях камісіі і яе аддзелаў, загадала сваім сакратарам паведаміць камісару аб.Камінскаму акты сваіх аддзелаў і ва ўсім аказаць яму дапамогу. На мемарыяле аб.Тхарніцкага, прысланага жыдом Шмуйлам Баярскім у выглядзе выпіскі, адказала, што жыд Баярскі павінен прадаць аб.Тхарніцкаму сукно па дамоўленай цане як гатовымі грашыма, так і скарбовымі асігнацыямі. Аддала на вырашенне свайго аддз. вайсковых патрэб мемарыял жаўнеркі Канстанцыі Пуцілоўскай, якая просіць вызначыць ёй дапамогу пасля смерці мужа. Камісар аб.кс.Юзаф Свяжынскі ад'ехаў на тыдзень у Каменку выконваць сваю дэпутацыю. На данясенні дазорцы сакольскага цыркуля аб.Дабравольскага, які звязаўся з камандуючым генерал-лейтэнантам аб.Ежы Грабоўскім, дала рэзалюцыю, што не трэба даваць ніякіх дагавораў на пажаданыя генералам аб. Рымінскім вазы, паколькі яны ужо не патрэбны адпаведна рэзалюцыі таго генерала Грабоўскага.

Сюды ж сесія апоўдні. Парадкавая камісія пад старшынствам гродзенскага абата аб.кс.М.Корна пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў Эрэнкрэйца, Бульчынскага, супрасльскага абата кс.Т.Віслоцкага, Ясінскага, Зялінскага, Гансеўскага, Камінскага, кс.Юрэвіча, Я.Канопкі. Загадала дазорцам цыркуляў як мага хутчэй данесці ў камісію колькі ў каторым дазоры знаходзіцца

касцёлаў, плебаній і кляштараў, а таксама цэркваў рознага вызнання і патлумачыць іх назвы. Мемарыял эканамічных стральцоў новадворскай кватэры, якія скардзяцца на навязванне начальствам лясных павіннасцяў, передала віцэ-адміністратару гродзенскай эканоміі аб.Эйсманту з просьбай даць тлумачэнне. Атрымала з аддз.жыўнасці ЦД ВКЛ паведамленне, што правіянт і фураж Ваўкавыскага павета ўжо забраны з магазінамі, а таму ўсё, што можна закупіць у зручнейшых месцах, леш паставіць у Крынкі, а з бліжэйшых — у Луннае з тым, каб камісія вызначыла ў Луннае пісара для прыёму і выбрала там месца. Для выканання гэтага паведамлення прызначыла ў лунінскі магазін са свайго аддз.жыўнасці аб.Юзафа Шэльбаха, якому загадала зараз жа выехаць з Гродна.

Мацей Корн, гродзенскі абат, камісар, старшыня.
За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.565—569.

№ 105. Дыяруш дзеянняў гродзенскага аддзела харчу з 7 да 13 верасня

Рапарт штодзённых чыннасцяў аддзела жыўнасці парадкавай камісіі Гродзенскага павета, выпісаны з дыяруша ад дня 7 да 13 месяца верасня 1794 года і пасланы у аддзел харчу ЦД ВКЛ.

Дзень 7 верасня. Загадаў сакольскаму кагалу даць 2800 фунтаў мяса на тыдзень па квітах маёра аб.Цэхановіча, будучага пры лазарэце калоны генерала камандуючага аб.Серакоўскага, абяцаючы таму кагалу заплату. Папрасіў генерал-маёра аб.Грабоўскага вярнуць у свой аддзел са Свіслачы рэгістратара Якуба Губарскага. Выдаў квіт в.Лапенкі, якая належыць гродзенскаму магістрату, за пастаўку ў гродзенскі магазін правіянту і фуража, менавіта, 7 камянёў і 32 фунты сухароў, 7 гарцаў

круп, 5 асьмін і 14 гарцаў аўса, 7 камянёў сена, і 32 фунты,13 куляў саломы. Па звароту аддз.парадку загадаў пісару гродзенскага магазіна аб.Бервінскаму даць 200 камянёў сена па квіту аб.Сухаржэўскага пад коней. якія пастаўлены з 200 дымоў. Выдаў гродзенскаму земскаму суддзе аб.Эйсманту квіт на 819 зл. 6 грош. на аплату правіянта і фуража з гродзенскага ключа. Паслаў у аддз.жыўнасці ЦД ВКЛ рапарт аб штотыднёвых чыннасцях свайго аддзела.

Дзень 8 верасня. Выдаў квіт за дастаўку правіянта і фуража з 70 дымоў сяла Русоты гродзенскага пробашства, менавіта — на 42 камяні сухароў, 3 асьміны і 16 гарцаў круп, 3 бочкі, 7 асьмін, 2 гарцы аўса, 42 камяні сена, 70 куляў саломы і 42 зл. за саланіну. Загадаў пісару магазіна выдаць харч на 7 дзён для экскарта з 70 коней па звароту каменданта, генерал-лейтэнанта аб.Грабоўскага з разліку 13 фунтаў сена і 2 гарцы аўса на кожнага каня. Звярнуўся ў аддз.парадку за вызначэннем 50 фурманак для вывазу ў Гродна сена з галынскага магазіна. Загадаў выдаць трохдзённы правіянт з індурскага магазіна на 9 коней і 6 чал. па рэзалюцыі генерал-лейтэнанта аб.Грабоўскага на імя аб.Седлікоўскага, пасланага з Саколкі ў Эйшышкі. Назначыў, згодна з універсалам ад 25 ліпеня б.г., правіянт і фураж з в.Грандзічы аб. Грандзічаў, належачай да магазіна, на адну пару пад каманду аб.Улана. Загадаў прэвальскаму двару выдаць па ўказу генерала Грабоўскага правіянт і фураж на 8 коней у камандзе высланага віленскага генерал-маёра аб.Корсака і за яго квітам. Забяспечыў упаўнаважанага Гродзенскага павета аб.Боуфала квітам на *(неразборл.— Я.А.)* камянёў сена, абяцаючы аплаціць кожны камень на 40 грош. гатовымі грашыма, а другую палову асігнацыямі. Распарадзіўся аб 50 конных фурманках для вывазу з Кундзіна ў Гродна 500 камянёў сена для выпраўленага з тым аб.Боуфала.

Дзень 9 верасня. Запэўніў інфлянцкага каноніка аб.кс.Міхаіла Куржанецкага аб аплаце гатовымі грашыма па 24 грош. за кожны камень пры пастаўцы тым 960 камянёў сена. Распарадзіўся ў аддз. парадку аб фурманках для вывазу 960 камянёў сена з добраў Ельня інфлянцкага каноніка аб.кс.Куржанецкага. Назначыў пісарам Лунінскага магазіна, толькі што створанага, аб.Яна Сырасека, якому выдаў інструкцыю і выслухаў таго прысягу. Загадаў аб.Багушэвічу закантрактаваць нешматлікія ў Гродна судны на публічны скарб, а дамовы з уласнікамі прысылаць у аддзел. Выслаў аб.Юзафа Плоцкага з падпісанай інструкцыяй і загадаў перавезці ў прэвальскі магазін з Лішкава і іншых месцаў Мерацкага павета магазіны па загаду ЦД. Загадаў палкоўніку аб.Трубіцкаму даць у дапамогу аб.Ю.Плоцкаму каманду для перавозкі сена з Галынкі ў Гродна. Загадаў аб.Цярлецкаму выдаць з галынскага магазіна сена, колькі таго можа памясціцца на 50 фурманках. Загадаў пісару гродзенскага магазіна ўзяць у магазін соль і селядзец з 6 віцін, прыбыўшых з Кралеўца ў Гродна па наказу ЦД. Загадаў аб.Трубіцкаму даць жаўнераў для суправаджэння сена з Ельні ў гродзенскі магазін згодна з выдадзенымі аддз. парадку білетамі. Запэўніў стольніка Гродзенскага павета аб.Эйсманта аб аплаце 100 вазоў сена з разліку 40 грош. за камень асігнацыямі, а другую палову гатовымі грашыма.

Дзень 10 верасня. Паведаміў пленуму парадкавай камісіі Гродзенскага павета, што для вывазу закупленага ў абывацеляў сена, вельмі патрэбнага магазіну, аддз.парадку ўчора заняўся наймам фурманак. Загадаў пісару сакольскага магазіна аб.Лодзе ўжыць прысутных жаўнераў для выбару з абывацеляў завінавачанага правіянту і фуражу згодна з прадстаўленым рапартам. Выдаў 2 квіты: адзін — слонімскаму стольніку аб.Адаму Шукевічу на здачу ў гродзенскі магазін ахвераваных з

2 віцін 18 бочак солі і 2 бочак селядцу згодна з наказам ЦД, другі — старазаконнаму Іцку Гершановічу гэтак жа з 2 віцін 18 бочак солі і 2 бочак седядцу. Загадаў пісару Бервінскаму задаволіць прапанову пленума парадк. камісіі Гродз. павета аб вызначэнні другой часткі каралеўскай стайні пад коней аб.Грабоўскага, а што да неабходнасці яе рамонту, то запытаўся аб гэтай справе ў аддз.парадку. Звярнуўся ў аддз. парадку за брычкамі з 200 дымоў, патрэбнымі для вывазу 250 камянёў сена, закантрактаванага ў аб.Дыбоўскага з аўгустаўскага ключа. Папрасіў у палкоўніка корпуса пікінераў аб.Гінета жаўнераў, каб выцягнуць з вады 3 плыты, купленыя на вайсковыя патрэбы.

Запэўніў ваўкавыскага скарбніка аб.Дзяконскага, што ён атрымае платы за прададзеныя ў гродзенскі магазін 600 камянёў сена па 40 грош. за кожны камень гатовымі грашыма, а другую частку асігнацыямі, а таксама папрасіў жаўнераў у палкоўніка аб.Трубіцкага для збору фурманак пад загаданае сена. Выдаў шамбеляну аб.Краскоўскаму квіт аб атрыманні ад яго, згодна з наказам ЦД, 18 бочак солі і 2 бочак селядцу, ахвераваных з 2 віцін, што вярнуліся з Крулеўца. Замест Сырасека паставіў пісарам луненскага магазіна аб.Усу Сатуса Калповіча, якому ўручыў прадпісаную інструкцыю і ад якога выслухаў адпаведную прысягу. Загадаў аб.Бервінскаму ў адпаведнасці з сённяшнім указам і прадпісаннем ЦД забраць з 6 віцін аб.Альшэўскага, якія вярнуліся з Кралеўца, соль і селядзец у гродзенскі магазін. Загадаў касіру свайго аддзела аб.Вінскаму выплаціць 20 зл.за паперы і аправу пратаколаў магазінных пісароў за квітам сакратара свайго аддзела аб.Бронца. Загадаў гродзенскаму суддзе аб.Андрэйковічу даставіць I тыс.камянёў сена на падыходзячае ў Гродна войска пад аплату кожнага каменю на 40 грош. гатовымі грашыма, а палову — асігнацыямі.

Дзень 11 верасня. Атрымаў рапарт дазорцы 8-га цыркуля аб.Геранiма Барэцкага аб тым, што ротмiстр аб.Крычынскi ўзяў за бiлеты правiянт i фураж для абозу генерала аб.Грабоўскага, стаячага пад Гродна. У той час дазорца не ведаў аб запасах падуладнага крынскага магазiна i сам загадаў даць з дыма па 2 камянi сена згодна з апошнiм унiверсалам. На той рапарт даў належны адказ. Атрымаў рапарт пiсара iндурскага магазiна аб.Абухоўскага з паведамленнем аб стане магазiна i па ягонаму жаданню асiгнаваў з касы 8 зл.18 грош. Папрасiў у аддз.парадку 50 фурманак для перавоза сена з iндурскага магазiна ў Гродна. Звярнуўся да аб.Трубiцкага за 6 жаўнерамi для пабору фурманак i пабору сена, належнага па бiлетах паручнiка. Атрымаў зварот аддз.жыўнасцi ЦД ВКЛ з тым, каб выслаць свайго камiсара для нагляду за праектам падрыхтоўкi да зiмы i з гэтай мэтаю паслаў камiсара свайго аддзела аб.Хлявiнскага. Згодна з наказам ЦД выдаў квiт аб.Юдыцкаму за здачу ў гродзенскi магазiн солi i селядца з 2 вiцiн, а аб.Несцяровiчу — з адной. Загадаў касiру свайго аддзела аб.Вiнскаму выплацiць за квiтам аб.Бервiнскага 40 зл. месячнай пенсii Плоцкаму, прынятаму ў пiсары магазiна. Абяцаў дзяржаўцу скiдзельскага ключа аб.Круповiчу заплацiць за дастаўку 50 сена грашыма палову, кожны камень па 40 грош., а за другую палову асiгнацыямi. Загадаў аб.Макоўскаму вызначаную пад коней Грабоўскага стайню ачысцiць ад фуражнага склада.

Дзень 12 верасня. Выдаў квiт аб.Даманскаму, якi згодна з указам ЦД здаў у гродзенскi магазiн з адной вiцiны 9 бочак солi i бочку селядцу. На атрыманыя з крынскага, галынскага i сакольскага магазiнаў штотыднёвыя рапарты аб iх стане з далучанымi рэестрамi i пытаннямi, даў адпаведны адказ. Паслаў пiсару галынскага магазiна аб. Цярлецкаму загад

змалоць наяўныя ў магазіне 58 бочак рэштак жыта і выслаць ў сакольскі магазін 100 камянёў сена. Нагадаў аддз.парадку аб фурманках для перавоза 100 камянёў сена з галынскага у сакольскі магазін па атрыманых білетах, пры чым загадаў палкоўніку аб.Трубіцкаму прыставіць жаўнераў для выбару фурманак пад спамянутае сена. Загадаў касіру свайго аддзела аб.Вінскаму выплаціць 330 зл.— дзве часткі асігнацыямі, а адну гатовымі грашыма — Хаіму Давідовічу з Ражанкі за купленыя ў таго 3 плыты дроў на патрэбу войска. Абавязаў шляхетны гродзенскі магістрат выбраць сярод сябе 2 асоб, а з старазаконнікаў таксама 2-х для ацэнкі дрэва, якое ляжыць на берагу Нёмана пад замкам і якое належыць старазаконнаму Вербелунскаму. Замест Якуба Губарскага назначыў рэгістратарам свайго аддзела Казіміра Горскага, ад якога выслухаў прадпісаную прысягу і выдаў 40 зл. на харчовае ўтрыманне. Выдаў аб.Радзівілу квіт аб атрыманні ад яго гродзенскім магазінам 12 бочак солі і 2 бочкі селядцу з 2 віцін, якія прыбылі з Кралеўца. Выдаў квіт віцебскаму абознаму аб.Равуцкаму на атрыманне 9 бочак солі і бочкі селядцу з адной віціны, што вярнулася з Кралеўца. Загадаў пісару гродзенскага магазіна выдаць 500 камянёў сена па наказу аддз.парадку і па квіту канюшага аб. Сухачэўскага. Па звароту скарбовага касіра аб.Кучэўскага загадаў аб.Бервінскаму выдаць 2 бочкі аўса для коней пры касе з аплатай бочкі па 30 зл. Загадаў сакольскаму кагалу выдаць з кожнай галавы па І фунту мяса, абяцаючы, што пры прадстаўленні квітоў кагал атрымае платы са скарба па 4 медных гроша за кожны фунт. Атрымаў ад касіра свайго аддзела рапарт аб стане касы.

Дзень 13 верасня. Атрымаў з аддз.жыўнасці ННР універсал адносна складкі і вывазу харчу і фуража ў войска з далучэннем прадпісання аб зборы збажыны з

палёў і своечасовым засеве, які пастанавіла зараз жа раздрукаваць і пераслаць крэсамі да сельскіх дазорцаў. Мемарыял стральца з Белага Берага Паўла Лодзі, паведамлены на пленуме, адаслаў на меркаванне дазорцы і калі даносчык сапраўды разораны, то паступіць так, каб ён не спазніўся з засевам поля. Загадаў пісару гродзенскага магазіна аб.Бербінскаму з запасаў лою зрабіць свечы на патрэбы лазарэта. Загадаў дазорцу аб.Дзевятковічу спыніць пакупку плытоў, абавязаўшы уласнікаў сплавіць іх у Гродна з пасведчаннем, колькі хто мае дрэва і якога гатунку, і з перасцярогай, каб прадавалі тое пасля таго, як аддз.харчу паведаміць камісіі. З аддз. харчу ЦД ВКЛ атрымала ўказ нарыхтаваць каля 4 тыс.гарцаў гарэлкі замест солі, за якой пасланы аб.Тавінскі. Учыніў 2 рэквізіцыі, адну — аб.Яленскаму, пасланаму для садзеяння ў выдачы правіянта і фуража з індурскага і крынскага магазінаў для калоны генерал-маёра войск ВКЛ аб.Грабоўскага і справаздачы аб тым у Гродна. Другую, такую ж, аб.Кулікоўскаму, дэлягаванаму ў Жыдамлю за касіра з тым, каб ён прыслаў рапарт аб сваіх чыннасцях.

Мартын Хлявінскі, камісар.

Павел Жылевіч, камісар.

Згодна з дзённікам *М.Бронц*, аддз. жыўнасці.

БПАНК, с.1090, л.570—574.

№ 106. Дыярыуш гродзенскай камісіі з 7 па 14 верасня

Штотыднёвы рапарт штодзённых чыннасцяў парадкавай камісіі Гродзенскага павета ад дня 7 да дня 14 месяца верасня 1794 года, пасланы у найсвятлейшую ЦД ВКЛ.

1794 года месяца 7 дня. Сесія ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Я.Ясінскага пачала сесію

ў прысутнасці аб.камісараў Гаўсмана, Мальчэўскага, супрасльскага абата кс.Віслоцкага, гродзенскага абата кс.Корна, Канопкі, Жылевіча, Маткевіча, Лахніцкага, Эрэнкрэйца, Бульчынскага. Загадала свайму аддз. вайсковых патрэб задаволіць просьбу генерал-маёра аб.Паўла Грабоўскага аб патрабаванні ў абывацеляў выдаць збеглых дэзерціраў з 5-га палка і корпуса стральцоў і потым даставіць іх у войска, а генерал-маёру параіла знайсці сродкі для хутчэйшага вышуку тых дэзерціраў. Атрымаўшы данясенне, што сяляне эканамічных ключоў не жадаюць малаціць збожжа, пекчы сухары, адвозіць правіянт і фураж у магазіны, загадала сялянам гэтую паслугу, патрэбную для войск Рэчы Паспалітай, выконваць старанна разам з шарварачнай павіннасцю, а экзекуцыю гэтага дастаўляць/даручыла дазорцам цыркуляў. Пры тым запэўніла абывацеляў, што ў якім бы месцы не хапала аўса ў вызначаную ўніверсалам прапорцыю фуража, тады у магазіны прызначаецца замест аўса палова жыта, або за 2 гарцы аўса адзін гарц жыта.

Дня 8 верасня. Сесія апоўдні. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Я.Ясінскага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў Камінскага, Бульчынскага, Зялінскага Андрэйковіча, Мальчэўскага, Эрэнкрэйца, кс.Віслоцкага, Канопкі, гродзенскага абата кс.Корна, Гаусмана, Сакалоўскага, Хлявінскага, Жылевіча, Гансеўскага, Маткевіча. Атрымала ўрадавыя газеты за №№ 61—63. З ННР атрымала рэзалюцыю аб распазнаванні квітоў і разліку належнасці за здадзены абывацелямі фураж войскам Рэчы Паспалітай. Згодна з прадпісаннем літоўскай ЦД ад дня бягучага 2-га, парад. камісія прыступіла да выбару камісараў, якім належыць разгледзіць і вырашыць справу кантрыбуцыйнай дэпутацыі месца Гродна, а ступаючы шляхам таго прадпісання, тайным галасаваннем выбрала са свайго кола наступных асоб па большасці галасоў: 1.Станіслава

Гоувальта, маючага 9 крэсак. 2.Тадэвуша Сухадольца —8 крэсак. 3. Ігнація Лахніцкага — 8 крэсак. 4.Яна Камінскага — 8 крэсак. 5. Тадэвуша Андрэйковіча — 5 крэсак, якіх міласцю Айчыны абавязала выканаць указ ЦД.

Дня 9 месяца, сесія ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам Я.Ясінскага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў Гансеўскага, Зялінскага, кс.Віслоцкага, кс.Юрэвіча, Канопкі, Жылевіча, гродзенскага абата кс.Корна, Сакалоўскага, Маткевіча, Андрэйковіча, Бульчынскага. Загадала свайму аддз. вайсковых патрэб ажыццявіць указ аддз. вайсковых патрэб НР аб павелічэнні рук рамеснікаў на гродзенскай мануфактуры для выдзелкі сукон, патрэбных войскам Рэчы Паспалітай. Прыняла ў аддз. жыўнасці перапіс жыхароў і іншых артыкулаў ад дазорцы 4-га цыркуля аб.Яна Казлоўскага і дазорцы 21-га цыркуля Якуба Клімашэўскага. Маючы мемарыял арандатара в.Канюхі жыда Лейзара Іцкавіча аб тым, што 2 бузацёрскія дэзерціры нарабілі ў ягонай карчме шмат шкод, а таксама рапарт дазорцы аб.Барановіча, што гэтыя дэзерціры збеглі з абозу аб.Грабоўскага з-пад Мінска і зараз знаходзяцца ў палкоўніка міліцыі Лідскага павета аб.Нарбута, камісія загадала таму палкоўніку Нарбуту выдаць іх разам з рэчамі і коньмі. Памясціла ў аддз.жыўнасці люстрацыю цыркуля, зробленую дазорцам 16-га цыркуля аб.Мікалаем Дзевятковічам. Згодна са зваротам камандуючага ў Літве генерала аб.Грабоўскага, выдала са свайго скарбовага аддзелу 4917 зл.24 гр. на корпус стральцоў аб.Сахоцкага. З нагоды скаргаў абывацеляў на затрымку курса скарбовых білетаў, якія не бяруць ні купцы, ні едучыя на таргі людзі, абавязала гродзенскі магістрат курс скарбовых білетаў абвяшчаць на кожным таргу ў месцы Гродна з бубнамі, вырашаючы ўсе надзвычайныя пытанні на таргах з-за няўзяцця білетаў. Па жаданню генерала камандуючага аб.Ежы Грабоўскага паслала

свайго камісара аб.Андрэйковіча дамовіцца, каб па загаду генерала разабраць другі мост на р.Нёман пад Гродна і спусціць яго ўніз. Гэтую чыннасць камісія даручыла свайму аддз. парадку.

Сюда ж сесія апоўдні. Парадкавая камісія пад старшынствам аб. Я.Ясінскага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў кс.Корна, Андрэйковіча, Зялінскага, Хлявінскага, Маткевіча, Гансеўскага, Канопкі, кс. Віслоцкага, Камінскага, Сакалоўскага, Эрэнкрэйца. Паколькі па паведамленню аддз.парадку з-за памяшчэння коней генерала камандуючага і прыбываючых афіцыялістаў ЦД у стайні замка не могуць памясціцца брычкавыя коні павета, то камісія загадала аддз. жыўнасці адвесці для коней другую частку магазіна. З нагоды атрымання тлумачэння віцэ-адміністратара гродзенскай эканоміі аб.Эйсманта на мемарыял стражнікаў і стральцоў новадворскай кватэры, камісія як на мемарыял тых стральцоў, так і на мемарыял Разаліі Скіндэравай дала рэзалюцыю ў тым, што ў сучасным стане Айчыны ніхто не можа ўхіліцца ад роўнага цяжару ўтрымання краёвага войска, а таму не можа вызваліць ад прадпісанай універсаламі дастаўкі правіянтаў, падаткаў і іншых паставак. Памясціла ў сваёй канцылярыі паведамленне генерала камандуючага аб.Ежы Грабоўскага, што перад выездам да вайсковых калон ён пакідае замест сябе для падпісвання рэквізіцый генерал-ад'ютанта аб.Радзішэўскага, загады якога камісіі трэба лічыць поўнавартымі. Мемарыял палкоўніка яго карал.мосці аб.Багуслава Стрыенскага, пададзены у двух пунктах, прынамсі, па-першае, каб дазорца выехаў на месца ўчыненай скаргі супраць сялян, па-другое, аб паслабленні экзекуцыі за недастаўку 50-дымовых рэкрутаў і вымаганні за іх 600 зл., камісія аддала ў свой аддз.вайсковых патрэб з загадам даць меркаванне гэтым жа днём. На моцы рэзалюцыі ННР ад 30 жніўня адносна распазнавання квітоў і разліку належнасці для

абываценляў за фураж, выдадзены у войска Рэчы Паспалітай, камісія выбрала сярод сябе наступных 5 асоб: аб.Міхаіла Барэцкага, кс.Тадэвуша Юрэвіча, Віктара Шумкоўскага, Дамініка Маткевіча, Андрэя Мальчэўскага, якім трэба паступаць у справе пагашэння квітоў за выдадзены у войска фураж згодна з вышэйзгаданай рэквізіцыяй, а паколькі з выбраных асоб аб.Барэцкі і Шумкоўскі зараз адсутнічаюць у Гродна, то загадала ім прыбыць на працягу 3-х дзён.

Дня 10 верасня. Сесія ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Я.Ясінскага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў Сухадольца, Гансеўскага, Зялінскага, кс.Юрэвіча, кс.Корна, кс.Віслоцкага, Сакалоўскага, Эрэнкрэйца, Канопкі, Андрэйковіча, Хлявінскага, Камінскага, Мальчэўскага, Бульчынскага. Атрыманае з аддз.вайсковых патрэб ННР пытанне — ці атрымала камісія ахвераваныя аб.Дамейкам 100 цэнтнераў жалеза — загадала адказаць свайму аддз.вайсковых патрэб. Аб.Юліян Сільвестровіч выканаў прысягу на парадкавае камісарства.У сувязі з паведамленнем, што мерацкая камісія выбрала месцам сваёй юрысдыкцыі Сейны, адкуль выдае квіты і загады да абываценляў Гродзенскага павета, звярнулася ў ЦД за рэквізіцыяй, каб мерацкая камісія ўстрымалася ад распараджэнняў у Гродзенскім павеце і больш іх не выдавала, асабліва, калі гродзенская камісія не думае адмахнуцца ад вайсковнх патрэб і хутка аб тым распарадзіцца. На мемарыял жыдоў язерскага прыкагалка, якія просяць вызваліць іх ад пабору пагалоўнага і ад наказанай пастаўкі двух фурманаў да павятовых брычак, адказала рэзалюцыяй, што не ў стане нікога вызваліць ад падаткаў, зараз вельмі патрэбных Айчыне. Што да фурманаў, то загадала свайму аддз. парадку пры дастаўцы аднаго фурмана адтэрмінаваць дастаўку другога на 2 тыдні. Аддала на думку свайго аддз. вайсковых патрэб мемарыял аб.зямянскага суддзі Гродзенскага павета Андрэя Эйсманта і віцэ-адміністра-

тара гродзенскай эканоміі Мацея Эйсманта са скаргай на моцны цяжар працяглай экзекуцыі за 50-дымовых рэкрутаў. На мемарыял дзяржаўцы хадалінскага ключа аб.Мікалая Лавіцкага камісія дала такую рэзалюцыю: паколькі Лавіцкі не прадставіў ніякай выпіскі на грунтоўнасць сваёй апеляцыі на скаргу жыда Лейзара Хаймовіча ў суд дазорцы, а камісія 4 дня бягучага ўхваліла і загадала выканаць дакрэт дазорцы, то яна ўхіляецца ад справы са спасылкай на ўласную выпіску. Другі раз адпісала маёру аб.Цэхановічу аб загадзе вызваліць таго ад фурманак, узятых на лазарэт. Адаслала ў свой аддз. бяспекі прускага дэзерціра, прысланага дазорцы 5-га цыркуля аб.Дзяржынскім.

Да таго ж сесія апоўдні. Парадкавая камісія пад старшынствам аб. Я.Ясінскага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў кс.Віслоцкага, Камінскага, Андрэйковіча, Зялінскага, кс.Юрэвіча, Канопкі, Сільвестровіча, кс.Корна, Гансеўскага, Сухадольца. Атрымаўшы рапарт дазорцы новадворскага цыркуля аб тым, што каманда генерала аб.Рымінскага, прахадзіўшая трактам праз Новы двор, дагэтуль не вярнула коней, узятых у яго цыркулі пад вайсковыя экіпажы, паведаміла тое данясенне слова ў слова аб.Рымінскаму з загадам разабрацца і ўчыніць сатысфакцыю па той скарзе. Скаргу віцэ-адміністратара гродзенскай эканоміі аб. Мацея Эйсманта на паручніка аб.Кланіцкага з палка генерал-маёра Гродзенскага павета аб.Казаноўскага аб учыненым наездзе на навасельскі ключ і захопе там эканамічнага каня, передала падпалкоўніку таго палка Няміру з пажаданнем адказу. Маючы адасланы ЦД мемарыял ксяндзоў кармелітаў і пасведчанне генерал-маёра Гродзенскага павета аб. Ельскага адносна паспалітага рушання, камісія лічыць ксяндзоў вольнымі ад паспалітага рушання, але абавязанымі даць 50-дымовых рэкрутаў.

Дня 11 верасня, сесія ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Я.Ясінскага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў Камінскага, Зялінскага, Андрэйковіча, кс.Віслоцкага, Гансеўскага, кс.Юрэвіча, Канопкі, Сільвестровіча, гродзенскага абата кс.Корна. Аддала ў аддз. справядлівасці мемарыял зямянскага суддзі Гродз. павета аб.Анзельма Эйсманта са скаргай на невыкананне мяшчанамі і прадмяшчанамі сакалоўскімі павіннасцяў, апісаных інвентарамі. На паведамленні парадкавага камісара аб.кс.Юзафа Свяжынскага аб выкананні дэлегацыі ў Каменцы і жаданні адлучыцца на 26 дзён для візітацыі касцёлаў, выказала падзяку за выкананне даручэння камісіі, а таксама загадала хутчэй прыбыць у Гродна для абавязкаў камісара, адклаўшы на вальнейшы час свае дэканскія візіты. Просьбу жыдоўкі Цырулічкі Давыдавай аб дапамозе ёй з-за ўзяцця яе мужа ў абоз генерал-маёра аб. Ельскага перадала гродзенскаму кагалу з тым, каб той паведаміў камісіі ці маецца на гэтае фундуш. На зварот скарбовага аддзела ЦД аб рамонце Гродзенскага замка, камісія дэлягавала камісара аб.Ясінскага, які данёс, што ўбачыў 60 вакон, пабітых звыш прадстаўленага рэестра. Таму камісія падцвердзіла скарбоваму аддзелу ЦД пра неабходнасць такога рамонту пры тым, што сама не мае для гэтага фундуша.

Атрымаўшы ад многіх пасэсараў эканамічных добраў яго каралеўскай мосці, а асабліва ад зямянскага суддзі аб.Эйсманта і гродзенскага стольніка аб. Эйсманта ж, скаргі на тое, што шмат дымоў у ключах іх пасэсій абцяжарана спісам 5 і 50-дымовых рэкрутаў звыш сапраўдных тарыфаў, загадала сваймý аддз. вайсковых патрэб скарацць набор рэкрутаў і расцягнуць выкананне, пасля чаго ўжо затрымаць экзекуцыю. Задала сваёй канцылярыі раздрукаваць і разаслаць для публічнага ведама паведамленне літоўскай ЦД аб шчаслівым вызваленні Варшавы ад непрыяцельскага

войска. Загадала свайму аддз.вайсковых патрэб разабрацца з просьбай пікінера Сільвестра Лебядзінскага ў яго жаданні зволіцца з ваеннай службы або атрымаць абмундзіраванне.

Сюды ж сесія апоўдні. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Я.Ясінскага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў Сакалоўскага, Зялінскага, Камінскага, Бульчынскага, Андрэйковіча, Гансеўскага, Сухадольца, Канопкі, Сільвестровіча, Мальчэўскага, кс.Вісłоцкага, Гоувальта, кс.Корна, Лахніцкага, Жылевіча. Прыняла пададзенае меркаванне аддз. справядлівасці наконт выканання павіннасцяў мяшчанамі і прадмяшчанамі Саколкі, якое дазволіла выдаць бакам. Аддала на вырашэнне свайго аддзела справядлівасці данясенне дазорцы 7-га цыркуля аб.Ігнація Барэцкага аб тым, што сяляне Васількаўскага староства і далей не жадаюць выконваць свае павіннасці. Паўторна прыказала свайму аддз. жыўнасці для забеспячэння гродзенскага магазіна, дзе стаяць розныя коні, ад шкоды аббіць і добра умацаваць шчытамі пустыя месцы, на што пасля будзе прыняты панесены кошт. На зварот скарбовага аддзела ЦД адказала, што раз ужо аб.Даўнаровіч, назначаны ЦД заняць па ўраду маёнткі ваявод Касакоўскіх, зараз адрапартаваў у ЦД спіс усяго начыння, якое ён набыў за час місіі, то застаецца толькі паведаміць ЦД з просьбай аб звароце яго ў павятовую канцылярыю.

Аддала на выкананне зварот генерал-маёра Гродзенскага павета аб арышце дэзерціруючай шляхты і загад даставіць з дымоў кажухі для затрыманых у абозе асоб. Загадала расследваць у аддз.справядлівасці скаргу аб.Матэвуша Карозы на сялян Васількаўскага староства, якія падзялілі між сабой грунты пад пасеў і знішчылі рогавы капец. Адаслала ў аддз.вайсковых патрэб данясенне Мікалая Унукоўскага аб знаходжанні ў Ліпску дэзерціраў. Па прапанове аддз.парадку ужыць

віціны пад мост у Долі ў час вызначаны аб.генералам камандуючым, вызначыла са свайго кола камісара аб. Зялінскага, які мусіць дадаць да 3-х віцін пад мастом яшчэ тры іншыя і аб гэтым распарадзіцца. Мемарыял Томаша Пятровіча, які просіць зволіць яго або яго бацьку ад жаўнерскай службы, паведаміла венгерскім ксяндзам камедулам з просьбай выправіцца наконт той службы.

Дня 12 верасня, сесія ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Я.Ясінскага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў кс.Корна, Андрэйковіча, Гансеўскага, Камінскага, Сільвястровіча, кс.Юрэвіча, кс.Віслоцкага, Канопкі, Зялінскага, Эрэнкрэйца, Сухадольца, Мальчэўскага, Бульчынскага, Хлявінскага, Сакалоўскага, Гаусмана, Лахніцкага. Рапарты дазорцаў аб. Барановіча і Дабравольскага аб учыненых камандамі палкоўніка аб.Нарбута, генерала Сцыпёна і маёра Цэхановіча шкодах, уцісках пры паборы вазоў у крэсах передала праз пасланага са свайго кола аб.Сухадольца генерал-лейтэнанту, камандуючаму аб.Ежы Грабоўскаму, які, узяўшы іх, даў загад вышэйзгаданым камандзірам трымацца прадпісаных арданансаў.

Сюды ж сесія апоўдні. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Я.Ясінскага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў Хлявінскага, кс. Віслоцкага, Зялінскага, Лахніцкага, Канопкі, Жылевіча, Камінскага, кс. Корна, Гансеўскага, Маткевіча, Сухадольца, Андрэйковіча. Аддала ў свой аддзел вайсковых патрэб 2 дызерціраў з другога палка, дастаўленых пры рапарце дазорцы калецкай парафіі аб.Шаўмана. Паведаміла мерацкай камісіі, якая зараз у Святых Язерах, пра абароты краёвага войска і належных асцярожнасцях. Паведаміла аддз.жыўнасці пра першыя ўніверсалы дазорцы 4-га цыркуля аб.Яна Казлоўскага. У адказ на данясенне дазорцы сакольскага цыркуля аб.Дабравольскага выслала прыказ генерал-лейтэнанта аб.Ежы Грабоўската як трэба паступаць пры паборы фурманак

маёру аб.Цэхановічу і загадала ўсім аб.дазорцам без ведама камісіі не выдаваць білетаў на вазы па пабочным указам. Аддала на рашэнне аддз. вайсковых патрэб скаргу аб.Вечаркоўскага на аб. Пранеўскага, прысланую з візай генерал-лейтэнанта аб.Ясінскага на пленум камісіі. Мемарыял сялян астроўскага ключа адаслала дазорцам з тым, каб яны рашылі пытанне іх згодна з існучымі звычаямі пры аплаце падаткаў. Адаслала дазорцам мемарыял сялян Астрыны чарлёнскага ключа з загадам, каб яны разабраліся ў пытанні выплаты падатку згодна з практыкай даўнейшых звычаяў.

Дня 13 верасня, сесія ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Я.Ясінскага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў Камінскага, Зялінскага, кс.Корна, кс.Віслоцкага, Канопкі, Гансеўскага, Жылевіча, Андрэйковіча. Атрымала ўрадавыя газеты над №№ 64—65. Аддала ў свой аддз.справядлівасці лісты рэзалюцый ННР з тым, каб ён паведаміў аб выкананні запісаных НР матэрый. Аддала свайму аддз.жыўнасці для абвяшчэння абывацелям належных артыкулаў з наказу аддз.жыўнасці ННР адносна складкі на вываз харчу і фуражу за плату ў войска. Загадала свайму аддз.парадку выканаць указ аддз.жыўнасці ЦД аб дастаўцы фурманак на перавоз магазіна з Мерацкага павета ў Прывалкі Гродзенскага павета. Аддала на выкананне аддз. вайсковых патрэб рэквізіцыю генерал-лейтэнанта аб.Е.Грабоўскага аб вызначэнні рамеснікаў для вырабу мундзіраў і ботаў для 2-га пяхотнага рэгімента. Памясціла ў сваёй канцылярыі прысланыя палкоўнікам паспалітага рушання Гродзенскага павета аб.Рыхліцкім прысягі 7 ротмістраў, камандуючых паспалітым рушаннем Гродзенскага павета, менавіта — Казінскага, Скальскага, Волмера, Шумінскага, Сезянеўскага, Кліманскага, Міцуты. Памясціла ў сваёй канцылярыі прысланыя генерал-маёрам Гродзенскага павета аб.Ельскім табліцы шляхты, вызваленай з паспалітага

рушання. На просьбу сялян барысаўскага ключа аб вызваленні іх ад дачы кажухоў, ботаў, сярмяг і кашуляў адказала, што не можа вызваліць іх ад такой пастаўкі, але за тое ім будзе заплочана адпаведна з універсалам.

Скаргу селяніна сухадалінскага ключа Францішкі Сабулы на эканома аб.Церпілоўскага аддала на разбіральніцтва таго эканома. На мемарыяле сялян гродзенскай эканоміі аб вызваленні іх ад дачы кажухоў, ботаў і іншых артыкулаў запісала, што яны не могуць быць вызвалены ад такіх паставак, але за тое ім будзе заплочана згодна з універсалам. Аддала ў свой аддз.парадку рапарт інтэнданта Малаберастаўіцкай парафіі аб.Ануфрыя Бергіла аб тым, што сяляне не жадаюць даваць грошы на брычкі параконных коней. Загадала занесці ў пратакол сведчанне генерал-маёра Гродзенскага павета аб.Ельскага, выдадзенае аб. Карчэўскаму, з падзякай за яго заслугі перад Айчынай за час знаходжання ў паспалітым рушанні. Загадала дазорцу аб.Барановічу трымацца рэзалюцыі генерала аб.Е.Грабоўскага ў справе абскаржэння аб.генерала Сцыпёна і палкоўніка аб.Нарбута за ўчыненыя шкоды. На мемарыяле аб.Пашкевіча дала рэзалюцыю ў тым, што аб.Пашкевіч падаецца ў аддз.вайсковых патрэб з даручэннем разгледзіць складзеныя тарыфы рэкрутаў для нагляду справядлівасці ў дастаўцы рэкрутаў з чарлёнскага ключа згодна з колькасцю дымоў у тарыфе і аб усім паведаміць камісіі. Атрымаўшы данясенне падпалкоўніка аб.Улінскага, што каштоўнае срэбра сабрана і ў адпаведнасці з загадам НН для перавозу яго ў Варшаву патрабуецца фундуш гатовымі грашыма, камісія дазволіла таму Улінскаму ўжыць сабраныя грошы найперш пад дарожныя расходы, рахунак чаго здаць у скарбовы аддзел ННР, даручыўшы стараннаму клопату Улінскага ўсякую асцярожнасць пры транспарціроўцы.

На мемарыяле дзяржаўцы полніцкага ключа аб.Францішкі Ваўкавіцкага адказала, што ўніверсал аб

дастаўцы брычак з коньмі прадпісвае тым, хто мае мала дымоў, даваць грошы сакратару камісіі аб.Садлуцкаму, а таму аб.Ваўкавіцкаму належыць са сваёй прэтэнзіяй звярнуцца да таго сакратара. Загадала ражанастоцкім ксяндзам дамініканам выдаць рэшткі непатрэбных касцёлу каштоўнасцяў і срэбра падпалкоўніку аб.Улінскаму, які ўпаўнаважаны НН адвесці іх у Варшаву.

Сюды ж сесія апоўдні. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Я.Ясінскага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў Сільвестровіча, кс. Корна, Канопкі, Зялінскага, кс.Віслоцкага, Гансеўскага, Хлявінскага, Андрэйковіча, Камінскага, Жылевіча, Сакалоўскага і Гоувальта. Адносна гвалтаў і абцяжарвання абывацеляў вайскоўцамі, якія не бяруць у камісіі ніякіх білетаў на пабор фуражу і іншых артыкулаў, прапанавала ЦД далажыць аб тым вышэйшай камандзе, а абывацельскі стан уцешыць і вызваліць ад непатрэбных уціскаў спецыяльным прадпісаннем. Потым пажадала, каб генерал камандуючы загадаў сваім арданансам усім вайсковым камісарыятам выдаць жывёльныя скуры і лой, узятыя на войска з Гродзенскага павета і якія павінны застацца на месцы. Мемарыял абывацеляў места Гродна са скаргай на пабор вайскоўцамі фурманак адаслала ў гродзенскі магістрат з тым, каб ён разам з камісіяй падаўся з такім данясеннем да вышэйшай каманды. Дазволіла супрасльскаму абату аб.кс.Віслоцкаму аддаліцца з Гродна на 2 тыдні да хаты.

Такі рапарт штотыднёвых чыннасцяў да дня 14 верасня 1794 года падпісваю *Ян Ясінскі.*

Згодна з дыярушам *Пётр Манюшка*, рэгент парад. кам. Гродз. павета.

За пячаткай.

ВПАНК,с.1090, л.582—586.

№107. 18 верасня. Зварот дырэктара гродзенскай мануфактуры Я.Бульчынскага

Найсвятлейшая парадкавая камісія Гродзенскага павета !

Гродзенская мануфактурная кампанія с першага моманту нарадовага паўстання старалася з старанным клопатам выконваць усе наказы як святлейшага вайсковага аддзела ННР, так і святлейшай парадк.камісіі Гродз.павета і кожны раз даваць столькі сукна, наколькі фабрыка здольная. Сукно па ўмове і кантракту з аддз.вайсковых патрэб НР аплочана краёвай манетай, а зараз, маючы 15800 зл.па заручэнні аддз.НР і некалькі тысяч скарбовых асігнацый з вайсковага аддзела камісіі Гродзенскага павета, мануфактура не можа ні купляць якіх матэрыялаў, ні выдаваць плату рамеснікам, а гэта па наступным прычынам. Абываццелі, пры стаянні непрыяцельскіх войскаў за 12 міль ад Гродна і з-за штодзённага страху ад яго нападу, адмаўляюцца браць скарбовыя білеты і не жадаюць прадаваць за іх матэрыялы, патрэбныя фабрыцы. Сяляне,прыязджаючыя на таргі з прадуктамі, зусім браць не жадаюць, а з вёсак выдаць не могуць з-за страты 20 %, якія жыды чыняць праз векселі і павелічэннем цаны патрэбных тавараў. Фабрыканты жа, як гэта засведчана на цяперашнім тыдні, не могучы купіць жыццёва важных прадуктаў, не хочуць ісці ў лабараторыі.

Самыя вялікія аўчарні ў Брэсцкім ваяводстве, аднак у ім цяжка купіць патрэбную для фабрыкі воўну за білеты або пад заручэнні, паколькі непрыяцель спыняе іх цыркуляцыю. З-за вырабу фарбаў, прывезеных з-за мяжы на I тыс.чырвоных зл., мануфактура вымушана выслаць гэтым месяцам у Крулявец 2 тыс.чырв.зл. на фарбы, на пакупку якіх не мае ні заручэнняў, ні білетаў. Па тых тады шчырых матывах, вядомых святлейшай камісіі, маю гонар прасіць аплаціць сукно гатовымі

грашыма да таго часу, пакуль у Літве не наступіць рэгулярнае абарачэнне білетаў і заручэнняў, бо пры такой агульнай нядзейнасці мануфактура не толькі не будзе ў стане на моцы загаду НР павялічыць варштаты і фабрыкантаў, але ўвогуле фабрыкі гродзенскай мануфактуры спыняцца, калі ўжо ні патрэбных ім матэрыялаў, ні рамеснікі прадуктаў для жыцця не змогуць купіць за скарбовыя білеты.

З чаканнем выніковай рэзалюцыі і глыбокім шанаваннем святлейшай камісіі ваш спольабывацель і найніжэйшы слуга Я.Бульчынскі, дырэктар гродзенскіх мануфактур. 1794 года месяца верасня 18 у Гродна.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.589—590адв.

№ 108. 19 верасня. Паведамленне палкоўніка Ю.Нарбута аб абаротах непрыяцеля

Найсвятлейшая ЦД ВКЛ !

Маючы весткі, якія рознымі выпадкамі паведамляюцца ЦД з павета, дзе я знаходжуся, маю гонар засведчыць, што пры выбранні розных кантаністаў з таго павета, на моцы ардынанса НН у сваім становішчы выканаўцы таго наказу, вымушаны найпершую ўвагу звяртаць на абароты непрыяцеля. Перадусім цвёрда даношу, што ў атрыманых запэўніваннях аб небяспецы, пагражаючай павету, нічога, акрамя пустых і фальшывых чутак, няма. На тым баку Нёмана непрыяцель трымае толькі патрулі і нідзе не спрабуе перапраўляцца, акрамя, хіба, некалькіх смелых казакоў, якіх у Беліцы на тым баку было 5 чал. Абоз іх дагэтуль на месцы пад Слонімам. Патрулі іх па некалькі дзесяткаў коней нападаюць толькі для часовых рабункаў жыўнасці ў Здзяцелі. Пастарунак у Навагрудку ўзмоцнены, адкуль да Пяскоў пасылаюцца патрулі на той бок Нёмана. Пад

Іўем і Морынам на месцы стаіць генерал-лейтэнант Ланскі. Пад Вільна жа ніадкуль не чакаем напасці. Пры павятовай камісіі і магазіне трымаем малую каманду, бо разасланыя навокал патрулі павінны засцерагаць іх бяспеку. Гэтыя весткі, як больш пэўныя і грунтоўныя, паведамляю святлейшай ЦД ВКЛ.

Рабілася ў Скідзелі 1794 года месяца 19 верасня.

Юзаф Нарбут, палкоўнік.

БПАНК, с.І090, л.59І—59І адв.

№ 109. 20 верасня. Зварот гродзенскай камісіі ў Вышэйшую раду з тлумачэннем цяжкасцяў уласнага ўрадавання

Рабілася ў Гродна на сесіі ў ніжнім замку 1794 года месяца верасня 20 дня.

Парадкавая камісія Гродзенскага павета па паўстанні народа імкнулася па абавязку свайго ўрадавання старанна выконваць розныя наказы НН і НР аб забеспячэнні войска рознымі патрэбамі ў меру абывацельскай магчымасці. Вось і зараз, пры паведамленні генерала камандуючага аб набліжэнні калон літоўскага войска да межаў Гродзенскага павета, папярэдзіла пасэсараў самых значных эканамічных добраў аб нарыхтоўцы фуража не з 5 дымоў, а з кожнага дыма па кваліфікацыі і звезці яго пры першай патрэбе. Насуперак такога распараджэння камісія атрымоўвае з розных бакоў білеты аб.Стрыенскага, выдадзеныя ўсім абывацелям Гродзенскага павета нават без погляду на магчымасці дастаўкі і з прычыны аддалення камісара на некалькі дзён з калоны. Камісія лічыць патрэбным указаць ЦД на гэтую несправядлівасць, з-за якой ні яна сама не бачыць як дабіцца ад абывацеляў выканання наказаў, ні абывацель не упэўнены чаму падпарадкоўвацца.Далучыўшы пры гэтым распараджэнне свайго

аддз.жыўнасці і білет аб.Стрыенскага, камісія чакае ад ЦД тлумачэння генералу камандуючаму, каб ён сваім арданансам запэўніў абываццеляў Гродзенскага павета чыіх указаў ім слухацца і чаго камісія павінна пільнавацца.

Універсал НН і НР загадвае ўсім жыхарам края даць з 5 і 50-ці дымоў кажухі, сярмягі і г.д. Гродзенская камісія загадала ўсім абывацелям свайго павета трымацца такога наказа. Між тым, маючы раней атрыманы мемарыял стральцоў каралеўскіх пушчаў аб вызваленні іх ад службы і не могучы сама вызваліць іх ад дачы належных войску патрэб, камісія знаходзіць іх жаданне слушным з нагоды выкананай імі вайсковай службы і таму чакае ад ЦД ВКЛ рэзалюцыі на жаданне тых стральцоў быць вольнымі ад абавязкаў, ускладзеных на ўсіх жыхароў края. Нарэшце, з-за непастаўкі многімі абывацелямі правіянта і фуража, прадпісанага ўніверсаламі, камісія вымушана шукаць у каманды вайсковай дапамогі, калі, насуперак сваіх намаганняў ёй, часта не выпадае знайсці жаўнераў.Таму камісія лічыць натуральнай рэччу атрымаць акрэслены шлях для паскарэння кары на абыякавых у выкананні загадаў улады, каб гэтым не адрываць жаўнераў ад уласцівых ім абавязкаў, а застрашаны абывацель хутка выконваў бы ўрадавыя наказы. Пасылаючы вышэйзгаданае ў ЦД, гродзенская камісія спадзяецца знайсці разуменне ў вярхоўнай уладзе, якая даб'ецца ад генерала камандуючага гарантый як для абывацеляў, так і для самой камісіі.

Даны на сесіі, як вышэй. *Ігнацій Лахніцкі, камісар, старшыня.*

Згодна з пратаколам *П.Манюшка*, рэгент парад. кам. Гродз. павета.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.591—591 адв.

№ 110. 20 верасня. Рапарт гродзенскага ўпраўляючага М.Эйсманта адносна тэрытарыяльных прэтэнзій мерацкай камісіі

Святлейшая ЦД ВКЛ, шаноўныя абывацелі !

З пачатку нарадовага паўстання пураўскі і домарскі ключы яго каралеўскай мосці гродзенскай эканоміі, размешчаныя ў Гродзенскім павеце, ва ўсім падлягалі рэквізіцыям парадкавай камісіі гэтага павета і яна займала ўсе ключы сваімі раскладамі, а перадусім пасэсары згаданых ключоў давалі з 5 дымоў кантаністаў у міліцыю Гродз.павета, затым адвозілі ў гродз.магазін патрэбны правіянт і фураж. Гродз.камісія сама незалежна выдавала білеты за фураж з тых ключоў, як пасэсіям свайго павета, і, нарэшце, даверыла сялян сваім дазорцам у падзеленых цыркулях. Наадварот, парадкавая камісія Мерацкага павета не аказвала ніякага інтарэса да гэтых ключоў. Зараз жа, калі ніжэйпадпісаны, жадаючы з абывацельскай дбайнасці хутчэй заспакоіць патрэбы краёвага войска і даставіць з таго ключа брычкі, на некалькі міляў ужо справадзіў людзей і коней, то Гродзенская парадкавая камісія, не маючы памянутыя ключы падуладнымі свайму павету, адмовіла ў сатысфакцыі і адаслала мяне ў мерацкую камісію за новым расходам. У такім здарэнні маю гонар падацца да святлейшай ЦД з просьбай, каб яна загадала парадкавай камісіі Гродзенскага павета прыняць дастаўленыя брычкі з коньмі і тым самым адхіліла ад новых выдаткаў, выпадаючых ужо на мерацкі транспарт.Уладкаванне ў самым пачатку абаюднасці ў тым трэба для таго, каб ніжэйпадпісаны не зведваў падобных сумненняў пры выкананні далейшых наказаў НР, а асабліва пры здачы кантаністаў, кажухоў і ботаў, якія ўласна належаць да Гродзенскага павета, дзе і камісары памянутых ключоў складаюць просьбы у міліцыі таго павета.

Верны аб.Мацей Эйсмант. 1794 года месяца верасня 20 дня. (Памета ЦД). Парадкавай камісіі Гродз.павета такія 50-дымовыя брычкі і іншыя рэчы (калі не трапляецца недахоп) прыняць замест мерацкага правіянта, а квіт гродз.камісіі будзе такой годнасці, як бы уласнік атрымаў сатысфакцыю ў Мерачы 21 верасня 1794 года.

БПАНК, с.1090, л.602—602 адв.

№ 111. Дыяруш аддзела харчу гродзенскай камісіі паміж 14 і 20 верасня

Дзень 14 верасня. Звярнуўся ў аддз.парадку за 15 фурманкамі для штодзённых паслугаў гродзенскага магазіна. Атрымаў рапарт дазорцы 3-га цыркуля, на які зараз жа даў адпаведную рэзалюцыю. Загадаў аддзелу парадка закантрактаваць 10 фурманак пад вываз жыта з галынскага магазіна на млыны і таксама папрасіў аб.Трубіцкага прыставіць жаўнераў пад суправаджэнне. Загадаў касіру свайго аддзела аб.Вінскаму выдаць за квітам пісару галынскага магазіна аб.Цярлецкаму 60 зл.належнай за верасень пенсіі, а вартаўніку — 40 зл. Звярнуўся да абываццеляў галынскага графства, перстунскага ключа і пасэсара в. Пратэлі, каб яны загадалі сялянам хутчэй выпекчы сухары з мукі, раздадзенай пісарам галынскага магазіна аб.Цярлецкім. Атрымаў рапарт аб.Плоцкага, пасланага забраць магазіны у Мерацкім павеце, які даносіць, што ўсё забрана акрамя 100 фур сена ў Мерачы, што належаць да абоза ў Сейнах.

Дзень 15 верасня. Атрымаў з пленума парадкавай камісіі Гродз. павета паведамленне дазорцы аб.Яна Казлоўскага, што ротмістр аб.Халецкі, пасланы палкоўнікам Азулевічам з 13 людзьмі і 26 коньмі ў Дуброву, распарадзіўся пра правіянт і фураж, на што ў адказ абавязаў дазорцу-абываццеля закупіць тое паблізу

пад абяцанне аплаты з касы. Загадаў пісару прэвальскага магазіна аб.Плоцкаму выдаць правіянт на 16 чал. і штодзённы фураж для 8 коней паручніка віленскай міліцыі аб.Купста, пасланага на пабудову маста ў Свентаянску. Загадаў выдаць за квітамі з сакольскага і галынскага магазінаў правіянт на 8 чал. і фураж на 8 коней падпаручніка 2-й брыгады ВКЛ аб.Багдановіча, які вяртаецца з экскартам да абозу ў Сэрцях. Звярнуўся ў аддзел парадку за абілечваннем 23 фурманак для перавозу магазіна з Жыдамлі ў Гродна.

Паслаў загад янаўскаму кагалу даставіць на тыдзень 280 фунтаў мяса за плату аддзелам па квітах за 4 грош.кожны фунт для 56 чал. пад камандай Базарэўскага, намесніка палкоўніка Азулевіча, якія састаяць пры багажах. Атрымаў рапарт пісара луненскага магазіна аб.Калповіча аб тым, што правіянт і фураж яшчэ не распараджаны і з бліжэйшых паветаў не прывезены ў магазін. Паслаў у аддз.жыўнасці ЦД ВКЛ рапарт штотыднёвых чыннасцяў з інфармацыяй аб стане магазінаў і касы.

Загадаў аб.Тавянскаму забраць з віціны стольніка аб.Дзяконскага ў старазаконных Іцкі Беньямовіча, Іцкі Вульфавіча і Мендэля Беньямовіча 30 гарцаў шынковых гарэлкі, ахвераванай замест солі. Атрымаў наказ аддз.жыўнасці ЦД, які прызначае 2-тыднёвы тэрмін утрымання ад экзекуцыі ліпкоўскіх ксяндзоў дамініканаў, у якіх праходзячыя войскі забралі нарыхтаваную на правіянт жыўнасць. Атрымаў рапарт дазорцы 4-га цыркуля аб.Яна Казлоўскага з інфармацыяй аб колькасці ўраджаю ў фальварках і розных прадуктах, насельніцтве, корчмах, млынах, усякай жывёле і г.д. Загадаў аб.Тавянскаму, пасланаму забраць соль, або вярнуцца з 4 тыс. гарцамі гарэлкі замест солі, або прыслаць рапарт, чаму так хутка не можа распарадзіцца. Па рэкамендацыі камандуючага генерал-лейтэнанта аб.Грабоўскага пастанавіў заснаваць у Янаве магазін

пад багаж, а ягонаму дазорцу, назначанаму пленумам камісіі, аб.Станіславу Клікоўскаму загадаў выбраць з абываделяў янаўскай, карыцінскай і ходараўскай парафій завіна-вачаны правіянт і жыўнасць, а для прыкуплі жыўнасці асігнаваў з касы 500 зл.гатовымі грашыма і 500 зл.у асігнацыях. Загадаў пісару прэвальскага магазіна аб.Плоцкаму праінфармаваць аб 800 зл., складзеных у мясцовага эканома прэвальскімі абывацелямі за правіянт і фураж згодна з першым універсалам.

Дзень 16 верасня. Загадаў касіру аб.Вінскаму выдаць за квітам 1 тыс. поль. зл. старазаконнаму Аўсею Хаймовічу за ўзятае ў яго на скарб дрэва. Адпаведна з разасланым 2 верасня папярэджваннем пасэсараў ключоў яго каралеўскай мосці аб нарыхтоўцы правіянту і фуражу, папрасіў іх прывезці ў магазін загаданы правіянт і фураж. Пастанавіў раздрукаваць першую рэквізіцыю і паведаміць яе кожнаму пасэсару астатніх ключоў і фальваркаў яго каралеўскай мосці.

Дзень 17 верасня. Загадаў касіру свайго аддзела аб.Вінскаму выплаціць кагальным старшыням Абраму Шапшэвічу і Абраму Мархелевічу 566 поль. зл. 22 грош. гатовымі грашыма, а другую палову асігнацыямі за дастаўку па загаду аддзела 2877 фунтаў мяса за квітам аб.Цэхановіча і 1366 фунтаў палкоўніку аб.Рымінскаму і за яго квітам. Паведаміў пленуму камісіі Гродзенскага павета, што афіцэры падаюць рэквізіцыі без вызначэння колькасці чалавек і коней, а таму прасіў спыніць гэтую недарэчнасць. З нагоды двух мемарыялаў ад сялян засценка і в.Кур'янкі гродзенскай эканоміі звярнуўся да адміністрацыі і пасэсараў, каб дапамаглі ў іх заняпалым стане з фундуша камунальнай складкі. Згодна з указам ад 30 жніўня бягучага года, выдаў з станіславоўскага і аўгустаўскага ключоў 3450 фунтаў і 690 гарцаў сена на 345 коней палкоўніку 3-й брыгады аб.Юрэвічу, 3400 фунтаў сена і 680 гарцаў аўса на 340

коней палкоўніку 5-га палка аб.Лішэўскаму, 3630 фунтаў сена і 726 гарцаў аўса для 363 коней падпалкоўніку 6-га палка аб.Сабалеўскаму, 4020 фунтаў сена і 804 гарцаў аўса на другі конны полк з 402 коньмі, 2010 фунтаў сена і 402 гарцаў аўса на 201 коней міліцыі Прэнскага павета пад камандай аб.Вітэтэльтэма, а з лабнёўскага ключа — 530 фунтаў сена і 106 гарцаў аўса на 53 кані каманды стралкоў Грабінскага.

Загадаў пісару луненскага магазіна аб.Калповічу варочаць правіянт і фураж гродзенскіх абывацеляў проста ў гродзенскі магазін, а ў свой прынімаць толькі з падуладных. Загадаў пісару галынскага магазіна аб.Цярлецкаму прыслаць на 100 фурманках у Гродна рэшткі сена, аўса, сухароў і бочку круп, а пісару індурскага магазіна аб.Абухоўскаму — сухары, крупы, авёс і сена на 300 вазах. Звярнуўся ў аддз. парадку за вызначэннем 400 фурманак пад правоз правіянта і фуража з Індуры і Галынкі ў Гродна. Атрымаў рапарт аб.Юзафа Тавянскага аб рэштках солі і селядцу на віціне, таксама аб замене солі гарэлкай, і загадаў таму выдаць з той віціны 10 бочак солі і 15 бочак селядцу камісару аб.Яленскаму, дэлягаванаму ў каманду генерал-маёра аб.Грабоўскага. Даручыў камісару аб.Яленскаму, дэлягаванаму да калоны генерал-маёра ВКЛ аб.Грабоўскага, выбраць правіянт і фураж, завінавачаны абывацелямі па пастаўках, згодна з апошнім універсалам, у крынскі і індурскі магазіны.

Дзень 18 верасня. Звярнуўся да генерал-лейтэнанта аб.Мейена за жаўнерамі для пабору фурманак пад транспарт магазіна з Галынкі. Па рэквізіцыі ад 30 жніўня б.г.выдаў учора 740 фунтаў, а сягоння 2010 фунтаў сена і 402 гарцы аўса на 201 коней міліцыі Прэнскага павета пад камандай Вітэльтэма з завінавачанага Лабненскага ключа. Па рэквізіцыі ад 30 жніўня 1794 года выдаў з перстунскага ключа на 350 коней палкоўніка 5-га палка аб.Лішэўскага 3300 фунтаў сена

і 700 гарцаў аўса, на 393 кані маёра 2-га палка аб.Рызманча 393 фунтаў сена і 786 гарцаў аўса, на 359 коней падпалкоўніка 6-га палка аб.Сабалеўскага 3590 фунтаў сена і 718 гарцаў аўса, а з каменкоўскага ключа яго каралеўскай мосці на 333 коней паручніка 3-й брыгады аб. *(неразборліва—Я.А.)* 3330 фунтаў сена і 666 гарцаў аўса. Згодна з папярэдняй рэквізіцыяй выдаў з перстунскага ключа яго каралеўскай мосці 1100 фунтаў сена і 232 гарцы аўса на 70 коней маёра артылерыі ВКЛ аб.Асі, будучага пры палку артылерыі ў калоне генерал-лейтэнанта аб.Мейена. Загадаў выбраць з стольніка аб.Эйсманта на 38 коней ад'ютанта пешай літоўскай гвардыі аб.Сухарскага 380 фунтаў закантрактаванага сена, а пісару аб.Бервінскаму выдаць з магазіна 76 гарцаў аўса на тую каманду. Атрымаў рапарт аб.Багдановіча з інфармацыяй аб прыходзе і расходзе купленага на публічны скарб дрэве. Згодна з рэквізіцыямі ад 30 жніўня свайго аддзела выдаў з скалубоўскага ключа яго каралеўскай мосці 1140 фунтаў сена і 228 гарцаў аўса на 114 коней маёра 8-га рэгімента аб.Камінскага, 1500 фунтаў сена і 300 гарцаў аўса на 150 коней маёру 4-га рэгімента аб.Дахтаровічу, з лабненскага ключа 530 фунтаў сена і 106 гарцаў на 53 кані каменданта корпуса стральцоў аб.Грабінскага, з скалубаўскага ключа 1170 фунтаў сена і 234 гарцы аўса на 117 коней падпалкоўніку 1-га рэгімента аб.Штэйціна, а таксама трэцці раз на 32 кані паручніка 7-га рэгімента аб.Якубоўскага сена 960 фунтаў і аўса 192 гарцы.

Наказаў пісару крынскага магазіна аб.Кеўлічу выстарацца фурманкі ў крынскім магістраце для вывазу ў гродзенскі магазін 400 штук валовых і 400 барановых скур, складзеных камісарам аб.Яленскім. Асігнаваў з магазіна на 2 дні авёс для 14 коней і харч на 15 чал. каманды ковенскай кавалерыі. Загадаў выдаць аб.Лахніцкаму 480, а камісару Гродзенскага павета аб.Маткевічу 120 камянёў сена з аплатай кожнага

камяню па 40 медзяных грошаў гатовымі грашыма, а другую палову асігнацыямі. Загадаў гродзенскаму стольніку аб.Эйсманту выдаць 168 камянёў сена для артылерыйскіх коней пры амунічных вазах, прычым таго сена, якое згаданы абывацель яшчэ не даставіў па першаму абавязку аб яго продажы. Паслаў загад язерскаму ключу выдаць, згодна з квітамі і на рэквізіцыі ад 30 жніўня б.г., правіянт на 11 чал. з артылерыі, пасланых у Новую Руду і фураж для 6 коней за ўвесь час іх знаходжання там. Што да просьбы вілейскага старасты аб.Паца, пададзенай у аддзел 27 жніўня, аб выдачы у прагрэсіі 3327 польс.зл. 15 грош. за дастаўку рэчаў у магазін і войска, то, паколькі той аб. Пац заплаціў прагрэсію гатовымі грашыма, а ЦД потым затрымала выкананне, аддзел назначае ацэнку правіянта і фуража ў ліквідацыйнай дэпутацыі. На двух мемарыялах жыдоў янаўскага кагала і кумяльскага ключа са скаргай на палкоўніка Азулевіча і другі полк, якія за час зімовага кватэравання завінілі 1724 зл. і 12,5 грош.за мяса і розныя рэчы, аддзел пастанаўляе, што прэтэнзію, якая паходзіць задоўга да паўстання народа, зараз нельга прыняць інакш, як толькі з дазволу генерала камандуючага, а калі той не знойдзе на аплату фундуша, то ўсё трэба вырашыць у ЦД.

Дзень19 верасня. Па рэзалюцыі генерал-лейтэнанта аб.Ясінскага выдаў з гродзенскага магазіна 3 вазы сена і бочку аўса. Па звароту паручніка аб.Рылы і ад'ютанта генерала Грабоўскага выдаў з гродзенскага магазіна на 2 дні фураж для 43 коней. Атрымаў рапарт пісароў індурскага і сакольскага магазінаў з інфармацыяй аб стане магазінаў. Вызваліў ад экзекуцыі фальварак Габяты аб.палкоўніка Адамовічавай з нагоды неаднаразовага праходу войска, якое спазнала няшчасце ў баі пад Вільна. Загадаў пасэсару аўгустаўскага ключа даставіць у гродзенскі магазін 800 камянёў сена. Выдадзеныя пасля ўніверсала 25 ліпеня 26 штук

наказаў аб правіянце і фуражу, завінавачаных абывацелямі Гродзенскага павета перад гродзенскім, індурскім, сакольскім, галынскім і крынскім магазінамі, аддаў для выбару палявому камісарыяту ВКЛ. Загадаў генералу камандуючаму літоўскай збройнай сілы падаць спецыфікацыю аплаты правіянта і фуража, завінавачанага пасэсарамі ключоў гродзенскай эканоміі, згодна з наказам аддзела ад 30 жніўня б.г. назначыць каманды для хутчэйшага спагнання жыўнасці для войска. На мемарыял Нямейцаў і Сачкоўцаў з воласці эканоміі яго каралеўскай мосці са скаргай на свой заняпад выдаў з пратакола агульную рэзалюцыю, адпавядаючую таму выпадку. Па звароту генерала камандуючага аб.Грабоўскага камісар аб.Яленскі, дэлягаваны у калону генерал-маёра войск ВКЛ аб.Грабоўскага, зрабіў ацэнку правіянта і фуража, пабранага пры правозе багажу ў каманду аб.Рымінскага, і загадаў заплаціць у касу выяўлены перабор.

Атрымаў рапарт свайго касіра аб.Вінскага з інфармацыяй аб стане касы. Па звароту ротмістра коннай гвардыі ВКЛ аб.Габы выдаў на верасень месяц на 39 коней з аўгустоўскага ключа 3276 фунтаў сена і з магазіна тамтэйшага 546 гарцаў аўса, а таксама на 36 чал. на тыдзень (да 27 верасня) з таго ж сакольскага ключа 252 фунтаў мяса. На мемарыяле дзяржаўцы перстунскага ключа аб.Рохта прапананаў таму паставіць у войска прадпісаную 30 жніўня жыўнасць, а паколькі ён не змог даставіць па папярэдняй асігнацыі, то параіў замяніць чым-небудзь той недабор.

Дзень 20 верасня. Загадаў касіру свайго аддзела аб.Вінскаму заплаціць за квітам дзяржаўцу скідзельскага ключа аб.Круповічу за дастаўку ў гродзенскі магазін 800 камянёў сена 533 зл.10 грош. гатовымі грашыма, а асігнацыямі 533 зл.10 грош. Выдаў за верасень месяц пісару сакольскага магазіна і вартаўніку правіянцкага магазіна 100 зл. Прыняў рапарт камісара

аб.Кулікоўскага аб заснаванні пад яго кіраўніцтвам у янаўскім магазіне багажу для літоўскага войска і даручыў яму ў далейшым прысылаць рапарты у звычайны час. Учыніў рапарт у аддз.харчу ЦД ВКЛ аб тым, што з-за павелічэння выдаткаў на аплату правіянта і фуража выдаў трэццюю частку гатовымі грошамі 10 тыс.зл., а палову — 30 тыс.зл. — асігнацыямі. Загадаў дзяржаўцу скідзельскага ключа аб.Юзафу Круповічу даставіць у гродзенскі магазін за квітам пісара Бярвінскага правіянт і фураж, належачы лідскай камандзе. Прыняў у сваю канцылярыю тлумачэнне пісара крынскага магазіна аб.Кеўліча таго, чаму ён не прыслаў штотыднёвага рапарта.

Загадаў аб.Бервінскаму або за плату, або ў выглядзе ахверавання прыняць соль і селядзец з 6 віцін, на якіх, згодна са сметай ЦД і рапарта кансумпцыйнага экзактара аб.Альшэўскага, знаходзіцца 1700 бочак солі і 283 бочак селядцу. Выдаў з гродзенскага магазіна правіянт на 15 галоў і фураж на 14 коней, вызначаных на дзень па смеце для ковенскай кавалерыі. З нагоды паступаючых скарг ад розных абывацеляў у тым, што яны насуперак магчымасці паставак атрымалі білеты ад шэфа гвардыі аб.Стрыенскага, аддз.жыўнасці паведаміў аб правіянце і фуражу ў індурскім і крынскім магазінах, а таксама, што наказы аб завінавачаным абывацелямі правіянце аддаў для спагнання аб.Яленскаму. Выканаў экзамен Матушэвічу, парабку з віціны Багушэвіча, для пераканання ў тым, што аб.Казлоўскі трымаў на віціне аб.Павуцкага бочкі напоўненыя расолам, з якіх адну аддаў замест селядца са сваёй віціны ў магазін ў якасці ахверавання. Загадаў прэвальскаму магістрату і дазорцу таго староства аказаць усялякую дапамогу пісару Плоцкаму як у заснаванні магазіна, так і яго рамонце. Не менш таго, каб з нагоды падыходу калоны літоўскіх войскаў мець з кожнага дыма па 20

фунтаў сухароў, па чвэрці аўса і сена, а двару абмалаціць гадавы ураджай, каб мець нагатове на цэлы год для расходу на насенне і спажывання войскам.

Дамінік Маткевіч, камісар.

Мартын Хлявінскі, камісар.

Згодна з дыярушам *Мартын Бронц*, сакратар аддз.жыўнасці.

За пячаткай.

БПАНК, с.1090, л.577—581 адв.

№ 112. Справаздача гродзенскай камісіі аб сваіх пленумах з 14 па 21 верасня

Штотыднёвы рапарт аб штодзённых чыннасцях парадкавай камісіі Гродзенскага павета ад дня 14 да дня 21 месяца верасня 1794 года, пасланы у святлейшую ЦД ВКЛ.

1794 года месяца верасня 14 дня. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Ігнація Лахніцкага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў Бульчынскага, Гансеўскага, Ясінскага, Канопкі, Хлявінскага, кс.Корна, Жылевіча і Зялінскага. Атрымала рапарт дазорцы кузніцкага цыркуля аб.Міхаэліса аб 22 касцёлах у ягоным цыркулі, які аддала ў свой аддз.інструкцый. Туды ж аддала рапарт дазорцы 8-га цыркуля аб.Гераніма Барэцкага аб касцёлах свайго цыркуля. Скаргу абываццеляў янаўскай парафіі на плябана той парафіі кс.аб.Палакоўскага аб паборах з шлюбаў, за хрост і г.д. аддала дазорцу таго цыркуля з загадам выканаць следства і пры чарговай камунікацыі прысласць у цяперашнюю камісію. Адаслала ў свой аддз.вайсковых патрэб просьбу аб.Мартына Пашкевіча аб аплаце кажухоў, ботаў і сярмяг, дастаўленых з чарлёнскага ключа яго каралеўскай мосці. На мемарыяле сялян в.Стрыеўка з язерскага ключа запісала рэзалюцыю, што паколькі здача 5-дымовых кантаністаў выконваецца па сіле

ўніверсала НР, то яна не можа нікога зволіць ад дастаўкі кажухоў, сярмяг і ботаў, хаця за тое будзе аплочана. Што да празмернага ўвядзення язерскім дваром работ, то сялянам трэба апеляваць да дазорцы, які і паведаміць ім аб тым памеры згодна з універсалам і запытае ў ЦД, з якога фундуша камісіі трэба плаціць абывацелям за дастаўленыя кажухі, сярмягі і боты.

Сесія дня 15 верасня, ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Ігнація Лахніцкага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў кс. М .Корна, Т. Андрэйковіча, кс. Юрэвіча, Камінскага, Сухадольца, Зялінскага, Бульчынскага, Гансеўскага, Ф.А.Пачобута, Юліяна Сільвестровіча, Ясінскага. Рэквізіцыю дазорцы 4-га цыркуля аб.Казлоўскага аб дастаўцы фуража на каманду, прыбыўшую ў Дуброву, адаслала за выніковай сатысфакцыяй у аддз.харчу. Мемарыял Яна Казлоўскага са скаргай на Навіцкага, адаслала таму ж Навіцкаму з загадам даць катэгарычнае тлумачэнне таму. Адаслала на меркаванне аддз. харчу і вайсковых патрэб зварот генерал-лейтэнанта аб.Грабоўскага. Паведаміла маёру аб.Юсту мемарыял жагорскіх сялян з патрабаваннем даць адказ на іх скаргу аб захопе двух коней пад артылерыю. Адаслала за вынікам у ЦД жаданне Міхаіла Вярэйскага адносна ягонай 47-гадовай службы у войску Рэчы Паспалітай. Адказала на зварот дзяржаўцы сакольскага ключа наступнае. 1.Што да невыканання сакольскімі мяшчанамі пастановы аддз.справядлівасці, то выслала свайго камісара аб.Хлявінскага з загадам папярэдзіць мяшчан і прадмяшчан аб дрэнных наступствах непаслушэнства. 2.Няхай аб. Эйсмант знясецца з камендантам лазарэта аб лепшым месцы размяшчэння лазарэта. 3.Загадала дазорцу сакольскага цыркуля дровы у лазарэт даставіць з бліжэйляжачых ключоў, менавіта з сакольскага, яленагорскага і стайкоўскага, а таксама ў адпаведнасці з прапарцыяналь-ным раскладам на ключах. У адказ

на жаданне аб.Грабоўскага вярнуць з палка Казаноўскага 25 чал., забраных з 50 дымоў распараджэннямі камісіі павета па рэзалюцыі генерал-лейтэнанта Макраноўскага, прапанавала таму ж генералу Грабоўскаму, што паколькі генерал Казаноўскі ні разу не задаволіў зваротам камісіі, то яна папрасіла генерала Макраноўскага раз і назаўсёды аддаць на патрэбы павета 25 чал. з 50-дымовых рэкрутаў, на што Макраноўскі і згадзіўся з камісіяй, якая паведамляе аб.генерал-лейтэнанту Грабоўскаму аб такім укладзе.

Сюды ж сесія апоўдні. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.І.Лахніцкага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў Ясінскага, кс. Корна, Камінскага, Зялінскага, Бульчынскага, кс.Юрэвіча, Канопкі, Сакалоўскага, Гансеўскага. Дэлягавала ад сябе камісара аб.Сакалоўскага ўзяць у ЦД грошы на аплату кажухоў, сярмяг і ботаў з просьбай паведаміць аб такім атрыманні. Мемарыял гродзенскага магістрата аб захопе фурманак жаўнерамі на таргах перадала генералу камандуючаму аб.Грабоўскаму для спынення такіх непрыстойнасцяў. Учыніла ў ЦД сваё прадстаўленне аб тым, каб не чапаць запакаваныя рознымі вайсковымі рэквізітамі брычкі з-за адсутнасці поўнай бяспекі ў Гродна. Па звароту генерал-лейтэнанта аб.Грабоўскага паслала правіянт і фураж для багажовага абозу з просьбай абілецідь іх.

Дня 16 верасня. Сесія ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.І.Лахніцкага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў кс.Корна, Андрэйковіча, Гансеўскага, кс.Юрэвіча, Сухадольца, Ясінскага, Сільвестровіча, Яна Камінскага. Атрымала ўрадавыя газеты пад №№ 66—70 уключна. Атрыманы загад аддз.вайсковых патрэб НР адносна паскарэння вырабу сукон на фабрыцы і адносна магчымасці ўжыць гатовыя грошы на замежны завоз адаслала ў аддз.вайсковых патрэб камісіі. Пераканаўшыся з рапарта эйсмантаўска-

га дазорцы у неабходнасць прадпісання, абавязала аб.кс.Юрэвіча скласці такое адпаведна з выдадзенай раней іструкцыяй камісіі і наказам НР для дазорцаў. Атрымала загад ННР пасылаць рапарты з гэтага моманту толькі ў ЦД. Загадала свайму аддз.харчу адрапартаваць камандуючаму генерал-лейтэнанту аб.Ясінскаму аб тым., колькі можна паставіць у войска жыўнасці і брычак. Аддала на думку аддз.жыўнасці рапарт аб.Яленскага, дэлягаванага ў калону літоўскага войска. Скаргу Кацярыны Мацееўскай на аб.Пятэльчыцаў і Эйсмантаў пастанавіла на пленуме па прапанове свайго аддз. справядлівасці адаслаць у крымінальны суд.

Дня 17 верасня, сесія ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.І.Лахніцкага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў Андрэйковіча, Гансеўскага, Мучынскага, Сільвестровіча, кс.Корна, кс.Юрэвіча, Ясінскага, Камінскага. Скаргу сакольскага дазорцы аб.Дабравольскага на жаўнераў, забраўшых ягонае памяшканне пры сакольскім лазарэце, перадала аб.Грабоўскаму. Рэкамендавала генералу камандуючаму аб.Ясінскаму обер-бамбардзіра аб.Францішка Абуховіча як значны час спраўнага ў сваёй службе чалавека. З нагоды просьбы сялян фальв. Засценкі эканоміі ўхваліла прапанову аддз. харчу абавязаць эканамічную адміністрацыю і пасэсара засеяць палеткі памянутых сялян і загадала аддз.харчу падаць тым сялянам эканамічнай вёскі сваю рэзалюцыю. Адаслала ў аддз. бяспекі данясенне дазорцы 3-га цыркуля Базыля Гансеўскага аб біцці сваёй жонкі селянінам Сарноцкім. Атрымала і зарэгістравала данясенне аб. *(неразборліва—Я.А.)* у 8 пунктах аб розных аб'ектах. Прынята прапанова аддз.харчу аб прыёме 5 авечак замест аднаго кажуха. Пагадзілася з двума ўніверсаламі НР — адзін аб дэпазітах абываацеляў на тэрміновыя патрэбы, другі — да абываацеляў Літоўскай правінцыі з перасцярогай

усякіх зносін з расійскімі войскамі. Павялічыла вартаўніку павятовай стайні аб.Сухаржэўскаму месячную пенсію з 60 да 80 зл.

Сюды ж сесія апоўдні. Парадкавая камісія пад старшынствам аб. І.Лахніцкага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў кс.Корна, Камінскага, кс.Юрэвіча, Гансеўскага, Бульчынскага, Андрэйковіча, Канопкі, Зялінскага, Сакалоўскага, М.Сухадольца. Загадала свайму скарбоваму аддзелу прыняць у касу грошы, якія былі выдадзены на справаводства інтэнданту вержбутоўскай каморы аб.Станіславу Здзітавецкаму і якія той адаслаў назад пры сваім рапарце. Памясціла ў сваёй канцылярыі рапарт дазорцы аб.Станіслава Залеўскага аб набліжэнні да Гродна калоны генерала Мейена. Паведаміла сваім аддз.парадку і вайсковых патрэб рэзалюцыю ЦД аб тым, што кажухі, сярмягі і іншыя рэквізіты палкам трэба выдаваць па загадах генерала камандуючага, а брычкі ўжываць на перавоз фуража. З нагоды атрыманай ад генерал-лейтэнанта аб.Ежы Грабоўскага просьбы выдаць пашпарты абывацелям Ковенскага павета для звароту іх дамоў з паспалітага рушання: паколькі з агульнага розгаласу і даходзячых з таго боку рапартоў вядома, што ў Коўна і за Коўна стаіць непрыяцельскае войска, а толькі што прысланы ННР універсал забараняе пашпарты абывацелям у месцы занятыя непрыяцелем, тады камісія, перадаючы ЦД гэтую рэквізіцыю генерала, чакае выніковага распараджэння. Адаслала за вынікам у ЦД зварот свайго аддз.вайсковых патрэб за атрыманнем гатовымі 6 тыс.зл.на розныя патрэбы. На просьбу дазорцы індурскага цыркуля аб.Мразоўскага аб звальненні яго ад абавязкаў, камісія прапанавала таму выконваць функцыю з абывацельскай стараннасці да часу, пакуль не наступіць новы раздзел цыркуляў. Атрымаўшы ад камандуючага генерал-лейтэнанта аб.Ежы Грабоўскага тлумачэнне аб.Стрыенскага на

скаргу Даўнаровіча ў тым, што камісар аб.Яленскі не пільнуецца калоны, куды ён быў адасланы камісіяй, звярнулася да камісара Яленскага, адказ якога пасылае генералу Грабоўскаму. Вярнула ў ЦД тлумачэнне, што ў дэпутацыі ліквідацыі вайсковых квітаў дастаткова камплекту з трох асоб. Выдала палкоўніку стральцоў аб.Трубіцкаму пасведчанне з адабрэннем усіх яго крокаў адносна сваіх жаўнераў, зробленых сапраўды добрым абывацелем.

Дня 18 верасня, сесія ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.І.Лахніцкага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў кс.Корна, Т.Андрэйковіча, Гансеўскага, кс.Юрэвіча, Зялінскага, Сільвестровіча, Бульчынскага. Атрымаўшы зварот генерал-лейтэнанта аб.Грабоўскага і ЦД ВКЛ аб прысылцы у фарміруемы пад Гродна палявы камісарыят камісара або адпаведнага да таго абывацеля, камісія ўпрасіла на тую паслугу аб.Юзафа Гоўвальта, вядомага патрыятызмам і абывацельскай дбайнасцю, якога і дэлягавала да палявога камісарыята войскаў Рэчы Паспалітай. Перадала ў свой аддз.харчу зварот гродскага суддзі аб. Эйсманта, які даручыў свайму калегу, аб.Хлявінскаму, дагадзіць жаданню гродскага суддзі. Адаслала ў свой аддз.скарбу за прапановай мемарыял гродзенскага маршалка аб.Волмера адносна двайной выплаты паўпрацэнта з добраў Гольна ў адукацыйную камісію. Атрымаўшы з дырэкцыі гродзенскіх мануфактур мемарыял аб тым, што кантракт на сукно заключаны з аддз.вайсковых патрэб ННР на краёвую манету і што пры здачы таго сукна яна атрымала заручэнні камісіі ў выглядзе скарбовых білетаў, на якія ні купіць нельга патрэбных фабрыцы матэрыялаў, ні заплаціць фабрыкантам, ды яшчэ страчвае 20 % пры выдатках, камісія адсылае ў ЦД просьбу дырэкцыі як жаданне справядлівае ва ўсіх пунктах. Прыняла і аддала ў сваю канцылярыю рэкамендацыю скарбовага аддзела ЦД

ВКЛ ротмістра маршалкоўскай харугвы аб.Любанскага як здольнага да ўсякіх публічных паслуг. Атрымаўшы мемарыял вознага крымінальнага суда аб.Заблоцкага з просьбай ураўняць яго пенсію з іншымі вознымі, будучымі пры камісіі, камісія прыхільна да тае просьбы загадала выплаціць яму 30 зл. у месяц так, як атрымліваюць іншыя розныя камісіі. Па звароту генерал-лейтэнанта аб.Грабоўскага, каб в.Рудня Гродзенскага павета была вольнай для ліцця жалезных куль, загадала ўсім абывацелям і ўласнікам Рудні скарыстаць сваю вольнасць для спраўнай дапамогі маёру артылерыі аб.Юсту, маючаму дазор за ліццём куль, і абавязала іх да тае публічнай патрэбы абывацельскай дбайнасцю.

Маючы скаргі многіх абывацеляў свайго павета, якія далі абмундзіраваных у вопратку 5-дымовых рэкрутаў без складкі з іншымі дварамі, а таму жадаюць вызваліцца ад дачы кажухоў, сярмяг, ботаў і капуль, камісія ў выніку такіх зваротаў выдала ўніверсал, загадаўшы ў ім дазорцам уважліва ўнікнуць у такія скаргі кожны па сваім цыркулі і аддаць справядлівасць кожнаму асобна селяніну ў роўным раскладзе як выдадзенага адзення на 5-дымовага рэкрута, так і на прадугледжаныя кажухі, сярмягі і боты, каторы універсал загадала раздрукаваць, разаслаць усім дазорцам цыркуляр і абвясціць з амбонаў. Адаслала за поспехам у аддз. парадку сваёй камісіі просьбу дазорцы адэльскага цыркуля аб.Круповіча аб павелічэнні стаянак у мястэчку Адэльск. Атрымала з рапартам дазорцы 14-га цыркуля Вялікаберастаўіцкай парафіі аб.Якуба Скродскага прысланага арыштанта, табліцу насельнікаў і просьбу аб прысылцы інструктажа на інтэнданства і для аб.Рубоўскага. Па ўсіх пунктах звярнулася ў аддз. бяспекі сваёй камісіі, табліцу жыхароў аддала ў свой аддз. скарбу. На мемарыяле аб. Альшэўскай, жадаючай узнагароды за 4-тыднёвую паслугу свайго мужа ў камісіі,

адказала, што па сведчанню расхода павятовай касы яе муж атрымаў заплату, а за заслугамі яго перад войскам трэба звярнуцца да вайсковай каманды. Адаслала на меркаванне эканамічнай адміністрацыі мемарыял стралкоў эканамічнай в. Камашоўка, жадаючых зволіцца ад платы чыншаў і іншых падаткаў.

Сюды ж сесія апоўдні. Парадкавая камісія пад старшынствам І.Лахніцкага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў Андрэйковіча, Гансеўскага, кс.Юрэвіча, Сільвестровіча, Канопкі і Камінскага. Атрымала два паведамленні: адно ад дазорцы аб.Казлоўскага аб выпадках гвалтаўніцтва вайскоўцаў, другое — ад дазорцы мастоўскага цыркуля аб.Дзевятковіча пра абароты непрыяцеля. Абодва рапарты паведаміла генералу каменданту Ясінскаму. На свае пытанне — ці можна выдаваць пашпарты выходзячым з ковенскага паспалітага рушання ў месцы занятыя расійскім войскам — камісія атрымала адказ ЦД, каб да такіх месцаў пашпартоў не выдавала. Атрымаўшы рахунак грошаў, узятых аб.バроўскім на суправаджэнне пораху, загадала скарбоваму аддзелу вярнуць рэквізіты аб.Бароўскаму па належным разглядзе такога рахунку.

Дня 19 верасня, сесія ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.І.Лахніцкага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў Андрэйковіча, Гансеўскага, кс.Корна, Ясінскага, Камінскага, кс.Юрэвіча, Бульчынскага, Сільвестровіча. Атрымала ўрадавыя газеты пад №№ 71—72 і ўніверсал аб увядзенні вайсковых крымінальных судоў. На мемарыяле месца Перарось адказала, што калі яго абывацелі з-за блізкага суседства з прусакамі не могуць даставіць прадпісаных універсаламі правіянта і брычак, а толькі задаволіць іх грашыма, тады за тыя ж самыя грошы яны ў стане памянутыя брычкі і фураж закупіць паблізу Гродна, у месцах бяспечных ад ворага, і ў натуры даставіць. Атрымала рапарт дазорцы заблудаўскага цыркуля аб.Бучацкага. Адаслала на думку аддз.жыўнасці

мемарыял аб.Родзі. Па звароту паручніка 1-га кавалерыйскага палка аб.Бараноўскага надзяліла моцай дазорцаў, у цыркулях каторых будзе знаходзіцца такі полк, выдаваць білеты згодна з прадпісаннем інструкцыі. Мемарыял капральшы Расчэўскай адасланы ў аддз. вайсковых патрэб за сатысфакцыяй яе просьбы згодна з прадпісаннем універсалаў. Мемарыял аб.Бухавецкага са скаргай на размеркаванне крэсаў адасланы у аддз. парадку. Адказала на рапарт дазорцы аб. Барэцкага адносна пабранага ў абывацеляў ваеннымі фуража і правіянту.

Дня 20 верасня, сесія ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.І.Лахніцкага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў кс.Корна, Андрэйковіча, Гансеўскага, Камінскага, Бульчынскага, кс.Юрэвіча, Канопкі, Зялінскага, Сакалоўскага. Атрымаyую са скарбовага аддз. ННР думку аб нерушы публічных набыткаў без асігнацыі генерала камандуючага і ЦД адаслала ў скарбовы аддзел сваёй камісіі за атрыманнем належнай выпіскі. Мемарыял аб.Эйсманта, які даносіць аб розных крыўдных учынках эканома Прэвальскага староства, адаслала дазорцы для спынення тых непрыстойнасцяў. Адаслала ў аддз. жыўнасці скаргу аб.Андрэйковіча на экзекуцыю ў валодаемых ім ключах. Камісія ўхваліла прапанову аддз. справядлівасці ў сувязі з рапартам дазорцы цыркуля адносна накладання падатку прапарцыянальна заселенай сялянамі зямлі. Прынята думка аддз.інструкцый адносна ўвядзення настаўнікаў. Канфірмаваны і адасланы ў скарбовы аддзел ННР выпіс скарбовага аддзела наконт не падваення пенсіі Гіблеру. Загадала раздрукаваць прысланую з НР інструцыю для дазорцаў і настаўнікаў і разасланць яе ў цыркулі. На мемарыяле шляхты, жадаючай вызваліцца ад падаткаў, дала ў адказ рэзалюцыю, што не ў моцы яе чыніць малейшыя палёгкі ў гэтым.

Адаслала да дазорцы цыркуля мемарыял колненскіх сялян з выказанымі ў ім скаргамі. Адаслала ў аддз.бяспекі скаргу Караля Маркевіча на аб.Міхаіла Мірковіча. На атрыманы з скарбовага аддзела ЦД загад дала свой адказ адносна не чынення абывацелям прыкрасцяў пры прыёме імі скарбовых білетаў. Скаргу Сузаны Белакозавай загадала паведаміць аб.Рафановічу. На просьбу сувалскіх сялян, жадаючых зволіцца ад падаткаў, адказала сведчаннем немагчымасці задаволіць іх у гэтым. Прэтэнзію сялян да аб.Францышэвіча адаслала на разбіральніцтва дазорцы. Прадставіла генералу камандуючаму аб.Макраноўскаму свой погляд якім спосабам можна дабіцца рэгулярнага абілечвання.

Да таго ж, сесія апоўдні. Парадкавая камісія пад старшынствам аб. І.Лахніцкага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў Андрэйковіча, Гансеўскага, кс. Корна, Сільвестровіча, Сакалоўскага, Камінскага, Хлявінскага. Адаслала за вынікам у аддз.жыўнасці зварот генерал-лейтэнанта жмудскай дывізіі аб.Ваўжэцкага аб пастаўцы фуражу ў яго каманду. Звярнулася ў ЦД за тым, каб яна звярнула ўвагу генерала камандуючага на ўціскі абывацеляў з нагоды выдачы білетаў аб.Стрыенскім і каб яна дала сваё заключэнне аб сярмягах і кажухах — ці можна іх трэбаваць з тых стральцоў, якія не з 5 дымоў, а з кожнага дыма абавязаны даць жаўнера. Прынята думка аддз.справядлівасці аб скарзе аб.Казлоўскага, маючага дазор над віцінамі, аб.Павуцкага на аб.Навіцкага, наглядальніка віцін аб.Багушэвіча. На скаргу аб.Андрэйковіча дала рэзалюцыю ў адпаведнасці з меркаваннем аддз. жыўнасці сваёй камісіі.

Ігнацій Лахніцкі, камісар, старшыня.

Згодна з дыярушам *Пётр Манюшка*, рэгент парад. каміс. Гродз. павет.

За пячаткай.

БПАНК,с.1090, л.596—600 адв.

№ 113. 24 верасня. Зварот гродзенскай камісіі ў ЦД з прапановай справядлівага размеркавання скарбовых асігнацый

Рабілася ў Гродна на сесіі ў ніжнім замку 1794 года месяца верасня 24 дня.

Парадкавая камісія Гродзенскага павета, імкнучыся да таго, каб распараджэнне ННР аб пазыцы на аблігацыйныя дакументы урада і замене наяўных грошай, будзь то золата, будзь то срэбра, на скарбовыя білеты як мага хутчэй, спраўней і карысней прынесла вынік Айчыне, пры тым з увагі , што нязменнае жаданне абываценяў прыкласціся да дапамогі Айчыне было б большым, калі б ахвяруючы гатовыя грошы на замену скарбовымі білетамі, атрымоўваў білеты зараз жа, з-за чаго не толькі валадары вялікіх маёнткаў, але і мала маючыя пацягнуцца ахвяраваць больш сум, чым маюць, на замену, бо з імкнення дагадзіць патрэбам Айчыны яны гатовы замяніць апошні свой запас на скарбовыя білеты, якія адразу ж пусцяць у абарот, чымсці стануць чакаць пэўнага тэрміну, а ў выніку гэтая ахвераваная колькасць апынецца нескарыстанай. Гэтыя разлікі вымушаюць парадкавую камісію папярэдне прапанаваць святлейшай ЦД ВКЛ, каб яна дала сённяшняй камісіі якую-небудзь суму на замену наяўных грошай скарбовымі білетамі.

Даны на сесіі як вышэй, *Францішак Гансеўскі, камісар, старшыня.*

Сапраўдна з пратаколам *Пётр Манюшка*, рэгент пар. кам.Гродз. пав.

За пячаткай.

БПАНК, с. 1090, л. 604.

№ 114. 27 верасня. Заява гродзенскага генерал-маёра А.Казаноўскага адносна фурманак

Копія ноты аб.Казаноўскага ў камісію парадку.

Атрымаўшы даручэнне генерал-лейтэнанта Ясінскага знесціся з парадкавай камісіяй па пытанню выдачы фурманак, зараз жа па тым загаду прашу толькі аб наступным. 1. Пасылаю спецыфікацыю фурманак, якія былі дастаўлены па білетах і дакуль яны будуць занятымі. 2. Плац ім вызначаны ў палацы генерал-маёра разам з вартай. 3. Прашу аднаго памочніка, які б паведаміў аддзелу парадку аб патрэбных фурманках і асігнаваннях як для выгод вайсковых, так і для ўважання патрэбаў магазіна жыўнасці, або што ўгледзіць аддз.парадку. 4. Я сам вызначаю аднаго для ўтрымання тых фурманак і здачы іх прысланаму. Чакаю на гэта хутчэйшай рэзалюцыі. З павагаю, 1794 года 27 дня верасня, Андрэй Казаноўскі, генерал-маёр Гродзенскага павета.

(Прыпіска). Гэты адрас учынены з генерал-маёрам аб.Ясінскім, прысланы генерал-маёрам аб.Казаноўскім у камісію Гродз.павета, а з аддзелу парадка паведамляецца ў ЦД ВКЛ у копіі. Мацей Корн, гродзенскі абат, парадкавы камісар.

БПАНК, с. 1090, л. 607.

№ 115. 27 верасня. Загад Цэнтральнай дэпутацыі кляштарам тэрмінова здаць рахункі каштоўнасцяў

Рабілася ў Гродна на сесіі 1794 года 27 верасня

ЦД Літоўская, акрамя агульных універсалаў, абвешчаных Радай усяму народу, асобна прадпісвае зборам законнікаў і законніц, у Гродна стаячых, без усякай адвалокі, нават пад прысягай, калі дэпутацыя палічыць гэта патрэбным, падаць у ЦД не пазней 8

гадзін раніцы 28 дня рэестры запасаў срэбра, золата і іншых дробязных рэчаў, кім бы не складзеных, а тое пад найсуровейшай і хуткай у крымінальным судзе адказнасцю, паколькі дэпутацыя, пасылаючы срэбра і золата ў ліцейню, чакае неадкладнай сатысфакцыі ўніверсалу ад 11 верасня. Дэпутацыя запэўняе, што ўтойванне такіх дэпазітаў пацягне не толькі асабістае пакаранне начальнікаў кожнага канвента, але і маёнткі канвента забяруцца ў прапорцыі схаванай маёмасці ў адказнасць за тое, калі довадамі знойдзецца, што нейкі канвент утойвае свае дэпазіты. Гэтае прадпісанне загадваецца зачытаць публічна ўпаўнаважанымі дэпутацыі ВКЛ ва ўсіх канвентах у прысутнасці ўсіх сабраных ксяндзоў і манашак кляштараў.

Юзаф Несялоўскі, навагрудскі ваявода, старшыня

Подпісы аб атрыманні і азнаямленні:

ксёндз Дамінік Сівіцкі, прэор гродзенскага закона

ксёндз Тадэвуш Юрэвіч, рэктар гродзенскіх школ

Валовічава, старэйшая манашак базыльянак

ксёндз Томаш Пацэвіч, старэйшы кся.бернардынаў

ксёндз Матэвуш Корн, вікары кляштара босых (кармелітаў)

Вірідыяна Кашкоўская, бернардынка

Глушынская, законніца святога Базыля

Юстынiян Лаўрыновіч, вікары гродз. базыліянскага абатства

ксёндз Тышкевіч, старшы гродз. францысканаў

За пячаткай.

БПАНК, с. 1090, л. 609—609 адв.

№ 116. Справаздача аддзела харчу гродзенскай камісіі ад 21 да 28 верасня

Рапарт штодзённых чыннасцяў аддзела жыўнасці парадкавай камісіі Гродзенскага павета, выпісаны з

дыяруша ад дня 21 да дня 28 месяца верасня 1794 года і паданы ў аддзел харчу ЦД ВКЛ.

Дзень 21 верасня. Прыняты рапарт аб.Яленскага аб стане магазінаў, прысланы з абозу пад Крынкамі. Загадаў пісару крынскага магазіна аддаць на выдзелку 400 штук валовых і столькі ж барановых скураў, здадзеных у магазін камісарам аб.Яленскім, па дамоўленай з рамеснікамі цане. Атрымаўшы загад аддз.харчу ЦД ужыць сена з Дубніцы на вайсковыя патрэбы за аплату, загадаў таму ключу даставіць яго ў магазін па цане 40 грош. за камень. Звярнуўся ў аддз.харчу за тым, каб атрымаць патрэбныя брычкі пад фураж і правіянт для абозу з прысутнасцю канюшага для дазору, і каб дэлягаваў камісара ў абоз з іншымі брычкамі. Выдаў інструкцыю дэлягаванаму ў абоз камісару аб.Макоўскаму з прапісаннем у 8 пунктах заўваг аб.Ваўжэцкага як дзейнічаць пры насычэнні магазінаў. Загадаў пісару сакольскага магазіна ніякім разам не перавозіць з вызначаных месцаў у іншае месца магазіна. Выдаў правіянта і фуража на 125 чал. і 25 коней Сакалоўскаму, выбіраючаму жаўнераў з 50 дымоў. Па звароту аддз.бяспекі выдаў на тыдзень правіянт на 11 чал.арыштантаў.

Выдаў інструкцыю камісару аб.Міхайлоўскаму, дэлягаванаму да калоны аб.Ваўжэцкага. Вызваліў ад экзекуцыі за правіянт і фураж аўгустоўскі ключ. Атрымаў рэзалюцыю аддз.харчу Літоўскай ЦД ад 21 верасня, якая загадвае паведаміць аб завінавачаных рознымі пасэсарамі правіянце і фуражу, і каб такіх прыцягнуць да крымінальнага суда. Звярнуўся да палкоўніка пікінераў аб.Гінета з тым, каб ён аддаў пад урад пісара гродзенскага магазіна 15 людзей для рэзі быдла. За прывезеныя сена, авёс, крупы, сухары і жывёлу выдаў 534 зл.польс.24 грош сялянам каменскага ключа. Па звароту аддз.бяспекі асігнаваў на 4 тыдні фураж

для каня арыштаванага шпіка.Адаслаў у Літоўскую ЦД ліст аб штотыднёвых чыннасцях.

Дзень 22 верасня. Загадаў усім пісарам магазінаў свайго павета як хутчэй прысланць рахункі ўсіх выдаткаў на войска. За дастаўленае па загаду ўпаўнаважанага Гродзенскага павета аб.Боуфала 600 камянёў сена ў гродзенскі магазін, асігнаваў 800 зл. у палове асігнацыямі, а другую палову гатовымі грашыма. Выдаў у аддз. харчу ЦД квіт на 30 тыс. зл., або 10 тыс. зл. у асігнацыях, а 20 тыс. зл. у заручэннях, залічанымі правіянцкаму касіру. За сведчаннем, што згодна з класіфікацыяй ЦД у гродзенскі магазін аб.Саматыха здаў з віціны 9 бочак солі і бочку селядцу, Гайжэўскі з двух віцін 18 бочак солі і 2 бочкі селядцу, Янкель Шаевіч з віціны 9 бочак солі і бочку селядцу, Багушэвіч з 2 віцін 18 бочак солі, выдаў квіты кожнаму паасобна. Звярнуўся ў ЦД за дазволам аб вызначэнні пенсіі адвакату 60 зл. рэгістратару 40 зл. — а тое з нагоды забароны выдаткаў камісіяй на моцы рэзалюцыі ЦД. Згодна з кантрактам, учыненым з абозам аб.Лахніцкім, асігнаваў у палове асігнацыямі, а ў палове гатовымі грашыма 597 польс.зл. 10 гр. за дастаўку ў гродзенскі магазін 448 камянёў і 1,5 фунтаў сена. Гэтак жа цалкам у асігнацыях выдаў 776 польс.зл. аб.Дзяконскаму, скарбніку, за 582 кам.сена. Учыніў адозву да аб.дазорцаў у цыркулярах свайго павета, каб чутчэй прыслалі рапарты аб пажатай збажыне і выкашаным сене ў адпаведнасці з разасланымі схемамі з адзнакай, што замінанне рапартоў прывядзе абвінавачанага да аддачы ў крымінальны суд.

Дзень 23 верасня. Атрымаўшы загад ЦД ВКЛ аб патрэбе хуткага распараджэння адносна дастаўкі ў палявы камісарыят быдла для мяса, тут жа, звязаўшыся з пленумам камісіі, абавязаў абывацеляў даць з 20 дымоў на працягу тыдня вала і двух бараноў пад пагрозай крымінальнага суда для непаслухмяных і

адпаведна гэтаму выдаў універсал. Загадаў аб.Завістоўскаму даставіць на наступны дзень 10 галоў быдла за ўстаноўленую цану. Атрымаўшы тлумачэнне дзяржаўцы дубніцкага ключа аб.Гарлеўскага, што ён здольны даставіць заквітаванае сена на сваіх фурманках, загадаў аддз.парадку набыць вазы ў бліжэйшых пасэсіях. Загадаў пісару галынскага магазіна ўчыніць разлік з аб.Бабінскім па першаму звароту і выдаць квіт. па звароту гродзенскай столькоўшы аб.Эйсмантавай на пленум камісіі аб тым, што сялянскія палеткі ў красніцкім ключы запушчаныя з-за непрадстаўлення начальствам ім збожжа на пасеў, загадаў аб.дазорцу нагадаць начальству двара пра неабходнасць трымацца прадпісання аб збожжы ННР і гродзенскай камісіі. Атрымаў і памясціў у сваёй канцылярыі рапарт дазорцы 14-га цыркуля. На складзеныя аб.Рымінскім і Цэхановічам квіты на 3242 фунтаў і 4 гарцы мяса, дастаўленае сакольскім кагалам, асігнаваў з правіянцкай касы 432 поль.зл. — у двух частках асігнацыямі, а трэцюю гатовымі грашыма. Выдаў на коней аддз.парадку да гродзенскага магазіна 2 бочкі аўса, папрасіў аб.Каза-ноўскага выслаць каманду для выбару фурманак пад перавоз 79 коней сена з Дубны. На рапарт дазорцы аб.Барановіча аб тым, што сяляне эканамічных ключоў не маюць чым засеіць палеткі, загадаў таму дазорцы дабіцца дапамогі ў фальварках. Асігнаваў з правіянцкай касы 2476 поль.зл. і 10 грош. — палову асігнацыямі, а другую палову гатовымі грашыма — аб.Эйсманту за сена, дастаўленае ў гродзенскі магазін згодна з кантрактам.

Дзень 24 верасня. На скаргу гродзенскага ротмістра аб.Ваўкавіцкага ў тым, што насуперак на ключах правіянта і фуража з раганіцкага ключа немагчыма даставіць збожжа з-за градобою, загадаў палову аўса здаць на працягу 3 дзён, а другую палову з жыўнасцю ўстрымаў да далейшага часу. Прыняў рапарт пісара сакольскага магазіна аб.Лады, на пытанні якога даў

адпаведны адказ. Па наказу аддз.жыўнасці ЦД ВКЛ ад 22 верасня б.г. да пленума парадкавай камісіі Гродзенскага павета адносна дастаўкі быдла на мяса для войска Рэчы Паспалітай і згодна з пастановай таго пленума выдаў адозву да ўсіх абывацеляў Гродз.павета, каб яны на працягу тыдня з моманту атрымання аб'явы даставілі ў магазін з 20 дымоў або ялавіцу або 4-гадовую пад'ялавіцу, а з 10 дымоў — барана або авечку за пастаноўленую цану, не караючы за тое сялян. Атрымаў рапарт пісара крынскага магазіна аб.Кеўліча з жальбай на недахоп фурманак для правозу скураў з тамтэйшага магазіна ў Гродна, на які даў адказ з даручэннем крынскаму кагалу даць патрэбныя фурманкі. Па загаду аддз.харчу ЦД ВКЛ аб вызначэнні на сваёй сесіі камісара для рэгламенту жыўнасці, дэлегаваў для гэтага аб.Хлявінскага. Загадаў пісару гродзенскага магазіна аб.Бервінскаму выдаць за квітам аб.Сухаржэўскага 500 камянёў сена пад брычкі павятовых коней згодна з рэквізіцыяй аддз.парадку. Атрымаў рапарт дазорцы 2-га цыркуля аб.Такаржэўскага з паведамленнем, што жаўнеры каманды генерала Мейена пабралі з дубасенскага ключа правіянт і фураж без платы і квітоў, аб чым паведамлена ў галоўны вайсковы камісарыят. Распарадзіўся аб пастаўцы быдла на мяса бліжэйшымі абывацелямі гродзенскай парафіі і дзяржаўцамі ключоў яго каралеўскай мосці, абяцаючы ім плату.

Загадаў свайму касіру аб.Вінскаму за дастаўку з станіслаўскага ключа правіянта, згодна з рэквізіцыяй ад 30 жніўня б.г., выплаціць асігнацыямі 723 зл. 22 грош. за квітам упраўляючага аб.Даледскага. Таму ж касіру даручыў выплаціць асігнацыямі 256 зл. па квіту камісара аб.Сухадольца за дастаўку ў магазін 5 ялавіц. Таксама загадаў выплаціць 785 зл. 2 грош. у асігнацыях за квітам аб.кс.Ромеравай і 225 польск. зл. аб.Скарбеку за дастаўку правіянта і фуражу згодна з рэквізіцыяй ад 30 жніўня б.г. За дастаўку па кантракту сена ў

гродзенскі магазін выплаціў аб.Маткевічу і Храптовічу 822 зл. 20 грош. — у палове гатовымі, а другую палову асігнацыямі, таксама за квітамі атрымальнікаў. Аб.Завістоўскаму за дастаўку правіянта і фуражу зодна з рэквізіцыяй ад 30 жніўня і за валоў на мяса асігнаваў з правіянцкай касы ў заручэннях 3095 зл. і 16 грош. Зрабіў ацэнку фуража, дастаўленага абывацелямі з 200 дымоў на брычкавых коней аддз.парадку. Загадаў дазорцу аб.Дзевятковічу хутчэй прывезці ў Гродна з Мастоў і іншых месц соль і селядзец, складзеных з абывацельскіх ахвераванняў, пад наглядам уласных вартаўнікоў. Згодна з прадстаўленым пасведчаннем, вызваліў палкоўніка аб.Нарвойшу ад пастаўкі ў магазін сена з в.Кірмаўка, але загадаў даставіць іншы правіянт. Загадаў пісарам індурскага і луненскага магазінаў перавезці ў Гродна магазіны цалкам, наняўшы фурманкі на тым баку (ракі).

Дзень 25 верасня. Згодна з універсалам і жаданнем аб.Гансеўскага, выдаў 538 польс.зл. за дастаўку ў гродзенскі магазін 11 галоў жывёлы. Выдаў 440 поль.зл. аб.Андрэйковічу за дастаўку сена. Загадаў пісару магазіна выдаць для хворых 5 штук дрэваў са скідкай пры аплаце. Асігнаваў з правіянцкай касы за скарбовымі заручэннямі 327 зл.24 грош. за сена і правіянт, дастаўленыя з дубасаўскага ключа. Даў білет кс.Палякоўскаму на дастаўку пад дазор аб.Кулікоўскага 15 бочкак жыта і столькі ж аўса, таксама за плату. Атрымаў рапарт правіянцкага касіра аб.Вінскага аб тыднёвых выдатках. У адказ на мемарыял скарбінка аб.Дзяконс-кага звярнуўся да каманды, будучай у квасніцкім ключы для экзекуцыі, вылучыць 2 жаўнераў для суправаджэння фуража, які аб.Дзяконскім вязецца.

Дзень 26 верасня. Загадаў выдаць з сакольскага магазіна камандзе коннай літоўскай гвардыі з 39 коней і 34 чал.правіянт і фураж разам з 100 вазамі саломы. Паслаў на меркаванне ЦД ВКЛ спісы абывацеляў, не

паставіўшых фураж і правіянт. Атрымаў і склаў у сваёй канцылярыі рапарты пісароў сакольскага і галынскага магазінаў. Даў адказ аб.Дзяконскаму, які, не прыняўшы квіты ад калоны за наказаны фураж, адаслаў недастаючы авёс і абвясціў, што нічога за жыта не прыме. Загадаў сакольскаму кагалу даць на тыдзень для каманды аб.Губы 252 фунтаў мяса, за што выдаў плату адпаведна з таксай. Загадаў палкоўніку аб.Трубіцкаму, каб ён наказаў патрулям, пасланым у мастоўскі ключ, даведацца аб віцінах з соллю, плывучых з Мастоў пад надзорам Тавінскага, дазволіўшы таму ўзяць з віцін гарэлку згодна з рэквізіцыяй аддз.вайсковых патрэб, і яшчэ не менш, каб аказаў дапамогу пры вывазе чаго б то ні было ў луненскім магазіне. Загадаў аб.Круповічу забяспечыць са свайго магазіна людзей у камандзе аб.палкоўніка Трубіцкага і за яго квітам, і аплаціць за ўсё, што акажацца звыш спецыфікацыі галоў.

Папрасіў генерала аб.Мейена даць варту для драўлянага склада. Атрымаў з Літоўскай ЦД загад прывезці ў Лунна соль з гродзенскага і жыта з галынскага магазінаў. Падцвердзіў аб выдачы квітаў аб.Ельскаму за фураж, дастаўлены аб.Кулікоўскім. Атрымаў і памясціў у сваёй канцылярыі рапарт дазорцы 15-га цыркуля. На данясенні пісара крынскага магазіна аб.Кеўліча аб тым, што не мае фурманак для правозу скураў, загадаў скуры злажыць у фальварку дзяржаўцы і папярэдзіў, што дзяржаўца будзе павінны ўдвая ўзнагародзіць скарб за верагодныя шкоды. Загадаў пісару луненскага магазіна як хутчэй вывезці магазін у Гродна, на што паслаў білеты аддз.парадку. Выдаў з правіянцкай касы 80 зл. аб.Юліяну Сільвестровічу за дастаўленую ў гродзенскі магазін гарэлку. Асігнаваў аб.Сухадольскаму 18 зл. за дастаўку ў той жа магазін 3 бараноў. Загадаў аб.Бервінскаму выдаць з магазіна 250 бочак солі для вывазу яе ў Васількава па квіту аб.Літоўскага. Звярнуўся да генерала аб.Казаноўскага

даць 200 фурманак пад вываз солі ў Васількава. Атрымаў данясенне пісара луненскага магазіна, што для правоза магазіна яшчэ не выдадзены білеты на фурманкі. У адказ на мемарыял аб.Вышэмірскага загадаў даставіць палову належнасці з купліскай воласці. Загадаў правіянцкаму касіру аб.Вінскаму заплаціць у заручэннях 1496 зл. 26 грош. пасэсару квасаўскага ключа за дастаўлены правіянт і фураж.

Дзень 27 верасня. Загадаў пісару драўлянага магазіна выдаць генерал-лейтэнанту аб.Мейену 130 вазоў дроў, з уліку калоды на 2 вазы. Атрымаў рапарт аб.Дзевятковіча аб мастоўскім складзе солі і аб плыцці з віцінамі аб.Тавінскага. Атрымаў і памясціў у сваей канцылярыі рапарт дазорцы 22-га цыркуля аб.Міхаэліса. Загадаў спыніць экзекуцыю камандзе, у Кузніцах стаячай. Атрымаў і памясціў у сваёй канцылярыі 2 рапарты — адзін з 10-га цыркуля, другі — ад 24-га цыркуля аб ураджаю розных прадуктаў. Разаслаў усім дазорцам загад, каб абывацелі ў іх цыркулях звазілі правіянт, фураж і быдла ў новыя магазіны, заснаваныя ў Кузніцах, Янаве і Васількаве. Загадаў дазорцу аб.Міхаэлісу вызначыць у Кузніцы месца пад магазін. Вызваліў падкаморага аб.Ельскага заснаваць магазін у Янаве, дзе ён знаходзіцца пры багажах.

За дастаўку ялавіцы і 2 бараноў асігнаваў з правіянцкай касы гродзенскім ксяндзам дамініканам 60 польс.зл. у білетах. Атрымаў загад пленума камісіі прысланць спецыфікацыю скураў у магазінах. Выдаў 2 вазы кулевай саломы і 7 вазоў дроў на каманду Мідлетона. Загадаў касіру аб.Вінскаму выплаціць у асігнацыях 120 польс.зл. пісару гродзенскага магазіна аб.Бервінскаму за празмерную працу пры ўваходзе войскаў. Загадаў пісарам крынскага і індурскага магазінаў прысланць дакладныя рапарты з паказам расходаў, астаткаў і г.д. Паставіў аб. Міхаіла Бяляўскага дазорцам як для атрымання ад абывацеляў жывёлы,

так і для атаксавання яе, і, выслухаўшы яго прысягу, памясціў яе тэкст у сваёй канцылярыі. Даў адказ на скаргу стральцоў сакольскай кватэры, а аб.Яленскаму, дэлегаванаму ў каманду аб.Паўла Грабоўскага, даручыў унікнуць у крыўды і выдаць скаржнікам квіт. Загадаў касіру Вінскаму заплаціць у заручэннях 3703 польск.зл. 13 грош. за правіянт і фураж, дастаўленыя з язерскага і скалубоўскага ключоў.

Дамінік Маткевіч, камісар
За пячаткай.

БПАНК, с. 1090, л. 613—617 адв.

№ 117. Дыяруш гродзенскай камісіі з 21 да 28 верасня

Рапарт штодзённых чыннасцяў парадкавай камісіі Гродзенскага павета ад дня 21 да дня 28 месяца 1794 года, у святлейшую ЦД ВКЛ пасланы.

1794 года месяца верасня 21 дня, сесія апоўдня. Парадкавая камісія пад старшынствам Францішка Гансеўскага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў кс.Корна, Зялінскага, Бульчынскага, Сухадольца, Канопкі, Маткевіча, Хлявінскага, Мальчэўскага. Атрымала з ЦД адказ на прапанову свайго аддз. харчу аб фуражу для калон і аддз. вайсковых патрэб аб кажухах для стральцоў, які паведаміла тым аддзелам.

Дня 22 верасня, сесія ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Ф.Гансеўскага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў кс.Корна, Сільвестровіча, кс. Юрэвіча, Зялінскага, Канопкі, Ф.А.Пачобута, Камінскага, Мальчэўскага, Бульчынскага. Атрымала з скарбовага аддзела ЦД 2 кніжкі, адну — трывалае ўстанаўленне староствам або права, ухваленае 24 красавіка 1792 г., другую — распараджэнне ННР аб продажы нарадовых добраў. Абедзьве тыя кіжкі аддала сваёй канцылярыі.

Аддала ў аддз.парадку ноту генерала аб.Казаноўскага са скаргай на заняцце палаца Брастоўскіх пад магазін яго палка. Аддала на выніковую сатысфакцыю аддз. вайсковых патрэб мемарыял аб.Ігнація Ключэўскага, жадаючага вярнуць належнасць, узятую з 15 дымоў на 50-дымовага кантаніста. На зварот генерала аб.Грабоўскага адносна размяшчэння лазарэта ў месцы Саколка адказала таму генералу, што ў паказаным месцы нельга размясціць шмат хворых і што камісія звяжацца пра такі аб'ект з месцам Крынкі. Адаслала на сатысфакцыю аддз.справядлівасці скаргу Плісаў на свайго ўпраўляючага. Туды ж аддала скаргі сялян на Францэвіча. Адаслала на рэзалюцыю аддз.парадку скаргу арандатара Каробчыцкага на вымаганне ўраджайных плёнаў.

У адказ на скаргу барысаўскага дзяржаўцы аб.Выкоўскага на непаслушэнства польніцкіх сялян загадала дазорцу аб.Ігнатовічу прымусіць непаслухмяных да належнай пакорнасці двару. Ухваліла цалкам прынесеную і зачытаную на пленуме камісіі адозву да дазорцаў. Адаслала на рэзалюцыю аддз.харчу рапарт дазорцы язерскага ключа, які тычыцца таго аддзела. Адаслала на ўвагу і рэзалюцыю віцэ-адміністрацыі эканоміі яго каралейскай мосці мемарыял аб.Рыдзеўскага, які распісаў вёскі кумяльскага ключа, якія нічога не маюць на пасевы. На мемарыяле адваката месца Ліпск Мікалая Унукоўскага адказала, што пытанне аб рэкрутах адсылаецца на рэзалюцыю аддз.вайсковых патрэб, а што да пабранага фуражу, то за атрыманнем патрэбных квітоў за паказаны фураж трэба звяртацца ў палявы камісарыят. З нагоды скаргі на аб.Шумскага і таварыша 5-га палка Малецкага, пабраўшых без ардананса каманды розны правіянт з вёсак дамброўскага цыркуля, звярнулася да генерала Грабоўскага ў пошуках справядлівай сатысфакцыі пакрыўджаным. Рапарт

дазорцы 18-га цыркуля па адпаведнай матэрыі аддз. вайсковых патрэб аддала на рэзалюцыю таго аддзела. Адаслала на рэзалюцыю генеральнага палявога камісарыята просьбу аб фуражы хірурга 6-га палка Крауза.

Да таго ж сесія апоўдні. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Ф.Гансеўскага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў кс.Эйсманта, Канопкі, Маткевіча, Сакалоўскага, Хлявінскага, Мальчэўскага, Лахніцкага, гродзенскага абата кс.Корна, Зялінскага, Гаусмана, Эрэнкрэйца, Андрэйковіча, Камінскага. Загадала дазорцу 42-га цыркуля перагледзець свой дакрэт па скарзе селяніна сухадалінскага ключа Францішка Сабулы на аб.Церпілоўскага. Аддала ў аддз.жыўнасці рапарт дэлегата аб.Яленскага аб колькасці галоў у калоне генерал-маёра аб.Паўла Грабоўскага і патрэбнага для іх правіянта і фуража. Камісія сведчыць, што гродзенскі скарбнік аб.Мартын Данкевіч, цнатлівы і добрага характару, без згоды і гвалтоўным прымусам прыцягнуты да таргавіцкіх чыннасцяў і, наадварот, з вялікай цнотай баронячы абывацеляў ад узрастаючых гвалтаў непрыяцеля, заслужыў агульны давер абывацеляў. Загадала скарбоваму аддзелу згодна з наказам ННР разаслаць упарадкаваныя і зацверджаныя пратаколы дэпазітаў і пазычак абывацеляў дазорцам цыркуляў з абавязкам звароту іх у камісію не пазней 15 кастрычніка. Сведчанні на дэпазіты і пазыкі абывацеляў надалей будуць выдавацца на пленуме камісіі за візай скарбовага аддзела. Аддала ў свой аддз.харчу паведамленне аб.Мацея Франкўскага аб дастаўцы ў Прывалкі правіянт і фураж на яго калону ў суме 6 тыс. зл.

Дня 23 верасня. Сесія ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Ф.Гансеўскага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў кс.Корна, Камінскага,

Сакалоўскага, кс.Антона Эйсманта, Андрэйковіча, Сухадольца, Гаусмана, Ясінскага, Зялінскага, Ф.Пачобута.

Адаслала ў аддз. вайсковых патрэб атрыманую з ННР уставу аб замене паспалітага рушання новым рэкрутам, конным і пешым. Выдала месячную асігнацыю на 60 зл. адвакату і 40 зл. рэгістратару аддз. жыўнасці. Аддала ў сваю канцылярыю ліст ЦД аб прыёме абывацельскіх дэпазітаў і пазык. Адаслала за вынікам у аддз.харчу данясенне віцэ-адміністрацыі эканоміі яго каралеўскай мосці аб запушчэнні палеткаў пасэсарамі некаторых ключоў. Ноту аб.Мацея Эйсманта па прадмету харчавання адаслала ў аддзел жыўнасці з загадам знесціся з палявым камісарыятам для задавальнення выказаных у ёй пажаданняў. На мемарыяле ад рознай шляхты запісала, што звяртаецца за рэзалюцыяй аддз.харчу па пункту аб уціску яе экзекуцыямі за непастаўку фуража. Загадала выдаць з публічных падаткаў 30 зл. за стварэнне адвакатам 50 кніжак пратаколаў для ўпісання ў іх дазорцамі цыркуляў абывацельскіх пазычак. Адаслала на выніковую рэзалюцыю аддз.вайсковых патрэб просьбу генерала Казаноўскага аплаціць працу хірурга батальёна стральцоў.

На мемарыяле Кацярыны Хілімонавай запісала, што не можа вызваліць ад устаноўленых Радай платы і магазінаў, а што да звальнення яе сына з вайсковай службы, то адсылае за рэзалюцыяй аддз.вайсковых патрэб. Адаслала на рэзалюцыю аддз.справядлівасці мемарыял вольных сялян астроўскага ключа аб дамаганні імі справядлівасці. На рэзалюцыю аддз. вайсковых патрэб адасланы мемарыял Ваўрынца Стэфановіча, жадаючага вызваліць сына з вайсковай службы. У адказ на мемарыял дзяржаўцы сакольскага ключа аб.Эйсманта са скаргай на непаслушэнства мяшчан і прадмяшчан Саколкі, загадала маёру войск

Рэчы Паспалітай аб.Цэхановічу аказаць пажаданую вайсковую дапамогу дазорцу сакольскага цыркуля для прывядзення непакорных да паслухмянасці двару. А што да жадання пакінуць на месцы брычкі ў сучасных абставінах, то тое адаслала па рэзалюцыю аддз.харчу. Адаслала на рэзалюцыю палявога камісарыята мемарыял ліпскіх мяшчан. Адаслала ў аддз.бяспекі мемарыял Нахіма Гзаловіча са скаргай на каманду Янкоўскага за напад на тызенгаўскую карчму. Пры разглядзе мемарыяла маркграфа палаца Сангушкаў аб.Дуброўскага вырашана: што да скаргі на ўчыненыя крыўды кватэруючымі жаўнерамі, то для разбору такіх крыўд пасланы аб.Ясінскі, а што да шкод, учыненых тымі кватэрантамі, то аб.Дуброўскі мусіць падацца за сартысфакцыяй да каменданта пікінераў аб.Кінштэта.

Да таго ж сесія апоўдні. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Ф.Гансеўскага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў кс. А.Эйсманта, Андрэйковіча, Сільвестровіча, Сухадольца, Зялінскага і Ф.Пачобута. Пленум камісіі ўхваліў сведчанне скарбовага аддзела на срэбра 12-й пробы літоўскай вагі 78 грывен 7 лотаў, здадзенага гродзенскім упаўнаважаным аб.Боўфалам у скарб Рэчы Паспалітай, з дэкларацыяй Рады выдаць абліг на суму, прапарцыянальную вартасці здадзенага. Атрымала з аддз.парадку Літоўскай ЦД адозву да прусакоў, адрасаваную ад імя польскага ўрада, якую загадала аддз.парадку разаслаць дазорцам на прускай мяжы. Ухваліла сведчанне скарбовага аддзела на срэбра 12-й пробы літоўскай вагі 159 грывен і 9 лотаў, складзеных у скарб Рэчы Паспалітай віленскім харунжым аб.Антонам Тызенгаузам, з дэкларацыяй Рады выдаць належны абліг на суму, прапарцыянальную вартасці здадзенага.

Дня 24 верасня, сесія ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Ф.Гансеўскага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў кс.Свяжынскага, кс.Юрэвіча,

кс.Эйсманта, Сільвестровіча, Сакалоўскага, Камінскага. Адаслала ў аддз.парадку скаргу аб.Эйсманта аб тым, што ён ужо двойчы ўплаціў грашовую складку са сваіх дымоў на прызначаныя брычкі. Зварот аб.Кулікоўскага па розных пытаннях адаслала ў аддз. жыўнасці, а на адзін дала свой адказ. Адаслала ў аддз.інструкцый рапарт дазорцы аб.Сезенеўскага. На паведамленне таго аб п'янстве сялян і кватэруючых у іх 5-дымовых кантаністаў, загадала паспяхова разабрацца, памятуючы пры гэтым адпаведныя распараджэнні. Адаслала ў аддз.вайсковых патрэб мемарыял Міхаіла Галубовіча. На мемарыяле шляхты, жадаючай вызваліцца ад падаткаў, засведчыла сваю немагчымасць задаволіць такую просьбу. Аддала на меркаванне аддз.харчу мемарыял шляхты астроўскага ключа, жадаючай вызваліцца ад збожжавай ссыпкі. Ухваліла сведчанне скарбовага аддзела, выдадзенае аб.кс.Кадлубоўскаму на срэбра 13-й пробы 6 грывен, 4 лоты, а таксама срэбра 12-й пробы 41 грывен, 11 лотаў з выдачай за вартасць выпадаючую суму. Ухваліла квіт, выдадзены скарбовым аддзелам кс.Міхаілу Кадлубоўскаму, гродзенскаму афіцыялу, за залатую табакерку коштам у 448 зл. з мэтай замены яе на скарбовыя білеты з парукай у тым, што грошы будуць выплачаны на працягу 8 месяцаў з нарадовага скарбу. Адаслала ў аддз.харчу сваёй камісіі загад аддз.жыўнасці Літоўскай ЦД адносна выбару солі і селядца. Асігнавала за квітамі сакратароў за выдаткі канцылярый у аддз.справядлівасці і інструкцый 50 зл., аддз.харчу — 55 зл. 17 грош., агульнай канцылярыі пленума — 31 зл. Адасланы ў аддз.бяспекі мемарыял аб.Радзевіча, а ў аддз. вайсковых патрэб — аб.Барвовічавай.

Да таго ж сесія апоўдні. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Ф.Ганседўскага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў Андрэйковіча, Сухадольца, кс.А.Эйсманта, кс.Юрэвіча, Канопкі, Ясінскага,

Жылевіча. На прапанову шаноўнага генерала аб.Макраноўскага — вывезці індурскі і луненскі магазіны, забраць срэбра з калоны аб.Ваўжэцкага, ужыць павятовых фурманкавых коней пад гарматы — загадала аддз.харчу вывезці магазіны, скарбоваму — забраць срэбра, парадкаваму — падкаваных коней здаць на волю генерала, а коней, што былі ў аддз.вайсковых патрэб, аддаць пад гарматы. Звярнулася ў ЦД за тым, каб тая прыслала ў камісію білеты для замены гатовых грошаў.

Дня 25 верасня, сесія ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Гансеўскага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў кс.Свяжынскага, кс.Эйсманта, кс.Юрэвіча, Сільвестровіча, Зялінскага і Камінскага. Рапарт ліпскага дазорцы аб.Гансеўскага аддала ў аддз.харчу з мэтай уладзіць данесенае. Адаслала ў аддз.вайсковых патрэб рапарты аб.Падвысоцкага і Нарвойшы, якія даносяць аб дэзерцірстве заступцаў паспалітага рушання і шляхты, выбранай у кавалерыю. Пленум ухваліў думку аддз.інструкцый адносна ўвядзення настаўнікаў. На думку аддз.справядлівасці адасланы мемарыял філіпаўскіх прадмяшчан са скаргай на аб.кс.Пузыну. Аддала ў аддз.вайсковых патрэб мемарыял Яна Грынашэўскага, які адмаўляецца ад вайсковай службы па стану здароўя. Туды ж адасланы мемарыялы Матэвуша Сташкоўскага і Юзафа Тамашэўскага, Андрэя Тубы і Мацея Дмітроўскага аб вызваленні іх сыноў з ваеннай службы, таксама аб тым жа мемарыял Томаша Петрашэвіча.На мемарыял інтэнданта маста аб.Гаеўскага па разважанні выдала 10 зл. да раней назначанай месячнай пенсіі, а за запазычанасцю адаслала ў скарбовы аддзел.

Сюды ж сесія апоўдні. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Ф.Гансеўскага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў кс.Свяжынскага, Андрэйковіча, кс.Эйсманта, Сільвестровіча, Камінскага, Ясінскага. Адказала камандуючаму генерал-лейтэнанту

аб.Ясінскаму адносна вызвалення фурманак (з абозу). У выніку свайго хадайніцтва, атрымала з ЦД асігнацыю на 40 тыс.польс.зл. у скарбовых білетах з мэтай замены іх на гатовыя грошы, якую загадала свайму скарбоваму аддзелу прыняць за квітам. Аддала ў аддз.інструкцый рапарт ходараўскага цыркуля аб.Дзяржынскага. Адаслала ў аддз.харчу і вайсковых патрэб два рапарты таго ж дазорцы: адзін — аб стрэльбах, другі — аб рэкрутах, што ў дамах знаходзяцца. Атрымала ардананс генерала камандуючага аб.Макраноўскага да ўсіх карпусоў аб тым, каб усе каманды прынімалі пад сваю стражу дэзерціраў, якіх будзе здаваць ім камісія. Адаслала ў аддз.парадку рапарт дазорцы сакольскага цыркуля аб.Дабравольскага аб патрэбе фурманак пад сакольскі лазарэт. Загадала скарбоваму аддзелу сваёй камісіі выканаць зварот скарбовага аддзела ЦД адносна прысылкі рахункаў даходаў і расходаў.

Дня 26 верасня. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Ф.Гансеўскага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў кс.Корна, Андрэйковіча, Зялінскага, кс.Свяжынскага, Маткевіча, Гоувальта, Камінскага, Сільвестровіча, кс.Эйсманта, Мальчэўскага і кс.Юрэвіча. Адаслала ў аддз.парадку мемарыял філіпаўскіх мяшчан адносна пастаўкі брычак. Атрымаўшы данясенне гродзенскіх ксяндзоў бернардынаў аб тым, што яны не ведаюць, ці ёсць у іх дэпазітах срэбра і золата, выслала са свайго кола камісараў кс.Эйсманта і Ясінскага з тым, каб яны па люстрацыі такіх дэпазітаў аддалі ксяндзам бернардынам або золата і срэбра, або грошы, абяцаўшы тым абавязковую сатысфакцыю згодна з выдадзеным універсалам НР. Гродзенскі земскі рэгент аб.Эйсмант паведаміў, што ў заведваемай ім канцылярыі ніякіх дэпазітаў не маецца. Адаслала ў свой аддз.бяспекі рапарт дазорцы гродзенскага цыркуля аб.Кандыбы аб такім здарэнні, што ў пасэсіі Замойскіх Русота адна жанчына, радзіўшы дачку, з сораму схавала ў алешніку,

якую там вельмі парвалі свінні. Туды ж паведаміла просьбу аб.Главацкага аб звароце пісталетаў, забраных аб.Былеўскім і Хлявінскім. Загадала камісарам аб.Шумкоўскаму і Барэцкаму да дня 30 бягучага прыбыць у Гродна для выканання сваіх абавязкаў. Паколькі тлумачэнне аб.Хлявінскага паказвае, што пісталеты аб.Главацкага былі здадзены ў магазін, то камісія звярнулася ў аддз.вайсковых патрэб за высвятленнем. Прыняў думку аддз.справядлівасці аб тым, каб дазорца 4-га цыркуля па знясенні з адміністрацыяй эканоміі яго каралеўскай мосці дапамог сялянам ці то з камунальных сялянскіх складак, ці то і іншага фундуша.

Сюды ж сесія апоўдні. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.Ф.Гансеўскага пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў кс.Свяжынскага, Андрэйковіча, Зялінскага, Сільвестровіча, кс. Эйсманта, Камінскага. Аддала ў скарбовы аддзел і аддз. вайсковых патрэб ахвераванні абывацеляў краснапольскай парафіі ў палатне і грошах, прысланых пры рапарце інтэнданта той парафіі аб.Равінскім. Быў зачытаны рапарт скідзельскага дазорцы аб.Барановіча.

Дня 27 верасня. Сесія ранняя. Парадкавая камісія пад старшынствам аб.С.Гоувальта пачала сесію ў прысутнасці аб.камісараў кс.Свяжынскага, Андрэйковіча, Зялінскага, Сільвестровіча, кс.Эйсманта, Камінскага. Атрымала ўрадавыя газеты пад №№ 80 і 81, а таксама ўніверсал аддз.парадку ННР, выпраўляючы памылку адносна тэрміну пастаўкі рэкрутаў і коней, якія адаслала ў аддз.вайсковых патрэб. Адаслала ў аддз.інструкцый рапарт дазорцы пунскага цыркуля аб.Клімашэўскага аб колькасці касцёлаў у ягоным цыркулі. Мемарыял аб.Алены Горскай са скаргай на затрымку кс.Козічам належных грошай, адаслала да кс.дэкана. Дала рэзалюцыю на пытанне дазорцы аб.Куяўскага аб непрыняцці аблігаў згодна з універсалам НР, якія

абавязвае абываценяў складаць гатовыя грошы. А прысланую тым жа дазорцам люстрацыю жыхароў і ўраджаю адаслала ў аддзел жыўнасці. Звярнулася ў аддзел жыўнасці наконт паведамлення аб залеглых у магазінах скурах.

Францішак Гансеўскі, камісар, старшыня
За пячаткай.

БПАНК, с. 1090, л. 620—624.

№ 118. 30 верасня. Разлік гродзенскай камісіі падрада з яўрэямі

Аддзел вайсковых патрэб гродзенскай камісіі атрымаў у магазін дастаўленага гродзенскімі купцамі Ёселем Лейбовічам і Шмуйлам Баярскім 233 паставы амунічнага сукна, 365 локцяў набойкі і 40,5 локцяў бойкі для абмундзіравання войскаў Рэчы Паспалітай, за што выпадае належнасці 38142 зл. Даны ў Гродна 30 верасня 1794 года.

Ян Сакалоўскі, камісар
Міхаіл Эрэнкрэйц, камісар
(Прыпіска). Каб за гэтыя рэчы, узятыя на патрэбы войска аддз.вайсковых патрэб камісіі Гродзенскага павета, ЦД ВКЛ магла залічыць на квіты камісараў гродзенскай камісіі, трэба запытацца ў ЦД.
Антон Лахніцкі
За пячаткай.

БПАНК, с. 1090, л. 626.

№ 119. 30 верасня. Зварот гродзенскіх купцоў у ЦД ВКЛ за аплатай падрада сукна

Святлейшая ЦД ВКЛ!

Мінула ўжо некалькі дзён пасля нашай незалішне ганарлівай просьбы атрымаць з ЦД умоўленую плату

гатовымі грашыма за сукно, узятае ў нас Гродзенскай парадкавай камісіяй, на якую просьбу дагэтуль не паступіла ніякай рэзалюцыі, а вайсковы аддзел ужо паўторна ўзяў у нас сукна на 38394 зл. Затым просім яшчэ раз святлейшую дэпутацыю загадаць заплаціць нам не меней як у палове гатовымі грашыма. Мы аплацілі гатоўкай такую вялікую партыю сукна, што дастаўленае на краёвыя патрэбы забрала ўвесь наш абарот і калі не атрымаем плату хаця б у палове гатоўкай, то пацерпіць не толькі наш гандаль, але наступіць нават невыгода краю ў атрыманні яму патрэбных прадуктаў і з'явяцца не меншыя шкоды. А таму яшчэ раз просім святлейшую ЦД мець ласку вызначыць на месцы там тую плату, каб нам яўна не прапасці, бо з усіх 78 тыс. мы ўзялі толькі 6500 гатоўкай. Няхай тады святлейшая дэпутацыя з ласкі дасць нам палову гатоўкай, а палову асігнацыямі, аб чым найпакорнейшэ просім, святлейшай ЦД слугі.

Юзаф Рубіновіч і Шмуйла Баярскі, купцы, гродзенскія абываталі

БПАНК, с. 1090, л. 629.

№ 120. 1 кастрычніка. Меркаванні гродзенскай камісіі аб цяжкасцях пры нарыхтоўцы харчовых запасаў

Рабілася ў Гродна месяца кастрычніка 1 дня 1794 года на сесіі.

Аддзел харчу парадкавай камісіі Гродзенскага павета ў адказ на пытанне аддз.харчу ЦД ВКЛ адносна ўстанаўлення падрадаў на закупку харчавання паведамляе, што аб.Макавецкі, даўно засядаючы ў камісарыяце, пры выдачы гатоўкі на закупку быдла адчувае цяжкасці, а што да закупкі збожжа, сена і г.д., то гэта залежыць ад рухавасці дазорцаў і іх ведання аб

дастатку прадуктаў пасля неабходных трат. А таму варта бы было загадаць абывацелям лішкі звыш патрэбных прадуктаў звозіць у магазіны за памяркоўную плату і тады не спатрэбіліся б і падрады на закупку збожжа. Дата ў Гродна як вышэй.

Ксёндз Жылевіч, камісар

Згодна з пратаколам *Мацей Бронц*, сакратар аддзела харчу

БПАНК, с. 1090, л. 557

Спіс імёнаў

Абрамовіч Казімір, бургамістр гродзенскага магістрата 1793, крымінальны суддзя

Абрамовіч Кушаль, арандатар Плаўска

Абуховіч Канстанцін

Абуховіч Томаш

Абуховіч Францыска, мінская кашталянша 1795

Абухоўскі Дыянісі, пісар індурскага магазіна

Абухоўскі Юзаф, пісар гродзенскага і індурскага магазінаў

Агінскі Міхаіл Клеафас, шэф корпуса вольных стралкоў

Агінскі Тадэвуш, трокскі ваявода

Агінская Ядвіга, жонка Тадэвуша

Адамовіч Антон

Адамовіч Вікторыя, палкоўніца

Адахоўскі Ян Хрызастом, харунжы, скарбнік ВКЛ

Адахоўскі Міхаіл, гродзенскі камісар, стражнік і гранічны суддзя 1792

Азулевіч Якуб, палкоўнік кавалерыі літоўскай

Акуневіч, інтэндант

Александровіч Антон, лідскі земскі суддзя, камісар

Александровіч Тадэвуш, гродзенскі гродскі суддзя, маршалак павета

Александровіч Францішак, харунжы, лідскі земскі пісар, кашталян, камісар

Александровіч Юзаф, лідскі ротмістр, камісар

Алендскі Юзаф

Альшэўскі Караль, лідскі шляхціч, цывільна-вайсковы камісар 1792

Альшэўскі Міхаіл, лідскі шляхціч

Альшэўскі Стэфан, лідскі шляхціч

Альшэўскі Францішак, адвакат літоўскага скарба

Алузінскі Антон, плябан у Квасаве

Андрэйковіч Тадэвуш, гродзенскі гродскі суддзя, камісар

Антановіч Матэвуш, завілейскі камісар

Антановіч Мацей, бурмістр Саколскі, пісар сакольскага магазіна

Антановіч Якуб, касір, лідскі камісар

Арамовіч Ян, ашмянскі камісар

Аржахоўскі Ваўрынец, пісар віленскага магазіна, мазырскі будаўнічы, член камісіі паліцыі ВКЛ 1793

Аржахоўскі Станіслаў

Асіа, маёр літоўскай артылерыі

Аскерка Міхаіл, браслаўскі паручнік

Ахатніцкая Брыгіда, гродзенская палкоўніца

Ахатніцкі Тэадор Мартын, ротмістр 1793, палкоўнік

Ахматовіч, сакратар лідскай камісіі

Ахоцкі, дзяржаўца ключа Крынкі

Бабецкі Тадэвуш, охарунжы, мытны дазорца

Бабранскі, ліцейшчык

Бабінскі Антон, ашмянскі камісар

Бабінскі Юзаф, гродзенскі каморнік

Бабінскі Юзаф, смаленскі лоўчы, мерацкі земскі суддзя

Багдановіч Міхаіл, падпаручнік 1 брыгады літоўскай, пісар занемунскі

Багуцкі Матэвуш, рэгент цывільна-вайсковы, завілейскі камісар

Багушэвіч Адам, завілейскі камісар

Багушэвіч Аляксандр, ротмістр пярэдняй літоўскай варты

Багушэвіч Станіслаў, прэсвітар Трабаў, ашмянскі камісар

Багушэвіч Юзаф, ашмянскі ротмістр

Бадзені Мартын, надворны падкаморы і падскарбі ВКЛ

Бадзінскі Людвік, экзактар, эйшынскі камісар

Бакоўскі Ігнацi, гродзенскі ротмістр

Бакоўскі Юзаф, рэгент літоўскай паліцыі, член Цэнтральнай дэпутацыі

Бакшанскі Іяхім, завіленскі камісар

Барановіч Міхаіл, ротмістр 1793, паручнік

Барвовіч Кацярына

Бародзіч Антон, лідскі абозны, земскі суддзя, эйшышскі камісар

Бароўскі Ігнат, браслаўскі паручнік (жанчына)
Бароўскі Францішак, маркграф Гародні
Барэцкі Геранім, гродзенскі стольнік, цывільна-вайсковы камісар, дазорца, шамбелян 1795
Барэцкі Ігнат, гродзенскі дазорца
Барэцкі Міхаіл, ротмістр, гродзенскі гродскі суддзя
Бачкоўскі Ігнаці, лідскі дазорца, лідскі судовы падстараста 1792
Баярскі Шмуйла, гродзенскі купец
Белакоз Сузана
Беліковіч Вінцэнт, браслаўскі генерал-маёр
Бенкунскі Рафал, стралец, ашмянскі камісар
Бенкунскі Севярын, ашмянскі скарбнік, камісар
Бенкунскі Феліцыян, ашмянскі камісар
Беньямовіч Іцка, гродзенскі купец
Беньямовіч Медэль, гродзенскі купец
Берасневіч Юзаф, ротмістр і капітан
Бервінскі Юзаф, лаўнік і пісар гродзенскага магістрата
Бергіл Ануфры, дазорца ў Малой Бераставіцы
Берк Аўгут, гродзенскі камісар
Берка, лідскі жыхар
Бетц Флор, член Цэнтральнай дэпутацыі
Більмін Мартын
Біспінк Тэадор, стольнік старадубскі і прэнскі
Бістром Тадэвуш, упіцкі цывільна-вайсковы камісар, гродзенскі камісар, член ЦД
Благажэўскі Андрэй, селянін ключа ў Янаве
Бонар Андрэй, дзяржаўца герасімоўскага ключа
Бонар
Боуфал Францішак, вербоўскі стараста, дазорца, упаўнаважаны ЦД
Браніцкі Францішак Ксаверы, вялікі каронны гетман
Брастоўскі Ксаверы, стараста мсцібаўскі
Брастоўская Барбара
Бронц Ваўрынец, гродзенскі камісар
Бронц Мартын, гродзенскі камісар
Будзілоўскі Мікалай, селянін

Буйгід Мар'яна
Букоўскі Ян, завілейскі камісар
Булгарын Павел, падканюшы літоўскі, гродзенскі падкаморы, шэф гродзенскіх валанцёраў
Булінскі Андрэй, завілейскі камісар
Бульчынскі Ян, дырэктар гродзенскай мануфактуры
Буры, браслаўскі гараднічы
Бухавецкі Ігнат, рэктар брэсцкіх школ, камісар
Бухавецкі Віктар, гродзенскі харунжы
Бучацкі Мацей, гродзенскі ротмістр, дазорца
Быкоўскі Тадэвуш, слонімскі харунжы
Былеўскі Мацей (Матэвуш), гродзенскі цывільна-вайсковы камісар, палкоўнік, сакалькі земскі суддзя, гранічны суддзя 1792
Бляўскі Міхаіл, гродзенскі дазорца
Бляк Юзаф, генерал-маёр
Важынскі Ігнат, шамбелян караля, ашмянскі гродскі суддзя, камісар
Важынскі Міхаіл, ашмянскі скарбнік, стараста вервоўскі
Важынскі Юзаф, ашмянскі падкаморы
Валовічава Марыя, старшая гродзенскіх ксяндзоў базылянаў
Валовіч Антон, надворны літоўскі, кашталян мерацкі 1795
Ванковіч Нікадзім, давераны П.Юндзіла
Ванковіч Юзаф, ротмістр гродзенскі
Варанецкая Тэадора
Варашэўскі Лукаш
Вардамака Базыль, радавы апалчэння
Ваўжэцкі Томаш, жмудскі генерал-лейтэнант
Ваўжэцкі, браслаўскі камісар
Ваўкавіцкі Геранім, ротмістр, падшэф літоўскай пяхотнай гвардыі
Ваўкавіцкі Іпаліт, гродзенскі земскі суддзя, камісар
Ваўкавіцкі Францішак, ротмістр старадубскі, дзяржаўца полніцкага ключа, гродзенскі камісар
Ваўчацкі Фаулід, інфлянцкі канонік, эйшышскі камісар

Гінат Юзаф, гродзенскі ротмістр
Гіняўскі Ігнацi, інтэндант
Гіршановіч Іцка
Главацкі
Глінскі Томаш
Глінскі, плябан Янава
Глінскі Аўгуст, сакратар ННР
Глінская
Глушынская Магдалена, старшая гродзенскіх базільянаў
Глушынскі Іяхім, лідскі таргавічанін
Глушынскі Матэвуш, лідскі крымінальны суддзя
Глушынскі Ян, лідскі таргавічанін
Гоппэ Адам, гродзенскі крымінальны суддзя
Горская Алена
Горскі Казімір, сакратар гродзенскай камісii
Готліб Ян, індурскі млынар
Гоувальт Станіслаў, гродзенскі земскі рэгент, пісар камісii
Гоувальт Юзаф, войскі старадубскі
Грабінскі Юзаф, палкоўнік гродзенскіх стралкоў
Грабоўскі Ежы, генерал-інспектар, дзяржаўца Квасаў і Равы, генерал-лейтэнант
Грабоўскі Павел, староста ваўкавыскі, генерал-маёр
Грабскі Вінцэнт, ваўкавыскі гродскі судзіц, ашмянскі цывільна-вайсковы камісар 1793, камісар 1794
Градзіцкі Томаш, дазорца Астрыны
Грандзіч
Грынашэўскі Ян, радавы
Грынеўскі Ян, шэф літоўскай пешай гвардыі
Губа Міхаіл, ротмістр каронная кавалерыі
Губарэвіч Пётр, лідскі крымінальны суддзя
Губарскі Якуб, пісар у Свіслачы
Губевіч Францішак, радавы
Гумпрэхт Францішак, эйшышскі камісар
Гушча Юзаф, шчучынскі мытны дазорца
Гуйновіч, лідскі радца
Гутнова Тэрэса

Гутаровіч Ігнаці, ашмянскі цывільна-вайсковы камісар, завілейскі камісар
Гязенд
Дабравольскі Юзаф, палкоўнік гродзенскіх пікінераў
Давідовіч Лейзар, арандатар Караліна
Давідовіч Хаім, жыхар Ражанкі
Давыдава Цыруля
Даледскі
Далкоўскі Ян, радца гродзенскага магістрата, дзяржаўца раганіцкага ключа
Даманскі Ігнат Францішак, маркграф
Дамброўскі Мартын
Дамейка Міхаіл
Данкевіч Мартын Юзаф, гродзенскі скарбнік, цывільна-вайсковы камісар, гродскі суддзя і стольнік 1795, член літоўскай канф.1793
Даукша Ян, ксёндз, лідскі камісар
Дауман
Даўнаровіч Гіляры, ашмянскі гранічны камісар 1793, камісар 1794
Даўнаровіч Міхаіл, эканом Бераставіцы, гродзенскі экзактар
Дахтаровіч Канстанцін, маёр 4-га літоўскага палка
Дашкевіч Ежы, лідскі земскі рэгент, камісар
Дашкевіч Міхаіл, дазорца, рэгент архіва скарбовай камісіі ВКЛ 1792
Дваракоўскі Ян
Дзевятковіч Мікалай, дазорца ў Мастах
Дзедзька Даніла, селянін
Дзедзька Стэфан, селянін
Дзескур Міхаіл, літоўскі маёр, маёр гродзенскіх пікінераў
Дзескур Ян, палкоўнік завілейскі
Дзівановіч, радавы 8-га літоўскага пяхотнага палка
Дзіваў Мікалай, брыгадзір
Дзяконскі Антон, гродскі пісар, надворны літоўскі падскарбі
Дзяконскі Ануфрый, стольнік ваўкавыскі, адміністратар Брэсцкай эканоміі

Дзяконскі Міхаіл, літоўскі надворны падскарбі, гродзенскі гранічны камісар 1792
Дзядзерка Дамінік, палкоўнік 8-га літоўскага палка
Дзяржынскі Мацей, гродзенскі чашнік, ротмістр, дазорца ў Янаве
Дзяржынскі Юзаф
Длускі Міхаіл, всёндз, член ЦД
Дмахоўскі Шыман, ашмянскі ротмістр, камісар
Дмітроўскі Мацей, радавы
Драгоўскі, дазорца кумяльскага ключа
Дубоўскі Себасцьян, ксёндз, лідскі камісар
Дуброўскі Міхаіл, маркграф гродзенскага замка
Дуйкевіч, дзяржаўца адэльскага ключа
Дыбоўскі Томаш, стараста вірыдаўскі , дзяржаўца язерскага ключа
Дымінская
Дэбоні, капітан стралкоў
Дэмбоўскі Тадэвуш, прэзідэнт Варшавы, упаўнаважаны ННР
Дэпацін Антон, падпалкоўнік літоўскай артылерыі
Дэрфельдэн Ота Вільгельм Хрыстафор, генерал-паручнік
Ельскі Канстанцін, гродзенскі генерал-маёр
Ельскі Францішак, палкоўнік старадубскі
Іванскі
Івашкевіч Юзаф, ашмянскі цывільна-вайсковы камісар, завілейскі камісар
Івашкевіч, капітан гродзенскіў пікінераў
Ігельстром Восіп Андрэевіч, расійскі пасол
Ігнатовіч Адам, радавы
Ігнатовіч Антон, гродзенскі цывільна-вайсковы камісар
Ігнатовіч Ян, гродзенскі камісар, дазорца гожскі
Іцкавіч Лейзар, арандатар
Жаба Ігнацій, шамбелян караля, ашмянскі камісар
Ждановіч, лідскі камісар
Жукоўскі Юзаф, паручнік завілейскі
Жылевіч Пётр Павел, гродзенскі дазорца
Жылінскі Людвік, мерацкі земскі суддзя, чашнік троцкі, мерацкі камісар

Жылінскі Юзаф Антон, гродзенскі войт і цывільна-вайсковы камісар

Жынеў Матэвуш, староста бярэзніцкі, дзяржаўца Воўпы, гродзенскі дэлегат у генеральную канфедэрацыю ВКЛ 1793 г.

Жытлок Міхаіл, брэсцкі камісар

Забела Барбара

Забела Шыман, мінскі кашталян, генерал-лейтэнант ВКЛ

Заблоцкі Юзаф, ашмянскі земскі суддзя, экзактар, камісар

Завадскі Юзаф, харунжы хелмскі

Завістоўскі Шыман, гродзенскі цывільна-вайсковы камісар 1792, камісар 1794

Завіша Каетан, завілейскі камісар

Загорскі Ян, гродзенскі таргавічанін

Загражскі Іван Аляксандравіч, генерал-паручнік

Заёнчак Юзаф, генерал-маёр, старшыня ННР

Закржэўскі Ян, прэзідэнт Варшавы

Залеская Зузана

Залескі Міхаіл, браслаўскі камісар

Залескі Станіслаў, гродзенскі дазорца

Залеўскі Станіслаў, гродзенскі дазорца

Залускі, эканом Свіры

Заманскі

Замбржыцкі Міхаіл, браслаўскі шляхціч

Замойскі Людвік, ротмістр навагрудскі

Занеўскі Антон, рэгент літоўскага скарба, экзактар гродзенскі 1793, сакольскі земскі пісар

Захваловіч Эдвард, рэгент лідскай камісіі

Здзітавецкі Станіслаў, пісар вярбілаўскай пошты

Златніцкі Антон, харунжы чырвонагародскі каронны

Зубаў Валерыян Аляксандравіч, генерал-маёр

Зялінскі Юзаф, харунжы, войт г.Гродна

Зяньковіч Казімір, завілейскі генерал-маёр

Зяньковіч Міхаіл, лідскі земскі і крымінальны суддзя

Зяньковіч Пётр, староста лудзіцкі, ашмянскі камісар

Кабылінскі Казімір, эйшышскі камісар

Кабляцкі Міхаіл
Кавалеўскі, плябан у Янаве
Кавалеўскі Ян, рэвізор браслаўскай камісіі
Кадлубоўскі Міхаіл, генеральны інспектар віленскай епархіі, плябан бераставіцкі, гродзенскі камісар
Кайчынскі Ян
Казаноўскі Андрэй, князь, палкоўнік гродзенскай міліцыі
Казаноўскі Рыгор, літоўскі метрыкант
Казіміравіч Павел
Казінскі, гродзенскі ротмістр
Казлова Мар'яна
Казлоўскі Стэфан, лідскі камісар
Казлоўскі Ян, гродзенскі дазорца
Калантай Гуга, ксёндз, член ННР
Каласоўская
Каліноўскі Ян, селянін гродзенскай эканоміі
Калінскі Міхаіл, гродзенскі экзактар, дазорца магазіна
Калповіч Уса Сатус, дазорца луненскага магазіна
Калыша, евангеліцкі плябан у Жупранах, ашмянскі камісар
Калянінавіч Янкель
Калясніцкі Дамінік, лідскі шляхціч
Камар Стэфан, мінскі каморнік, ашмянскі камісар
Камар Тадэвуш, ашмянскі камісар
Камароўскі Павел
Каменскі Дамінік, браслаўскі харунжы і камісар
Каменскі Ян, эканом, гродзенскі рэвізор
Камінкі, рамеснік
Камінскі Ленард, паручнік ВКЛ, дазорца эйшышскі
Камінскі Пётр, слонімскі каморнік
Камінскі Тадэвуш, маёр 8-га літоўскага палка
Камінскі Ян, гродзенскі дазорца
Кандыба Станіслаў, гродзенскі ротмістр, дазорца
Канопка Дамінік, пісар вярбілаўскай каморы
Канопка Ян, генеральны рэвізор літоўскага скарба, падпаручнік 1793, гродзенскі камісар
Кантрым Фердынанд, пісар віленскай таргавіцкай канфедэрацыі

Канцэўскі Томаш

Капыцкі Якуб, загадчык палявога камісарыята, капітан

Каржанеўскі Ежы, паручнік 2-га літоўскага палка

Каржанеўскі Якуб, маркграф замка

Карвоўская Брыгіта

Карвоўскі Ян, капітан гродзенскіх стралкоў

Карловіч Людвік, мерацкі камісар

Каробчыцкі, эканом

Кароза Матэвуш, дзяржаўца васількаўскага староства

Картрынская

Карыцінскі Лейка, арандатар

Касакоўскі Шыман, палявы гетман ВКЛ, генерал-лейтэнант

Касакоўскі Юзаф, інфлянцкі біскуп

Касацкі Станіслаў, ашмянскі земскі рэгент, камісар

Касіцкі Міхаіл, плябан у Лунна

Кастравіцкі Ігнаці, лідскі камісар, генерал ВКЛ 1792

Кастраміцінаў, рускі дызерцір

Касцюшка Андрэй Тадэвуш, Найвышэйшы начальнік паўстання

Каханоўскі Міхаіл, палкоўнік ВКЛ, член ННР

Кахціцкі Ежы, гродзенскі ротмістр

Кашкоўская Вірыдзіна, старшая гродзенскага кляштара бернадзінак

Кашкоўскі Казімір

Квашэўскі, завілейскі камісар

Квінт Антон, браслаўскі падчашы, камісар, ротмістр

Квінт Валенці, браслаўскі камісарКерсноўскі Людвік, паштмайстар у Аранах

Кеўліч Алаіз, шамбелян караля, рэвізор тытунёвы, пісар крынскага магазіна

Кіляноўскі Антон

Кінштэт Ежы, дзяржаўца ў гродзенскай эканоміі, палкоўнік гродзенскіх пікінераў

Кінштэт Урсуля, жонка Ежы

Кіркуць Адам, лідскі мечнік, эйшышскі камісар

Клава Тадэвуш, радца гродзенскага магістрата, прэзідэнт Гродна

Курмановіч Аўдоцця

Кучынскі Юзаф, лідскі мешчанін, камісар

Кучэўскі Павел, генеральны касір гродзенскага магазіна

Кучэўскі Францішак, ксёндз, эйшышскі камісар

Куяўскі Бальтазар, шамбелян караля, стражнік шабельскай каморы, дазорца ў Сейнах

Лабенскі Юзаф, гродзенскі камісар

Лабецкі Юзаф, гродзенскі палкоўнік, камісар

Лавіцкі Мікалай, дзяржаўца галынскага ключа, дазорца

Лазоўскі Ян, лідскі таргавічанін

Ланеўскі Антон, гродзенскі экзактар, камісар

Ланеўскі Рох, плябан у Іўі, ашмянскі камісар

Лапа Юзаф, старадубскі дэлягат у ЦД

Лапачэўскі, плябан у Янаве

Лапінскі Даўгін, рэгент гродзенскіх ксяндзоў кармелітаў

Ланскі Мікалай Сяргеевіч, генерал-маёр

Ласі Барыс Пятровіч, генерал-маёр

Ластоўскі, браслаўскі камісар

Лахніцкі Ігнацы, палкоўнік, скарбнік літоўскі, гродзенскі камісар

Лаўрыновіч Антон, ксёндз

Лаўрыновіч Віктар, плябан у Каменцы

Лаўрыновіч Юстыніян, вікары гродзенскага базыялінскага абатства

Лаўцэвіч Гіляры, віленскі ротмістр, кантралёр літоўскага скарба

Лебкоўская, браслаўская шляхцянка

Лебядзінскі Сільвестр, радавы

Лейбовіч Алькон

Лейбовіч Ёсель

Лезаровіч Янкель

Лепарскі Ян, генерал-ад'ютант ВКЛ

Лінкоўскі Міхаіл, эканом

Ліпінскі Стэфан, пісар эйшышскай парадкавай камісіі

Ліпніцкі Ежы, падстолі інфлянцкі

Ліпніцкі Ксаверы, гродзенскі камісар

Ліпніцкі Леапольд, інтэндант паліцыі, пісар гродзенскага крымінальнага суда

Лісоўскі Рох, плябан у Іўі і Дудзічах, ашмянскі камісар
Лішэўскі Людвік, палкоўнік 5-га палка
Лодзя Павел, пісар сакольскага магазіна
Лук"яновіч Томаш, гродзенскі мешчанін
Лухоўскі Сцяпан, брэсцкі камісар
Лучкоўскі Войцех
Лучэўская Канстанцыя
Любамірскі Міхаіл, князь, генерал-лейтэнант
Любанскі Юзаф, ротмістр гродзенскіх гусар
Любанскі Юзаф, смаленскі канонік, плябан у Ашмянах, ашмянскі камісар
Любастанкі, дзяржаўца
Любашэвіч Кацярына
Любецкая Тэрэса, княгіня, дзяржаўца сейвеская
Любецкі Францішак, князь, маршалак пінскі 1793
Лявіцкі Дыянісій, харунжы латышоўскі і брацлаўскі
Ляговіч Юзаф, ашмянскі цывільна-вайсковы камісар, стольніковіч, ашмянскі камісар
Лянкевіч Мацей, ротмістр старадубскі
Мазуркевіч Юзаф, браслаўскі дваранін
Маеўскі Юзаф, лаўнік гродзенскага магістрата, дазорца
Макавецкі, інтэндант
Макоўскі, эканом Ліды
Макоўскі Ян, дазорца
Макраноскі Станіслаў, генерал-лейтэнант
Макрэцкі Ян, лідскі земскі суддзя
Максімовіч Ян, пікінер
Малецкі, радавы
Мальскі Блож
Мальчэўскі Мацей, стараста Опсы
Мануцы Станіслаў, стараста Опсы, член генеральнай літоўскай канф. 1792
Манюшка Пётр, сакольскі экзактар, пісар гродзенскай камісіі
Маргевіч
Мароз Габрыэль, ротмістр
Мароз Ян, гродзенскі падчашы, гродскі і гранічны суддзя 1792—93

Маркевіч Караль
Маркевіч Мартын, ваўкавыскі паручнік, гродскі суддзя
Мархелевіч Абрам
Марыконі Бенедыкт, пісар ВКЛ, член ЦД
Марыноўская Мар'яна
Марэк (Яцэк), арандатар Мерачы
Масевіч Антон, пінскі каморнік, ашмянскі камісар
Маскелевіч Казімір, бургамістр Ліды 1792, лідскі камісар
Маскевіч
Масчынскі Адам, харунжы брацлаўскі
Маткевіч Дамінік, гродзенскі камісар
Маткевіч Юзаф, рэгент літоўскага скарбу, надворны падкаморы караля
Матушэвіч, парабак
Матушэвіч Мацей, эйшышскі камісар
Мацееўская Кацярына
Махвіц Клеманс, брэсцкі камісар
Машэўскі Францішак, ксёндз, лідскі камісар і дазорца
Медушэўскі Юзаф, гродзенскі ротмістр
Меер Юзаф, гродзенскі камісар у ЦД
Меер Рахеля, дзяржаўца прэвальскага староства
Меін Ян, генерал-лейтэнант
Мечнікоўскі Мартын, ашмянскі харунжы, камісар
Мігдал
Мілкевіч Мікалай, гродзенскі цывільна-вайсковы камісар, ротмістр 1793, камісар 1794 г.
Міркові́ч Міхаіл
Міркі́ Багуслаў, браслаўскі падкаморы, камісар, упаўнаважаны у ННР
Мірскі Стэфан, гродзенскі камісар
Мірскі Тадэвуш, браслаўскі мечнік
Місевіч Ануфры, ашмянскі скарбовы дваранін, камісар
Міхайлоўскі Антон, дзяржаўца Вырвішак
Міхалкевіч Філіп, гродзенскі лаўнік
Міхальскі Караль, пісар каронны 1795 г.
Міхальчэўскі, маёр коннай гвардыі
Міхневіч Томаш, мерацкі камісар, дазорца

Міхаэліс Пётр, сакратар кузніцкай пошты
Міхаэліс Філіп, віцэ-адміністратар гродзенскай эканоміі
Міхоцкі Юзаф, гродзенскі камісар
Міцэвіч Станіслаў, ашмянскі камісар
Міцкевіч Томаш, пекар
Міцкевіч Юзаф, ксёндз, гродзенскі камісар
Міцута Антон, гродзенскі харунжы 1792, рэгіментары ваўкавыскай канфедэрацыі 1793
Мразоўскі Францішак Антон, ротмістр, індурскі дазорца
Мракоўскі Ануфрый, эйшыскі камісар
Мроўскі, індурскі дазорца
Мучынскі Францішак, гродзенскі камісар у ЦД, мечнік і земскі суддзя
Новаконскі Цэзары, браслаўскі земскі суддзя, камісар
Новаконскі, ксёндз браслаўскі
Новамейскі Войцех, паручнік каронны, дзяржаўца крынскі і квасаўскі
Навіцкі Ігнат, радавы
Навіцкі Казімір
Навіцкі, плябан у Лідзе
Навумовіч Якуб, селянін
Навумовіч Яна
Нарвойша Юзаф, ротмістр, палкоўнік паспалітага рушання
Нарбут Дамінік, лідскі ротмістр, упаўнаважаны у ННР
Нарбут Юзаф, генерал-ад'ютант ВКЛ, палкоўнік лідскай міліцыі, пісар камісіі паліцыі ВКЛ 1793, член лідскай канфедэрацыі 1793
Нарбут Адам, лідскі земскі суддзя, стольнік 1793
Нахімовіч Юдзель
Невяровіч Ігнацій, завілейскі камісар
Несялоўскі Юзаф, навагрудскі ваявода
Несцяровіч
Нікалаевіч Раман, фельшар
Няміра Юзаф, капітан, падпалкоўнік пікінераў
Нямцэвіч Ян, брэсцкі камісар
Павуцкі Каетан, ротмістр ваўкавыскі 1788, гродзенскі абозны 1793 і член гродзенскай канфедэрацыі 1793

Падвысоцкі Мікалай, палкоўнік 1795
Пажароўскі Казімір, плябан у Дубраве, гродзенскі дазорца
Пазняк Вінцэнт, ашмянскі бургамістр
Палашэўскі Якуб, браслаўскі камісар
Палубінская Марыя, жонка гродзенскага краўчыца Юзафа
Палікоўскі Гаспар, плябан у Янаве
Панфілаў Іван, селянін з Опсы
Панцэржынскі Людвік, стараста азарыцкі, ротмістр і цывільна-вайсковы камісар, гранічны гродзенскі камісар 1792—93
Панятоўскі Станіслаў, брат караля, падскарбі літоўскі, генеральны ўпраўляючы каралеўскімі эканоміямі ў ВКЛ
Панятоўскі Вінцэнт, пісар гродзенскай камісіі, сакратар ЦД
Паўлікоўскі Тадэвуш, лідскі крымінальны суддзя і камісар
Паўлоўская Ганна
Пастальскі, гродзенскі камісар
Патоцкі Станіслаў Счэсны, генерал кароннай артылерыі
Пац Юзаф, граф, вілейскі стараста
Пацэвіч Томаш, старшы гродзенскага кляштара бернардынаў
Пачобут Феліцыян, гродзенскі камісар, каморнік 1792
Пашкевіч Бенедыкт, завіленскі камісар
Пашкевіч Мартын, пісар брэсцкай камісіі
Пашкевіч Станіслаў, ашмянскі каморнік, камісар
Пашкевіч Яцэк, брэсцкі камісар
Пашкевіч, плябан у Прэнах
Пранеўскі Лонгін, паручнік
Пратасевіч Клеменс, лідскі цывільна-вайсковы камісар і член канфедэрацыі 1793 г.
Прозар Караль, упаўнаважаны ВКЛ у ННР
Прыстаноўскі Стэфан, ашмянскі харунжы, камісар
Петрашкевіч Максім, таварыш 2 брыгады ВКЛ
Петрашэўскі Якуб

Петрыкоўскі Антон, лідскі скарбовы дваранін
Петрыкоўскі Ежы
Пілецкая Люцыя
Пілецкі Цімафей, эйшышскі камісар
Пілкевіч Якуб, евангеліцкі плябан у Заблудаве
Піруcкі Юзаф, дазорца ў Астрыне
Пiслевiч Францiшак, ашмянскі ротмістр, цывільна-вайсковы камісар 1792, камісар 1794
Піўцэвіч Караль, завілейскі камісар
Плоцкі Адам, пісар гродзенскага магазіна
Плоцкі Юзаф, гродзенскі камісар
Пузына Ігнацій, стараста Міхалішак і Дзівіна, арандатар рачного сплаву ў Крулявец
Пузына Ганна, жонка Ігнацыя
Пузына Нікадзім, канонік у Геранёнах, генеральны афіцыял віленскай епархіі
Пуцілоўскі Бенедыкт, адвакат гродзенскай камісіі
Пуцілоўскі Тадэвуш, член ЦД
Пялчынскі, ксёндз
Пянкоўская
Пяткевіч Юзаф
Пятровіч Томаш, ашмянскі камісар
Пятровіч Ян, завілейскі парадкавы камісар
Пятэльчыц Войцех
Раецкі Каетан, віцебскі абозны, член гродзенскай канфедэрацыі 1792
Рагуза Дыянісій, аршанскі ротмістр, гродзенскі камісар
Радавіцкі Ігнацій, ваўкавыскі ротмістр, лоўчы
Радзевіч Вінцэнт
Радзівіл Алена (Праздзецкая) княгіня
Радзівіл Міхаіл Геранім, князь, віленскі ваявода
Радзівонаўскі Юзаф, лідскі камісар
Радзішэўскі, генерал-ад'ютант
Радзішэўскі, плябан у Рэчках
Размыстоўскі Павел
Раеўскі Юзаф, лідскі бургамістр, крымінальны суддзя і камісар
Раймуш, ігумен яблонаўскага манастыра, брэсцкі камісар

Райскі Стэфан, кобрынскі палкоўнік
Ракоўскі Ануфры, радавы
Рамаиоўскі Самуэль
Растальскі Пётр, гродзенскі радца
Расткоўская
Расткоўскі
Расчэўская Мар'яна, капральша
Рафановіч Якуб, віце-прэзідэнт гродзенскага магістрата
Рачуцкі, лідскі камісар
Ржэвускі Севярын, гетман польны каронны
Роберсон Антон, інтэндант у Заблудаве
Ровінскі Хрыстафор, інтэндант Краснаполля
Рогава
Родзя Эльжбета
Ромар, манахіня
Ромер Антон, трокскі падваявода, член генеральнгай літоўскай канфедэрацыі 1792 г.
Рохт Хрысціян, маёр, дзяржаўца перстунскага ключа
Рубіновіч Ёсель
Рубоўскі Тэадор, губернатар Вялікаберастравіцкага графства, дазорца
Рудзінскі Ануфрый, ашмянскі паручнік, завілейскі камісар
Рудніцкі Ян, ад'ютант Ш. Касакоўскага
Рудомін Юзаф, браслаўскі стольнік, камісар
Русніцкая Мар'яна
Ручынскі, плябан у Сейнах
Рыбыцкі Юзаф, ксёндз, лідскі камісар
Рыдзеўскі Ян, староста райгародскі
Рыдзеўскі Павел, ксёндз
Рызманч, маёр 2-га палка
Рыла, паручнік
Рымашэўскі Павел, эканом Опсы
Рымінскі Ігнацій, палкоўнік прэнскі
Рыхліцкі Войцех, палкоўнік каронны
Рыхлоцкі Юзаф, лідскі камісар
Рэпнін Мікалай Васільевіч, князь

Рэпніцкі Ян, селянін
Рэхцінг Ян, браслаўскі камісар
Сабанскі Тадэвуш, ашмянскі будаўнічы, камісар
Сабанскі Фелікс, губернатар дзярэчынскага графства
Сабалеўскі Ігнацій, галоўны скарбнік ВКЛ, гродзенскі дазорца
Сабула Францішак, селянін
Савіцкі Антон, гродзенскі камісар, галоўны рэвізор гродзенскага скарба
Савіцкі Кастула, мерацкі камісар
Садлуцкі Вінцэнт, гродзенскі камісар
Садоўскі Антон, браслаўскі каморнік, ашмянскі камісар
Сакалоўскі Ян, гродзенскі ротмістр, рэвізор скарбу, гродзенскі камісар
Саковіч Фабіян, брэсцкі камісар
Салмановіч Ян, шамбелян караля, браслаўскі камісар
Саматыха Ян, гродзенскі лллллляхціч
Сапега Францішак, князь, генерал
Сарноцкі, селянін
Сарноцкі Ян, ковенскі камісар
Сарока Лявон, завілейскі камісар
Сахоцкі Мікалай, літоўскі земскі рэгент, дзяржаўца Кумпаль, палкоўнік стралкоў
Сачок, селянін
Свідзерскі Ігнацій, лідскі камісар, рэгент лідскай канфедэрацыі 1793
Свяжынскі Юзаф, ксёндз, гродзенскі камісар
Сеген Тадэвуш, войт Ваўкавыска 1793, шэф ваўкавыскага паспалітага рушання
Седлікоўскі Мікалай, эйшышскі камісар
Седнік Дамінік
Седлікоўскі, дэкан, гродзенскі камісар
Сезянеўскі Юзаф, гродзенскі камісар, дазорца, ротмістр 1792
Серакоўскі Караль, генерал
Серакоўскі Францішак (?), капітан пікінераў
Сівіцкі Дамінік, старшы гродзенскага кляштара дамініканаў

Сільвестровіч Антон, гродзенскі камісар
Сільвестровіч Юліян, шамбелян караля, смаленскі мастаўнічы і падкаморы
Сініла Юзаф, селянін з ключа Янаў
Скальскі Тадэвуш, віленскі ротмістр, маёр міліцыі
Скарбек Ігнацi, гродзенскі канюшы, камісар
Скіндзер Разалія
Скіндзер Станіслаў, лідскі чашнік
Скоцкі
Скродскі Іяхім
Скродскі Якуб, капітан Кароны, гродзенскі каморнік і гранічны суддзя
Славінскі Юзаф, браслаўскі камісар
Смігельскі Канстанцін, завілейскі камісар
Собалеў Пётр, дызерцір
Стамецкі, намеснік Пінскай брыгады
Станішэўскі Міхаіл, інфлянцкі канонік, дэкан, ашмянскі камісар
Старжынская Кацярына
Старжынскі Мартын, радавы
Старжынскі Павел
Старжынскі Стэфан
Сташкоўскі Матэвуш, радавы
Страдзінскі Людвік, браслаўскі
Стржэніцкі, намеснік брыгады
Стрыенскі Багуслаў, гродзенскі ротмістр і палкоўнік
Стрыенскі Ян Караль, шэф коннай літоўскай гвардыі
Стэцкі Францішак
Сулістроўскі Стэфан, ашмянскі гранічны суддзя, камісар
Сулістроўскі Тадэвуш, ашмянскі вайсковіч, камісар
Супінскі Мартын, ашмянскі судовы падстараста, камісар
Сухаў Іван, дэзерцір
Сухадолец Тадэвуш, падпалкоўнік, гродзенскі камісар, дазорца
Сухаржэўскі, вартаўнік
Сухаржэўскі Ян, войскі усхоўскі (каронны)
Сухарскі, ад'ютант 6-га літоўскага палка

Сухачэўскі, канюшы
Сучыцкі Адам, мінскі ротмістр, ашмянскі камісар
Сцефановіч Ваўрынец
Сцыпіён Караль, лідскі генерал-маёр
Сцыпіён Юзаф, экспадстолі 1793, лідскі судовы староста
Сырасек Ян, дазорца гродзенскага магазіна
Сядліцкі Юзаф, эйшышскі генерал-маёр
Сялява
Табалеўскі Ваўрынец, гродзенскі крымінальны суддзя
Тавянскі Юзаф, інтэндант
Такаржэўскі Пётр, рэвізор скарбу, гродзенскі дазорца
Такачэўскі Пётр
Талібскі Станіслаў, ашмянскі каморнік, камісар
Талкоўскі Аляксандр, лідскі ротмістр
Талочка Антон
Тамашэўскі Багдан, член ННР
Тамашэўскі Юзаф, харунжы ВКЛ 1792, фуражовы камісар
Тачылоўскі Пётр, браслаўскі камісар
Трацэўскі Ян, ашмянскі каморнік, камісар
Траццяк Тадэвуш, ротмістр старадубскі, завілейскі камісар
Трубіцкая Клара
Трубіцкі Міхаіл, шамбелян караля, палкоўнік гродзенскіх стралкоў
Туда Андрэй, радавы
Тукайла Міхаіл, лідскі гродскі суддзя, камісар
Тупальскі Самуэль, лідскі суддзя, дзяржаўца ключа Біскупцы
Турскі Антон, член ЦД
Тхарніцкі
Тызенгауз Антон, віленскі харунжы, член ЦД
Тышкевіч Рыгор, старшы кляштара гродзенскіх францысканаў
Улан Мустафа, ротмістр літоўскі
Улінскі Ануфры, ротмістр ваўкавыскі, падпалкоўнік артылерыі ВКЛ

Умастоўскі Мартын, лідскі камісар
Умастоўскі Якуб, ашмянскі камісар
Унукоўскі Мікалай, адвакат у Ліпску
Урублеўскі Ігнаці, радца Гродзенскага магістрата
Фергіс Юзаф, ковенскі палкоўнік, упаўнаважаны ННР
Філіповіч Аётр
Флеберман, мерацкі камісар, капітан пікінераў
Франкоўскі Мацей
Францышэвіч Антон, ковенскі камісар
Францэвіч
Фрэйліх Кляра, жонка капітана Караля
Фуярскі Тадэвуш, лідскі камісар
Хаймовіч Аўсей, гродзенскі яўрэй
Хаймовіч Лейзар
Хаймовіч Моўша
Халецкі Пётр, завілейскі камісар
Халецкая Урсуля, дзяржаўца камянецкага ключа
Халецкі Юзаф, ксёндз, браслаўскі камісар
Хамінскі Канстанцін, завілейскі камісар
Хамінскі Іяхія, завілейскі камісар
Хацяноўскі Юзаф, ксёндз, гродзенскі камісар
Хілімонава Кацярына
Ходзька Людвік, ашмянскі лоўчы, камісар
Храптовіч Іяхім, гродзенскі камісар
Храптовіч Іяхім, літоўскі канцлер
Храптовіч Караль, гродзенскі судовы стараста
Храптовіч Фабіян, харунжы таўрогінскі, ашмянскі камісар
Хржыжаноўскі Гілярый, аршанскі цывільна-вайсковы камісар 1792, завілейскі камісар
Церпілоўскі Тадэвуш Цыпрыян, эканом, сарбнік парнаўскі 1788
Цехановіч Ігнацій, маёр 5-га літоўскага палка
Ціханскі Даніэль, ротмістр сакольскі
Ціхоцкі Метаз, ксёндз, гродзенскі дазорца
Цыцыянаў Павел Дзмітрыевіч, генерал-маёр
Цярлецкі Ануфры, пісар галынскага магазіна

Чартарыжскі Адам, князь, генерал каронны
Чэховіч Віктар, ашмянскі земскі суддзя, камісар
Чэховіч Ігнаці, завілейскі камісар
Чэховіч Мацей, завілейскі камісар
Чэховіч Томаш, браслаўскі камісар
Чэховіч Філіп, завілейскі камісар
Чыж Антон, ашмянскі камісар
Чэрніцкі Міхаіл, мазырскі скарбнік, ашмянскі камісар
Чэх Томаш, сакратар ННР
Чэхілоўская-Міхайлава
Шабуневіч Міхаіл, смаленскі ротмістр
Шавельскі Мікалай, скарбовы стражнік ВКЛ 1792
Шадзінскі Людвік, селянін з Опсы
Шалевіч Дамінік, лідскі камісар
Шалевіч Мацей, адвакат у Крынсках, лідскі камісар
Шалевіч Юзаф, лідскі камісар
Шаняўскі Ігнат, гродзенскі камісар
Шанюта Стэфан, селянін
Шапшэвіч Аўрам
Шауман, інтэндант Калетна
Шаціла, браслаўскі камісар
Шаеўла Янкель
Шацюк (Тадэвуш ?) скарбовы дваранін
Швыкоўскі Ян, член віленскай таргавіцкай канфедэрацыі, павешаны
Шломавіч Арон
Шломавіч Іавель
Шломавіч Ісак
Штадзен, браслаўскі
Штэйцін Багуслаў, падпалкоўнік 1-га літоўскага палка
Шуберт, дзяржаўца
Шукевіч Адам, слонімскі стольнік
Шульц Юзаф, ксёндз вількамірскі, камісар
Шумінскі Казімір, гродзенскі ротмістр
Шумінскі Пётр, дазорца ў Крынках
Шумкоўскі Аляксандр, лідскі камісар
Шумкоўскі Віктар, гродзенскі гродскі і гранічны суддзя 1792, краўчы, камісар

Шумскі Якуб, віленскі ротмістр, радавы апалчэння
Шындзер Юзаф, капітан гродзенскай міліцыі
Шэлпах (Шэйбах) Юзаф, гродзенскі скарбнік
Шэмет Аўгуст, лідскі чашнік, земскі суддзя, член мясцовай канфедэрацыі 1793, крымінальны суддзя і камісар
Шчыт Юзаф, шамбелян караля, ашмянскі камісар
Эйсмант Анзельм, гродзенскі земскі суддзя і член мясцовай канфедэрацыі 1792, земскі пісар 1793
Эйсмант Антон, гродзенскі палкоўнік і камісар
Эйсмант Ежы, інфлянцкі канонік, гродзенскі дэкан, плябан у Эйсмантах, камісар
Эйсмант Адам, гродзенскі ротмістр, гранічны суддзя 1792
Эйсмант Андрэй, гродзенскі земскі і гродскі суддзя, камісар
Эйсмант Бенавентура, гродзенскі земскі рэгент
Эйсмант Багуміла, жонка Антона
Эйсмант Мацей, гродзенскі стольнік, віцэ-адміністратар гродзенскай эканоміі
Эйсмант Фердынанд, гродзенскі войскі і гранічны камісар
Эльснер Антон, рэгент мерацкай камісіі
Эльснер Вінцэнт, мерацкі камісар
Эрэнкрэйц Міхаіл, гродзенскі скарбовы кантралёр 1792, камісар
Юда, лідскі яўрэй
Юдзіцкі Юзаф, стражнік ВКЛ, рэчыцкі судовы староста, генерал-лейтэнант
Юндзіл Пётр, гродзенскі гранічны камісар 1792, генерал-ад'ютант ВКЛ
Юндзіл Францішак, гродзенскі падкаморы і гранічны камісар 1792, ротмістр
Юндзіл Юзаф, гродзенскі цывільна-вайсковы камісар
Юрага Антон, ашмянскі ротмістр, цывільна-вайсковы камісар 1792, камісар
Юст Фрыдрых, маёр літоўскай артылерыі
Юрэвіч Караль, палкоўнік 3-й літоўскай брыгады
Юрэвіч Тадэвуш, езуіт, рэктар гродзенскіх школ, камісар

Ягадзінскі Лявон, паручнік

Ягмін Павел, брэсцкі камісар, кобрынскі харунжы, віцэ-адміністратар брэсцкай эканоміі

Язерскі Казімір, шамбелян караля, генеральны касір скарбу ВКЛ, гродзенскі скарбнік

Якубоўскі Пётр, паручнік, ад'ютант 7-га літоўскага палка

Яленскі Юзаф, мазырскі краўчы, трокскі земскі суддзя

Яноўскі Ежы, ігумен віленскага праваслаўнага манастыра, віленскі камісар

Янулевіч Ежы, селянін

Янушкевіч Пётр, пісар тытунёвых збораў Гродна, дазорца гродзенскай мануфактуры

Ясінскі, ляснічы ў Богіне (Браслаўскі павет)

Ясінскі Ян, загадчык гродзенскай друкарні 1792, пісар гродзенскага магазіна, камісар

Ясінскі Якуб, генерал-лейтэнант

Яскевіч Барталамей

Яч Ігнат, камісар і рэгент лідскага крымінальнага суда

Яч Фульгенд, эйшышскі камісар

Змест

№ 1. 8 мая. Заклік Часовай рады Мазавецкага княства да агульнага узбраення ВКЛ 10

№ 2. 4 чэрвеня. Прадпісанне Найвышэйшай нарадовай рады аб паўсюднай арганізацыі парадкавых камісій 10

№ 3. 9 чэрвеня. Прадпісанне ННР аб паслухмянасці упаўнаважанаму Катлу 12

№ 4. 18 чэрвеня. Рэквізіцыя ННР у ЦД аб падсумаванні спраў таргавіцкай канфедэрацыі 13

№ 5. 18 чэрвеня. Рэзалюцыя ННР на розныя прапановы Кобрынскай парадкавай камісіі 14

№ 6. 21 чэрвеня. Рэзалюцыя ННР адносна аплаты сукна з гродзенскай фабрыкі 15

№ 7. 27 чэрвеня. Рэзалюцыя ННР аб назначэнні складу Брэсцкай парадкавай камісіі 15

№ 8. 15 ліпеня. Рэзалюцыя ННР на меркаванні ЦД ВКЛ аб яўцы на паспалітае рушанне застаўнікоў і пасэсараў 16

№ 9. 21 ліпеня. Адказ ННР на пажаданні гродзенскага генерал-маёра А.Казаноўскага адносна асігнаванняў гродзенскай касе 16

№ 10. 5 жніўня. Рэзалюцыя ННР адносна розных эканамічных пытанняў 17

№ 11. 16 кастрычніка. Тлумачэнні Віленскай парадкавай камісіі перашкод пры рэалізацыі універсала ад 6 чэрвеня аб паспалітым рушанні 18

№ 12. 30 красавіка. Рапарт парадкавай камісіі Ашмянскага павета аб адкрыцці сваёй прысутнасці 20

№ 13. 12 мая. Рапарт бурмістра Ашмян у віленскі магістрат аб ваеннай абстаноўцы 21

№ 14. 29 ліпеня. Рапарт парадкавай камісіі Ашмянскага павета аб сваім складзе 22

№ 15. 16 мая. Рапарт Завілейскай парадкавай камісіі аб цяжкасцях у сваёй дзейнасці 225

№ 16. 31 мая. Прадстаўленне Завілейскай парадкавай камісіі перашкод пры публікацыі універсалаў 26

№ 17. 14 чэрвеня. Даклад завілейскай камісіі аб безабароннасці сваіх дзеянняў 27

№ 18. 11 ліпеня. Рапарт завілейскай камісіі аб змене сваёй дыслакацыі 28

№ 19. 11 ліпеня. Выпіска з пратаколу штодзённых чыннасцяў ваенна-парадкавай камісіі Завілейскага павета 29

№ 20. 4 жніўня. Рапарт Завілейскай камісіі аб сваіх чыннасцях пасля 11 ліпеня 31

№ 21. 13 жніўня. Тлумачэнні Завілейскай камісіі сваіх вандровак 34

№ 22. 29 мая. Рапарт камісіі Эйшышскага павета аб самавольных уцёках сялян у валанцёры і замяшаннях пры гэтым 35

№ 23. 27 чэрвеня. Адказ эйшышскай камісіі на скаргі шляхты аб стратах пры зборы паспалітага рушання 36

№ 24. 1 верасня. Справаздача эйшышскай камісіі аб выкананні фінансавых даручэнняў 37

№ 25. 6 мая. Паведамленне камісіі Лідскага павета аб першых падзеях свайго існавання 39

№ 26. 23 чэрвеня. Прадстаўленне лідскай камісіяй цяжжкасцяў пры фарміраванні павятовага апалчэння 40

№ 27. 25 чэрвеня. Рапарт лідскага бургамістра Ю.Раеўскага аб пагрозах і рабунках непрыяцеля вакол Ліды 42

№ 28. 13 ліпеня. Рапарт членаў крымінальнага суда Лідскага павета аб пачатку сваёй дзейнасці 44

№ 29. 15 ліпеня. Рапарт лідскага рэктара Ф.Крушэўскага аб захопе Ліды 45

№ 30. 4 жніўня. Рапарт лідскай камісіі з месца новай дыслакацыі 47

№ 31. 12 жніўня. Рапарт лідскай камісіі з апісаннем сутычкі пад Слонімам 48

№ 32. 20 жніўня. Рапарт лідскай камісіі аб першых сваіх дзеяннях у Новым Двары 50

№ 33. 26 жніўня. Справаздача лідскай камісіі аб тыдні сваіх дзеянняў 52

№ 34. 26 жніўня. Распараджэнне ЦД ВКЛ адносна забеспячэння войскаў 56

№ 35. 26 жніўня. Адказ лідскай камісіі на розныя загады ЦД ВКЛ 57

№ 36. 26 жніўня. Справаздача лідскай камісіі на розныя загады аб харчу 57

№ 37. 27 жніўня. Хадайніцтва камісара Ю.Шалевіча аб сваёй працы 59

№ 38. 1 верасня. Рапарт лідскага аддзелу харчу аб сваёй дзейнасці 59

№ 39. 1 верасня. Рапарт вайсковага аддзела лідскай камісіі аб забеспячэнні войска 61
№ 40. 2 верасня. Справаздача лідскай камісіі за тыдзень дзейнасці 62

№ 41. 4 верасня. Данясенне лідскай камісіі аб ваенных здарэннях 65

№ 42. 12 верасня. Данясенне камісара Я.Габіхта у лідскую камісію 67

№ 43. 12 верасня. Адрас лідскай камісіі з поваду шпіёнства Ю.Кучынскага 68

№ 44. 13 кастрычніка. Апісанне камісарам Ф.Машэўскім рабункаў расійскіх войскаў у Лідзе 69

№ 45. 13 кастрычніка. Допыт лідскага мешчаніна, абывацеля Юзафа Кунцэвіча 72

№ 46. 14 кастрычніка. З допыту лідскага магістрата аб налётах ворага 73

№ 47. 17 кастрычніка. Рапарт лідскай камісіі аб небяспецы Астрыні 76

№ 48. 26 кастрычніка. Рапарт лідскай камісіі аб апошніх сваіх дзеяннях са Скідзеля 77

№ 49. 27 жніўня. Даклад кобрынскай камісіі аб цяжкасцях у сваёй дзейнасці 78

№ 50. 25 мая. Рапарт браслаўскай камісіі аб паўторных выбарах свайго складу 80

№ 51. 3 чэрвеня. Справа аб арышце маёмасці графоў Мануцы 81

№ 52. 6 чэрвеня. Рапарт браслаўскай камісіі аб розным 82

№ 53. 5 ліпеня. Даклад браслаўскай камісіі аб недахопах кадраў 83

№ 54. 14 ліпеня. Справаздача браслаўскай камісіі аб сваёй папярэдняй дзейнасці 84

№ 55. 23 ліпеня. Паведамленне браслаўскай камісіі аб пераносе сваёй прысутнасці ў Анікшты 92

№ 56. 2 чэрвеня. Зварот мерацкай камісіі, занепакоенай лёсам паўстання 93

№ 57. 13 мая. Даручэнні гродзенскай парадкавай камісіі свайму дэлягату ў Часовую раду 95

№ 58. 13 мая. Апісанне пачатку дзейнасці гродзенскай камісіі 96

№ 59. 13 мая. Рапарт начальніка гродзенскай міліцыі К. Ельскага 100

№ 60. 14 мая. Рапарт К.Ельскага адносна кантрыбуцыі з Гродна 101

№ 61. 16 мая. Рэзалюцыя Вышэйшай літоўскай рады адносна дызерціраў 103

№ 62. 18 мая. Меркаванні Вышэйшай рада ВКЛ адносна збору рэкрутаў 104

№ 63. 19 мая. Запрос А.Казаноўскага адносна пастаўкі валанцёраў 105

№ 64. 24 мая. Апраўданні гродзенскіх таргавічан у сваёй нявіннасці 105

№ 65. 30 мая. Адказ Т.Касцюшкі на спрэчныя моманты у дзейнасці мясцовых камісій ВКЛ 107

№ 66. 7 чэрвеня. Пастанова Часовай рады ВКЛ наконт арыштаваных таргавічан 109

№ 67. 22 чэрвеня. Скарга дэпутацыі бяспекі на разлад вайсковай субардынацыі па розных пытаннях 111

№ 68. 27 чэрвеня. Прапановы гродзенскай камісіі ў адносінах да фарміравання паспалітага рушання 112

№ 69. Апісанне гродзенскай камісіі сваіх чыннасцяў з 10 да 30 чэрвеня 113

№ 70. 4 ліпеня. Пастанова гродзенскай камісіі аб фінансаванні выправы К.Ельскага ў бельскую зямлю 138

№ 71. 4 ліпеня. Паведамленне гродзенскай камісіі аб гатоўнасці выканаць Паланецкі універсал Т.Касцюшкі 138

№ 72. 4 ліпеня. Праект найма сялян гродзенскай парадкавай камісіі 139

№ 73. 7 ліпеня. Рапарт гродзенскай камісіі аб розным К.Ельскага 143

№ 74. 8 ліпеня. Водгук аддзела Цэнтральнай дэпутацыі на праект прымусовага найма гродзенскай камісіі 147

№ 75. 8 ліпеня. Рапарт гродзенскай камісіі аб тыднёвай дзейнасці 147

№ 76. 9 ліпеня. Сведчанне гродзенскай камісіі аб стане узбраення павета 156

№ 77. 10 ліпеня. Адрачэнне Т.Клавы ад урада прэзідэнта Гродна 157

№ 78. 12 ліпеня. Рапарт Ф.Бауфала аб выкананні сваёй дазорскай дзейнасці 157

№ 79. 17 ліпеня. Апраўданні гродзенскай камісіі на сваю несубардынацыю 159

№ 80. 19 ліпеня. Данясенне гродзенскай камісіі аб устанаўленні дазораў у павеце 160

№ 81. Справаздача гродзенскай камісіі аб сваёй дзейнасці паміж 12 і 19 ліпеня 161

№ 82. 20 ліпеня. Хадайніцтва Ф.Боуфала аб паскарэнні рэалізацыі праекта прымусовага найма 172

№ 83. Дыяруш чыннасцяў гродзенскай парадкавай камісіі з 19 да 26 ліпеня 173

№ 84. 1 жніўня. Рашэнне гродзенскай камісіі аб секвестры маёнткаў удзельнікаў таргавіцкай канфедэрацыі 184

№ 85. Дыяруш дзейнасці гродзенскай камісіі з 3 да 9 жніўня 185

№ 86. Справаздача аддзела харчавання гродзенскай камісіі з 10 да 16 жніўня 189

№ 87. Рапарт гродзенскай камісіі аб пленарнай дзейнасці з 4 да 17 жніўня 195

№ 88. Справаздача аддзела харчу гродзенскай камісіі аб дзейнасці з 16 да 23 жніўня 210

№ 89. 22 жніўня. Перасцярогі Цэнтральнай дэпутацыі адносна раздваення сваёй улады з-за самадзейнасці А.Тызенгауза 214

№ 90. 23 жніўня. Пастанова Цэнтральнай дэпутацыі адносна праціўнікаў паўстання па звароту Ф.Боуфала 215

№ 91. 24 жніўня. Тлумачэнне Цэнтральнай дэпутацыі свайго непакою ад пагрозы двоеўладдзя ў паўстанні ВКЛ 216

№ 92. 25 жніўня. Зварот гродзенскай камісіі ў Цэнтральную дэпутацыю з просьбай аб павелічэнні платы камісарам 218

№ 93. 26 жніўня. Зварот гродзенскай камісіі ў Цэнтральную дэпутацыю з пытаннем аб суднах і рускіх палонных 219

№ 94. 26 жніўня. Загад Цэнтральнай дэпутацыі ўсім парадкавым камісіям аб здачы ўсіх рахункаў у генеральную касу ВКЛ 220

№ 95. 26 жніўня. Хадайніцтва ваўкавыскіх таргавічан да ўпаўнаважанага Т.Касцюшкі аб вызваленні на парукі 221

№ 96. 27 жніўня. Адозва Цэнтральнай дэпутацыі на пагрозу двоеўладдзя 222

№ 97. 28 жніўня. Напамін гродзенскай камісіі пра свой праект прымусовай паншчыны у Вышэйшую раду 223

№ 98. 29 жніўня. Адозва гродзенскай камісіі да абывацеляў павета з нагоды нарыхтоўкі вайсковага правіянту 224

№ 99. 30 жніўня. Тлумачэнне аддзела гродзенскай камісіі сваёй кампетэнцыі на прыкладзе пакражы каня яўрэя І.Шломавіча 226

№ 100. Рапарт аддзела харчу гродзенскай камісіі аб сваёй дзейнасці паміж 24 і 31 жніўня 227

№ 101. Рапарт аб пленарных пасяджэннях гродзенскай камісіі з 24 да 31 жніўня 233

№ 102. 2 верасня. Зварот Цэнтральнай дэпутацыі да абывацеляў з аб'явай аб разліку скарбовымі білетамі за харчовыя рэквізіцыі 246

№ 103. Рапарт аб дзеяннях аддзела харчу гродзенскай камісіі з 1 да 7 верасня 247

№ 104. Справаздача гродзенскай камісіі з 1 да 7 верасня 255

№ 105. Дыяруш дзеянняў гродзенскага аддзела харча з 7 да 13 верасня 264

№ 106. Дыяруш гродзенскай камісісі з 7 да 14 верасня 270

№ 107. 18 верасня. Зварот дырэктара гродзенскай мануфактуры Я.Бульчынскага 282

№ 108. 19 верасня. Паведамленне палкоўніка Ю.Нарбута аб абаротах непрыяцеля 283

№ 109. 20 верасня. Зварот гродзенскай камісіі ў Вышэйшую раду з тлумачэннем цяжкасцяў уласнага ўрадавання 284

№ 110. 20 верасня. Рапарт гродзенскага ўпраўляючага М.Эйсманта адносна тэрытарыяльных прэтэнзій мерацкай камісіі 286

№ 111. Дыяруш аддзела харчу гродзенскай камісіі паміж 14 і 20 верасня 287

№ 112. Справаздача гродзенскай камісіі аб сваіх пленумах з 14 па 21 верасня 295

№ 113. 24 верасня. Зварот гродзенскай камісіі ў ЦД з прапановай справядлівага размеркавання скарбовых асігнацый 305

№ 114. 27 верасня. Заява гродзенскага генерал-маёра А.Казаноўскага адносна фурманак 306

№ 115. 27 верасня. Загад Цэнтральнай дэпутацыі кляштарам тэрмінова здаць рахункі капітоўнасцяў 306

№ 116. Справаздача аддзела харчу гродзенскай камісіі ад 21 да 28 верасня 307

№ 117. Дыяруш гродзенскай камісіі з 21 да 28 верасня 315

№ 118. 30 верасня. Разлік гродзенскай камісіі падрада з яўрэямі 324

№ 119. 30 верасня. Зварот гродзенскіх купцоў у ЦД ВКЛ за аплатай падрада сукна 324

№ 120. 1 кастрычніка. Меркаванні гродзенскай камісіі аб цяжкасцях пры нарыхтоўцы харчовых запасаў 325

Навуковае выданне

Анішчанка Яўген Канстанцінавіч

ЗБОР ТВОРАЎ У ШАСЦІ ТАМАХ

ТОМ 1

КАМІСАРЫ КАСЦЮШКІ
Дакументы паўстання 1794 г. у Літоўскай правінцыі

У аўтарскай рэдакцыі

Камп'ютарны набор *Таццяны Пуцейка*
Адказны за выпуск *Віктар Хурсік*

Падпісана ў друк 21.01.2004. Фармат 60x84 1/16.
Папера афсетная. Гарнітура Школьная. Афсетны друк.
Ум.-друк. арк. 21,2. Улік.-выд. арк. 12,32.
Наклад 150 асобнікаў. Замова 296

Індывідуальны прадпрымальнік Віктар Хурсік
Ліцэнзія ЛВ 573 выдадзена 18.11.2002
220117 Мінск, прасп. імя газ. "Известия", д.57, кв. 31.
тэл. 2703382

Надрукавана з арыгінал-макета выдаўца
ў друкарні УП "Ходр" БелТІЗ.
220004 Мінск, вул. Вызвалення, 9.
Ліцэнзія ЛП №91 выдадзена 12.12.2002

Касцюшка пад Рацлавіцамі

ISBN 985-6718-16-3
9 799856 718160 >

Publisher
Khursik Viktar

The order and buying by:
E-mail: Khursik_Viktor@tut.by